ГЕАГРАФІЯ

КРАІНЫ І НАРОДЫ



8

ГЕАГРАФІЯ

КРАІНЫ І НАРОДЫ

Вучэбны дапаможнік для 8 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2019

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 911(075.3=161.3)
ББК 26.8я721
Г27

А ў т а р ы: П. С. Лопух (ад аўтараў; § 5–10; 15–18; 50–57), М. Л. Страха (§ 1–4; 11–14; 19–49; метадычны апарат), В. У. Сарычава (ад аўтараў; § 5–10; 15–18; 50–57; метадычны апарат), А. Г. Шандроха (метадычны апарат да § 19–49)

Пераклад з рускай *Т. К. Слауты*

Р э ц э н з е н т ы: кафедра турызму і краіназнаўства ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (кандыдат геаграфічных навук, дацэнт *С. В. Арцёменка*); настаўнік геаграфіі кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы «Сярэдняя школа № 3 імя В. М. Усава г. Гродна» *В. М. Садомцава*

Для мастацкага афармлення вучэбнага дапаможніка выкарыстаны ілюстрацыі, набытыя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку на гандлёвай пляцоўцы Shutterstock

ISBN 978-985-599-063-6

© Слаута Т. К., пераклад на беларускую мову, 2019
© Геаграфічная аснова. Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь, 2019
© РУП «Белкартаграфія», 2019
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2019

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ЗМЕСТ

Ад аўтараў 6

§ 1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія. Аб’ект і прадмет вывучэння. 8

РАЗДЗЕЛ I. НАСЕЛЬНІЦТВА І ЯГО ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ 12

ТЭМА 1. ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ 12

§ 2. Палітычная карта свету і асаблівасці яе фарміравання 12

§ 3. Дзяржавы свету па формах праўлення, палітыка-тэрытарыяльным уладкаванні, памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва. 15

§ 4. Якасныя і колькасныя змены на палітычнай карце. Этапы фарміравання палітычнай карты свету 20

ТЭМА 2. НАСЕЛЬНІЦТВА СВЕТУ 24

§ 5. Колькасць насельніцтва свету і яе дынаміка. Міграцыі насельніцтва 24

§ 6. Размяшчэнне насельніцтва. Гарады і сельскія паселішчы 29

§ 7. Расавы і этнічны склад насельніцтва свету. Геаграфія рэлігій свету. 34

§ 8. Геаграфія матэрыяльнай і духоўнай культуры 38

ТЭМА 3. ПРЫРОДНЫЯ РЭСУРСЫ І ІХ РОЛЯ Ў ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА. 43

§ 9. Паняцце аб прыродных рэсурсах 43

§ 10. Размяшчэнне радовішчаў асноўных відаў мінеральных рэсурсаў і іх сувязь з тэктанічнай будовай Зямлі 49

ТЭМА 4. АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ГАСПАДАРКІ 53

§ 11. Паняцце аб гаспадарцы. Структура гаспадаркі 53

§ 12. Фактары размяшчэння гаспадаркі 58

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 13. Паняцце аб сусветным рынку, сусветным гандлі і сусветнай гаспадарцы 62
§ 14. Паказчыкі ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краін 66

ТЭМА 5. СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА 70
§ 15. Сельская гаспадарка і яе галіновая структура 70
§ 16. Раслінаводства. Геаграфія вырошчвання збожжавых культур 74
§ 17. Раслінаводства. Геаграфія вырошчвання тэхнічных культур і бульбы 77
§ 18. Геаграфія жывёлагадоўлі 82

ТЭМА 6. ПРАМЫСЛОВАСЦЬ 87
§ 19. Здабыўная прамысловасць 87
§ 20. Энергетыка. Вытворчасць электраэнергіі 90
§ 21. Апрацоўчая прамысловасць. Металургія 95
§ 22. Машынабудаванне 100
§ 23. Хімічная прамысловасць 104
§ 24. Лясная гаспадарка і лясная прамысловасць 109
§ 25. Лёгкая і харчовая прамысловасць 112

ТЭМА 7. СФЕРА ПАСЛУГ 116
§ 26. Сфера паслуг: структура і асаблівасці размяшчэння 116
§ 27. Транспарт 119
§ 28. Геаграфія турызму і гандлю 124

РАЗДЗЕЛ II. РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД СВЕТУ 128

ТЭМА 8. ЕЎРОПА 128
§ 29. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Еўропы. Краіны Паўночнай Еўропы. Вялікабрытанія 128
§ 30. Фінляндыя, Швецыя, Данія, Ісландыя, Нарвегія 133
§ 31. Літва, Латвія, Эстонія 136
§ 32. Краіны Заходняй Еўропы. Германія 139
§ 33. Францыя 143
§ 34. Краіны Паўднёвай Еўропы. Італія 147
§ 35. Краіны Усходняй Еўропы. Польшча 152
§ 36. Украіна 155

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 9. РАСІЙСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ 159
§ 37. Расія на палітычнай карце свету 159
§ 38. Насельніцтва Расіі. Дэмаграфічныя працэсы 162
§ 39. Геаграфія прамысловасці Расіі 166
§ 40. Геаграфія сельскай гаспадаркі і транспарту Расіі 170

ТЭМА 10. АЗІЯ 176
§ 41. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Азіі. Краіны Усходняй Азіі. Японія 176
§ 42. Кітай 181
§ 43. Краіны Паўднёвай Азіі. Індыя 186
§ 44. Краіны Цэнтральнай Азіі: Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Туркменістан, Кыргызстан 190
§ 45. Краіны Заходняй Азіі: Азербайджан, Арменія, Грузія 194

ТЭМА 11. ПАЎНОЧНАЯ І ЦЭНТРАЛЬНАЯ АМЕРЫКА 199
§ 46. Паўночная і Цэнтральная Амерыка. Палітычная карта. Насельніцтва 199
§ 47. Краіны Паўночнай Амерыкі. Злучаныя Штаты Амерыкі 202
§ 48. Канада 208
§ 49. Краіны Цэнтральнай Амерыкі. Мексіка 211

ТЭМА 12. ПАЎДНЁВАЯ АМЕРЫКА 214
§ 50. Палітычная карта і насельніцтва Паўднёвай Амерыкі 214
§ 51. Агульная характарыстыка гаспадаркі Паўднёвай Амерыкі. Экалагічныя праблемы гаспадарчага асваення рэгіёна 217
§ 52. Бразілія 222

ТЭМА 13. АФРЫКА 227
§ 53. Палітычная карта і насельніцтва Афрыкі 227
§ 54. Агульная характарыстыка гаспадаркі Афрыкі 230
§ 55. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна: Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Егіпет 234

ТЭМА 14. АЎСТРАЛІЯ І АКІЯНІЯ 240
§ 56. Аўстралійскі Саюз 240
§ 57. Акіянія. Новая Зеландыя 244

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

АД АЎТАРАЎ

Паважаныя васьмікласнікі!

У папярэдніх курсах геаграфіі вы пазнаёміліся з асноўнымі прыроднымі працэсамі і з'явамі, якія адбываюцца у геаграфічнай абалонцы Зямлі, а таксама з фізіка-геаграфічнымі асаблівасцямі прыроды мацерыкоў і акіянаў. Атрыманыя веды дапамогуць вам у гэтым навучальным годзе асвоіць асновы новага раздзела геаграфічнай навукі — грамадскай, або сацыяльна-эканамічнай, геаграфіі. Вы пазнаёміцеся з асноўнымі паняццямі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі, з асаблівасцямі насельніцтва і яго гаспадарчай дзейнасці ў свеце, асобных рэгіёнах і краінах, з заканамернасцямі тэрытарыяльнай арганізацыі эканамічнага жыцця грамадства. Мацерыкі ў дадзеным курсе разглядаюцца як макрарэгіёны, у іх складзе — рэгіёны і краіны, якія, у сваю чаргу, з'яўляюцца часткай рэгіёнаў.

Прапануем даведацца, як складзены вучэбны дапаможнік «Геаграфія. Краіны і народы». Ва ўступным параграфе дапаможніка разглядаюцца аб'ект і прадмет сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Вучэбны дапаможнік складаецца з двух раздзелаў: агульнага і рэгіянальнага. Вывучаючы матэрыял першага раздзела, вы пазнаёміцеся з палітычнай картай свету і асаблівасцямі яе фарміравання, насельніцтвам і асноўнымі дэмаграфічнымі працэсамі, якія адбываюцца ў свеце, а таксама з прыроднымі рэсурсамі і іх роляй у жыцці чалавека, агульнай характарыстыкай гаспадаркі, асноўнымі яе галінамі і відамі дзейнасці. Другі раздзел прысвечаны рэгіянальнаму агляду зямнога шара, агульным і рэгіянальным сацыяльна-эканамічным адрозненням Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі, Аўстраліі і Акіяніі, комплекснай эканоміка-геаграфічнай характарыстыцы рэгіёнаў і найбуйнейшых краін свету.

Тэмы раздзелаў вучэбнага дапаможніка структураваныя такім чынам, што пытанні, якія разглядаюцца ў іх, адпавядаюць тэмам урокаў. Кожную тэму ўрока адкрываюць рубрыкі «Успамінаем»  , «Разважаем»  . Першая рубрыка прапануе вам успомніць раней пройдзены матэрыял, неабходны для вывучэння новай тэмы, другая — утрымлівае найбольш актуальнае пытанне, на якое нацэлена тэма ўрока.

Тэкст параграфаў уключае наступныя рубрыкі. Рубрыка «Асноўныя паняцці» (вылучана колерам і значком ) змяшчае фармулёўкі новых асноўных паняццяў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. «Важная

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

інфармацыя» ўтрымліваецца ў рубрыцы, пазначанай . У каляровай рамцы размешчаны дадатковыя матэрыялы рубрыкі «Даведацца больш», якія ўключаюць цікавыя звесткі або факты, прысвечаныя матэрыялам урока. Для поўнага засваення матэрыялу навучальнага дапаможніка вам спатрэбіцца інфармацыя, змешчаная ў геаграфічным атласе «Геаграфія. Краіны і народы» для 8 класа. Спасылка на неабходнасць звярнуцца да навучальнага атласа пазначана значком з указаннем старонкі размяшчэння карты або дыяграмы. Пытанні па тэксце і геаграфічныя назвы, прызначаныя для абавязковага запамінання, вылучаны ў тэксце параграфаў *курсівам*.

Ключавыя палажэнні ў тэксце параграфа вылучаны сінім колерам.

У канцы кожнага параграфа размешчаны выніковыя рубрыкі. Кароткія вывады тэмы вылучаны колерам у рубрыцы «Абагульнім і запомнім!» . Яны дазваляюць паўтарыць і замацаваць самае галоўнае са зместу вывучанага матэрыялу параграфа. Рубрыка «Праверым сябе» змяшчае пытанні, якія даюць магчымасць праверыць паўнату засвоенага матэрыялу ўрока. Заданні рубрыкі «Ад тэорыі да практыкі» выконваюцца з мэтай набыцця і замацавання практычных уменняў. Заданні рубрык «Абмяркуем» і «Для дапытлівых» разлічаны на зацікаўленых у больш глыбокім вывучэнні геаграфіі. З дапамогай QR-кода вы зможаце паглядзець на мабільнай прыладзе (смартфоне або планшэце) відэаматэрыялы, якія дэманструюць асаблівасці тэхналагічных працэсаў асноўных вытворчасцей.

Жадаем поспехаў у вывучэнні сацыяльна-эканамічнай геаграфіі!

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія. Аб’ект і прадмет вывучэння



Успамінаем. *Што з’яўляецца аб’ектам і прадметам вывучэння геаграфіі? Якія навукі ўваходзяць у склад геаграфіі?*



Разважаем. *Навошта чалавеку патрэбны веды ў галіне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі?*

1.1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія. Аб’ект і прадмет вывучэння. З курса фізічнай геаграфіі вы ўжо ведаеце, што геаграфія — гэта сістэма ўзаемазвязаных паміж сабой навук. Усе разам яны фарміруюць нашы веды аб геаграфічнай абалонцы Зямлі, яе будове і працэсах, якія адбываюцца ў ёй. Геаграфічная абалонка — агульны аб’ект вывучэння ўсіх геаграфічных навук. Прыродную частку геаграфічнай абалонкі Зямлі вывучае фізічная геаграфія. *(Успомніце, з якіх кампанентаў складаецца зямная прырода і якія геаграфічныя навукі іх вывучаюць.)* Неад’емная частка геаграфічнай абалонкі Зямлі — грамадства, якое, знаходзячыся ва ўзаемадзеянні з навакольным прыродным асяроддзем, з’яўляецца аб’ектам вывучэння грамадскай або сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.

Галоўны прадмет любога геаграфічнага даследавання — размяшчэнне аб’ектаў. Сацыяльна-эканамічная геаграфія вывучае асаблівасці размяшчэння грамадства. Грамадства як складанае ўтварэнне ўключае насельніцтва, яго гаспадарчую дзейнасць і вынікі гэтай дзейнасці — матэрыяльную і духоўную культуру. Таму ў складзе сацыяльна-эканамічнай геаграфіі вылучаюць асобныя напрамкі, якія маюць свае, больш канкрэтныя аб’ект і прадмет вывучэння. Напрыклад, асаблівасці размяшчэння насельніцтва вывучае геаграфія насельніцтва, а размяшчэнне гаспадарчай дзейнасці людзей — эканамічная геаграфія. У кожнай з іх можна вылучыць больш вузкія напрамкі. У эканамічнай геаграфіі, напрыклад, вылучаюць геаграфію прамысловасці, геаграфію сельскай гаспадаркі, геаграфію транспарту. Сацыяльна-эканамічная геаграфія — гэта навука, якая вывучае асаблівасці размяшчэння насельніцтва і гаспадарчай дзейнасці людзей як у свеце ў цэлым, так і ў асобных рэгіёнах і краінах. Яна ўключае эканамічную геаграфію, геаграфію насельніцтва і палітычную геаграфію (табл. 1).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Табліца 1. Склад сацыяльна-эканамічнай геаграфіі

Сацыяльна-эканамічная геаграфія											
Эканамічная геаграфія				Геаграфія насельніцтва (сацыяльная геаграфія)					Палітычная геаграфія		
Геаграфія прамысловасці	Геаграфія сельскай гаспадаркі	Геаграфія транспарту	Геаграфія паслуг	Геадэмаграфія	Геаграфія рэлігій	Этнічная геаграфія	Геаграфія міграцый	Геаграфія рассялення	Геаграфія выбараў	Ваенная геаграфія	Геаграфія канфліктаў

1.2. Роля сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў жыцці чалавека і грамадства. Любая навука развіваецца, задавальняючы патрэбы грамадства ў пэўных ведах. Сацыяльна-эканамічная геаграфія не з’яўляецца выключэннем. Фактарамі, якія вызначалі ўзнікненне і наступнае развіццё грамадскай геаграфіі, былі практычныя патрэбы гандлю, кіравання, ваеннай справы. У перыяд апісальнай геаграфіі ў геаграфічных працах прыводзіліся падрабязныя звесткі аб гаспадарчай дзейнасці людзей на розных тэрыторыях, аб дзяржаўным ладзе гэтых тэрыторый. Такія звесткі былі карысныя перш за ўсё для ўстанаўлення і развіцця гандлёвых сувязей.

Адной з найважнейшых задач, якія стаяць перад сучасным грамадствам, з’яўляецца дасягненне ўстойлівага развіцця, што дазволіць будучым пакаленням людзей жыць не горш, чым жыве цяперашняе пакаленне. Арганізацыяй Аб’яднаных Нацый (ААН) вызначаны мэты ўстойлівага развіцця, якія ўключаюць эканамічныя аспекты (аптымальнае спажыванне і вытворчасць), сацыяльныя (якасць жыцця і адукацыя), экалагічныя (экалагічна аптымальныя ўмовы жыцця). Дасягненне гэтых мэт магчыма толькі з улікам асаблівасцей кожнай канкрэтнай тэрыторыі. Атрыманыя сацыяльна-эканамічнай геаграфіяй веды дазваляюць ацаніць сучасны ўзровень развіцця любой тэрыторыі і вызначыць прыярытэтныя напрамкі для яе ўстойлівага развіцця.

Вялікая светапоглядная роля сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Атрыманыя веды дазволяць вам лепш арыентавацца ў сучасным свеце,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

разумець палітычныя і эканамічныя працэсы, што адбываюцца ў ім, мець уяўленне аб жыцці людзей у іншых краінах, іх культуры, традыцыях, звычаях. Гэтыя веды спрыяюць у тым ліку і патрыятычнаму выхаванню чалавека. Яны дазваляюць бачыць месца сваёй краіны сярод іншых краін свету, даюць уяўленне аб яе ролі ў рэгіянальных і агульнасусветных працэсах.

З'яўляючыся адной з самых старажытных навук, геаграфія працягвае быць неабходнай і запатрабаванай у сучасным грамадстве. Развіваючыся, яна дае адказы на самыя надзённыя пытанні сучаснасці. Разам з іншымі навукамі яна дапамагае шукаць адказ на галоўнае пытанне: як чалавецтву ўладкаваць свой дом — планету Зямля — так, каб жыццё цяперашніх і будучых пакаленняў у кожным рэгіёне, у кожнай краіне і ў кожнай мясцовасці было камфортным.

1.3. Рэгіёны свету ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Сучасны свет — гэта каля 300 краін, якія размешчаны на розных мацерыках і ў розных частках свету. Краіны адрозніваюцца паміж сабой памерамі тэрыторыі, колькасцю насельніцтва, асаблівасцямі развіцця гаспадаркі. Кожная з іх прайшла свой гістарычны шлях развіцця, у працэсе якога сфарміраваліся асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Аднак паміж краінамі, размешчанымі на адной тэрыторыі, маюцца агульныя рысы: падабенства геаграфічнага становішча і прыродных умоў. Пад уплывам прыроднага падабенства шмат агульнага з'яўляецца ў гісторыі засялення і асваення тэрыторыі чалавекам, у гаспадарчай дзейнасці, у аб'ектах матэрыяльнай і духоўнай культуры. Такое падабенства краін дазваляе аб'ядноўваць іх у рэгіёны.

Рэгіён у сацыяльна-эканамічнай геаграфіі — гэта частка тэрыторыі зямнога шара, на якой размяшчаюцца краіны, што характарызуюцца падабенствам геаграфічнага становішча, агульнасцю гістарычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця.

Краіны, размешчаныя ў адным рэгіёне, як правіла, актыўна супрацоўнічаюць паміж сабой, развіваюць эканамічныя, палітычныя, культурныя сувязі. Разам яны аб'ядноўваюць намаганні для вырашэння праблем, якія ўзнікаюць, у тым ліку экалагічных, звязаных з забруджваннем і разбурэннем навакольнага прыроднага асяроддзя. Таму рэгіёны, гэтак жа як і асобныя краіны, з'яўляюцца важным аб'ектам вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.

У адпаведнасці з прапановай ААН увесь свет дзеліцца на пяць буйных макрарэгіёнаў (Еўропа, Азія, Амерыка, Афрыка, Аўстралія і Акіянія), у кожным з якіх вылучаецца некалькі рэгіёнаў ніжэйшага парадку (форзац 2).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У Еўропе вылучаюцца: Заходняя Еўропа, Паўночная Еўропа, Паўднёвая Еўропа, Усходняя Еўропа, у Азіі — Заходняя Азія, Цэнтральная Азія, Паўднёвая Азія, Усходняя Азія, Паўднёва-Усходняя Азія, у Афрыцы — Паўночная Афрыка, Заходняя Афрыка, Цэнтральная Афрыка, Усходняя Афрыка, Паўднёвая Афрыка, у Амерыцы — Паўночная Амерыка, Цэнтральная Амерыка, Карыбскі басейн, Паўднёвая Амерыка, у Аўстраліі і Акіяніі — Аўстралія і Новая Зеландыя, Меланезія, Мікранезія, Палінезія. *(Знайдзіце іх на карце.)*

с. 48

Межы рэгіёна праводзяцца па межах краін, што ў яго ўваходзяць. У кожным рэгіёне ёсць краіны — рэгіянальныя лідары, якія адыгрываюць вызначальную ролю ў яго эканамічным, палітычным, культурным развіцці. Напрыклад, у Паўночнай Амерыцы гэта ЗША, у Паўднёвай Амерыцы — Бразілія, у Заходняй Еўропе — Федэратыўная Рэспубліка Германія (ФРГ) і Францыя.

Абагульнім і запомнім. Аб’ектам вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі з’яўляецца грамадства і яго складовыя часткі: насельніцтва, гаспадарчая дзейнасць людзей, матэрыяльная і духоўная культура. Прадмет вывучэння эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі — асаблівасці размяшчэння насельніцтва і гаспадарчай дзейнасці людзей. Веды, атрыманыя сацыяльна-эканамічнай геаграфіяй, дапамагаюць людзям эфектыўна выкарыстоўваць тэрытарыяльныя рэсурсы, вырашаць экалагічныя праблемы. Пры вылучэнні рэгіёнаў у сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ўлічваюцца асаблівасці геаграфічнага становішча краін, падабенства ў развіцці насельніцтва і гаспадаркі, матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Праверым сябе. 1. Што агульнага паміж геаграфічнымі навукамі? 2. Што з’яўляецца аб’ектам і прадметам сацыяльна-эканамічнай геаграфіі? 3. Якую ролю ў жыцці чалавека і грамадства адыгрываюць веды ў галіне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі? 4. Што такое рэгіён і для чаго праводзіцца рэгіяналізацыя свету? 5. На якія рэгіёны дзеліцца сучасны свет?

Ад тэорыі да практыкі. Уявіце, што вы з’яўляецеся прадпрымальнікам і збіраецеся адкрыць сетку прадпрыемстваў рознічнага гандлю ў буйным населеным пункце. Як вы думаеце, ці спатрэбяцца вам геаграфічныя веды пры выбары канкрэтнага месца для размяшчэння гандлёвых прадпрыемстваў? Свой адказ абгрунтуйце.

Абмяркуем. Якую практычную значнасць мае рэгіяналізацыя свету?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

РАЗДЗЕЛ І. НАСЕЛЬНІЦТВА І ЯГО ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

ТЭМА 1. ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ



§ 2. Палітычная карта свету і асаблівасці яе фарміравання

Успамінаем. *Што з'яўляецца аб'ектам і прадметам вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі? Якія навукі ўваходзяць у склад сацыяльна-эканамічнай геаграфіі?*

Разважаем. *Ці заўсёды краіна з'яўляецца дзяржавай? Чаму існуюць залежныя тэрыторыі?*

2.1. Палітычная карта свету. Важным элементам жыцця грамадства з'яўляецца палітыка. Гэта асаблівая сфера дзейнасці, якая звязана з кіраваннем грамадствам. Для ажыццяўлення кіравання грамадствам ствараецца спецыяльны механізм, які называецца дзяржавай.

Палітыка як асаблівая сфера дзейнасці грамадства з'яўляецца аб'ектам вывучэння палітычнай геаграфіі — самастойнай навукі ў складзе сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Палітыка ажыццяўляецца на пэўнай тэрыторыі і залежыць ад яе асаблівасцей: геаграфічнага становішча, памераў, наяўнасці прыродных рэсурсаў. Як вынік, на кожнай тэрыторыі фарміруюцца своеасаблівыя палітыка-тэрытарыяльныя ўтварэнні, якія вывучаюцца палітычнай геаграфіяй.

Галоўнае палітыка-тэрытарыяльнае ўтварэнне сучаснага грамадства — дзяржава. Акрамя дзяржаў, існуюць і іншыя палітыка-тэрытарыяльныя ўтварэнні: залежныя тэрыторыі, тэрыторыі з міжнародным статусам. Усе палітыка-тэрытарыяльныя ўтварэнні, а таксама розныя палітычныя працэсы і з'явы могуць быць адлюстраваны на карце.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Палітычная карта — геаграфічная карта, на якой адлюстраваны дзяржавы, іх межы і сталіцы, залежныя тэрыторыі і іх адміністрацыйныя цэнтры.

Рознымі ўмоўнымі знакамі на палітычнай карце могуць паказвацца формы праўлення і палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржаў, раёны канфліктаў, спрэчныя тэрыторыі і іншая інфармацыя, якая характарызуе палітычнае жыццё грамадства.

2.2. Краіны і дзяржавы ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. У сацыяльна-эканамічнай геаграфіі паняцці «краіна» і «дзяржава» нераўназначныя. Паняцце «краіна» больш шырокае і ёмістае, чым паняцце «дзяржава». Кожная дзяржава з'яўляецца краінай, але не кожная краіна з'яўляецца дзяржавай.

Паняцце «краіна» мае пераважна сацыяльна-эканамічны і гісторыка-культурны змест. Краіну можна вызначыць як тэрыторыю, на якой пражывае пастаяннае насельніцтва. Для насельніцтва краіны характэрныя пэўны ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, палітычнай арганізацыі, своеасаблівая культура і гаспадарчая дзейнасць. З палітычнага пункту гледжання краіна можа валодаць суверэнітэтам (незалежнасцю), і тады яна адначасова з'яўляецца дзяржавай. Але краіна можа і не валодаць суверэнітэтам, а мець толькі пэўны ўзровень самакіравання. У гэтым выпадку яна будзе знаходзіцца ў залежнасці ад іншай суверэннай дзяржавы (залежная тэрыторыя) або быць яе часткай (аўтаномія, суб'ект федэрацыі, самаабвешчаная дзяржава).

Галоўная прыкмета дзяржавы — гэта суверэнітэт, ці незалежнасць. **Дзяржаўны суверэнітэт** — гэта норма міжнароднага права, якая дазваляе дзяржаве самастойна, без умяшання з боку іншых дзяржаў, вырашаць пытанні свайго ўнутранага жыцця (унутраная палітыка) і будаваць адносіны з іншымі дзяржавамі (знешняя палітыка).

Адрозненні паміж паняццямі «краіна» і «дзяржава» добра відаць на прыкладзе Індыі. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі сучаснай Індыі ўзніклі задоўга да нашай эры. Аднак у XVIII ст. нашай эры практычна ўся тэрыторыя сучаснай Індыі страціла свой суверэнітэт і доўгі час знаходзілася ў каланіяльнай залежнасці ад Вялікабрытаніі. Індыя як дзяржава знікла, але як вялікая краіна, са сваёй рэлігіяй, культурай, самасвядомасцю насельніцтва, яна працягвала існаваць. Індыя як суверэнная дзяржава аднавілася ў 1947 г., дабіўшыся незалежнасці ад Вялікабрытаніі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

З 300 краін свету толькі 194 — суверэнныя дзяржавы. Акрамя суверэнных дзяржаў, краінамі лічацца залежныя тэрыторыі, на якіх пражывае пастаяннае насельніцтва, а таксама самаабвешчаныя, але не прызнаныя дзяржавы, суб'екты федэрацый і аўтаномныя ўтварэнні ў складзе дзяржаў.

2.3. Суверэнныя дзяржавы і залежныя тэрыторыі. Суверэнітэт — галоўная і асноватворная прыкмета незалежнай дзяржавы. Сярод іншых найважнейшых прыкмет — наяўнасць тэрыторыі, пастаяннага насельніцтва, нацыянальнай гаспадаркі, сістэмы органаў улады, сталіцы, нацыянальнага заканадаўства. Дзяржавы маюць таксама асноўныя сімвалы: герб, сцяг, гімн.

Суверэнная дзяржава — гэта краіна, якая валодае дзяржаўным суверэнітэтам, што распаўсюджваецца на пэўную тэрыторыю, у межах якой пражывае пастаяннае насельніцтва, вядзецца гаспадарчая дзейнасць і працуе сістэма органаў улады, што ажыццяўляюць унутраную і знешнюю палітыку.

Акрамя дзяржаў, існуюць палітыка-тэрытарыяльныя ўтварэнні (тэрыторыі), якія знаходзяцца ў рознай ступені залежнасці ад суверэнных дзяржаў, але валодаюць пры гэтым пэўным узроўнем самакіравання. Большасць сучасных залежных тэрыторый — гэта былыя калоніі, якія ў сілу шэрага абставін не змаглі атрымаць незалежнасць. Больш за ўсё залежных тэрыторый у Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША. Ёсць яны таксама ў Нідэрландаў, Аўстраліі, Новай Зеландыі і некаторых іншых дзяржаў.

2.4. Дзяржаўная мяжа. Кожная дзяржава фарміруецца і развіваецца на пэўнай тэрыторыі, г. зн. у межах пэўнай часткі геаграфічнай абалонкі Зямлі. Частка геаграфічнай абалонкі Зямлі, на якую распаўсюджваецца суверэнітэт дзяржавы, называецца тэрыторыяй дзяржавы. У склад тэрыторыі дзяржавы абавязкова ўваходзіць адзін або некалькі ўчасткаў сушы разам з унутранымі водамі (рэкі, азёры, вадасховішчы, балоты). Калі дзяржава мае выхад да мораў або акіянаў, то ў яе склад уваходзяць тэрытарыяльныя воды — прылеглая да сушы водная прастора мораў і акіянаў пэўнай шырыні. Суверэнітэт дзяржавы распаўсюджваецца таксама на паветраную прастору над сушай і тэрытарыяльнымі водамі і на зямныя нетры пад імі.

Тэрыторыі дзяржаў аддзяляюцца адна ад другой, а таксама ад тэрыторый, якія маюць міжнародны статус, дзяржаўнымі межамі. **Дзяржаўная мяжа** — гэта рэальная, пазначаная на мясцовасці або ўяўная лінія, якая

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вызначае межы прасторавага распаўсюджвання дзяржаўнага суверэнітэту. Дзяржаўныя межы з дапамогай пэўных умоўных знакаў пазначаюцца на карце. Межы паміж дзяржавамі ўсталёўваюцца на аснове дамовы паміж імі з улікам нормаў міжнароднага права. Самую працяглую дзяржаўную мяжу мае Расія — каля 60 000 км, у яе ж і самая працяглая водная мяжа — каля 40 000 км.

Працэс устанаўлення меж праходзіць у два этапы. Спачатку дзяржавы дамаўляюцца аб месцы праходжання мяжы паміж імі і абазначаюць яе на картах. Гэты працэс называецца дэлімітацыяй. Затым адбываецца дэмаркацыя дзяржаўнай мяжы — абазначэнне яе на мясцовасці.

Абагульнім і запомнім. Прадметам вывучэння палітычнай геаграфіі з'яўляецца палітыка-тэрытарыяльная арганізацыя грамадства. Палітычная карта — спецыяльная геаграфічная карта, на якой адлюстраваны дзяржавы, іх сталіцы і межы, залежныя тэрыторыі і іх адміністрацыйныя цэнтры. Кожная дзяржава з'яўляецца краінай, але не кожная краіна з'яўляецца дзяржавай. Дзяржаўная мяжа — гэта лінія, якая пазначае межы прасторавага распаўсюджвання дзяржаўнага суверэнітэту.

Праверым сябе. 1. Што вывучае палітычная геаграфія? 2. Якія аб'екты адлюстроўваюцца на палітычнай карце свету? 3. У чым адрозненне паміж краінай і дзяржавай? 4. Якія асноўныя прыкметы дзяржавы? 5. Што ўяўляюць з сябе залежныя тэрыторыі? 6. Што ўключае ў сябе тэрыторыя дзяржавы?

Ад тэорыі да практыкі. Уявіце, што вас уключылі ў склад камісіі па ўсталяванні дзяржаўнай мяжы. Якой будзе паслядоўнасць дзеянняў гэтай камісіі?

Абмяркуем. Чаму не кожную краіну можна назваць дзяржавай?

§ 3. Дзяржавы свету па формах праўлення, палітыка-тэрытарыяльным уладкаванні, памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва

Успамінаем. *У чым асноўнае адрозненне паміж краінай і дзяржавай? Што ўваходзіць у склад тэрыторыі дзяржавы?*

Разважаем. *Чаму сучасныя дзяржавы адрозніваюцца па формах праўлення і палітыка-тэрытарыяльным уладкаванні? Якое значэнне для дзяржавы мае памер тэрыторыі і колькасць насельніцтва?*

3.1. Формы праўлення дзяржаў. Як вы ўжо ведаеце, на сучаснай палітычнай карце свету налічваецца 194 суверэнныя дзяржавы. Усе яны

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

розныя і не падобныя адна на адну. Але ў той жа час існуюць агульныя для розных дзяржаў прыкметы, якія дазваляюць ажыццяўляць іх групоўку, зыходзячы з падабенства па нейкай прыкмеце. *(Успомніце, якая прыкмета для дзяржавы з'яўляецца асноватворнай.)*

Для кожнай дзяржавы характэрны пэўны дзяржаўны лад. Ён дае ўяўленне аб тым, каму належыць улада ў дзяржаве, як яна рэалізуецца, колькі існуе ўзроўняў улады.

Форма праўлення залежыць ад таго, каму належыць улада ў дзяржаве і якімі спосабамі яе атрымліваюць. Дзяржавы могуць мець або рэспубліканскую (рэспубліка), або манархічную (манархія) форму праўлення.

Рэспубліка — дзяржава, у якой усе найвышэйшыя органы дзяржаўнай улады абіраюцца грамадзянамі або ствараюцца агульнадзяржаўнымі прадстаўнічымі ўстановамі.

У рэспубліках вярхоўным носьбітам улады з'яўляецца народ (народаўладдзе). Аднак сам народ непасрэдна ў паўсядзённым жыцці свае ўладныя паўнамоцтвы не рэалізуе, а дэлегуе іх пэўным выбарным прадстаўнікам (прэзідэнту) і органам (парламенту). Менавіта гэтыя прадстаўнікі і органы ад імя народа рэалізуюць яго ўладныя паўнамоцтвы. *(Падумайце, якія палітычныя працэсы, што перыядычна адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь, з'яўляюцца праявай непасрэднага народаўладдзя.)*

Калі найбольш значныя ўладныя паўнамоцтвы сканцэнтраваны ва ўсенародна абранага прэзідэнта, ***рэспубліка*** называецца ***прэзідэнцкай***. Прэзідэнцкімі рэспублікамі з'яўляюцца Беларусь, Казахстан. Калі ж ключавая роля ў дзяржаўным жыцці належыць парламенту, ***рэспубліка*** з'яўляецца ***парламенцкай*** (ФРГ, Індыя, Партугалія). Бываюць ***парламенцка-прэзідэнцкія рэспублікі***, у якіх уладныя паўнамоцтвы раўнамерна размеркаваны паміж парламентам і прэзідэнтам (Францыя, Украіна).

У дзяржавах з манархічнай формай праўлення асноўным носьбітам уладных паўнамоцтваў з'яўляецца манарх (кароль, князь, імператар, султан і г. д.). У залежнасці ад паўнаты ўлады, засяроджанай у руках манарха, манархіі бываюць абсалютнымі і абмежаванымі.

Манархія — дзяржава, у якой вярхоўная дзяржаўная ўлада цалкам ці часткова сканцэнтравана ў руках аднаасобнага кіраўніка дзяржавы — манарха — і, як правіла, перадаецца па спадчыне.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У нешматлікіх ***абсалютных манархіях*** у руках манарха сканцэнтравана ўся паўната ўлады (судовая, заканадаўчая, выканаўчая). Абсалютнымі манархіямі, напрыклад, з'яўляюцца Ватыкан, Саудаўская Аравія, Катар (мал. 1). У большасці сучасных манархій уладныя паўнамоцтвы манарха абмежаваны канстытуцыяй і парламентам, абраным народам. Такія ***манархіі*** называюць ***канстытуцыйнымі*** або ***парламенцкімі*** (Вялікабрытанія, Іспанія, Данія) (мал. 2).



Мал. 1. Эмір Катара



Мал. 2. Парламент Вялікабрытаніі

У манархіях уладу, як правіла, атрымлівае ў спадчыну адзін з прадстаўнікоў манаршага роду. Аднак бываюць і выбарныя манархіі, напрыклад Ватыкан. Усяго ў свеце ў цяперашні час налічваецца больш за 40 манархій. *(Па палітычнай карце свету ў атласе вызначце, у якіх макрарэгіёнах свету прадстаўлены пераважна рэспублікі, а ў якіх — манархіі.)*

с. 8–9

Спецыфічную групу манархій складаюць так званыя каралеўствы Садружнасці. Садружнасць нацый — гэта міжнародная арганізацыя, якая аб'ядноўвае 53 дзяржавы, у абсалютнай большасці — былыя калоніі Вялікабрытаніі. 16 дзяржаў (уключаючы Вялікабрытанію), што ўваходзяць у склад Садружнасці нацый, прызнаюць брытанскага манарха (каралеву Лізавету II) кіраўніком сваіх дзяржаў і фармальна з'яўляюцца манархіямі. Сярод іх Канада, Аўстралія, Новая Зеландыя.

3.2. Формы палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржаў. У залежнасці ад колькасці ўзроўняў улады ў дзяржаве і характару размежавання ўлады па тэрыторыі вылучаюць формы палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржаў. Адрозніваюць дзяржавы з унітарнай (унітарныя дзяржавы) і федэратыўнай (федэратыўныя дзяржавы) формамі палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання.

Унітарная дзяржава — гэта адзінае дзяржаўнае ўтварэнне, якое складаецца з адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, што падпарадкоўваюцца цэнтральным органам улады.

Унітарную форму палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання мае большасць дзяржаў свету, у тым ліку і Рэспубліка Беларусь.

с. 11

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ва ўнітарных дзяржавах могуць быць аўтаномныя ўтварэнні. Гэта часткі тэрыторыі дзяржавы, якія адрозніваюцца нацыянальнымі, культурнымі і іншымі асаблівасцямі. Прыкладам аўтаноміі з'яўляюцца Фарэрскія астравы ў складзе Каралеўства Данія.

Федэратыўная дзяржава (федэрацыя) — дзяржаўнае ўтварэнне, у якім існуюць два ўзроўні дзяржаўнай улады: агульнадзяржаўны ўзровень і ўзровень суб'ектаў федэрацыі.

Першы ўзровень улады ў федэрацыі — агульнадзяржаўны. Ёсць агульнафедэральныя законы, агульнафедэральныя прэзідэнт, парламент. Кампетэнцыя (паўнамоцтвы) агульнафедэральных органаў улады распаўсюджваецца на ўсю тэрыторыю дзяржавы без выключэння. Другі ўзровень улады складаюць суб'екты федэрацыі (штаты, землі, рэспублікі, правінцыі і г. д.), якія разам і ўтвараюць федэратыўную дзяржаву. У кожным суб'екце федэрацыі ёсць свае органы ўлады, якія вырашаюць пытанні ў адпаведнасці з заканадаўствамі суб'ектаў федэрацыі. Федэрацыямі з'яўляюцца як найбольш буйныя па памерах тэрыторыі дзяржавы (Расія, Канада, ЗША, Бразілія), так і адносна невялікія, напрыклад Бельгія. *(Як вы думаеце, якімі прычынамі можа быць абумоўлена федэратыўная форма ўладкавання дзяржаў?)*

3.3. Адрозненне дзяржаў па памерах тэрыторыі, колькасці насельніцтва. Дзяржавы свету істотна адрозніваюцца паміж сабой па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва. Для лепшага разумення гэтых адрозненняў і іх аналізу звычайна ажыццяўляюць групоўку дзяржаў. Так, па памеры тэрыторыі дзяржавы звычайна аб'ядноўваюць у наступныя групы: найбуйнейшыя, буйныя, вялікія, сярэднія, малыя і мікрадзяржавы (мал. 3). **Найбуйнейшыя дзяржавы** маюць плошчу тэрыторыі больш за 5 млн км^2. У гэтую групу ўваходзіць 6 дзяржаў: Расія (самая буйная па памерах тэрыторыі дзяржава свету — 17,2 млн км^2), *Канада, Кітай,* ЗША, Бразілія, Аўстралія. **Буйныя** дзяржавы плошчай ад 1 да 5 млн км^2 больш



Мал. 3. Групоўка дзяржаў свету па памерах тэрыторыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

шматлікія — іх 23. Сярод іх Індыя, Мексіка, Аргенціна. Групу **вялікіх** утвараюць дзяржавы з плошчай тэрыторыі ад 500 тыс. да 1 млн км^2. Такіх дзяржаў больш за 20, сярод іх Турцыя, Украіна, Францыя.

Найбольш шматлікай (больш за 70) з'яўляецца група **сярэдніх** дзяржаў з памерамі тэрыторыі ад 50 да 500 тыс. км^2. Сярод іх Германія, Беларусь, Польшча. Наступную групу складаюць **малыя** дзяржавы (1–50 тыс. км^2). Да іх адносяцца Данія, Бельгія, Ізраіль. Вылучаюць і групу **мікрадзяржаў**, плошча якіх не перавышае 1 тыс. км^2. Самая малая дзяржава свету — Ватыкан (усяго 0,44 км^2).

Як правіла, найбольш буйныя па памерах тэрыторыі дзяржавы з'яўляюцца і найбольш населенымі. Сусветным лідарам па колькасці насельніцтва доўгі час заставаўся *Кітай*. Цяпер у гэтай краіне пражывае каля 1 млрд 400 млн чалавек. Блізкая па колькасці насельніцтва да Кітая *Індыя* — 1 млрд 370 млн чалавек. У краінах, якія ідуць за імі, колькасць насельніцтва істотна меншая. У *ЗША* жыве больш за 300 млн чалавек, яшчэ ў 10 дзяржавах налічваецца больш за 100 млн чалавек у кожнай. Гэтыя дзяржавы адносяцца да ліку **найбуйнейшых** па колькасці насельніцтва. У іх засяроджана больш за 60 % усяго насельніцтва свету. Самая малая па колькасці насельніцтва дзяржава свету — Ватыкан (каля 1 тыс. чалавек).

Абагульнім і запомнім. Аснову дзяржаўнага ладу складаюць форма праўлення і форма палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання. Па форме праўлення дзяржавы дзеляцца на рэспублікі і манархіі. Па асаблівасцях палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання вылучаюць унітарныя і федэратыўныя дзяржавы. Сучасныя дзяржавы значна адрозніваюцца па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва.

Праверым сябе. 1. Што такое форма дзяржаўнага праўлення і якімі бываюць дзяржавы па форме праўлення? 2. У чым асноўнае адрозненне абсалютнай і абмежаванай манархій? 3. Якімі бываюць дзяржавы па форме палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання? 4. Колькі ўзроўняў улады ў федэратыўнай дзяржаве і як яны суадносяцца паміж сабой? 5. Як адрозніваюцца дзяржавы па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы карту атласа, вызначце, якія найбуйнейшыя па памерах тэрыторыі дзяржавы ўваходзяць у лік найбуйнейшых па колькасці насельніцтва.

Абмяркуем. Чаму манархічная форма праўлення найбольш распаўсюджана ў Еўропе і Азіі і практычна не прадстаўлена ў Афрыцы?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 4. Якасныя і колькасныя змены на палітычнай карце. Этапы фарміравання палітычнай карты свету

Успамінаем. *Якія аб'екты адлюстроўваюцца на палітычнай карце свету?*


Разважаем. *У чым прычыны змен, якія адбываюцца на палітычнай карце свету? Чаму пастаянна павялічваецца колькасць суверэнных дзяржаў?*

4.1. Якасныя і колькасныя змены на палітычнай карце. Палітычнае жыццё грамадства вельмі дынамічнае. Любая дзяржава знаходзіцца ў пастаянным развіцці, якое можа прыводзіць да змены яе меж, формы праўлення і палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання, месцазнаходжання сталіцы і іншых змен. Дзяржавы могуць распадацца на некалькі новых або аб'ядноўвацца з іншымі дзяржавамі. Раней залежныя тэрыторыі могуць набываць незалежнасць і папаўняць шэрагі суверэнных дзяржаў. Усе гэтыя змены адбываюцца ў свеце пастаянна, але з рознай інтэнсіўнасцю ў розныя гістарычныя перыяды часу. Як вынік пастаянна змяняецца і палітычная карта свету. *(Выкарыстоўваючы веды, атрыманыя пры вывучэнні гісторыі, выкажам здагадку, у якія гістарычныя перыяды на палітычнай карце свету маглі адбывацца найбольш істотныя змены.)*

Змены на палітычнай карце прынята дзяліць на колькасныя і якасныя. Як правіла, яны ўзаемазвязаны і могуць адбывацца адначасова.

Да асноўных **колькасных змен** адносяцца: павелічэнне або памяншэнне колькасці дзяржаў, памераў іх тэрыторыі, змены ў адміністрацыйным дзяленні дзяржаў, складзе міжнародных арганізацый. Прыкладам колькасных змен можа быць распад СССР і ўтварэнне 15 новых незалежных дзяржаў, аб'яднанне ФРГ, ГДР і Заходняга Берліна ў адну дзяржаву (мал. 4).

Вынікам колькасных змен на працягу XX–XXI стст. стала значнае павелічэнне колькасці незалежных дзяржаў. Так, калі ў 1900 г. на палітычнай карце свету налічвалася крыху больш за 50 незалежных дзяржаў, то ў цяперашні час іх 194.



Мал. 4. Аб'яднанне ФРГ і ГДР

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сярод **якасных** змен найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца змены формы праўлення і палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы, перанос сталіцы ў іншы горад, атрыманне тэрыторыяй статусу незалежнай дзяржавы, змены ў назве дзяржавы. Як правіла, пытанне аб форме праўлення або палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання, а таксама аб выбары сталіцы вырашаецца пры распадзе або аб'яднанні дзяржаў. Напрыклад, пры аб'ектаў Германіі захавалася форма федэратыўнага ўладкавання, якая была раней у ФРГ, а на тэрыторыі былога ГДР было ўтворана пяць новых суб'ектаў федэрацыі — федэральных зямель. Сталіцай аб'яднанай дзяржавы стаў г. Берлін.

4.2. Этапы фарміравання палітычнай карты свету. Палітычная карта свету пачала фарміравацца ў працэсе з'яўлення першых дзяржаў. *(Успомніце з курса гісторыі, калі з'явіліся першыя дзяржавы.)*

Доўгі час палітычная карта характарызавалася крайняй няўстойлівасцю. На ***старажытным этапе*** (2 тыс. гадоў да н. э. — V ст. н. э.) і аж да ***Сярэднявечча*** (V–XV стст. н. э.) паміж дзяржавамі вяліся пастаянныя войны за тэрыторыі і рэсурсы. Дзяржавы ўзнікалі і знікалі, то яны пашыралі свае межы, то распадаліся на некалькі дзяржаў. Пастаянна мяняліся іх назвы. *(Успомніце з курса гісторыі дзяржавы старажытнага перыяду. Вызначце, якія дзяржавы знаходзяцца на тэрыторыі іх існавання ў цяперашні час.)* Пры гэтым паміж дзяржавамі назіраліся значныя адрозненні па ўзроўні развіцця. Адны з іх, пераважна еўрапейскія і азіяцкія, характарызаваліся больш высокім узроўнем сфарміраванасці дзяржаўных інстытутаў улады і эканамічнага развіцця. Іншыя (афрыканскія, большасць амерыканскіх) знаходзіліся на пачатковых стадыях развіцця дзяржаўнасці і мелі адсталую гаспадарку.

Новы этап у фарміраванні сучаснай палітычнай карты свету (з XV ст. да Першай сусветнай вайны) звязаны з *эпохай Вялікіх геаграфічных адкрыццяў (ВГА)*. Яна паклала пачатак перыяду каланіяльнага падзелу і наступных перадзелаў свету паміж еўрапейскімі дзяржавамі.

Пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў на палітычнай карце свету з'явіліся каланіяльныя імперыі, якія валодаюць велізарнымі тэрыторыямі. Самай буйной каланіяльнай імперыяй гэтага перыяду была Вялікабрытанія. Максімальнай плошчы яна дасягнула да 1919 г. — 34,75 млн км^2, або 22 % зямной сушы. Вялікія калоніі мелі таксама Францыя, Нідэрланды, Бельгія, Германія, ЗША і многія іншыя краіны. Каланізацыя значна змяніла натуральны ход развіцця многіх краін Амерыкі, Афрыкі, Азіі, Аўстраліі і Акіяніі.

Паколькі XVIII–XIX стст. былі перыядам актыўнага развіцця прамысловай вытворчасці, то калоніі станавіліся найважнейшымі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


пастаўшчыкамі сыравіны для еўрапейскіх краін і рынкамі збыту гатовай прадукцыі. Эканамічнае развіццё еўрапейскіх краін праходзіла нераўнамерна, паміж імі пастаянна абвастраліся палітычныя і эканамічныя супярэчнасці і вялася барацьба за перадзел сфер уплыву і каланіяльных уладанняў.

Найбольш значны ўплыў на фарміраванне сучаснай палітычнай карты свету аказалі падзеі, якія адбыліся на мяжы новага і ***найноўшага*** (канец Першай сусветнай вайны — 90-я гг. XX ст.) этапаў. Ключавую ролю ў гэтых зменах адыграла Першая сусветная вайна, вынікам якой сталі распад цэлага шэрага імперый і ўтварэнне на іх месцы новых дзяржаў. Так, спынілі сваё існаванне Расійская імперыя, Аўстра-Венгрыя, Асманская імперыя, значную частку тэрыторыі страціла Германія. На іх месцы ўзніклі новыя дзяржавы. Напрыклад, была адноўлена дзяржаўнасць Польшчы.

Канчатковае фарміраванне сучаснай палітычнай карты свету адбылося пасля Другой сусветнай вайны. На яго аказалі ўплыў два асноўныя працэсы. Першы — гэта супрацьстаянне дзвюх грамадска-палітычных сістэм: сацыялістычнай, на чале якой стаяў СССР, і капіталістычнай, пазіцыі лідараў у якой займалі ЗША і краіны Заходняй Еўропы. Вынікам гэтага супрацьстаяння стала гонка ўзбраенняў, у тым ліку і ядзерных, барацьба за сферы ўплыву, шматлікія канфлікты, у тым ліку і ўзброеныя.

Скончылася дадзенае супрацьстаянне распадам СССР і знікненнем сістэмы сацыялістычных дзяржаў у 90-я гг. XX ст. На месцы СССР утварылася 15 незалежных дзяржаў. *(Знайдзіце на палітычнай карце свету дзяржавы, якія ўтварыліся ў выніку распаду СССР.)* Распаліся і іншыя сацыялістычныя дзяржавы. На месцы Чэхаславакіі ўтварыліся Чэхія і Славакія (мал. 5), а на месцы Югаславіі — шэсць дзяржаў (Сербія, Славенія, Боснія і Герцагавіна, Харватыя, Чарнагорыя і Паўночная Македонія). Некаторыя з гэтых змен суправаджаліся ўзброенымі канфліктамі, а таксама прывялі да ўзнікнення цэлага шэрага самаабвешчаных, але не прызнаных сусветнай супольнасцю дзяржаў.

с. 10



Мал. 5. Раздзяленне Чэхаславакіі

Другі важны палітычны працэс гэтага этапу — *дэкаланізацыя*, г. зн. атрыманне незалежнасці калоніямі і ўтварэнне на іх месцы суверэнных дзяржаў. Так, у 1960 г., які ўвайшоў у гісторыю як «год Афрыкі», незалежнасць атрымалі 17 афрыканскіх дзяржаў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паколькі большасць посткаланіяльных дзяржаў з'яўляюцца маладымі, то палітычныя сістэмы ў іх да канца не сфарміраваліся і іх дзяржаўнасць з'яўляецца няўстойлівай. Паміж гэтымі дзяржавамі існуюць спрэчкі і адбываюцца канфлікты за прыналежнасць тэрыторый. Вельмі часта ў аснове такіх канфліктаў ляжаць рэлігійныя і этнічныя супярэчнасці.

Апошнімі па часе ўтварэння суверэннымі дзяржавамі на палітычнай карце свету сталі Усходні Тымор (2002 г.), Чарнагорыя (2006 г.) і Паўднёвы Судан (2011 г.). *(Як вы думаеце, ці будуць з'яўляцца на палітычнай карце свету новыя незалежныя дзяржавы? Абгрунтуйце свой адказ.)*

Сучасны этап фарміравання палітычнай карты (з пачатку XXI ст.) звязаны з імкненнем большасці дзяржаў свету актыўна супрацоўнічаць паміж сабой, вырашаць спрэчкі і праблемы, якія ўзнікаюць, мірным шляхам. Асаблівая роля ў такім супрацоўніцтве адводзіцца міжнародным арганізацыям. Найбольш уплывовая арганізацыя сучаснасці — ААН. У яе склад уваходзяць 193 дзяржавы свету. Адзінай суверэннай дзяржавай, якая не ўваходзіць у склад ААН, з'яўляецца Ватыкан. На Савет Бяспекі ААН ускладзена галоўная адказнасць за падтрыманне міру і бяспекі ва ўсім свеце. Акрамя гэтага, створаны ўплывовыя міжнародныя арганізацыі, намаганні якіх накіраваны на развіццё супрацоўніцтва паміж краінамі ўнутры асобных рэгіёнаў. У Еўропе гэта Еўрапейскі саюз (ЕС), у Афрыцы — Афрыканскі саюз, у Амерыцы — Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў.

Абагульнім і запомнім. Палітычная карта дынамічная, на ёй адлюстроўваюцца змены, якія адбываюцца ў палітычным жыцці грамадства. Змены на палітычнай карце свету бываюць колькаснымі і якаснымі. У фарміраванні палітычнай карты можна вылучыць некалькі этапаў: старажытны, сярэдневяковы, новы, найноўшы і сучасны.

Праверым сябе. 1. Якія прычыны змен, што адбываюцца на палітычнай карце свету? 2. Якія змены на палітычнай карце свету адносяцца да колькасных? Прывядзіце прыклады колькасных змен. 3. Назавіце якасныя змены на палітычнай карце свету і прывядзіце іх прыклады. 4. Якія этапы вылучаюцца ў гісторыі развіцця палітычнай карты свету? 5. Якія працэсы былі вызначальнымі ў найноўшы перыяд развіцця палітычнай карты?

Ад тэорыі да практыкі. Падумайце, якімі спосабамі можа быць павялічана тэрыторыя дзяржавы, і прывядзіце прыклады.

Абмяркуем. Лічыцца, што колькасныя і якасныя змены на палітычнай карце свету ўзаемазвязаны. Ці так гэта? Аргументуйце свой адказ.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 2. НАСЕЛЬНІЦТВА СВЕТУ




§ 5. Колькасць насельніцтва свету і яе дынаміка. Міграцыі насельніцтва

Успамінаем. *Якія краіны па колькасці насельніцтва з'яўляюцца найбуйнейшымі ў свеце?*

Разважаем. *Ці можа колькасць насельніцтва свету пастаянна расці?*

5.1. Колькасць насельніцтва свету і яе дынаміка. У цяперашні час зямны шар засяляе каля 7,6 млрд чалавек. Колькасць насельніцтва Зямлі пастаянна расце. З кожным новым стагоддзем скорасць павелічэння колькасці насельніцтва нарастала (мал. 6). *(Вызначце па малюнку, як змяняўся тэрмін павелічэння колькасці насельніцтва на 1 млрд.)*

Прычынай невялікага павелічэння колькасці насельніцтва на ранніх стадыях развіцця чалавецтва быў нізкі ўзровень развіцця гаспадаркі, вялікая залежнасць чалавека ад прыроды. Асабліва хуткі рост насельніцтва




Мал. 6. Дынаміка колькасці насельніцтва свету

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

свету назіраўся ў другой палове XX ст.: з 2,5 млрд у 1950 г. да 6 млрд да 2000 г.


Прырост колькасці насельніцтва ў рэгіёнах свету моцна адрозніваецца. У рэгіёнах з перавагай эканамічна развітых краін (Еўропа, Паўночная Амерыка, Аўстралія) колькасць насельніцтва расце павольна, а ў некаторых краінах Еўропы нават зніжаецца. У рэгіёнах з перавагай краін з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця (Азія, Афрыка, Паўднёвая Амерыка) адзначаецца адносна хуткі рост колькасці насельніцтва (мал. 7).



Мал. 7. Доля рэгіёнаў у колькасці насельніцтва свету: а) 1950 г., б) 2018 г. (%)

Аднак навукоўцы мяркуюць, што рост колькасці насельніцтва Зямлі замарудзіцца. Паводле ацэнак дэмографаў, насельніцтва свету дасягне 8 млрд чалавек у 2023 г., яго колькасць павялічыцца ўсяго да 9,5 млрд чалавек да 2050 г., а 10 млрд чалавек дасягне толькі да 2056 г. У цяперашні час значная частка насельніцтва свету пражывае ў Азіі (60 %) і Афрыцы (17 %). Найбуйнейшыя па колькасці насельніцтва краіны знаходзяцца таксама ў Азіі (мал. 8). Колькасць насельніцтва Беларусі ў 2018 г. склала 9,5 млн чалавек.

5.2. Натуральны прырост насельніцтва. Колькасць насельніцтва свету залежыць ад нараджальнасці і смяротнасці, вывучэннем якіх займаецца навука дэмаграфія.



Мал. 8. Найбольш населеныя краіны свету і прагноз колькасці іх насельніцтва (млн чал.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дэмаграфія (ад грэчаскіх слоў «дэмас» — ‘народ’, «графа» — ‘пішу’) — гэта навука аб аднаўленні насельніцтва.

Нараджальнасць, смяротнасць і натуральны прырост насельніцтва адносяцца да асноўных дэмаграфічных працэсаў. Паказчыкам нараджальнасці з’яўляецца колькасць народжаных на кожную 1000 жыхароў за пэўны перыяд часу, часцей за ўсё за год, паказчыкам смяротнасці — колькасць памерлых на кожную 1000 жыхароў за год. У залежнасці ад суадносін нараджальнасці і смяротнасці назіраецца або павелічэнне (прырост), або змяншэнне колькасці насельніцтва свету.

Натуральны прырост насельніцтва — гэта розніца паміж колькасцю народжаных і памерлых за пэўны перыяд часу.

Калі смяротнасць перавышае нараджальнасць, то натуральны прырост аказваецца адмоўным і называецца натуральным змяншэннем насельніцтва. Для параўнання натуральнага прыросту ў розных краінах і рэгіёнах яго вызначаюць у праміле (‰) у разліку на кожную 1000 жыхароў. У цяперашні час сярэднесусветная нараджальнасць складае каля 20 ‰, смяротнасць — 8 ‰, натуральны прырост — 12 ‰. У асобных рэгіёнах свету натуральны прырост мае істотныя адрозненні. *(Прааналізуйце карту, назавіце рэгіёны і краіны з высокім і нізкім натуральным прыростам насельніцтва і краіны з натуральным змяншэннем.)*

с. 14

На паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці ўплываюць розныя фактары. Нараджальнасць залежыць як ад прыродных фактараў (розны час сталення насельніцтва ў краінах з гарачым і халодным кліматам), дэмаграфічных (суадносіны мужчын і жанчын, а таксама старых і маладых узростаў), так і ад сацыяльна-эканамічных. Да апошніх адносіцца, напрыклад, узровень дабрабыту, агульнай культуры і адукацыі насельніцтва. Нягледзячы на тое, што ў забяспечаных сем’ях часта бывае шмат дзяцей, галоўная заканамернасць усё ж зваротная: нараджальнасць звычайна значна вышэйшая ў бедных сем’ях і бедных краінах. Паказчыкі смяротнасці залежаць у першую чаргу ад якасці жыцця людзей, медыцынскага абслугоўвання.

Высокая нараджальнасць і нізкая смяротнасць абумоўліваюць высокі натуральны прырост. Такія суадносіны характэрныя для краін з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця. Так, напрыклад, у краінах Афрыкі, Азіі, Паўднёвай Амерыкі адзначаецца хуткі рост насельніцтва. Тут пражывае каля 2/3 усяго насельніцтва свету. Для краін з высокім узроўнем эканамічнага развіцця (краіны Еўропы, Паўночнай Амерыкі, Аўстралія) характэрны або вельмі невялікі, або «нулявы» і нават адмоўны прырост

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

насельніцтва. Гэта звязана з памяншэннем нараджальнасці і нізкай смяротнасцю насельніцтва. *(Прааналізуйце карту «Натуральны прырост насельніцтва», прывядзіце прыклады краін з высокім, сярэднім і нізкім натуральным прыростам насельніцтва, а таксама краін, у якіх назіраецца натуральны спад.)*

с. 14

5.3. Міграцыі насельніцтва. Змена колькасці насельніцтва краін і рэгіёнаў залежыць не толькі ад натуральнага прыросту, але і ад міграцыі насельніцтва.

Міграцыі насельніцтва — перамяшчэнні людзей, звязаныя, як правіла, з пастаяннай або часовай зменай месца жыхарства.

Выезд са сваёй краіны ў іншую называецца эміграцыяй, а ўезд — іміграцыяй. Адрозніваюць некалькі відаў міграцыі (мал. 9).



Мал. 9. Віды міграцыі

Перамяшчэнне некаторай часткі насельніцтва ўнутры краіны называюць унутранай міграцыяй. Да самага распаўсюджанага тыпу ўнутраных міграцый адносіцца міграцыя насельніцтва з вёскі ў горад. Перамяшчэнне насельніцтва з адной краіны або рэгіёна ў іншыя краіны або рэгіёны з'яўляецца знешняй міграцыяй. Па працягласці міграцыі дзеляць на пастаянныя і часовыя. Для часовых міграцый характэрна сезоннае перамяшчэнне мігрантаў. Сезонная міграцыя можа быць унутрыдзяржаўнай і міждзяржаўнай. Яна, як правіла, звязана з неабходнасцю забеспячэння дадатковай працоўнай сілай сезонных работ, напрыклад сельскагаспадарчых. Да сезоннай міграцыі таксама адносяцца паездкі на вучобу, лячэнне,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адпачынак. Маятнікавая міграцыя адбываецца штодня: выезд з месца жыхарства на працу або вучобу і назад.

Асноўнымі прычынамі вымушаных міжнародных міграцый з'яўляюцца: эканамічны крызіс, палітычныя хваляванні, войны, тэрарызм. У асобных выпадках яны прымаюць масавы характар, калі мільёны жыхароў вымушаны пакідаць месца пастаяннага жыхарства.

Адным з відаў працоўнай міграцыі грамадзян з'яўляецца «ўцечка мазгоў», калі найбольш кваліфікаваныя кадры мігрыруюць у іншыя краіны з нагоды эканамічнай выгады.

Асноўныя сучасныя міграцыйныя патокі накіраваны як з краін з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця ў эканамічна развітыя краіны, так і ўнутры гэтых краін. У асноўным гэта міграцыі працоўнай сілы з больш бедных у больш багатыя краіны. Яны выкліканы тым, што ва ўмовах высокага прыросту насельніцтва ў краінах Азіі, Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі ёсць лішак працоўных рэсурсаў. А эканамічна развітыя краіны, асабліва еўрапейскія, з нізкім натуральным прыростам і натуральным змяншэннем насельніцтва, наадварот, маюць патрэбу ў працоўнай сіле. Акрамя таго, назіраецца велізарная розніца ва ўмовах жыцця і аплаце працы паміж беднымі і багатымі краінамі. Яшчэ адна важная прычына міграцыі — пошук палітычнага прытулку людзьмі, якія пражываюць у рознага роду «гарачых пунктах» нашай планеты. У выніку міграцый з краін з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця ў краіны з высокім узроўнем склаліся два галоўныя рэгіёны прыцягнення мігрантаў — Заходняя Еўропа і Паўночная Амерыка. *(Прааналізуйце карту, прывядзіце прыклады розных накірункаў міграцый насельніцтва.)*

с. 15

Абагульнім і запомнім. Колькасць насельніцтва краін свету залежыць ад натуральнага прыросту. Вывучэннем узнаўлення насельніцтва займаецца навука дэмаграфія. У выніку працэсаў нараджальнасці і смяротнасці адбываецца або натуральны прырост, або змяншэнне насельніцтва. Унутраныя і знешнія міграцыі спрыяюць перараз мяркаванню насельніцтва ўнутры краін і паміж асобнымі краінамі і рэгіёнамі свету.

Праверым сябе. 1. Якая колькасць насельніцтва свету і Рэспублікі Беларусь? Як змянялася колькасць насельніцтва свету з сярэдзіны XVIII ст. да цяперашняга часу? 2. Якія дэмаграфічныя працэсы характарызуюць змены колькасці насельніцтва? 3. Што называецца натуральным прыростам насельніцтва? 4. Якія фактары могуць спрыяць павелічэнню колькасці насельніцтва краіны? 5. Які працэс называецца міграцыяй і якія тыпы міграцый назіраюцца ў свеце?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ад тэорыі да практыкі. Параўнайце дынаміку ўдзельнай вагі рэгіёнаў у колькасці насельніцтва свету (мал. 7), растлумачце змены. Прааналізуйце дыяграму (мал. 8) і вызначце, у якіх краінах колькасць насельніцтва павялічваецца, а ў якіх — памяншаецца. Назавіце прычыны.

Для дапытлівых. Заходняя Еўропа на працягу стагоддзяў была крыніцай масавай эміграцыі, а ў цяперашні час ператварылася ў найбуйнейшы ў свеце ачаг іміграцыі. Растлумачце прычыны.

§ 6. Размяшчэнне насельніцтва. Гарады і сельскія паселішчы

Успамінаем. *У якіх кліматычных паясах найбольш спрыяльныя ўмовы для пражывання?*

Разважаем. *Якія прыродныя з'явы маглі спрыяць рассяленню людзей па планеце?*

с. 14


6.1. Размяшчэнне насельніцтва. Размяшчэнне насельніцтва — гэта прасторавы малюнак размеркавання насельніцтва на пэўнай тэрыторыі. Па меркаванні большасці навукоўцаў, першыя людзі з'явіліся ва Усходняй Афрыцы. Сучаснае размяшчэнне насельніцтва — вынік працяглага засялення і асваення зямель. На першым этапе ў размяшчэнні насельніцтва асноўная роля належала прыроднаму фактару. Людзі засялялі тэрыторыі са спрыяльным для жыцця кліматам і багатымі прыроднымі рэсурсамі. Найбольш заселенымі былі дэльта Ніла, даліна Ганга, востраў Ява, Месапатамская нізіна (раён знакамітых рачных цывілізацый Тыгра і Еўфрата).

Насельніцтва размешчана на Зямлі вельмі нераўнамерна. У свеце існуюць як густа-, так і слабазаселеныя тэрыторыі. Каля 70 % насельніцтва размяшчаецца на 7 % усёй плошчы сушы. Незаселеныя землі (пустыні, экватарыяльныя лясы, высакагорныя раёны) складаюць каля 15 % плошчы сушы. Ва Усходнім паўшар'і засяроджана 86 % насельніцтва Зямлі, у Заходнім — усяго 14 %. Пастаяннае насельніцтва адсутнічае ў Антарктыдзе.

Асноўная частка насельніцтва Зямлі жыве ва ўмераным, субтрапічным і трапічным геаграфічных паясах, на нізінах і раўнінах на вышыні да 500 м над узроўнем мора і ў вузкай прыбярэжнай паласе да 200 км ад мора (мал. 10). *(Чаму асноўная частка насельніцтва сканцэнтравана ва ўмераным, субтрапічным і трапічным геаграфічных паясах?)*

На Зямлі гістарычна сфарміравалася пяць раёнаў з высокай канцэнтрацыяй насельніцтва: Усходне-Азіяцкі (Кітай, Рэспубліка Карэя, Японія), Паўднёва-Азіяцкі (Індыя, Бангладэш, Пакістан, Шры-Ланка), Паўднёва-Усходнеазіяцкі (Інданезія, Тайланд, Філіпіны, Малайзія), Заходнееўрапейскі (Бельгія, Вялікабрытанія, Германія, Нідэрланды, поўнач Францыі) і Атлантычны (паўночна-ўсходняя частка ЗША, паўднёва-ўсходняя частка Канады). У іх засяроджана каля 90 % усяго насельніцтва Зямлі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 10. Размеркаванне насельніцтва свету:
а) у залежнасці ад вышыні мясцовасці (у м); *б*) па ступені аддаленасці ад мора (у км)

6.2. Шчыльнасць насельніцтва. Ступень заселенасці тэрыторыі характарызуецца шчыльнасцю насельніцтва.

Шчыльнасць насельніцтва — адносіны колькасці насельніцтва (колькасць чалавек) да плошчы тэрыторыі (км^2), на якой яно пражывае.

Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва на Зямлі — 58 чал./км^2. Каля паловы заселенай сушы мае сярэднюю шчыльнасць насельніцтва менш за 5 чал./км^2. Шчыльнасць насельніцтва моцна адрозніваецца па рэгіёнах і краінах (мал. 11). Самая высокая шчыльнасць насельніцтва сярод краін адзначаецца ў Бахрэйне (1964 чал./км^2), Бангладэш (больш за 1101 чал./км^2), Рэспубліцы Карэя (511 чал./км^2). Сярод найбольш населеных краін высокая сярэдняя шчыльнасць у Кітаі (147 чал./км^2) і Індыі (412 чал./км^2). У ЗША яна складае 33 чал./км^2, у Расіі — 8 чал./км^2. *(Выкарыстаўшы карту атласа, прывядзіце прыклады краін з найбольш высокай шчыльнасцю насельніцтва ва ўсіх рэгіёнах свету.)*

с. 16

Класіфікацыя краін паводле шчыльнасці насельніцтва:

з высокай шчыльнасцю — больш за 200 чал./км^2;

са шчыльнасцю насельніцтва блізкай да сярэднесусветнай — каля 50 чал./км^2;

з нізкай шчыльнасцю насельніцтва — менш за 10 чал./км^2.



Мал. 11. Шчыльнасць насельніцтва рэгіёнаў (чал./км^2)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6.3. Гарады і сельскія паселішчы. У працэсе засялення Зямлі людзьмі склаліся дзве асноўныя сістэмы рассялення: качавая і аселая. Качавая або паўкачавая сістэмы характэрны для жывёлагадоўцаў Паўночнай Афрыкі, Цэнтральнай Азіі, для перадгорных і горных раёнаў. Іх жыццё звязана з пастаяннай зменай месца жыхарства з прычыны сезонных змен у прыродзе.

Аселая сістэма рассялення звязана з утварэннем сістэмы пастаянных паселішчаў або населеных пунктаў. Населены пункт — гэта тэрыторыя з пастаяннымі селішчамі людзей, дзе вырабляюцца матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. Для яго характэрна канкрэтнае геаграфічнае становішча, пэўныя функцыі, колькасць жыхароў, свая гісторыя паходжання. Адрозніваюць гарадскія і сельскія населеныя пункты (мал. 12). *(Да якога тыпу адносіцца ваш населены пункт?)*

Сельскія населеныя пункты бываюць малыя, сярэднія і буйныя і па ліку жыхароў (людзей) могуць быць ад менш чым 10 чалавек (у выглядзе хутароў) да некалькіх тысяч жыхароў. Па функцыях, якія яны выконваюць, яны дзеляцца на сельскагаспадарчыя, несельскагаспадарчыя і змешаныя. Насельніцтва сельскагаспадарчых населеных пунктаў займаецца сельскагаспадарчай вытворчасцю. Несельскагаспадарчыя населеныя пункты — гэта рабочыя і курортныя пасёлкі, службовыя паселішчы пры чыгунках.

Большая частка насельніцтва свету жыве ў гарадах. Горад — гэта населены пункт, які мае вялікую колькасць насельніцтва, занятага, як правіла, не сельскай гаспадаркай. Гарады маюць вялікае значэнне для грамадства і выконваюць пэўныя функцыі (мал. 13). Горад, які выконвае некалькі функцый, называюць шматфункцыянальным. Ён можа быць прамысловым, культурным і навуковым цэнтрам. *(Якія функцыі выконвае ваш або найбліжэйшы да вас горад?)*



Мал. 12. Тыпы населеных пунктаў



Мал. 13. Функцыі гарадоў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


Па колькасці насельніцтва вылучаюць малыя гарады — да 50 тыс. жыхароў, сярэднія — 50–100 тыс., буйныя — 100–500 тыс., найбуйнейшыя — 500 тыс. — 1 млн і гарады-мільянеры — больш за 1 млн жыхароў. На пачатку XX ст. у свеце было толькі дзесяць гарадоў-мільянераў, цяпер іх больш за 400.

Адзінага паняцця «горад» не існуе. У некаторых краінах да гарадоў адносяць паселішчы з колькасцю ад 1 тыс. чалавек, у ЗША — 2,5 тыс. чалавек, у Рэспубліцы Беларусь — 6 тыс. чалавек, у Расіі — 12 тыс. чалавек, у Японіі — 30 тыс. чалавек.


6.4. Урбанізацыя. З павелічэннем колькасці гарадскіх жыхароў, ператварэннем гарадоў у транспартныя вузлы, гандлёвыя і культурна-навуковыя цэнтры змянялася значэнне гарадоў у жыцці краін. Гэты працэс атрымаў назву «ўрбанізацыя».

Урбанізацыя (ад лацінскага «урб» — ‘горад’) — працэс росту гарадскога насельніцтва, павелічэння колькасці гарадоў і іх узбуйнення, павышэння ролі гарадоў у развіцці грамадства, распаўсюджвання гарадскога ладу жыцця на ўсю сістэму населеных месцаў.

Для сучаснага этапу ўрбанізацыі характэрныя тры асаблівасці: хуткія тэмпы павелічэння долі гарадскога насельніцтва (мал. 14), далейшая канцэнтрацыя насельніцтва пераважна ў буйных гарадах, пашырэнне («расплыванне») тэрыторыі гарадоў. Сёння больш за палову насельніцтва свету жыве ў гарадах (54 %). Доля гарадскога насельніцтва ў агульнай колькасці моцна адрозніваецца па рэгіёнах (мал. 15).



Мал. 14. Змяненне суадносін гарадскога і сельскага насельніцтва з 1950 г. (прагноз да 2030 г.) (%)



Мал. 15. Колькасць (млн чал.) і доля гарадскога насельніцтва (%) па рэгіёнах

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 17 Найбольш высокая ўдзельная вага гарадскога насельніцтва ў краінах з высокім узроўнем эканамічнага развіцця. Напрыклад, у Японіі 92 % насельніцтва жыве ў гарадах, у ЗША і Канадзе — 82 і 81 % адпаведна, у многіх краінах Еўропы — больш за 80 %. Для краін з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця характэрныя высокія тэмпы ўрбанізацыі. Асноўная прычына заключаецца ў перавагах гарадскіх умоў для жыцця. Узбуйненне гарадоў прыводзіць да памяншэння колькасці сельскіх населеных пунктаў. Вялікі горад ператвараецца ў галоўны цэнтр вытворчасці, культуры, абслугоўвання насельніцтва, утвараючы агламерацыю.

Агламерацыя (ад лацінскага «аггломеро» — ‘далучаю’) — гэта кампактная групоўка гарадоў, аб’яднаных вытворчымі, транспартнымі і культурнымі сувязямі.

Агламерацыя — гэта якасна новая форма сучаснага гарадскога рассялення. У высокаразвітых краінах гарадская агламерацыя стала галоўнай формай гарадскога рассялення. У найбольш буйных гарадскіх агламерацыях колькасць насельніцтва перавышае 30 млн жыхароў. Найбуйнейшымі гарадскімі агламерацыямі свету з’яўляюцца Гуанчжоу (48 млн чал.), Токіа (40 млн чал.), Шанхай (31 млн чал.).

Абагульнім і запомнім. Насельніцтва Зямлі размешчана вельмі нераўнамерна. Ступень заселенасці тэрыторыі характарызуецца шчыльнасцю насельніцтва. Месца пастаяннага пражывання людзей называюцю населеным пунктам. Адрозніваюць гарадскія і сельскія населеныя пункты. Большая частка насельніцтва свету жыве ў гарадах. Працэс росту колькасці гарадскога насельніцтва і колькасці гарадоў, павышэння іх ролі ў развіцці грамадства называецца ўрбанізацыяй. Працэс урбанізацыі суправаджаецца ўтварэннем гарадскіх агламерацый.

Праверым сябе. 1. Як размешчана насельніцтва на Зямлі і якія фактары паўплывалі на гэта? 2. Які паказчык характарызуе ступень заселенасці тэрыторыі? 3. У якіх краінах назіраецца самая высокая шчыльнасць насельніцтва? 4. Назавіце найбольш распаўсюджаныя тыпы паселішчаў. 5. Які сусветны працэс называюць урбанізацыяй?

Ад тэорыі да практыкі. Да якога тыпу паселішчаў адносіцца ваш населены пункт? Якая колькасць яго насельніцтва?

Абмяркуем. У цяперашні час назіраецца пераход ад урбанізацыі да субурбанізацыі — працэсу росту і развіцця прыгараднай зоны буйных гарадоў. Як вы думаеце, у чым прычыны такой з’явы?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 7. Расавы і этнічны склад насельніцтва свету. Геаграфія рэлігій свету

Успамінаем. *Якія прычыны сучасных міграцый насельніцтва і куды накіраваны асноўныя міграцыйныя патокі?*

Разважаем. *Якімі прычынамі абумоўлена разнастайнасць людзей на Зямлі?*

7.1. Расавы склад насельніцтва. Насельніцтва свету адрозніваецца па знешніх прыкметах — колеры скуры, валасоў і вачэй, рысах твару, целаскладзе. Устойлівыя знешнія прыкметы, якія перадаюцца па спадчыне ад бацькоў да дзяцей, з пакалення ў пакаленне, незалежна ад месца пражывання, называюцца расавымі прыкметамі.

Раса — гэта гістарычна сфарміраваная супольнасць людзей з устойлівымі знешнімі прыкметамі, якія перадаюцца па спадчыне.



Мал. 16. Асноўныя чалавечыя расы

Фарміраванне рас пачалося дзясяткі тысяч гадоў таму пад уплывам мясцовых прыродных умоў. У цяперашні час вылучаюць тры асноўныя расы, якія аб'ядноўваюць каля 70 % насельніцтва планеты (мал. 16).

с. 19

Найбольш шматлікая еўрапеоідная (еўразійская) раса (42 %), распаўсюджана яна ў рэгіёнах з умераным кліматам. Прадстаўнікоў еўрапеоіднай расы адрозніваe светлы колер скуры, розная афарбоўка вачэй і валасоў, вузкі нос, які выступае, тонкія вусны. Еўрапеоіды засяляюць большасць краін Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Паўднёва-Заходняй і Паўднёвай Азіі, Паўночнай і Паўднёвай Афрыкі, Аўстралію.

Прадстаўнікі мангалоіднай (азіяцка-амерыканскай) расы менш шматлікія (20 %) і распаўсюджаны на тэрыторыях з суровым кантынентальным кліматам, у асноўным у краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Азіі, у Амерыцы. Іх адрозніваe жоўты колер скуры, прамыя чорныя валасы, вузкія карыя вочы.

Большасць краін Афрыкі і астравоў Ціхага акіяна засяляюць прадстаўнікі экватарыяльнай (негра-аўстралоіднай) расы (7,3 %). Яна

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

характэрная для рэгіёнаў з гарачым кліматам. Да гэтай расы таксама адносіцца карэннае насельніцтва Аўстраліі. Іх расавыя прыкметы — цёмна-карычневая або чорная скура, кучаравыя валасы, карыя вочы, шырокі нос, тоўстыя вусны.

У выніку працяглага гістарычнага працэсу перамяшчэння і змешвання прадстаўнікоў асноўных рас сфарміраваліся змешаныя расы. Самымі вядомымі з іх з'яўляюцца метысы, мулаты, самба (мал. 17). Іх колькасць складае каля 30 % насельніцтва свету.



Мал. 17. Схема змешвання асноўных рас і ўтварэнне змешаных рас

7.2. Этнічны склад насельніцтва. Чалавецтва вельмі разнастайнае і ў этнічных адносінах. Этнас, ці народ, — устойлівая група людзей, якія размаўляюць на адной мове, маюць адзінае паходжанне, побыт і культуру, жывуць на пэўнай тэрыторыі.

У свеце налічваецца каля 4 тыс. этнасаў. Яны адрозніваюцца па колькасці. Толькі 310 народаў маюць колькасць больш за 1 млн чалавек, якія складаюць каля 96 % насельніцтва свету. Найбуйнейшыя народы свету: кітайцы (1170 млн чал.), хіндустанцы (265 млн чал.), бенгальцы (225 млн чал.), амерыканцы ЗША (200 млн чал.), бразільцы (175 млн чал.), рускія (150 млн чал.).

Асноўная прыкмета народа, ці этнасу, — агульная мова. Усяго ж у свеце налічваецца больш за 2 тыс. моў (мал. 18). Па ступені блізкасці ўсе мовы аб'ядноўваюцца ў сем'і і групы.

Найбольш шматлікая моўная сям'я — індаеўрапейская (45 % насельніцтва свету). На мовах індаеўрапейскай сям'і размаўляюць 150 народаў раманскай (французская, іспанская, партугальская, італьянская), германскай (нямецкая, англійская, ідыш, галандская), славянскай (руская, польская, украінская),



Мал. 18. Найбольш распаўсюджаныя мовы свету (млн чал.)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

індаарыйскай (хіндзі, маратхі, пенджаб), іранскай (фарсі, таджыкская) і іншых моўных груп. Другая па колькасці прадстаўнікоў — сіна-тыбецкая сям'я (22 % насельніцтва свету), на мовах якой размаўляюць пераважна ў Кітаі, Непале, Бутане.

Да ліку найбуйнейшых адносяцца таксама семіцкая сям'я (распаўсюджаная ў Заходняй Азіі і Паўночнай Афрыцы), дравідыйскай сям'я (у Паўднёвай Азіі), алтайская сям'я (у Азіі і Еўропе).

Тэрыторыі распаўсюджвання моў, этнічныя межы часта не супадаюць з дзяржаўнымі межамі краін. Таму краіны бываюць як аднанацыянальнымі, так і шматнацыянальнымі. Аднанацыянальныя краіны — гэта краіны, дзяржаўныя межы якіх супадаюць з этнічнымі межамі, а асноўная нацыянальнасць складае больш за 90 % усяго насельніцтва. Іх больш за ўсё ў Еўропе (Данія, Швецыя, Германія, Польшча, Італія). Да такіх краін таксама адносяцца Саудаўская Аравія, Японія, Егіпет. Шматнацыянальныя краіны — гэта краіны, у межах якіх пражывае некалькі этнасаў, існуе некалькі дзяржаўных моў. Напрыклад, у Швейцарыі чатыры дзяржаўныя мовы. *(Колькі дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь? Чаму?)*

7.3. Геаграфія рэлігій свету. Рэлігія (ад лацінскай «рэлігіа» — 'набожнасць, святасць') — форма разумення навакольнага свету, заснаваная на веры ў звышнатуральнае. Рэлігіі складваліся на працягу многіх стагоддзяў і нават тысячагоддзяў. Іх колькасць пастаянна павялічвалася, а роля ўзрастала. І ў нашы дні каля 4/5 усіх жыхароў планеты варта аднесці да катэгорыі вернікаў. Па ліку вернікаў рэлігіі прынята падзяляць на тры групы: сусветныя, нацыянальныя і мясцовыя племянныя вераванні. Рэлігіі, якія аб'ядноўваюць сотні мільёнаў вернікаў розных нацыянальнасцей у многіх дзяржавах і рэгіёнах свету, называюць сусветнымі рэлігіямі. Да сусветных рэлігій адносяцца будызм, хрысціянства і іслам (мал. 19). Іх вызнае больш як палова насельніцтва Зямлі.



Мал. 19. Сусветныя рэлігіі

с. 19

Будызм — самая старажытная з сусветных рэлігій, якая ўзнікла ў сярэдзіне 1-га тысячагоддзя да н. э. у Старажытнай Індыі. Яна звязана з рэальнай асобай, царэвічам з Паўночнай Індыі, які затым быў названы Будам («прасветленым»). Гэтай рэлігіі прытрымліваюцца ў розных краінах каля 600 млн чалавек (8 % насельніцтва свету). Будызм шырока распаўсюджаны ў Паўднёва-

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Усходняй і Усходняй Азіі. Будысцкі сусветны цэнтр знаходзіцца ў Бангкоку, свяшчэнная кніга — Трыпітака («Тры кошыкі»). Прадстаўнікі гэтай рэлігіі ў якасці святынь выбіраюць боскія статуі.

Хрысціянства ўзнікла ў пачатку 1-га тысячагоддзя н. э. у Паўднёва-Заходняй Азіі. Гэта самая буйная рэлігія ў свеце па колькасці паслядоўнікаў — 2,4 млрд чалавек (каля 32 % насельніцтва свету) — і па геаграфіі — у большасці краін свету ёсць хрысціянскія абшчыны. Заснавана хрысціянства на веры ў Ісуса Хрыста як Богачалавека, Збавіцеля і Бога Сына, які сышоў на Зямлю, каб сваёй пакутніцкай смерцю загладзіць грахі людзей. Галоўная крыніца хрысціянскага веравучэння — Святое Пісанне (Біблія).

Хрысціянства ў працэсе свайго развіцця ў 1054 г. раскалолася на дзве асноўныя галіны: каталіцызм і праваслаўе, а пазней, у XVI ст., з'явіўся пратэстантызм. Для самай шматлікай галіны хрысціянства — каталіцкай — характэрная жорсткая цэнтралізацыя, заснаваная на ўсеўладдзі Папы Рымскага, рэзідэнцыяй якога служыць Ватыкан. Праваслаўе, наадварот, падзяляецца на 15 самастойных цэркваў. Для пратэстантаў характэрная наяўнасць шматлікіх рэлігійных плыней, рэлігійны цэнтр адсутнічае. Каталіцызм распаўсюджаны ў Партугаліі, Францыі, Іспаніі, Італіі, Германіі. Пратэстантызм узнік у Паўночнай і Цэнтральнай Еўропе і атрымаў распаўсюджванне ў калоніях Вялікабрытаніі. Праваслаўных больш за ўсё пражывае ў Расіі, Украіне, Беларусі, Грэцыі, Малдове, ёсць яны сярод амерыканцаў.

Іслам — самая маладая з сусветных рэлігій, якая ўзнікла ў VII ст. на Аравійскім паўвостраве. Колькасць вернікаў складае 1,7 млрд чалавек (23 % насельніцтва свету). Іслам (мусульманства) распаўсюджаны ў Паўднёва-Заходняй Азіі, на поўначы Афрыкі, у некаторых краінах Цэнтральнай і Усходняй Азіі, Інданезіі, у меншай меры — у Еўропе. Заснавальнікам ісламу лічыцца жыхар Меккі Мухамед. Веравучэнне заснавана на пакланенні адзінаму Богу — Алаху і прызнанні Мухамеда пасланнікам Алаха. Свяшчэнная кніга — Каран (у перакладзе з арабскай — 'чытанне'), у ім сабраны пропаведзі, малітвы, павучанні, апавяданні і прыпавесці, вымаўленыя Мухамедам пры яго жыцці. Святымі цэнтрамі ісламу з'яўляюцца гарады Мекка і Медзіна ў Саудаўскай Аравіі.

Сярод нацыянальных рэлігій, якія вызнаюцца адным народам, — індуізм, канфуцыянства, сінтаізм, іўдаізм. (*Выкарыстоўваючы карту, прывядзіце прыклады дзяржаў, у якіх пражываюць прыхільнікі кожнай з гэтых рэлігій.)*

с. 19

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Расавы склад насельніцтва свету разнастайны, каля 70 % людзей адносіцца да трох асноўных рас. Па этнічным складзе краіны бываюць аднанацыянальнымі і шматнацыянальнымі. Рэлігійны склад свету характарызуецца разнастайнасцю. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца сусветныя рэлігіі: будызм, хрысціянства і іслам. Іх вызнае больш як палова насельніцтва Зямлі.

Праверым сябе. 1. Якія групы людзей называюць расамі? 2. Па якіх асноўных прыкметах вылучаюць расы? 3. Якія расы адносяць да асноўных і ў якіх рэгіёнах свету яны распаўсюджаны? 4. Ад прадстаўнікоў якіх асноўных рас утварыліся змешаныя расы? 5. Якія мовы найбольш распаўсюджаны ў свеце? 6. Якія рэлігіі адносяцца да сусветных?

Ад тэорыі да практыкі. Прадстаўнікі якіх нацыянальнасцей і прыхільнікі якіх рэлігій пражываюць у вашай мясцовасці?

Для дапытлівых. На думку многіх спецыялістаў, у XXI ст. іслам стане самай буйной рэлігіяй у свеце па колькасці вернікаў. Як вы думаеце, чаму?

§ 8. Геаграфія матэрыяльнай і духоўнай культуры

Успамінаем. *У якіх рэгіёнах свету назіраецца самая высокая шчыльнасць насельніцтва?*

Разважаем. *Якую ролю выконвае культура ва ўзаемаадносінах людзей розных краін?*

8.1. Фарміраванне сусветных культур. Паняцце **культура** (ад лацінскага «культура» — 'вырошчванне, апрацоўка') азначае сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных чалавечым грамадствам, спосабаў іх стварэння і прымянення, якія характарызуюць узровень развіцця грамадства. Прыродныя ўмовы, што акружаюць чалавека, у значнай ступені вызначаюць адметныя рысы яго культуры, яе асаблівасці ў розных рэгіёнах Зямлі. Краіны адрозніваюцца гісторыяй развіцця іх народаў, прыроднымі ўмовамі, культурай, пэўнай агульнасцю гаспадарчай дзейнасці. Яны ўтвараюць гісторыка-культурныя рэгіёны свету, або цывілізацыі. Найбольш важнымі складовымі часткамі сусветных цывілізацый з'яўляецца матэрыяльная і духоўная культура народаў.

Распаўсюджванне культуры і асобных яе кампанентаў — ладу жыцця і традыцый насельніцтва, элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, культурнай спадчыны папярэдніх пакаленняў — вывучае геаграфія культуры.

8.2. Геаграфія матэрыяльнай культуры. Матэрыяльная культура народаў уключае прылады працы, жыллё, адзенне, ежу — усё, што неабходна

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

для задавальнення матэрыяльных патрэб чалавека. З улікам асаблівасцей прыроднага асяроддзя чалавек на Зямлі будуе жыллё, харчуецца тымі прадуктамі, якія ў асноўным можна атрымаць у прыроднай зоне яго пражывання, апранаецца ў адпаведнасці з кліматычнымі ўмовамі. Матэрыяльная культура народаў з'яўляецца прыкладам адаптацыі жыцця людзей да прыродных умоў.

Жыллё. Пра ўменні людзей прыстасоўвацца да прыродных умоў сведчаць дамы з бярвення ва ўмераных шыротах. Шчыліны паміж бярвёнамі ў гэтых дамах праканапачаны мохам і надзейна абараняюць ад маразоў. У Японіі з-за землетрасенняў дамы будуюць з рассоўнымі лёгкімі сценамі, устойлівымі да ваганняў зямной кары (мал. 20).



Хата — драўляны дом жыхароў лясной зоны



Мінка — традыцыйны японскі дом



Юрта — складны дом жыхароў сцяпных раёнаў Азіі



Іглу — жыллё эскімосаў

Мал. 20. Тыпы жылля розных народаў

Адзенне. На адзенне людзей аказвае ўплыў навакольнае прыроднае асяроддзе. У гарачым цеплавым поясе ў многіх краінах Азіі і Афрыкі адзенне жанчын — гэта спадніца і блузка з лёгкай тканіны. Большая частка мужчынскага насельніцтва арабскіх і афрыканскіх краін носіць доўгія, да падлогі, шырокія кашулі.

У Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі распаўсюджаны нясшытыя формы адзення пад пояс — сары. Халатападобнае адзенне лягло ў аснову сучаснага адзення кітайцаў і в'етнамцаў. У халодным цеплавым поясе насельніцтва тундры аддае перавагу цёплым глухім доўгім курткам з капюшонам (мал. 21). Адзенне адлюстроўвае нацыянальныя рысы, характар, тэмперамент народа, сферу яго дзейнасці.



Индыйскае сары



Кітайскі халат



Арабская кашуля



Глухая куртка эскімосаў

Мал. 21. Адзенне розных народаў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ежа. Харчовыя асаблівасці людзей цесна звязаны з прыроднымі ўмовамі месцаў пражывання, спецыфікай вядзення сельскай гаспадаркі, рэлігійнымі і нацыянальнымі традыцыямі народаў. Амаль ва ўсіх народаў свету пераважае раслінная ежа.

Так, у большасці краін, уключаючы Беларусь, распаўсюджаны стравы з агародніны. У краінах з умераным кліматам — пераважна з бульбы, у трапічных краінах — з батату і маніёкі.

8.3. Геаграфія духоўнай культуры. Да духоўнай культуры (г. зн. звязанай з унутраным, маральным светам чалавека) адносяцца тыя каштоўнасці, якія створаны чалавекам для задавальнення духоўных патрэб. Гэта літаратура, тэатр, выяўленчае мастацтва, музыка, танцы, архітэктура і інш. Духоўная культура, як і матэрыяльная, цесна звязана з прыроднымі ўмовамі, гісторыяй народаў, іх этнічнымі асаблівасцямі, рэлігіяй. Аднак уплыў прыроднага асяроддзя на духоўную культуру выяўляецца ў меншай ступені, чым на матэрыяльную. Прырода дае фізічны матэрыял, падказвае вобразы для мастацкай творчасці, спрыяе або перашкаджае яе развіццю.



Мал. 22. Гатычны стыль у архітэктуры — Міланскі кафедральны сабор (*а*); стыль барока — Сабор Святога Пятра ў Ватыкане (*б*)

У розных раёнах Зямлі развіваліся і змяняліся розныя ***архітэктурныя стылі***. На іх фарміраванне ўплывалі рэлігійныя погляды, нацыянальныя асаблівасці, навакольная прырода. Напрыклад, у архітэктуры Еўропы доўгі час панавалі гатычны стыль і барока (мал. 22). Будынкі гатычных сабораў дзівяць ажурнасцю і лёгкасцю, іх параўноўваюць з каменнымі карункамі. Яны часта выказваюць рэлігійныя ідэі сваіх стваральнікаў. Стыль барока (з італьянскага «барока» — ‘схільны да празмернасцей’), які атрымаў шырокае распаўсюджванне ў Іспаніі, Германіі, Францыі, выяўляецца ў архітэктуры шыкоўных палацаў і цэркваў з багаццем скульптур.

Архітэктура мячэцей, мінарэтаў у Турцыі, Індыі, шмат’ярусных будынкаў і храмаў у М’янме з выявамі сланоў, мудрагелістых раслін адлюстроўвае навакольную прыроду.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ва ўсіх народаў свету распаўсюджана ***выяўленчае*** і ***дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*** — стварэнне мастацкіх вырабаў, прызначаных для практычнага выкарыстання. Асабліва багатыя на такія промыслы краіны Азіі. У Японіі распаўсюджаны роспіс па фарфоры, у Індыі — чаканка, у краінах Паўднёва-Усходняй Азіі — дыванаткацтва. З мастацкіх промыслаў Беларусі вядомыя пляценне з саломкі, ткацтва, мастацкая кераміка.

Духоўная культура акумулюе ў сабе гісторыю, звычаі і традыцыі народаў, прыроду тых краін, дзе яны пражываюць. Элементы матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў розных краін аказваюць узаемны ўплыў, распаўсюджваюцца па ўсім свеце.

8.4. Аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. У 1972 г. ЮНЕСКА (спецыялізаваная ўстанова Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры) прыняла Канвенцыю па ахове аб'ектаў культурнай і прыроднай спадчыны, што ўступіла ў сілу ў 1975 г. Асноўная яе мэта — зрабіць унікальныя культурныя або экалагічна значныя аб'екты, створаныя чалавекам ці прыродай, вядомымі ў свеце. Такім чынам вырашалася задача абароны іх ад знішчэння пад уплывам прыродных працэсаў, напрыклад землетрасенняў, або антрапагенных фактараў (узброеных канфліктаў, бескантрольнага турызму).

Сучасны спіс аб'ектаў Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ўключае 1094 аб'екты: 847 — культурных, 209 — прыродных, 38 — змешаных.

Аб'екты са спісу Сусветнай спадчыны ўяўляюць з сябе шэдэўры чалавечага генію, прыродныя феномены прыгажосці і эстэтычнай важнасці. Аб'ектамі Сусветнай культурнай спадчыны абвешчаны асобныя архітэктурныя збудаванні і ансамблі: Акропаль, саборы ў Ам'ене і Шартры, цэлыя гістарычныя цэнтры Санкт-Пецярбурга і Варшавы, Маскоўскі Крэмль з Чырвонай плошчай, а таксама цэлыя гарады (Бразіліа, Венецыя) і архітэктурныя запаведнікі (напрыклад, Дэльфы). Прыроднымі аб'ектамі з'яўляюцца, напрыклад, нацыянальныя паркі (Вялікі Бар'ерны рыф, Елаўстонскі нацыянальны парк) (мал. 23).

Дзяржавы, на тэрыторыі якіх размешчаны аб'екты Сусветнай спадчыны, бяруць на сябе адказнасць па іх захаванні. ЮНЕСКА са свайго боку з Фонду Сусветнай спадчыны вылучае сродкі для прыярытэтнага фінансавання і падтрымання іх у належным стане і развіцця міжнароднага турызму. Акрамя таго, ЮНЕСКА гарантуе іх захаванасць і цэласнасць, павышае прэстыж, кантралюе стан.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Горад Бразіліа



Вялікі Бар'ерны рыф



Елаўстонскі нацыянальны парк

Мал. 23. Аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА

Абагульнім і запомнім. Матэрыяльная і духоўная культура народаў адлюстроўвае асаблівасці прыроднага асяроддзя розных рэгіёнаў Зямлі. Яна збліжае розныя народы, дапамагае лепш разумець адзін аднаго ў вырашэнні важных міжнародных палітычных, эканамічных, экалагічных праблем чалавецтва. Унікальныя прыродныя і культурныя аб'екты ўнесены ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА з мэтай іх захавання і развіцця турызму.

Праверым сябе. 1. Прывядзіце прыклады элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва розных рэгіёнаў Зямлі. 2. Пакажыце залежнасць матэрыяльнай культуры насельніцтва ад прыродных умоў. 3. Якія архітэктурныя стылі вы ведаеце? 4. Ахарактарызуйце статус аб'ектаў Сусветнай спадчыны.

Ад тэорыі да практыкі. 1. Выявіце ўплыў прыродных умоў на асаблівасці культуры на прыкладзе сваёй мясцовасці. 2. Падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) пра аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА на тэрыторыі Беларусі.

Абмяркуем. Як вы разумееце выказванне «ўсякае мастацтва ёсць перайманне прыроды»?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 3. ПРЫРОДНЫЯ РЭСУРСЫ І ІХ РОЛЯ Ў ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА



§ 9. Паняцце аб прыродных рэсурсах

Успамінаем. *Якія прыродныя целы называюць карыснымі выкапнямі?*

Разважаем. *Чаму адны прыродныя рэсурсы аднаўляюцца, а іншыя — не?*

9.1. Паняцце аб прыродных рэсурсах. Віды прыродных рэсурсаў. На працягу свайго існавання чалавек пастаянна выкарыстоўвае багацці прыроды.

Прыродныя рэсурсы — гэта багацці прыроды, якія чалавек выкарыстоўвае ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці.

Прыродныя рэсурсы размешчаны на зямной паверхні нераўнамерна, таму забяспечанасць імі розных рэгіёнаў і краін свету розная.


Існуе некалькі класіфікацый прыродных рэсурсаў. Напрыклад, па паходжанні ў розных абалонках Зямлі вылучаюць мінеральныя, зямельныя, водныя, біялагічныя, кліматычныя прыродныя рэсурсы (мал. 24).



Мал. 24. Віды прыродных рэсурсаў па паходжанні

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Суадносіны паміж велічынёй прыродных рэсурсаў і памерамі іх выкарыстання называюцца рэсурсазабяспечанасцю. Па велічыні гэтага паказчыка можна меркаваць пра багацце або беднасць на прыродныя рэсурсы таго ці іншага рэгіёна свету.



Мал. 25. Віды мінеральных рэсурсаў па выкарыстанні

Мінеральныя рэсурсы, ці карысныя выкапні, — гэта мінералы і горныя пароды, якія выкарыстоўваюцца чалавекам. Як вы ўжо ведаеце, па выкарыстанні мінеральныя рэсурсы дзеляцца на паліўныя (гаручыя), рудныя (металічныя), нярудныя (неметалічныя) (мал. 25).

У працэсе гаспадарчай дзейнасці чалавек здабывае з зямлі вугаль, нафту, газ, руды чорных і каляровых металаў і іншыя карысныя выкапні. За апошнія 100 гадоў у сувязі з ростам патрэбы ў металах з нетраў Зямлі было здабыта карысных выкапняў у 35 разоў больш, чым за ўвесь час існавання чалавецтва. У перспектыве перад чалавецтвам паўстане вострая праблема недахопу мінеральных рэсурсаў.

Зямельныя рэсурсы — гэта зямная паверхня, якая прыдатная для пражывання чалавека і гаспадарчай дзейнасці. Зямельныя рэсурсы — адзін з самых галоўных рэсурсаў прыроды. Усе землі планеты (13,5 млрд га) — гэта сусветны

Сельскагаспадарчыя ўгоддзі — гэта ралля, шматгадовыя насаджэнні, натуральныя лугі і пашы. Яны складаюць 1/3 зямельнага фонду планеты.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

зямельны фонд. У яго ўваходзяць плошчы, занятыя пад раллю, пашы, лясы, населеныя пункты, прамысловыя прадпрыемствы і г. д. (мал. 26).



Мал. 26. Структура сусветнага зямельнага фонду (%)

Доля апрацоўваемых зямель складае ўсяго 11 % зямельнага фонду. Большая іх частка размешчана ў лясной, лесастэпавай і стэпавай прыродных зонах у такіх краінах, як ЗША, Індыя, Кітай, Расія, Канада. Па плошчы апрацоўваемых зямель лідзіруюць Азія і Еўропа, найменшыя плошчы — у Аўстраліі з Акіяніяй і Паўднёвай Амерыцы. Лугі і пашы займаюць каля 23 %. Па плошчы пашы найбуйнейшымі краінамі свету з'яўляюцца Аўстралія, Кітай, ЗША, Бразілія і Казахстан. Частку зямельных рэсурсаў складаюць ***глебавыя рэсурсы*** — глебавае покрыва Зямлі, прыдатнае для выкарыстання ў сельскай і лясной гаспадарцы. Галоўнай уласцівасцю глебавых рэсурсаў з'яўляецца іх натуральная ўрадлівасць. *(Якія тыпы глеб адрозніваюцца найбольшай урадлівасцю?)*

Лясы і хмызнякі займаюць каля 30 %, але найбольшую плошчу складаюць землі, якія не выкарыстоўваюцца, — пустыні, высакагор'і, а таксама землі, занятыя ледавікамі. *(Выкарыстоўваючы дыяграмы атласа, ахарактарызуйце структуру зямельных рэсурсаў па рэгіёнах свету.)*

с. 22

Водныя рэсурсы — гэта паверхневыя і падземныя воды, якія выкарыстоўваюцца або могуць выкарыстоўвацца чалавекам. Яны ўключаюць воды акіянаў і мораў, рэк, азёр, каналаў, вадасховішчаў, падземныя воды, воды ледавікоў. Агульны аб'ём вады на планеце складае 1,4 трлн км^3. Аднак 97 % іх — салёныя воды Сусветнага акіяна і толькі 3 % — прэсныя воды.

Значная частка прэснай вады сканцэнтравана ў ледавіках — 77,6 %, падземныя воды складаюць 21,8 %, паверхневыя — усяго 0,6 %. Прэсная вада выкарыстоўваецца для водазабеспячэння насельніцтва, у сельскай гаспадарцы, для вытворчых і бытавых патрэб (мал. 27). Водныя аб'екты служаць таксама транспартнымі шляхамі (рэкі, азёры, вадасховішчы, каналы).




Мал. 27. Структура сусветнага спажывання прэснай вады (%)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Найбольшымі рэсурсамі прэснай вады валодаюць Азія і Паўднёвая Амерыка, найменшымі — Аўстралія і Афрыка. Аднак самымі забяспечанымі прэснай вадой з разліку на душу насельніцтва рэгіёнамі з'яўляюцца Аўстралія і Акіянія і Паўднёвая Амерыка, а найменш забяспечанымі — Азія і Афрыка. З краін найбольш забяспечанымі з'яўляюцца Бразілія, Расія, Канада.

Біялагічныя рэсурсы — гэта жывая прырода Зямлі, расліны і жывёлы, якія выкарыстоўваюцца або могуць выкарыстоўвацца чалавекам (мал. 28). Сярод раслінных рэсурсаў найбольш важныя лясныя рэсурсы. Яны могуць выкарыстоўвацца для атрымання драўніны, харчовых прадуктаў (ягад, грыбоў), для адпачынку (рэкрэацыйны рэсурс). Лес — асноўная крыніца кісларoду, натуральны ачышчальнік атмасферы. Ён абараняе глебы ад разбурэння, паверхневыя воды — ад спусташэння.



Мал. 28. Віды біялагічных рэсурсаў

Лясамі пакрыта каля 4 млрд га (каля 27 % плошчы сушы). Самымі вялікімі плошчамі лясоў валодаюць Паўднёвая Амерыка і Азія, а найменшымі — Аўстралія з Акіяніяй. Краіны — лідары па лесапакрытай плошчы: Расія, Бразілія, Канада, ЗША, Кітай. Лясы свету ўтвараюць два прыкладна роўныя па плошчы паясы: Паўночны і Паўднёвы. Паўночны лясны пояс размешчаны ў асноўным ва ўмераных шыротах Еўразіі і Паўночнай Амерыкі. Нарыхтоўка драўніны вядзецца ў многіх дзяржавах гэтага пояса (Расія, Канада, ЗША). Паўднёвы лясны пояс размешчаны ў межах экватарыяльных і трапічных шырот. Прыкладна 2/3 лясоў гэтага пояса прыходзіцца на басейны рэк Амазонкі і Конга. Гэтыя вільготныя экватарыяльныя лясы і пераменна-вільготныя субэкватарыяльныя лясы называюць «лёгкімі планеты». *(Успомніце, якія дрэвы растуць у гэтых лясах.)* Уплыў чалавека на раслінны і жывёльны свет прывёў да знікнення многіх

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


відаў раслін і жывёл. Найважнейшай задачай чалавецтва з'яўляецца захаванне біялагічнай разнастайнасці планеты.

Кліматычныя рэсурсы — гэта ўласцівасці клімату, якія выкарыстоўваюцца або могуць выкарыстоўвацца ў гаспадарцы. Сонечная і ветравая энергіі размяркоўваюцца па зямным шары нераўнамерна. Найбольшая колькасць сонечнай энергіі паступае ў трапічных шыротах. Рэсурсы ветравой энергіі сканцэнтраваны галоўным чынам ва ўмераным поясе. Аднак перашкодай у выкарыстанні ветравой энергіі з'яўляецца яе зменлівасць. *(Вызначце па карце, якія краіны маюць больш спрыяльныя ўмовы для выкарыстання сонечнай і ветравой энергіі.)*

с. 8–9

Уласцівасці клімату, якія можна выкарыстоўваць у сельскагаспадарчай дзейнасці, называюцца ***агракліматычнымі рэсурсамі***. Яны ўключаюць сонечную энергію, цяпло, вільготнасць, неабходныя для вырошчвання сельскагаспадарчых культур.

9.2. Вычарпальныя і невычарпальныя прыродныя рэсурсы. Па прыкмеце вычарпальнасці прыродныя рэсурсы дзеляць на дзве групы: вычарпальныя і невычарпальныя (мал. 29).



Мал. 29. Класіфікацыя прыродных рэсурсаў па прыкмеце вычарпальнасці

Вычарпальныя прыродныя рэсурсы — гэта рэсурсы, выкарыстанне якіх прыводзіць да іх памяншэння ці поўнага знікнення.

У сваю чаргу, вычарпальныя прыродныя рэсурсы падзяляюцца на ўзнаўляльныя і неўзнаўляльныя.

Узнаўляльныя рэсурсы — гэта рэсурсы, здольныя аднаўляцца за параўнальна кароткі час.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Да ўзнаўлення здольныя біялагічныя рэсурсы — расліны і жывёлы. Прырода сама рэгулюе колькасць іх відаў. Аднак яны маюць патрэбу ў абароне ад празмернага выкарыстання. Да адносна ўзнаўляльных рэсурсаў адносяцца глебы. Скорасць іх фарміравання вельмі малая. Адзін сантыметр гумусу ствараецца некалькі сотняў гадоў, а на аднаўленне ўрадлівага пласта пасля эрозіі неабходна некалькі тысяч гадоў. Чалавек можа рэгуляваць працэсы ўзнаўлення глебы. Так, пры ўнясенні ўгнаенняў і правільным чаргаванні вырошчваемых культур аднаўленне глебы ідзе значна хутчэй. Забяспечыць пастаянную магчымасць узнаўлення ўзнаўляльных рэсурсаў — галоўная задача чалавецтва.

Неўзнаўляльныя рэсурсы — гэта рэсурсы вычарпальныя, якія ў прыродзе не аднаўляюцца.

Да вычарпальных і неаднаўляльных прыродных рэсурсаў адносяцца мінеральныя рэсурсы. Радовішчы карысных выкапняў сфарміраваліся ў зямной кары за працяглы геалагічны перыяд часу. Іх узрост лічыцца мільёнамі гадоў, і запасы іх абмежаваныя. У выніку інтэнсіўнага выкарыстання непазбежна надыходзіць вычарпанне іх запасаў. Гэта патрабуе беражлівага і эканомнага іх выкарыстання.

Невычарпальныя прыродныя рэсурсы — гэта рэсурсы, выкарыстанне якіх не прыводзіць да памяншэння іх запасаў.

Да невычарпальных прыродных рэсурсаў адносяцца сонечная энергія, энергія ветру, энергія зямных нетраў, энергія марскіх прыліваў і хваль, энергія вады і паветра. Цяпло нетраў Зямлі, гэтак жа як і ветравая энергія, энергія водных цячэнняў, прыліваў і адліваў, выкарыстоўваецца для атрымання электраэнергіі.

Абагульнім і запомнім. Багацці прыроды, якія выкарыстоўваюцца чалавекам у жыцці і гаспадарчай дзейнасці, называюцца прыроднымі рэсурсамі. Па паходжанні ў розных абалонках Зямлі яны падзяляюцца на мінеральныя, зямельныя, водныя, біялагічныя, кліматычныя. Іх падзяляюць таксама на вычарпальныя і невычарпальныя. Вычарпальныя прыродныя рэсурсы падзяляюцца на ўзнаўляльныя і неўзнаўляльныя.

Праверым сябе. 1. Якія прыродныя целы і з'явы адносяцца да прыродных рэсурсаў? 2. Назавіце асноўныя віды мінеральных рэсурсаў. 3. Чаму змяняецца структура зямельных рэсурсаў? 4. Якую ролю ў жыцці чалавека адыгрываюць лясныя рэсурсы? 5. Ці могуць пад уплывам дзейнасці чалавека ўзнаўляльныя прыродныя рэсурсы быць вычарпальнымі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ад тэорыі да практыкі. Прывядзіце прыклады прыродных рэсурсаў вашай мясцовасці, якія адносяцца да розных катэгорый па прыкмеце вычарпальнасці.

Абмяркуем. Што азначае выраз «Мы не атрымалі ў спадчыну зямлю ад нашых продкаў, мы пазычылі яе ў нашых нашчадкаў»?

§ 10. Размяшчэнне радовішчаў асноўных відаў мінеральных рэсурсаў і іх сувязь з тэктанічнай будовай Зямлі

Успамінаем. *Што такое платформа і якую будову яна мае? Якая тэктанічная структура называецца складкаватым поясам і чым яна характарызуецца?*

Разважаем. *Ці могуць быць знойдзены новыя буйныя радовішчы карысных выкапняў на Зямлі?*

Зямная кара багатая на карысныя выкапні. У цяперашні час у сваёй гаспадарчай дзейнасці чалавек выкарыстоўвае больш за 200 відаў мінеральных рэсурсаў. Іх разнастайнасць і запасы ў рэгіёнах свету тлумачацца залежнасцю размяшчэння радовішчаў розных відаў мінеральных рэсурсаў ад тэктанічнай будовы Зямлі (мал. 30).



Мал. 30. Віды мінеральных рэсурсаў па выкарыстанні і іх сувязь з тэктанічнай будовай

10.1. Геаграфія радовішчаў паліўных рэсурсаў. Найбольш значнымі паліўнымі мінеральнымі рэсурсамі з'яўляюцца вугаль, нафта і прыродны газ. Яны маюць асадкавае паходжанне, таму іх радовішчы адносяцца да асадкавых чахлоў платформаў.

с. 23

Вугаль — першы з карысных выкапняў, якія выкарыстоўваюцца чалавекам у якасці паліва. Аж да 60-х гг. XX ст. вугаль заставаўся самай выкарыстальнай крыніцай энергіі. Толькі ў канцы мінулага

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

стагоддзя яго замянілі іншыя энерганосьбіты. Аднак і цяпер ён актыўна выкарыстоўваецца ў электраэнергетыцы для вытворчасці электраэнергіі, у металургічнай прамысловасці пры выплаўленні чыгуну, з'яўляецца сыравінай для хімічнай прамысловасці. Яго ўтварэнне адбывалася ў тэктанічных прагінах з назапашанай расліннасці (дрэвападобных папараці, хвашчоў і дзеразы, а таксама першых голанасенных раслін) на працягу доўгага геалагічнага часу пры высокім ціску і тэмпературы. Большая частка вугальных басейнаў размешчана ў Паўночным паўшар'і. У Азіі, Паўночнай Амерыцы і Еўропе сканцэнтраваны самыя буйныя вугальныя басейны свету. Сярод іх *Тунгускі*, Ленскі, *Канска-Ачынскі* (буравугальны), Кузнецкі ў Расіі, Рурскі ў Германіі, частка Апалачскага ў ЗША, Данецкі ва Украіне. На долю ЗША, Расіі і Кітая прыходзіцца палова сусветных запасаў вугалю. Значнымі яго запасамі валодаюць таксама Аўстралія, Індыя, Германія, Украіна, Казахстан.

Басейн — гэта вобласць бесперапыннага распаўсюджвання карысных выкапняў. Басейн уключае некалькі радовішчаў.

с. 23

Найважнейшым відам паліўных рэсурсаў з'яўляецца **нафта**. У цяперашні час яна — галоўны энерганосьбіт і выкарыстоўваецца як сыравіна не толькі для атрымання паліва (бензін, газа, дызельнае паліва, топачны мазут), але і ў хімічнай прамысловасці (змазачныя маслы, хімічныя валокны, сінтэтычны каўчук, пластмасы, спірт, мыйныя сродкі).

Прыродны газ — самы танны від паліва. Для здабычы прыроднага газу не патрабуюцца помпы, акрамя таго, як і вугаль, ён можа выкарыстоўвацца ў якасці паліва без спецыяльнай перапрацоўкі. Перавагі гэтага віду паліва яшчэ і ў тым, што пры спальванні ён дае шмат цяпла і ў меншай меры забруджвае атмасферу. Прыродны газ таксама з'яўляецца сыравінай для вытворчасці, напрыклад, мінеральных угнаенняў, пластмас, хімічных валокнаў. *(Як вы выкарыстоўваеце прыродны газ у побыце?)*

Нафта і прыродны газ маюць блізкае паходжанне, таму вельмі часта іх радовішчы размешчаны побач і называюцца нафтагазаноснымі правінцыямі. Нафтагазаносных правінцый у свеце налічваецца каля 600, а агульная колькасць нафтавых радовішчаў — больш за 50 тысяч. Радовішчы звычайна прымеркаваны да платформаў, міжгорных прагінаў і западзін, узбярэжных зон мораў. У цяперашні час амаль трэцяя частка нафты і прыроднага газу здабываецца з шэльфа акіяна.

Радовішчы нафты і прыроднага газу знаходзяцца на ўсіх мацерыках. Самыя вялікія запасы нафты сканцэнтраваны ў Азіі. Найбуйнейшымі ў свеце нафтагазаноснымі правінцыямі з'яўляюцца тэрыторыя *Персідскага заліва* (Саудаўская Аравія, Кувейт, Ірак, Іран, Аб'яднаныя Арабскія

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Эміраты), а таксама *Заходне-Сібірская правінцыя* (Расія). У Еўропе велізарныя запасы нафты былі адкрыты на шэльфе Паўночнага мора (Вялікабрытанія і Нарвегія). Буйныя радовішчы нафты знаходзяцца ў Афрыцы: *Паўднёва-Афрыканская правінцыя* (узбярэжжы Гвінейскага заліва) і паўночная частка Сахары. Вялікімі запасамі нафты валодаюць Паўночная і Паўднёвая Амерыка. Нафтагазаносная правінцыя *Мексіканскага заліва* з'яўляецца адной з найбуйнейшых у рэгіёне. Новыя буйныя радовішчы нафты адкрыты на ўзбярэжжы Паўночнага Ледавітага акіяна.

10.2. Геаграфія радовішчаў рудных рэсурсаў. Радовішчы рудных карысных выкапняў сустракаюцца часцей за ўсё ў месцах выхаду на паверхню крышталічнага падмурка платформаў, у межах разломаў платформаў і складкаватых абласцей зямной кары. Вялікую колькасць рудных пакладаў, якія ўтварыліся ў выніку тэктанічных працэсаў, прынята называць руднымі паясамі.

Рудныя карысныя выкапні маюць вялікае значэнне ў сучасным свеце, паколькі з іх атрымліваюць усе неабходныя металы. Металы з'яўляюцца непераўзыдзенымі канструкцыйнымі матэрыяламі.

Асноўным з чорных металаў з'яўляецца жалеза. У чыстым выглядзе жалеза выкарыстоўваецца рэдка, яно з'яўляецца асновай для вытворчасці сталі.

Жалеза — адзін з найбольш распаўсюджаных элементаў у зямной кары, таму радовішчаў жалезных руд вельмі шмат. Асноўныя радовішчы прымеркаваны да крышталічнага падмурка старажытных платформаў, а таксама да складкаватых абласцей. Напрыклад, радовішчы жалезных руд у Хібінах размешчаны ў месцах выхаду на паверхню Балтыйскага крышталічнага шчыта Усходне-Еўрапейскай платформы. У раёне Варонежскага крышталічнага шчыта гэтай жа платформы знаходзіцца *Курская магнітная анамалія* — адзін з найбуйнейшых у свеце жалезарудных басейнаў. Ва Уральскіх гарах, узрост якіх большы за 300 млн гадоў, радовішчы сустракаюцца ў раёнах тэктанічных разломаў старажытнага Урала-Мангольскага складкаватага пояса.

с. 23

Найбольш вядомыя радовішчы жалезных руд размешчаны раўнамерна па зямным шары. Буйныя радовішчы жалезных руд у Еўропе прымеркаваны да Курскай магнітнай анамаліі (Расія), Крыварожскага радовішча (Украіна), Латарынгскага басейна (Францыя, Люксембург, Бельгія). У Паўночнай Амерыцы найбуйнейшымі радовішчамі з'яўляюцца Лабрадор-Сіці, Ньюфаўндлендскае (Канада), Верхняга возера (ЗША), а ў Паўднёвай Амерыцы — Каражас і Ітабіра (Бразілія). Вялікія запасы жалезнай руды разведаны ў Аўстраліі, Індыі, Кітаі.

Да ліку найбольш запатрабаваных каляровых металаў адносяцца алюміній і медзь. **Алюміній** — самы распаўсюджаны метал у зямной кары. Аднак толькі ў канцы XIX ст. быў атрыманы з руды металічны алюміній. Гэты лёгкі, трывалы, устойлівы да акіслення метал, які валодае высокай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

электраправоднасцю, шырока выкарыстоўваецца ў гаспадарчай дзейнасці, напрыклад у самалётабудаванні, аўтамабілебудаванні, ракетабудаванні.

с. 23 Да алюмініевых руд адносяць некалькі горных парод: баксіты, алуніты і ніфеліны. Самае высокае ўтрыманне алюмінію ў баксітах (40–45 %). Асноўныя баксітаносныя правінцыі: Міжземнаморская (Францыя, Італія, Грэцыя, Венгрыя, Румынія і інш), узбярэжжа Гвінейскага заліва (Гвінея, Гана, Камерун), Карыбскага басейна (Ямайка, Гаіці, Гаяна, Сурынам) і Аўстралійская. Самая буйная з іх — Міжземнаморская, размяшчэнне якой вызначаецца прымеркаванасцю да Альпійска-Гімалайскага складкаватага пояса.

З глыбокай старажытнасці чалавек выкарыстоўвае **медзь**. *(Успомніце з гісторыі, як называліся археалагічныя эпохі, звязаныя з вытворчасцю гэтага металу і яго сплаву.)* У цяперашні час медзь — аснова электратэхнікі, галоўным чынам дзякуючы яе электраправоднасці. Яна шырока выкарыстоўваецца ў вытворчасці электратэхнікі. У свеце вядома каля 200 горных парод, у якіх утрымліваецца медзь. Аднак здабываць яе мэтазгодна толькі з 17. Медныя руды ўтрымліваюць ад 1 % медзі і вышэй. Радовішчы медзі ўтвараюць два «медныя паясы». Першы знаходзіцца на тэрыторыі Афрыкі (Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Замбія) і прымеркаваны да старажытнай складкаватай вобласці Афрыканскай платформы. Другі працягнуўся ўздоўж ціхаакіянскага ўзбярэжжа Амерыкі ў Кардыльерах і Андах (Чылі, Перу, ЗША, Мексіка, Канада) у межах Кардыльерска-Андскага складкаватага пояса.

Абагульнім і запомнім. Размяшчэнне мінеральных рэсурсаў залежыць ад тэктанічнай будовы Зямлі. Паліўныя рэсурсы маюць асадкавае паходжанне, таму іх радовішчы прымеркаваны да асадкавых чахлоў платформаў. Радовішчы рудных рэсурсаў прымеркаваны да крышталічнага падмурка старажытных платформаў, а таксама да складкаватых паясоў, нярудныя — да платформаў і складкаватых паясоў.

Праверым сябе. 1. Прывядзіце прыклады паліўных, рудных і нярудных мінеральных рэсурсаў. 2. Да якіх тэктанічных структур прымеркаваны паліўныя карысныя выкапні, а да якіх — рудныя? 3. Чаму большая частка вугальных басейнаў размешчана ў Паўночным паўшар'і? 4. У якіх раёнах Зямлі адкрыты новыя нафтагазаносныя радовішчы? 5. Чаму найбуйнейшыя рудныя радовішчы ўтвараюць «паясы»?

Ад тэорыі да практыкі. Назавіце і пакажыце на карце найбуйнейшыя вугальныя басейны, нафтагазаносныя правінцыі, радовішчы жалезных, алюмініевых і медных руд.

Абмяркуем. Чаму нафту называюць «чорным золатам», а прыродны газ — «блакітным золатам»?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 4. АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ГАСПАДАРКІ



§ 11. Паняцце аб гаспадарцы. Структура гаспадаркі

Успамінаем. *Што з'яўляецца аб'ектам вывучэння эканамічнай геаграфіі? Якія віды дзейнасці людзей вам вядомыя?*

Разважаем. *Чаму ў працэсе гістарычнага развіцця грамадства гаспадарчая дзейнасць людзей ускладняецца, становіцца ўсё больш разнастайнай?*

11.1. Паняцце аб гаспадарцы.

Гаспадарка — гэта сукупнасць усіх відаў дзейнасці людзей, у працэсе якой ствараюцца новыя матэрыяльныя і нематэрыяльныя даброты, накіраваныя на задавальненне разнастайных патрэб чалавека (мал. 31).



Мал. 31. Склад гаспадаркі

Першымі і найбольш прымітыўнымі відамі гаспадарчай дзейнасці людзей былі збіральніцтва, рыбная лоўля і паляванне. Займаючыся імі, чалавек прысвойваў тое, што было створана прыродай, і задавальняў сваю

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

галоўную патрэбу — патрэбу ў ежы. Паступова, па меры развіцця грамадства, патрэбы чалавека і чалавечая дзейнасць станавіліся больш разнастайнымі. Насельніцтва стала займацца сельскай гаспадаркай. Адбыўся першы грамадскі падзел працы. У складзе сельскай гаспадаркі вылучыліся раслінаводства і жывёлагадоўля.

Удасканаленне прылад працы і спосабаў іх вырабу прывяло да ўзнікнення іншых відаў дзейнасці. З'явіліся рамёствы, якія потым паклалі пачатак прамысловай вытворчасці. Людзі будавалі жыллё, пракладвалі дарогі. У працэсе гэтага ўзнікла будаўніцтва і транспарт. З часам людзі пачалі абменьвацца вынікамі сваёй працы — паявіўся гандаль. Усе гэтыя віды дзейнасці ажыццяўляліся на пэўнай тэрыторыі і былі ўзаемазвязаны паміж сабой. Спачатку паявілася хатняя гаспадарка, потым — гаспадарка канкрэтнага населенага пункта. Па меры развіцця і ўмацавання дзяржаў фарміравалася нацыянальная гаспадарка, а развіццё эканамічных адносін паміж краінамі прывяло да ўзнікнення сусветнай гаспадаркі.

Такім чынам, гаспадарка, або гаспадарчая дзейнасць людзей, — катэгорыя гістарычная і тэрытарыяльная (геаграфічная). Яна фарміруецца на пэўнай тэрыторыі і мае свае асаблівасці ў кожны канкрэтны перыяд гістарычнага развіцця.

11.2. Структура гаспадаркі. Пад структурай гаспадаркі разумеюцца суадносіны розных відаў гаспадарчай дзейнасці паміж сабой. Веданне структуры гаспадаркі дазваляе ўстанавіць, якія віды гаспадарчай дзейнасці з'яўляюцца вядучымі, г. зн. адыгрываюць асноўную ролю ў эканоміцы краіны, рэгіёна, усяго свету.

На працягу большай часткі гістарычнага часу вядучым відам гаспадарчай дзейнасці ў большасці краін свету была сельская гаспадарка. Такая эканоміка называлася аграрнай. Па меры ўдасканалення прылад працы, тэхнікі і тэхналогій узрастала значэнне прамысловай вытворчасці і пераважным станавіўся прамысловы (індустрыяльны) тып эканомікі. У канцы XX ст. асноўную ролю ў гаспадарцы найбольш развітых краін свету сталі адыгрываць паслугі, што дазволіла казаць аб пераходзе да постіндустрыяльнага тыпу эканомікі (мал. 32).

Эканоміка ўключае гаспадарчую дзейнасць людзей, а таксама адносіны, звязаныя з вытворчасцю і размеркаваннем тавараў і паслуг.

Вывучэнне структуры гаспадаркі дазваляе не толькі вызначаць тып эканомікі, але і выяўляць асаблівасці развіцця асобных відаў гаспадарчай дзейнасці. Напрыклад, можна ўстанавіць суадносіны паміж раслінаводствам і жывёлагадоўляй у сельскай гаспадарцы. Больш высокая ўдзельная

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 32. Структура эканомікі аграрнага (*а*), індустрыяльнага (*б*) і постіндустрыяльнага тыпу (*в*), (%)

вага кошту прадукцыі жывёлагадоўлі, як правіла, сведчыць аб высокім узроўні развіцця ўсёй сельскай гаспадаркі. Такая структура сельскай гаспадаркі характэрная для найбольш развітых у эканамічных адносінах краін. У краінах, якія развіваюцца, вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы адыгрывае раслінаводства.

Разлічыўшы структуру прамысловасці, можна даведацца, як суадносяцца ў ёй здабыўная і апрацоўчыя вытворчасці. У краінах з высокім узроўнем эканамічнага развіцця вызначальную ролю ў прамысловасці маюць апрацоўчыя вытворчасці, а сярод іх — машынабудаванне і хімічная прамысловасць. У краінах, якія развіваюцца, высокім застаецца ўдзельная вага здабыўных вытворчасцей.

11.3. Сферы, галіны і віды гаспадарчай дзейнасці. Сучасная гаспадарка — гэта некалькі тысяч самых разнастайных відаў гаспадарчай дзейнасці людзей. Іх узнікненне з'яўляецца вынікам працэсаў грамадскага падзелу працы. *(Успомніце з курса гісторыі, што з сябе ўяўляе працэс грамадскага падзелу працы і якімі прычынамі ён абумоўлены.)*

Від гаспадарчай, або эканамічнай, дзейнасці — гэта працэс, пры якім аб'яднанне матэрыяльных рэсурсаў, абсталявання, працы, тэхналогій прыводзіць да атрымання аднастайнага набору прадуктаў (тавараў або паслуг).

Прыкладам грамадскага падзелу працы падчас гістарычнага развіцця можа служыць вылучэнне ў сельскай гаспадарцы раслінаводства і жывёлагадоўлі. У раслінаводстве, у сваю чаргу, таксама вылучыліся самастойныя віды дзейнасці: вырошчванне збожжавых культур, садоўніцтва, агародніцтва, бульбаводства і г. д. У жывёлагадоўлі з часам вылучыліся развядзенне буйной рагатай жывёлы (жывёлагадоўля), свінагадоўля, авечкагадоўля і іншыя напрамкі.

У цяперашні час у Рэспубліцы Беларусь распрацаваны і выкарыстоўваецца Агульнадзяржаўны класіфікатар відаў эканамічнай дзейнасці

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(АКЭД) (форзац 1). У ім вылучана некалькі ўзроўняў відаў дзейнасці. Першы, самы высокі ўзровень класіфікацыі, уключае ўзбуйненыя віды дзейнасці (сельская гаспадарка, прамысловасць, транспарт і інш.). На наступным узроўні ў кожным з гэтых узбуйненых відаў дзейнасці вылучаюць віды дзейнасці больш нізкага парадку. Усяго ў класіфікатары прадстаўлена пяць узроўняў відаў дзейнасці.

Вы ўжо ведаеце, што ўсе віды эканамічнай дзейнасці ўзаемазвязаны паміж сабой. Кожны новы від дзейнасці гістарычна з'яўляўся як запыт з боку грамадства на задавальненне нейкіх патрэб людзей. Таму існуе цэлы шэраг блізкіх паміж сабой відаў эканамічнай дзейнасці, якія можна аб'яднаць у галіны гаспадаркі.

Галіна гаспадаркі — сукупнасць відаў эканамічнай дзейнасці, якія валодаюць падабенствам выкарыстанай сыравіны, выпрацаванай прадукцыі, арганізацыі вытворчасці і тэхналогій.

У аснове ўзаемасувязі відаў дзейнасці ўнутры галіны можа ляжаць агульнасць выкарыстанай сыравіны (лясная прамысловасць), або выкарыстаных тэхналогій (хімічная прамысловасць), або прызначэння выпушчанай прадукцыі (харчовая прамысловасць, паліўная прамысловасць).

Акрамя разнастайных відаў дзейнасці і галін гаспадаркі, вылучаюцца таксама сектары і сферы гаспадарчай дзейнасці. Аб'яднанне відаў дзейнасці ў сектары адбываецца ў залежнасці ад характару выпрацаванай прадукцыі. Адпаведна вылучаюць першасны, другасны і трацічны сектары эканомікі (мал. 33).

У першасны сектар аб'ядноўваюцца віды дзейнасці, напрамую звязаныя з выкарыстаннем прыродных рэсурсаў (сельская гаспадарка, здабыўная прамысловасць). Другасны сектар утвараюць галіны апрацоўчай прамысловасці і будаўніцтва. Разам галіны першаснага і другаснага сектараў ствараюць так званы рэальны сектар эканомікі. Менавіта тут вырабляецца



Мал. 33. Сектары эканомікі: першасны (*а*), другасны (*б*), трацічны (*в*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

матэрыяльная (рэальная) прадукцыя, якая мае рэчыўна-энергетычную форму. Таму віды дзейнасці першаснага і другаснага сектараў эканомікі аб'ядноўваюць у сферу матэрыяльнай вытворчасці, або сферу вытворчасці.

Сфера вытворчасці — частка гаспадаркі, што аб'ядноўвае віды эканамічнай дзейнасці, у якіх ствараюцца матэрыяльныя даброты.

Трацічны сектар аб'ядноўвае віды дзейнасці па аказанні паслуг. **Паслуга** — гэта адно або некалькі дзеянняў, накіраваных на задавальненне разнастайных патрэб чалавека. Тут матэрыяльная прадукцыя не вырабляецца. Яна або перараспределяецца (гандаль), або дастаўляецца да спажыўца (транспарт), або аднаўляюцца яго спажывецкія якасці (рамонт). Віды дзейнасці трацічнага сектара аб'ядноўваюцца ў ***сферу нематэрыяльнай вытворчасці***, або ***сферу паслуг***.

Сфера паслуг — частка гаспадаркі, якая ўключае ў сябе ўсе віды паслуг.

Абагульнім і запомнім. Гаспадарка — гэта сукупнасць усіх відаў дзейнасці людзей, у працэсе якой ствараюцца новыя матэрыяльныя і нематэрыяльныя даброты, накіраваныя на задавальненне разнастайных патрэб чалавека. Пад структурай гаспадаркі разумеюцца суадносіны розных відаў гаспадарчай дзейнасці паміж сабой. У мэтах вывучэння відаў гаспадарчай дзейнасці, арганізацыі статыстычнага ўліку вынікаў дзейнасці людзей праводзіцца класіфікацыя відаў гаспадарчай дзейнасці, вылучаюцца галіны гаспадаркі, сектары і сферы гаспадарчай дзейнасці.

Праверым сябе. 1. Што разумеецца пад гаспадаркай? Якія прычыны паяўлення і ўскладнення гаспадарчай дзейнасці людзей? 2. Што разумеецца пад структурай гаспадаркі і як яна вызначаецца? 3. Для чаго патрэбны веды аб структуры гаспадаркі? 4. Што такое галіна гаспадаркі і па якіх прыкметах віды гаспадарчай дзейнасці аб'ядноўваюцца ў галіны? 5. На аснове якіх прыкмет вылучаюцца сферы гаспадарчай дзейнасці?

Ад тэорыі да практыкі. Пабудуйце кругавую дыяграму, якая адлюстроўвае структуру занятасці вашых сваякоў па сектарах і сферах гаспадарчай дзейнасці.

Абмяркуем. Як вы лічыце, ці будуць з часам з'яўляцца новыя віды гаспадарчай дзейнасці людзей? Адказ абгрунтуйце.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 12. Фактары размяшчэння гаспадаркі



Успамінаем. *Што такое тэрыторыя? Як размяшчаецца насельніцтва па тэрыторыі зямнога шара?*



Разважаем. *Чаму ў розных краінах і рэгіёнах свету назіраюцца істотныя адрозненні ў размяшчэнні відаў гаспадарчай дзейнасці?*

12.1. Паняцце аб фактарах размяшчэння гаспадаркі. Размяшчэнне гаспадаркі і асобных відаў гаспадарчай дзейнасці людзей (прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, транспарту і інш.) на тэрыторыі асобных краін, рэгіёнаў і ўсяго свету адбываецца не выпадкова, а пад уплывам пэўных умоў (фактараў).

Фактары размяшчэння гаспадаркі — умовы, якія аказваюць вырашальны ўплыў на выбар месца для размяшчэння канкрэтных вытворчасцей або відаў гаспадарчай дзейнасці.

На пачатковым этапе развіцця грамадства вызначальную ролю ў размяшчэнні відаў гаспадарчай дзейнасці адыгрывалі прыродныя ўмовы, прыродныя рэсурсы або прыродны фактар. Гэты фактар і сёння не страціў свайго значэння. Напрыклад, усе здабыўныя прамысловыя вытворчасці размяшчаюцца ў раёнах знаходжання радовішчаў карысных выкапняў. Для вырошчвання тых ці іншых сельскагаспадарчых культур вялікае значэнне маюць характар клімату і ўзровень урадлівасці глеб.

Фактары размяшчэння гаспадаркі не з'яўляюцца нязменнымі. Па меры развіцця грамадства і ўскладнення гаспадарчай дзейнасці людзей змянялася роля адных фактараў і з'яўляліся іншыя. Так, для развіцця гандлю вялікае значэнне мела наяўнасць транспартных шляхоў. Таму важнай станавілася роля транспартнага фактару.

У якасці прыкладу змены ролі фактараў можна прывесці фактар працоўных рэсурсаў. Першапачаткова шматлікія вытворчасці арыентаваліся на наяўнасць дастатковай колькасці работнікаў і размяшчаліся ў густанаселеных раёнах або ў буйных гарадах. З часам асноўная ўвага стала надавацца якасці працоўных рэсурсаў, узроўню іх кваліфікацыі. Вельмі часта паяўленне на тэрыторыі адной вытворчасці — прычына для паяўлення іншых вытворчасцей і тым самым таксама становіцца фактарам іх размяшчэння. Напрыклад, будаўніцтва буйной гідраэлектрастанцыі, якая вырабляе танную электраэнергію, спрыяе паяўленню ў непасрэднай блізкасці ад яе энергаёмістых вытворчасцей. Гэта такія вытворчасці, у кошце прадукцыі якіх высокую ўдзельную вагу складаюць выдаткі на электраэнергію. Да іх ліку, напрыклад, адносіцца вытворчасць алюмінію, хімічных валокнаў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

12.2. Віды фактараў размяшчэння гаспадаркі. Фактараў або прычын, якія ўплываюць на размяшчэнне ўсёй гаспадаркі і асобных відаў гаспадарчай дзейнасці, вельмі шмат. Звычайна вылучаюць тры асноўныя групы:

да ***прыродных фактараў*** адносяць запасы мінеральна-сыравінных рэсурсаў, горна-геалагічныя ўмовы іх здабычы і выкарыстання, кліматычныя характарыстыкі тэрыторыі, характар рэльефу і інш. Гэтыя фактары вызначальныя ў размяшчэнні прадпрыемстваў здабыўной прамысловасці, вадаёмістых вытворчасцей, сельскай гаспадаркі, пры арганізацыі адпачынку і турызму;

да ***сацыяльна-эканамічных фактараў*** адносяць асаблівасці размяшчэння насельніцтва, колькасную і якасную характарыстыкі працоўных рэсурсаў, узровень гаспадарчай асвоенасці тэрыторыі, эканамічную палітыку дзяржавы і інш.;

да ***матэрыяльна-тэхнічных фактараў*** адносяць матэрыяльна-тэхнічную і навукова-тэхнічную базу для гаспадарчай дзейнасці.

У кожнай з пералічаных груп можна вылучыць самастойныя фактары, якія аказваюць непасрэдны ўплыў на размяшчэнне канкрэтных прадпрыемстваў і вытворчасцей. Асноўнымі фактарамі размяшчэння гаспадаркі з'яўляюцца: сыравінны, энергетычны, працоўны, спажывецкі, транспартны, экалагічны, развіцця навукі і тэхналогій (мал. 34).

З гістарычнага пункту гледжання ў залежнасці ад часу іх з'яўлення фактары размяшчэння гаспадаркі можна падзяліць на традыцыйныя (старыя) і сучасныя (новыя). Да традыцыйных фактараў адносяцца сыравінны, працоўны, транспартны, да сучасных — экалагічны і развіцця навукі і тэхналогій.

На размяшчэнне канкрэтных відаў гаспадарчай дзейнасці ўплывае, як правіла, не адзін, а некалькі фактараў адначасова. Так, многія прадпрыемствы хімічнай прамысловасці размяшчаюцца з улікам энергетычнага і экалагічнага фактараў. Уплыў энергетычнага фактару тут абумоўлены неабходнасцю выкарыстання вялікай колькасці электраэнергіі для вытворчасці адзінкі прадукцыі. Напрыклад, для вытворчасці сінтэтычных валокнаў, пластмас. Роля экалагічнага фактару заключаецца ў негатыўным уплыве многіх хімічных вытворчасцей на навакольнае асяроддзе. Таму не дапускаецца іх размяшчэнне ў густанаселеных раёнах або прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні да тэхналогій па ачыстцы шкодных выкідаў.



Мал. 34. Асноўныя фактары размяшчэння гаспадаркі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

12.3. Характарыстыка асноўных фактараў размяшчэння гаспадаркі.

Пад ***сыравінным фактарам*** разумеецца размяшчэнне прадпрыемстваў каля крыніц зыходнага матэрыялу (сыравіны) для атрымання пэўнай прадукцыі: каля радовішчаў карысных выкапняў, буйных водных аб'ектаў, у лясных зонах і да т. п. Такія вытворчасці заснаваны на перапрацоўцы зыходнай сыравіны і выкарыстоўваюць яе ў вялікіх аб'ёмах, што робіць перавозку сыравіны на вялікія адлегласці немэтазгоднай (мал. 35). Сыравінны фактар аказвае значны ўплыў на размяшчэнне цэлага шэрага прамысловых вытворчасцей. Напрыклад, на вытворчасць калійных угнаенняў, цэменту, лесапілаванне, узбагачэнне руд каляровых металаў.



Мал. 35. Вытворчасць калійных угнаенняў

Падобным на сыравінны фактар з'яўляецца паліўны фактар. Ён аказвае вызначальны ўплыў на размяшчэнне вытворчасцей, якія выкарыстоўваюць вялікія аб'ёмы мінеральнага паліва: вугалю, прыроднага газу, мазуту. Да такіх галін адносяцца цеплаэнергетыка, асобныя вытворчасці чорнай металургіі, хімічнай прамысловасці. Так, найбольш магутныя цеплавыя электрастанцыі ў ЗША, Расіі, Кітаі пабудаваны каля буйных вугальных радовішчаў. Каля іх размяшчаюцца шматлікія прадпрыемствы па вытворчасці чыгуну і сталі.

Энергетычны фактар уплывае на размяшчэнне прадпрыемстваў, у якіх на вытворчасць адзінкі прадукцыі выкарыстоўваецца вялікая колькасць пераважна электрычнай энергіі. Такія вытворчасці называюцца энергаёмістымі. Да іх адносіцца вытворчасць многіх каляровых металаў (алюмінію, тытану і інш.) (мал. 36), хімічных валокнаў, паперы. Прадпрыемствы па вытворчасці энергаёмістай прадукцыі размяшчаюцца ў тых раёнах, дзе ў вялікіх аб'ёмах вырабляецца пераважна танная электраэнергія, напрыклад, каля буйных гідраэлектрастанцый.



Мал. 36. Вытворчасць алюмінію

Працоўны фактар аказвае вырашальны ўплыў на размяшчэнне відаў дзейнасці, заснаваных на выкарыстанні вялікай колькасці працоўных рэсурсаў (працаёмістыя вытворчасці). Напрыклад, у прамысловасці да такіх вытворчасцей адносіцца швейная. У сельскай гаспадарцы найбольш працаёмістымі з'яўляюцца рысаводства, агародніцтва, пладаводства (мал. 37). Арыентаваныя на працоўны фактар вытворчасці размяшчаюцца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пераважна ў густанаселеных раёнах з танной працоўнай сілай.



Мал. 37. Збор вінаграду

Спажывецкі, або ***рынкавы, фактар*** уплывае на размяшчэнне відаў дзейнасці, якія вырабляюць масавую прадукцыю, што карыстаецца шырокім (часам паўсядзённым) попытам у насельніцтва. Гэта прадукты харчавання, адзенне, абутак, бытавая тэхніка і інш. Спажывецкі фактар таксама з'яўляецца вызначальным для размяшчэння большасці відаў дзейнасці ў сферы паслуг: гандлю, адукацыі, бытавых паслуг. Прадпрыемствы гэтых відаў дзейнасці размяшчаюцца практычна ва ўсіх буйных населеных пунктах, г. зн. арыентуюцца на рынак збыту, на спажыўца.

Роля ***транспартнага фактару*** важная для ўсіх галін, прадукцыя якіх не спажываецца на месцы яе вытворчасці, а пастаўляецца ў іншыя раёны. Таму многія вытворчасці размяшчаюцца каля буйных транспартных вузлоў, у марскіх партах, на магістральных лініях чыгунак, нафтаправодаў.

Фактар ***развіцця навукі*** і ***тэхналогій*** аказвае вызначальны ўплыў на размяшчэнне сучасных высокатэхналагічных і навукаёмістых вытворчасцей: электронікі, робататэхнікі, фармацэўтычнай прамысловасці, біятэхналогіі. Прадпрыемствы, якія вырабляюць такую прадукцыю, размяшчаюцца пераважна ў краінах з высокім узроўнем эканамічнага развіцця, паблізу ад цэнтраў навуковых даследаванняў.

Экалагічны фактар заснаваны на ўліку ўплыву вытворчасцей на стан навакольнага асяроддзя. Да вытворчасцей, якія характарызуюцца вялікімі выкідамі забруджвальных рэчываў або іншым шкодным уздзеяннем на навакольнае асяроддзе, прад'яўляюцца павышаныя экалагічныя патрабаванні. Іх забараняецца размяшчаць у буйных гарадах і густанаселеных раёнах, на іх павінны выкарыстоўвацца сучасныя малаадходныя тэхналогіі і ўзводзіцца збудаванні па ачыстцы выкідаў. У сучасных умовах роля экалагічнага фактару ўзрастае — ён уплывае на размяшчэнне ўсіх вытворчасцей, аднак найбольш моцна ўлічваецца ў хімічнай прамысловасці, металургіі, энергетыцы (пры будаўніцтве АЭС).

Абагульнім і запомнім. Умовы, якія аказваюць вырашальны ўплыў на выбар месца для размяшчэння канкрэтных вытворчасцей або відаў гаспадарчай дзейнасці, называюцца фактарамі размяшчэння гаспадаркі. Асноўнымі фактарамі размяшчэння гаспадаркі з'яўляюцца: сыравінны, энергетычны, працоўны, спажывецкі, транспартны, экалагічны, развіцця навукі і тэхналогій.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым сябе. 1. Што разумеецца пад фактарамі размяшчэння гаспадаркі? 2. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння гаспадаркі. 3. На размяшчэнне якіх відаў гаспадарчай дзейнасці вызначальны ўплыў аказваюць прыродныя фактары? 4. Якія прамысловыя вытворчасці адносяцца да катэгорыі энергаёмістых, працаёмістых і якія асаблівасці іх размяшчэння? 5. Якая роля экалагічнага фактару ў размяшчэнні прадпрыемстваў прамысловасці і сельскай гаспадаркі?

Ад тэорыі да практыкі. Уявіце, што вы арганізуеце сучасную высокатэхналагічную вытворчасць лекавых сродкаў. На якія фактары вы будзеце арыентавацца пры выбары месца размяшчэння дадзенага прадпрыемства і ці мэтазгодна яго размяшчэнне на тэрыторыі Беларусі?

Абмяркуем. Чаму з часам роля адных фактараў у размяшчэнні гаспадаркі ўзмацняецца, а іншых — слабее?

§ 13. Паняцце аб сусветным рынку, сусветным гандлі і сусветнай гаспадарцы

Успамінаем. *Што разумеецца пад фактарамі размяшчэння гаспадаркі? Якія прычыны грамадскага падзелу працы?*

Разважаем. *Чаму ўзнікненне сусветнага рынку і сусветнай гаспадаркі з'яўляецца аб'ектыўным гістарычным працэсам?*

13.1. Гаспадарчая спецыялізацыя. У паўсядзённым жыцці вам не раз даводзілася чуць такія словы, як «спецыяльнасць», «спецыяліст», «спецыялізаваны». Ва ўсіх гэтых паняццяў агульная сэнсавая нагрузка. Спецыяльны — гэта асаблівы, асобны, які вылучаецца сярод іншых. Шырока выкарыстоўваецца гэтае паняцце і пры характарыстыцы гаспадарчай дзейнасці людзей.


Спецыялізацыя — гэта засяроджванне дзейнасці людзей, прадпрыемстваў, тэрыторый на вытворчасці найбольш выгаднай прадукцыі.

Спецыялізацыя ў гаспадарчай дзейнасці існуе здаўна. На пачатковым этапе развіцця грамадства, пакуль абмен вынікамі гаспадарчай дзейнасці паміж людзьмі быў абмежаваны, на кожнай канкрэтнай тэрыторыі людзі імкнуліся вырабляць усю неабходную ім прадукцыю. Аднак нават у гэтым выпадку ў кагосьці лепш атрымлівалася паляваць, у кагосьці — збіраць у лесе грыбы і ягады, у кагосьці — лавіць рыбу. Як вынік, з часам адбываўся падзел працы, узнікала гаспадарчая (галіновая) спецыялізацыя.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У далейшым падзел працы і спецыялізацыя адбываліся на ўсіх этапах развіцця грамадства. У аснове гэтых працэсаў ляжала эканамічная выгада: магчымасць атрымаць больш якаснай прадукцыі пры меншых выдатках на яе вытворчасць.

Вынікам гаспадарчай спецыялізацыі з'яўляецца вылучэнне самастойных відаў гаспадарчай дзейнасці або галін (галіновая спецыялізацыя) і іх замацаванне за тэрыторыямі (тэрытарыяльны падзел працы і тэрытарыяльная спецыялізацыя) (мал. 38).



Мал. 38. Гаспадарчая спецыялізацыя

13.2. Тэрытарыяльны падзел працы (ТПП). Сутнасць любога падзелу працы заключаецца ў спецыялізацыі вытворцы на выпуску пэўных відаў прадукцыі ў памерах, якія перавышаюць уласныя патрэбы ў гэтай прадукцыі. Такая прадукцыя прызначана пераважна для рэалізацыі за межамі дадзенай тэрыторыі.

Тэрытарыяльны падзел працы — аб'ектыўны гістарычны працэс гаспадарчай спецыялізацыі пэўных тэрыторый (раёнаў, рэгіёнаў, краін) на вытворчасці пэўных відаў тавараў і паслуг, зыходзячы са спецыфічнага спалучэння прыродных, сацыяльна-эканамічных і тэхналагічных фактараў.

Эканамічны сэнс дадзенага працэсу ў тым, што агульныя выдаткі на вытворчасць прадукцыі на дадзенай тэрыторыі аказваюцца мінімальнымі. Памяншэнне выдаткаў забяспечваецца за кошт больш спрыяльных умоў. У выніку, пастаўляючы прадукцыю на рынак, вытворцы маюць магчымасць атрымліваць большы прыбытак. Як вынік, вытворчасць паступова замацоўваецца за дадзенай тэрыторыяй. У якасці сіноніма тэрытарыяльнага падзелу працы часта выкарыстоўваюць паняцце *геаграфічны падзел працы*.

Гаспадарчая спецыялізацыя спрыяе наладжванню абмену (гандлю) паміж вытворцамі. Без абмену вынікамі гаспадарчай дзейнасці тэрытарыяльны падзел працы немагчымы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

13.3. Сусветны рынак, сусветны гандаль і сусветная гаспадарка. Вытворцы, якія спецыялізуюцца на вытворчасці той ці іншай прадукцыі, актыўна абменьваюцца вынікамі сваёй гаспадарчай дзейнасці. У працэсе абмену (гандлю) выраблены прадукцыяй складваюцца рынкі — мясцовыя (у населеных пунктах, раёнах), нацыянальныя (унутры краін) і сусветны рынак. Як вынік, фарміруецца мясцовая, нацыянальная і сусветная гаспадарка.

Гандаль (рынак тавараў і паслуг) з'яўляецца найважнейшым відам эканамічных адносін паміж вытворцамі прадукцыі. Аднак, акрамя яго, існуюць і іншыя віды эканамічных адносін: абмен працоўнымі і фінансавымі рэсурсамі, навукова-тэхнічнай інфармацыяй і г. д.

Узнікненню сусветнага гандлю спрыяла наладжванне міжнародных гандлёвых адносін. Міжнародным лічыцца гандаль паміж дзвюма і больш краінамі. Па меры таго як у гандлёвыя адносіны ўключаліся краіны розных рэгіёнаў свету, сфарміраваўся сусветны гандаль.

Сусветны гандаль — сістэма міжнародных таварна-грашовых адносін, якая складваецца са знешняга гандлю ўсіх краін свету.

Сусветны гандаль з'явіўся ў працэсе зараджэння сусветнага рынку ў XVI–XVIII стст., чаму ў немалой ступені паспрыяла эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. У далейшым яго маштабы толькі ўзрасталі, а геаграфія пастаянна пашыралася. У выніку развіцця сусветнага гандлю сфарміраваўся сусветны рынак, які стаў асновай для развіцця і найважнейшай складовай часткай сусветнай гаспадаркі.

Сусветны рынак — складовая частка сусветнай гаспадаркі, якая прадстаўляе сферу попыту і прапановы, а таксама камерцыйнага абмену тавараміі паслугамі. Сусветны рынак таксама можна вызначыць як сістэму ўстойлівых таварна-грашовых адносін паміж дзяржавамі, прадпрымальнікамі, камерцыйнымі арганізацыямі, фірмамі розных краін, звязанымі паміж сабой удзелам у міжнародным падзеле працы.

Ва ўмовах пашырэння і паглыблення сусветных гаспадарчых сувязей таварныя рынкі страчваюць нацыянальныя межы, ператвараючыся ў сусветныя таварныя рынкі, на якія са сваёй прадукцыяй выходзяць прадстаўнікі ўсіх краін. Сусветны рынак прадстаўлены рознымі відамі таварных рынкаў, рынкаў паслуг, фінансавых рынкаў, рынкаў рэсурсаў, у тым ліку і працоўных. Дзейнасць сусветных рынкаў тавараў і паслуг рэгулюецца міжнароднымі дамовамі і пагадненнямі. На кожным таварным рынку складваюцца свае цэнтры гандлю. Па спосабе арганізацыі гандлю адрозніваюць асаблівыя віды рынкаў: аўкцыёны, таргі, міжнародныя выставы (мал. 39) і кірмашы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сусветная гаспадарка — гэта сукупнасць нацыянальных гаспадарак усіх краін свету, звязаных паміж сабой сістэмай эканамічных адносін. Фарміраванне сусветнай гаспадаркі пачалося ў XVIII ст. Гэты перыяд характарызаваўся бурным развіццём вытворчасці тавараў. Канчаткова ж фарміраванне сусветнай гаспадаркі завяршылася ў канцы XIX — пачатку XX ст., чаму ў немалой ступені спрыяла развіццё буйной машыннай вытворчасці.



Мал. 39. Міжнародны аўтасалон у Франкфурце-на-Майне (ФРГ)

Асаблівасцю сучаснай сусветнай гаспадаркі з'яўляецца ўсталяванне больш цесных сувязей паміж прадпрыемствамі розных краін, у выніку чаго вытворчасць адной краіны становіцца часткай сусветнай вытворчасці — грамадскага працэсу.

Абагульнім і запомнім. Гаспадарчая спецыялізацыя — гэта працэс засяроджвання намаганняў і рэсурсаў на пэўных відах дзейнасці. Тэрытарыяльны падзел працы ўяўляе з сябе працэс замацавання асобных відаў гаспадарчай дзейнасці за пэўнымі тэрыторыямі. У выніку гаспадарчай спецыялізацыі і тэрытарыяльнага падзелу працы адбываецца развіццё сусветнага гандлю, фарміраванне сусветнага рынку і сусветнай гаспадаркі.

Праверым сябе. 1. Што такое гаспадарчая спецыялізацыя і якія яе прычыны? 2. Як узаемазвязаны паміж сабой гаспадарчая спецыялізацыя і тэрытарыяльны падзел працы? 3. Што з'яўляецца найважнейшай умовай тэрытарыяльнага падзелу працы? 4. Чаму гаспадарчая спецыялізацыя і тэрытарыяльны падзел працы з'яўляюцца аб'ектыўнымі гістарычнымі працэсамі? 5. Калі і ў сувязі з чым пачалося фарміраванне сусветнага рынку і сусветнай гаспадаркі?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначце, на якіх відах гаспадарчай дзейнасці спецыялізуецца раён ці вобласць, у якіх вы жывяце.

Для дапытлівых. Карыстаючыся дадатковымі крыніцамі інфармацыі, вызначце найбуйнейшыя таварныя біржы, што існуюць у цяперашні час, і купля-продаж якіх тавараў на іх ажыццяўляецца.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 14. Паказчыкі ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краін

Успамінаем. *Што такое структура гаспадаркі і што яна характарызуе?*

Разважаем. *Чаму для вызначэння ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны неабходна выкарыстоўваць розныя паказчыкі?*

14.1. Валавы ўнутраны прадукт. Вы ўжо ведаеце, што краіны свету моцна адрозніваюцца паміж сабой па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва. *(Успомніце, якія краіны з'яўляюцца сусветнымі лідарамі па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва, а ў якіх краін гэтыя паказчыкі найменшыя.)* Не менш істотнымі з'яўляюцца адрозненні краін па маштабах эканомікі і ўзроўні эканамічнага развіцця. Для таго каб можна было параўноўваць краіны паміж сабой па характары эканамічнага развіцця, выкарыстоўваюцца розныя паказчыкі. Адным з найбольш значных статыстычных паказчыкаў, якія характарызуюць маштабы эканамічнага развіцця асобнай краіны або ўсяго свету, з'яўляецца валавы ўнутраны прадукт.

Валавы ўнутраны прадукт (ВУП) — гэта эканамічны паказчык, які адлюстроўвае рынкавы кошт усіх тавараў і паслуг, вырабленых за год ва ўсіх галінах эканомікі на тэрыторыі краіны.

Пры разліку ВУП улічваецца дзейнасць усіх вытворцаў прадукцыі, размешчаных на тэрыторыі дадзенай краіны, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці.

Краіны, якія з'яўляюцца сусветнымі лідарамі па памерах ВУП і валодаюць самымі магутнымі эканомікамі ў свеце, можна падзяліць на дзве групы. У першую ўваходзяць высокаразвітыя ў эканамічных адносінах краіны, у тым ліку і тыя, што не з'яўляюцца сусветнымі лідарамі па колькасці насельніцтва (ЗША, Японія, Германія, Францыя, Вялікабрытанія, Італія). Другую групу ўтвараюць краіны, якія развіваюцца і валодаюць, як правіла, вялікай колькасцю насельніцтва (Кітай, Індыя, Расія, Інданезія, Бразілія, Мексіка). Паводле ацэнак Сусветнага банка, сукупны ВУП усіх краін свету ў 2018 г. склаў 136 461 млрд дол. ЗША.

14.2. Адрозненні краін па ўзроўні эканамічнага развіцця. ВУП адлюстроўвае маштабы эканомікі, характарызуе агульную эканамічную моц краіны, але не дазваляе зрабіць вывад аб узроўні яе эканамічнага развіцця. Напрыклад, знаходжанне Індыі на 3-м месцы ў свеце па памерах ВУП не сведчыць аб тым, што ўзровень яе эканамічнага развіцця вышэйшы, чым у Нідэрландаў, якія знаходзяцца па паказчыку ВУП на 26-м месцы ў свеце. Таму для вызначэння ўзроўню эканамічнага развіцця краіны, а таксама

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва выкарыстоўваюць іншы паказчык — *валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва*.

Паказчык ВУП на душу насельніцтва адлюстроўвае размеркаванне вырабленага багацця паміж насельніцтвам краіны і характарызуе ўзровень матэрыяльнага дабрабыту людзей. Сярэднесусветны паказчык душавога ВУП, па даных Сусветнага банка, склаў у 2017 г. 10 700 дол. ЗША.


с. 25 *(Выкарыстоўваючы карту і палітычную карту свету, вызначце краіны, ВУП на душу насельніцтва ў якіх вышэйшы за сярэднесусветны ўзровень і, наадварот, знаходзіцца на нізкім узроўні.)*

Найбольш высокі паказчык ВУП на душу насельніцтва характэрны для краін з постіндустрыяльным тыпам эканомікі, высокім узроўнем прадукцыйнасці працы, сучаснай структурай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Гэтыя краіны актыўна ўдзельнічаюць у міжнародным падзеле працы, значная частка вырабленай імі прадукцыі арыентавана на экспарт. Сусветнымі лідарамі па паказчыку ВУП на душу насельніцтва з'яўляюцца Люксембург, Швейцарыя, Нарвегія.

Групу краін, у якіх ВУП на душу насельніцтва перавышае 20 тыс. дол. ЗША, прынята называць краінамі з высокім узроўнем эканамічнага развіцця (мал. 40). Да гэтай групы адносіцца большасць краін Еўропы, а таксама Канада, ЗША, Аўстралія, Новая Зеландыя (усяго каля 40 краін свету). *(Калі параўнаць спіс краін-лідараў па ВУП і ВУП на душу насельніцтва, то ён моцна адрозніваецца. Як вы думаеце, у чым прычына такіх адрозненняў?)*

Краіны, у якіх ВУП на душу насельніцтва знаходзіцца ў межах ад 2 да 20 тыс. дол. ЗША, складаюць групу сярэднеразвітых па ўзроўні эканамічнага развіцця. У яе ўваходзіць каля 90 краін з усіх рэгіёнаў свету, у тым ліку Рэспубліка Беларусь. У большасці сваёй гэта краіны, эканоміка якіх развіваецца хуткімі тэмпамі. Адбываюцца змены галіновай структуры гаспадаркі, у ёй узрастае роля сферы паслуг. Гэтыя краіны актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных эканамічных зносінах.

с. 25 *(Выкарыстоўваючы карту і палітычную карту свету, прывядзіце прыклады сярэднеразвітых краін з розных рэгіёнаў свету.)*



Мал. 40. Класіфікацыя краін свету па ўзроўні эканамічнага развіцця

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У трэцюю групу, з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця, уваходзяць краіны, ВУП на душу насельніцтва ў якіх не перавышае 2 тыс. дол. ЗША. Усяго такіх краін каля 60. Большасць з іх размешчана ў Афрыцы (Конга, Чад, Мадагаскар) і Паўднёвай Азіі (Бангладэш). Нізкія паказчыкі ВУП на душу насельніцтва ў гэтых краінах шмат у чым тлумачацца адсталай структурай эканомікі, перавагай у ёй галін здабыўной прамысловасці і сельскай гаспадаркі, моцнай залежнасцю ад экспарту высокатэхналагічнай прадукцыі з эканамічна развітых краін.

У групе краін з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця звычайна вылучаюць яшчэ каля 10 найменш эканамічна развітых краін. ВУП на душу насельніцтва ў іх не перавышае 500 дол. ЗША. Гэтым краінам міжнародная супольнасць аказвае фінансавую і матэрыяльную дапамогу.

14.3. Індэкс чалавечага развіцця (ІЧР). Групы краін па ІЧР. Паказчык ВУП на душу насельніцтва характарызуе матэрыяльны дабрабыт чалавека і дазваляе параўноўваць краіны па ўзроўні эканамічнага развіцця. Аднак, акрамя матэрыяльнага дабрабыту, для сучаснага чалавека важным складнікам годнага жыцця з'яўляюцца розныя сацыяльныя выгоды: даступнасць і якасць адукацыі, медыцынскага абслугоўвання, магчымасць атрымліваць дакладную інфармацыю, забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці і многае іншае. У забеспячэнні гэтых выгод для людзей вялікую ролю адыгрывае дзяржава, рэалізуючы разнастайныя праграмы развіцця, у тым ліку праграмы падтрымкі асобных груп насельніцтва. Таму для характарыстыкі ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны недастаткова толькі паказчыка ВУП на душу насельніцтва. З гэтай мэтай ААН быў прапанаваны такі паказчык, як індэкс чалавечага развіцця.

Індэкс чалавечага развіцця — гэта сукупны паказчык узроўню развіцця чалавека ў той ці іншай краіне.

Часам яго выкарыстоўваюць у якасці сіноніма такіх паняццяў, як «якасць жыцця» або «ўзровень жыцця». У дакументах ААН развіццё чалавека разумеецца як «працэс пашырэння свабоды людзей жыць доўгім, здаровым і творчым жыццём, актыўна ўдзельнічаць у забеспячэнні справядлівасці і ўстойлівасці развіцця на планеце».

с. 25

ІЧР вымярае дасягненні краіны з пункту гледжання стану здароўя, атрымання адукацыі і фактычнага даходу яе грамадзян па трох асноўных напрамках (інтэграваных паказчыках), для кожнага з якіх ёсць свая шкала ацэньвання (свае індэксы) ад 0 да 1.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Першы напрамак характарызуецца такім паказчыкам, як індэкс чаканай працягласці жыцця: здароўе і даўгалецце, якія вымяраюцца паказчыкам сярэдняй чаканай працягласці жыцця пры нараджэнні.

Другі напрамак прадстаўлены індэксам адукацыі: доступ да адукацыі, які вымяраецца сярэдняй чаканай працягласцю навучання дзяцей школьнага ўзросту і сярэдняй працягласцю навучання дарослага насельніцтва.

Трэці напрамак характарызуецца паказчыкам узроўню жыцця, які вымяраецца велічынёй ВУП на душу насельніцтва ў доларах ЗША.

У выніковым рэйтынгу ІЧР усе краіны ранжыруюцца па чатырох групах: з вельмі высокім узроўнем ІЧР (каля 60 краін); з высокім узроўнем ІЧР (больш за 50 краін); з сярэднім узроўнем ІЧР (каля 40 краін); з нізкім узроўнем ІЧР (40 краін). Рэспубліка Беларусь у рэйтынгу за 2017 г. займае 53-е месца і ўваходзіць у групу краін з вельмі высокім узроўнем ІЧР. Сусветнымі лідарамі па ІЧР у 2017 г. былі Нарвегія (0,953), Швейцарыя (0,944) і Аўстралія (0,939). Самыя нізкія паказчыкі ІЧР у Чада, Нігера і Цэнтральна-Афрыканскай Рэспублікі (ніжэй за 0,4)

Абагульнім і запомнім. ВУП — гэта эканамічны паказчык, які адлюстроўвае рынкавы кошт усіх тавараў і паслуг, выраблены за год ва ўсіх галінах эканомікі на тэрыторыі краіны. ВУП на душу насельніцтва паказвае размеркаванне выпрабленага багацця паміж насельніцтвам краіны. Індэкс чалавечага развіцця — гэта сукупны паказчык узроўню развіцця чалавека ў той ці іншай краіне, які ўлічвае стан здароўя, атрыманне адукацыі і фактычны даход яе грамадзян.

Праверым сябе. 1. Які паказчык адлюстроўвае маштабы эканамічнага развіцця краіны? 2. Ці можна па памерах ВУП краіны судзіць аб узроўні яе эканамічнага развіцця? 3. Які паказчык выкарыстоўваецца для характарыстыкі ўзроўню эканамічнага развіцця краіны? 4. У чым адрозненне паміж узроўнямі эканамічнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны? 5. Які паказчык выкарыстоўваецца для характарыстыкі ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і як ён вызначаецца?

Ад тэорыі да практыкі. Па памеры ВУП Кітай выйшаў у сусветныя лідары, абагнаўшы ЗША. Аднак па ўзроўні эканамічнага развіцця ён займае 71-е месца ў свеце, значна саступаючы ЗША (7-е месца). Як вы думаеце, ці зможа Кітай па ўзроўні эканамічнага развіцця ў найбліжэйшы час істотна наблізіцца да ЗША?

Абмяркуем. У рэйтынгу краін па паказчыках ВУП на душу насельніцтва і ІЧР Беларусь займае 88-е і 53-е месцы адпаведна. Як вы думаеце, у чым прычына названых адрозненняў?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 5. СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА



§ 15. Сельская гаспадарка і яе галіновая структура

Успамінаем. *Якія землі называюць сельскагаспадарчымі ўгоддзямі? Якія віды дзейнасці характэрныя для сельскага насельніцтва?*

Разважаем. *Чаму ўдзельная вага сельскай гаспадаркі ў структуры сусветнай эканомікі памяншаецца?*

15.1. Агульная характарыстыка. Сельская гаспадарка — найстарэйшы від эканамічнай дзейнасці чалавека, які ўзнік прыкладна дзесяць тысяч гадоў таму. Вы ўжо ведаеце, што гэты від дзейнасці на працягу значнай часткі гістарычнага часу заставаўся найважнейшым у свеце. Затым ён саступіў першынство прамысловасці, а ў далейшым — і сферы паслуг. *(Успомніце, якую долю ў структуры сучаснай сусветнай эканомікі займае сельская гаспадарка.)* Тым не менш і ў цяперашні час сельская гаспадарка — адзін з асноўных відаў эканамічнай дзейнасці сферы матэрыяльнай вытворчасці. Сельская гаспадарка ў першую чаргу з'яўляецца галоўным пастаўшчыком прадуктаў харчавання для насельніцтва Зямлі і забяспечвае шэраг галін прамысловасці сыравінай раслінага і жывёльнага паходжання. Акрамя таго, у ёй занята каля 1,1 млрд чалавек. Немалаважным з'яўляецца і тое, што сельская гаспадарка адрозніваецца паўсюдным распаўсюджваннем, г. зн. атрымала развіццё практычна ва ўсіх краінах свету (мал. 41–42).



Мал. 41. Фермерская гаспадарка ў Паўночнай Амерыцы



Мал. 42. Земляробства ў Афрыцы

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У развіцці сусветнай сельскай гаспадаркі назіраецца наступная заканамернасць: чым вышэйшы ўзровень эканамічнага развіцця краіны, тым ніжэйшая ўдзельная вага сельскай гаспадаркі ў структуры занятасці насельніцтва і ВУП краіны. І наадварот, чым ніжэйшы ўзровень эканамічнага развіцця краіны, тым вышэйшая ўдзельная вага сельскай гаспадаркі ў структуры занятасці насельніцтва і ВУП краіны. Пры гэтым аб'ёмы сельскагаспадарчай вытворчасці ў эканамічна высокаразвітых краінах могуць значна перавышаць адпаведныя паказчыкі краін з сярэднім і нізкім узроўнямі эканамічнага развіцця.

У краінах з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця атрыманне прыросту сельскагаспадарчай прадукцыі ажыццяўляецца за кошт прыцягнення дадатковай працоўнай сілы і пашырэння пасяўных плошчаў (пры нязменнай матэрыяльна-тэхнічнай базе, з выкарыстаннем ужо ўжывальных гатункаў раслін, пародаў жывёлы і г. д.). Такі шлях развіцця сельскай гаспадаркі называюць экстэнсіўным.

У структуры занятасці насельніцтва для большасці краін з высокім узроўнем эканамічнага развіцця ўдзельная вага занятых у сельскай гаспадарцы рэдка перавышае 5–6 % і максімальна падымаецца да 10 % (1 % у Вялікабрытаніі, ЗША; 2 % у Канадзе, Бельгіі; да 3 % у Даніі, Германіі; 4 % у Італіі, Францыі). Доля сельскай гаспадаркі ў ВУП гэтых краін — ад 1–2 % да 10 %. У сусветнай сельскагаспадарчай вытворчасці доля краін з высокім узроўнем эканамічнага развіцця складае крыху больш за 20 %.

Для эканамічна развітых краін характэрна павелічэнне сельскагаспадарчай прадукцыі з дапамогай механізацыі, хімізацыі, ірыгацыі (штучнага паліву), прымянення новых тэхналогій, выкарыстання высокаўраджайных і хваробаўстойлівых гатункаў і высокапрадукцыйных пародаў жывёл. Такі шлях развіцця сельскай гаспадаркі называюць інтэнсіўным.

У краінах з сярэднім і нізкім узроўнем эканамічнага развіцця ўдзельная вага занятых у сельскай гаспадарцы складае 20–60 %, а часам даходзіць да 80–90 %. Доля галіны ў ВУП гэтых краін мае тэндэнцыю да зніжэння, але ў большасці з іх застаецца высокай і вельмі высокай (больш за 50 % — у трапічных краінах Афрыкі, больш за 30 % — у некаторых краінах Азіі і Лацінскай Амерыкі). Гэта азначае, што ў краінах гэтых рэгіёнаў асабліва высокая залежнасць эканомікі ад сельскай гаспадаркі. Доля краін з сярэднім і нізкім узроўнем эканамічнага развіцця ў прадукцыі ўсёй сусветнай сельскай гаспадаркі складае каля 80 %.


Сусветнымі лідарамі па аб'ёмах сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўляюцца Кітай, ЗША, Індыя, Бразілія. Сярод іх вылучаюцца Кітай і ЗША. Кожная з гэтых краін вырабляе 1/10 сусветнай прадукцыі сельскай гаспадаркі. Індыя і Бразілія вырабляюць прыкладна па 5–6 % сусветнай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадукцыі сельскай гаспадаркі. Значныя аб'ёмы сельскагаспадарчай вытворчасці маюць таксама Японія, Францыя, Германія, Расія, Аўстралія.

15.2. Структура сельскай гаспадаркі. Сельская гаспадарка — гэта від эканамічнай дзейнасці, які займаецца вырошчваннем культурных раслін і развядзеннем свойскіх жывёл.

У структуры сельскай гаспадаркі вылучаюць раслінаводства і жывёлагадоўлю (мал. 43). Каля 60 % валавой прадукцыі сусветнай сельскагаспадарчай вытворчасці прыходзіцца на жывёлагадоўлю. У эканамічна развітых краінах жывёлагадоўля, як правіла, з'яўляецца вядучай галіной сельскай гаспадаркі. Яе прадукцыя па кошце значна перавышае прадукцыю раслінаводства. Выключэнне складаюць краіны, якія валодаюць выключна спрыяльнымі прыроднымі ўмовамі для развіцця асобных галін раслінаводства. Землі Канады і ЗША спрыяльныя для развіцця збожжавай гаспадаркі, краін Паўднёвай Еўропы — для вырошчвання субтрапічных культур (вінограду, цытрусавых і да т. п.).



Мал. 43. Склад сельскай гаспадаркі

У краінах з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця практычна паўсюдна вядучай галіной сельскай гаспадаркі з'яўляецца раслінаводства. Сярод развітых краін выключэнне складаюць Японія, Іспанія, Партугалія, Грэцыя, у якіх высокая доля раслінаводства.

15.3. Узаемасувязь сельскагаспадарчай дзейнасці з прыроднымі ўмовамі і рэсурсамі. Галіновая структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі краін шмат у чым залежаць ад прыродных умоў. Пры гэтым вырашальную ролю адыгрываюць глебы і клімат. Для развіцця сельскай гаспадаркі ўрадлівых глеб недастаткова. Сельскагаспадарчыя культуры патрабуюць аптымальнай колькасці цяпла, вільгаці, святла. Яны змяняюцца з геаграфічнай шыратой. Кожнай геаграфічнай шыраце адпавядае пэўная сума спрыяльных для росту раслін тэмператур, колькасць атмасферных ападкаў, працягласць вегетацыйнага перыяду. Дадзеныя агракліматычныя паказчыкі вызначаюць умовы для вырошчвання сельскагаспадарчых культур. У перыяд вегетацыі раслін для адных культур важным з'яўляецца высокая тэмпература, для другіх — вялікая колькасць ападкаў, для трэціх — вялікая колькасць ападкаў і спрыяльныя для вегетацыі тэмпературы. Неспрыяльныя кліматычныя з'явы (засухі, замаразкі) у вегетацыйны перыяд абмяжоўваюць актыўнае развіццё раслін, зніжаюць ураджайнасць сельскагаспадарчых культур, а часам цалкам іх знішчаюць (паводкі). *(Падумайце, якія неспрыяльныя кліматычныя з'явы ўплываюць на вырошчванне бульбы ва ўмовах Беларусі.)*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На размяшчэнне і развіццё жывёлагадоўлі таксама ўплываюць прыродныя ўмовы. Рацыёны кармлення складаюцца ў адпаведнасці з кліматычнымі ўмовамі. Ва ўмовах халоднага клімату неабходна абараняць жывёл ад холаду. Прадугледжваецца будаўніцтва памяшканняў з тоўстымі сценамі для ўтрымання цяпла. Пры пашавай жывёлагадоўлі павінны быць прадугледжаны хованкі ад снегу, дажджу і ветру. Пры нізкіх тэмпературах догляд за жывёламі праводзіцца ў памяшканнях. У шыротах з гарачым кліматам неабходна абараняць жывёл ад перагрэву. Для павышэння эфектыўнасці жывёлагадоўлі пароды буйной рагатай жывёлы падбіраюцца з улікам кліматычных умоў.

Асаблівасці агракліматычных рэсурсаў значна адрозніваюцца па цеплавых паясах. У кожным з іх фарміруецца своеасаблівы набор галін раслінаводства і жывёлагадоўлі. Так, у халодным поясе Еўразіі і Паўночнай Амерыкі пры недахопе цяпла і наяўнасці вечнай мерзлаты магчыма аленегадоўля, а раслінаводства — толькі ў закрытым грунце. Ва ўмераным цеплавым поясе развіта масавае земляробства і вырошчваецца шырокі набор сельскагаспадарчых культур. У паўднёвай яго частцы, у субтрапічным геаграфічным поясе, атрымліваюць два ўраджаі ў год: зімой — культур умеранага пояса, летам — трапічнага. У гарачым цеплавым поясе запасы цяпла практычна неабмежаваныя, вегетацыя доўжыцца круглы год. Культурныя расліны прадстаўлены відамі трапічнага і экватарыяльнага паходжання.

Сучасная навука і тэхніка дазваляюць аслабіць уплыў прыродных умоў на вырошчванне сельскагаспадарчых культур, але да пэўных меж.

Абагульнім і запомнім. Сельская гаспадарка — адзін з вядучых відаў эканамічнай дзейнасці. Сельская гаспадарка з'яўляецца асноўным пастаўшчыком прадуктаў харчавання для насельніцтва свету і забяспечвае шэраг галін прамысловасці сыравінай раслінага і жывёльнага паходжання. Гэты від эканамічнай дзейнасці падзяляюць на дзве галоўныя галіны — раслінаводства і жывёлаводства. Сельская гаспадарка цесна звязана з прыроднымі ўмовамі і рэсурсамі. Агракліматычныя рэсурсы абумоўліваюць прадукцыйнасць і ўмовы развіцця раслінаводства і жывёлагадоўлі.

Праверым сябе. 1. Які від эканамічнай дзейнасці называюць сельскай гаспадаркай? 2. Якія галоўныя галіны ўключае сельская гаспадарка? 3. Для якіх краін па ўзроўні эканамічнага развіцця сельская гаспадарка адыгрывае найбольш важную ролю? 4. Якая роля ў развіцці сельскай гаспадаркі агракліматычных рэсурсаў? 5. Ці можна сцвярджаць, што прыродны фактар з'яўляецца асноўным у развіцці і размяшчэнні сельскай гаспадаркі? Аргументуйце свой пункт гледжання.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ад тэорыі да практыкі. Калі б у вас з'явілася магчымасць развіваць сельскую гаспадарку ў субтрапічным поясе, якія гэта былі б галіны, у якіх краінах і чаму?

Абмяркуем. Які ўплыў на развіццё сельскай гаспадаркі можа аказаць пацяпленне клімату?

§ 16. Раслінаводства. Геаграфія вырошчвання збожжавых культур


Успамінаем. *Якія сельскагаспадарчыя культуры вырошчваюцца ў вашай мясцовасці? Які ўплыў на развіццё сельскай гаспадаркі аказваюць прыродныя ўмовы?*

Разважаем. *Чаму збожжавая гаспадарка займае лідзіруючыя пазіцыі ў раслінаводстве?*

16.1. Раслінаводства. Найважнейшай галіной сельскай гаспадаркі з'яўляецца раслінаводства.

Раслінаводства — гэта галіна сельскай гаспадаркі, якая займаецца вырошчваннем культурных раслін.


Аснову раслінаводства складае земляробства — від дзейнасці людзей, звязаны з апрацоўкай зямель. Культурныя расліны, якія апрацоўваюцца з мэтай атрымання прадуктаў харчавання, тэхнічнай сыравіны і корму для жывёл, называюць сельскагаспадарчымі культурамі. Раслінаводства спецыялізуецца на вырошчванні: збожжавых, зернебабовых (гарох, лубін, сачавіца і інш.); кармавых (караняплоды і сеяныя травы); тэхнічных; агароднінных (памідоры, капуста, агуркі і інш.); клубняплодаў (бульба, батат, маніёк); пладовых (яблыкі, грушы, бананы, цытрусавыя і г. д.) культур (мал. 44). Найбольш разнастайны склад маюць тэхнічныя культуры, сярод якіх вылучаюць валакністыя, алейныя, цукраносныя, танізуючыя і інш.



Мал. 44. Склад раслінаводства

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

16.2. Геаграфія вырошчвання збожжавых культур. Аснову сусветнага раслінаводства складае вырошчванне збожжавых культур (мал. 45). Пад імі занята каля 1/2 усіх сусветных ворных угоддзяў. Шырокая геаграфія вырошчвання збожжавых культур абумоўлена іх разнастайнасцю і прыстасаванасцю да розных прыродных умоў, а таксама невысокай патрабавальнасцю да культуры земляробства (апрацоўкі глебы, догляду за пасевамі і інш.) і ўніверсальнасцю іх ужывання.



Мал. 45. Збожжавыя культуры


Найважнейшым паказчыкам, які характарызуе збожжавую гаспадарку, з'яўляецца валавы збор збожжа. Ён залежыць ад памеру пасяўных плошчаў і ўраджайнасці збожжавых культур. Сусветны валавы збор збожжавых пастаянна расце.

Валавы збор — гэта агульны збор сельскагаспадарчых культур з усёй плошчы пасеваў.

с. 27

Лідарамі па валавым зборы збожжавых культур сярод рэгіёнаў свету з'яўляюцца Азія, Еўропа і Паўночная Амерыка. Асноўная частка збожжавых культур вырабляецца ў Кітаі, ЗША і Індыі.

16.3. Галоўныя збожжавыя культуры. З усіх збожжавых культур галоўная роля ў свеце належыць пшаніцы, кукурузе і рысу. Іх доля ў агульных пасевах і валавым сусветным зборы збожжавых культур складае каля 80 % (мал. 46). Штогадовы сусветны збор кожнай з іх перавышае 500 млн т. У той жа час для рэгіёнаў свету характэрны пэўны набор асноўных збожжавых культур: у Еўропе — пшаніца, жыта, ячмень; у Азіі — рыс,



Мал. 46. Структура пасяўных плошчаў (*а*) і валавога збору (*б*) збожжавых (%)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пшаніца; у Амерыцы — кукуруза, пшаніца, рыс; у Аўстраліі — пшаніца, ячмень; у Афрыцы — кукуруза, сорга і проса.



Мал. 47. Пшаніца

Пшаніца — гэта галоўная збожжавая культура ўмеранага пояса, якая служыць хлебам прыкладна для паловы чалавецтва (мал. 47). Радзімай пшаніцы лічыцца Пярэдняя Азія (Заходняя і Паўднёва-Заходняя Азія) і Міжземнамор'е. Яна не занадта патрабавальная да вады, дае добрыя ўраджаі на чарназёмных глебах. Вырошчваецца ў асноўным у стэпавай і лесастэпавай прыродных зонах Еўропы і Азіі, прэрыях Паўночнай Амерыкі, пампе Паўднёвай Амерыкі, паўпустынях Аўстраліі. Сусветнымі лідарамі сярод краін па вытворчасці пшаніцы з'яўляюцца Кітай, Індыя і ЗША. На долю Азіі прыходзіцца 2/5 сусветнай вытворчасці пшаніцы, Еўропы — прыкладна 1/3 (асноўныя вытворцы — Францыя, Расія, Украіна). Найбуйнейшым рэгіёнам, які спецыялізуецца на вырошчванні пшаніцы, з'яўляецца таксама Паўночная Амерыка (ЗША і Канада).

Рыс — традыцыйная азіяцкая культура, вырошчваецца амаль у 100 краінах свету. Гэта старажытная і вельмі ўраджайная культура, якая сваім паходжаннем абавязана паўвостраву Індастан. Рыс — цеплалюбівая і вільгацелюбівая культура субтрапічнага і трапічнага кліматычных паясоў мусоннага тыпу клімату. Вырошчваецца ў асноўным на штучна арашальных землях (чэках) (мал. 48). Гэта круглагадовая культура, ураджаі якой збіраюць два, тры, а то і чатыры разы на год. Асноўная вытворчасць рысу засяроджана ў краінах Азіі. На дадзены рэгіён прыходзіцца 9/10 сусветнага збору. У *Кітаі* і *Індыі* засяроджана каля паловы сусветнай вытворчасці рысу. Трэцяе месца па валавым зборы займае *Інданезія*. Краіны рэгіёна з'яўляюцца таксама яго асноўнымі спажыўцамі. Крыху больш за 10 млн т рысу вырабляюць Бразілія, Пакістан.



Мал. 48. Вырошчванне рысу



Мал. 49. Кукуруза

Кукуруза — асноўная культура сусветнай збожжавай гаспадаркі і самая ўраджайная (рыс. 49). Радзімай вырошчвання з'яўляецца Паўднёвая Амерыка. Кукуруза больш цёпла- і вільгацелюбівая, чым пшаніца. Яна з'яўляецца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

культурай не толькі сярэдняга, але і субтрапічнага пояса. Арэал вырошчвання пачынаецца ад 58° пн. ш. і дасягае 40° пд. ш. Лідзіруючыя пазіцыі сярод рэгіёнаў займаюць Паўночная Амерыка і Азія, за якімі ідуць Паўднёвая Амерыка і Еўропа. Галоўныя ў свеце вытворцы кукурузы — *ЗША*, *Кітай*, *Бразілія*, Аргенціна і Украіна. У апошняе дзесяцігоддзе вытворчасць кукурузы ў ЗША і Кітаі ўзрасла на 20 %. Кукуруза не толькі харчовая культура. Яна таксама выкарыстоўваецца ў якасці корму жывёл у выглядзе збожжа і зялёных частак раслін.

Абагульнім і запомнім. Галіна сельскай гаспадаркі, якая займаецца вырошчваннем культурных раслін, называецца раслінаводствам. Аснову сусветнага раслінаводства складае вырошчванне збожжавых культур. Галоўнымі збожжавымі культурамі з'яўляюцца пшаніца, кукуруза і рыс.

Праверым сябе. 1. Якую галіну сельскай гаспадаркі называюць раслінаводствам? 2. Якія фактары адыгрываюць вызначальную ролю ў размяшчэнні раслінаводства? 3. Якія сельскагаспадарчыя культуры складаюць аснову раслінаводства? 4. Якія збожжавыя культуры з'яўляюцца галоўнымі і чаму? 5. Як прыродныя ўмовы паўплывалі на размяшчэнне раёнаў вырошчвання пшаніцы, кукурузы і рысу? 6. Чаму пастаянна расце сусветны валавы збор збожжавых культур?

Ад тэорыі да практыкі. Назавіце і пакажыце на карце краіны, якія з'яўляюцца асноўнымі вытворцамі пшаніцы, кукурузы і рысу.

Абмяркуем. Чаму арэал вырошчвання збожжавых культур супадае з арэалам расселення чалавека?

Для дапытлівых. Пасяўныя плошчы, занятыя пшаніцай, амаль у 1,5 раза большыя за плошчы, занятыя пад рысам, хаця зборы гэтых культур прыблізна аднолькавыя. Як вы думаеце, чаму?

§ 17. Раслінаводства. Геаграфія вырошчвання тэхнічных культур і бульбы


Успамінаем. *Якія прыродныя рэсурсы называюць агракліматычнымі? Якія галіны вылучаюцца ў складзе раслінаводства?*

Разважаем. *Чаму для тэхнічных культур характэрныя больш вузкія арэалы распаўсюджвання?*

17.1. Тэхнічныя культуры. Агульная характарыстыка. Нягледзячы на асаблівую ролю збожжавых культур у забеспячэнні харчовым і

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кармавым збожжам, больш за палову апрацаваных зямель планеты занята тэхнічнымі культурамі. Тэхнічнымі іх называюць таму, што для здабывання іх карысных уласцівасцей патрабуецца дадатковая прамысловая перапрацоўка. Іх склад значна разнастайнейшы за склад збожжавых культур (мал. 50). У адрозненне ад збожжавых для тэхнічных сельскагаспадарчых культур характэрныя меншыя арэалы распаўсюджвання. Гэта звязана з асаблівымі патрабаваннямі да агракліматычных умоў. Значную частку тэхнічных культур вырошчваюць у экватарыяльных і трапічных шыротах і толькі некаторыя з іх — ва ўмераных. Для кожнай культуры можна назваць прыродную зону са спрыяльнымі ўмовамі для яе вырошчвання. Напрыклад, для цукровага трыснягу і бавоўніку аптымальныя саванны і рэдкалессі, для льну-даўгунцу — раёны зоны шыракалістых і змешаных лясоў, для цукровых буракоў і сланечніку — лесастэпавая зона.



Мал. 50. Склад тэхнічных культур

Тэхнічныя сельскагаспадарчыя культуры падзяляюць на дзве вялікія групы: харчовыя і нехарчовыя. У склад харчовых тэхнічных культур уваходзяць алейныя, цукраносныя, танізуючыя. Сярод нехарчовых тэхнічных культур галоўнымі з'яўляюцца валакністыя культуры.

17.2. Геаграфія вырошчвання валакністых культур. Валакністыя культуры — гэта культуры, якія вырошчваюць для атрымання расліннага валакна. Сярод іх сустракаюцца расліны, якія ўтвараюць валакно на насенні (бавоўнік), пладах (какосавая пальма), сцёблах (лён-даўгунец, канаплі, джут), лісці (агава, юкка) (мал. 51).



Мал. 51. Валакністыя культуры: бавоўнік (*а*), лён-даўгунец (*б*), джут (*в*), агава (*г*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 29

Найбольш важнай валакністай культурай з'яўляецца бавоўнік, радзімай якога лічацца паўвостраў Індастан і Паўднёвая Амерыка. Вядома, што ў Індыі баваўняную пражу атрымлівалі яшчэ ў 3 тысячагоддзі да н. э. Як трапічная расліна бавоўнік прад'яўляе высокія патрабаванні да цяпла, сонечнага святла і добра ўвільготненых, багатых на пажыўныя рэчывы глеб. Асноўныя пасевы бавоўніку сканцэнтраваны ў Азіі (Кітай, Індыя, Пакістан), Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы (ЗША, Бразілія).

Лён-даўгунец — валакністая культура ўмеранага кліматычнага пояса з залішнім увільгатненнем. У цяперашні час вырошчваннем ільну займаюцца больш за дзесяць краін, сярод іх Кітай, Бельгія, Францыя, Расія, Беларусь і інш.

Азіяцкай культурай з'яўляецца джут, з якога атрымліваюць грубае валакно. Найбуйнейшыя вытворцы — Індыя і Бангладэш. Натуральнае грубае валакно сізалю атрымліваюць з лісця агавы, якая расце ў Афрыцы. Сізаль ідзе на выраб канатаў, шпагату, упаковачных тканін, мачалак, шчотак.

с. 27

17.3. Геаграфія вырошчвання алейных культур. Алейныя культуры займаюць 2-е месца пасля збожжавых у харчовым рацыёне насельніцтва планеты. Асноўную частку алеяў вырабляюць з соі, алейнай пальмы, рапсу, сланечніку, пладоў аліўкавага дрэва.

Па памерах валавога збору 2-е месца сярод алейных культур займае соя. Радзімай гэтай цяпло- і вільгацелюбівай культуры з'яўляецца Кітай. З сярэдзіны XX ст., як толькі навучыліся здабываць з соевых бабоў алей і бялок, пасевы гэтай культуры ўзраслі ў шмат разоў. Асноўныя яе пасевы сканцэнтраваны ў Амерыцы (ЗША, Бразілія, Аргенціна), дзе яна выкарыстоўваецца не толькі як алейная, але і як кармавая культура, і Азіі (Кітай).

Сланечнік — расліна ўмеранага і субтрапічнага паясоў, радзімай якога з'яўляецца Паўднёвая Амерыка. Для добрага ўраджаю гэтай культуры неабходна ўрадлівая глеба і дастатковая колькасць цяпла. Найбольш значныя пасевы сланечніку сканцэнтраваны ў Еўропе (Украіна, Расія), Азіі (Кітай), Амерыцы (Аргенціна).

Яшчэ адной распаўсюджанай алейнай культурай з'яўляецца ***рапс***. Большасць даследчыкаў лічыць, што радзіма рапсу — Міжземнамор'е. Рапс — холадаўстойлівая культура, якая добра прыстасавалася да ўмеранага клімату. Сёння ён вырошчваецца асабліва шырока ў тых прыродных

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

зонах, дзе іншыя алейныя культуры не заўсёды спеюць. Галоўныя рэгіёны свету па вытворчасці насення рапсу: Азія (Кітай, Індыя), Паўночная Амерыка (Канада), Еўропа (Францыя, Германія, Польшча).

Па аб'ёме вытворчасці з алеяў раслінага паходжання лідарам з'яўляецца пальмавы алей. Яго атрымліваюць з пладоў ***алейнай пальмы***. Радзімай гэтай расліны лічацца прыбярэжныя раёны экватарыяльнай Заходняй Афрыкі. Алейная пальма патрабуе шмат сонца і вады круглы год, патрабавальная яна і да глебы. Асноўны раён вырошчвання — Паўднёва-Усходняя Азія (Малайзія, Інданезія).

Аліва — адно з найбольш старажытных дрэў, якія вырошчваюцца. Яго завезлі з Цэнтральнай Азіі і Месапатаміі ў Егіпет і Фінікію, а затым — у Грэцыю. Расце ў сухіх камяністых абласцях з кароткай мяккай зімой і доўгім гарачым летам. Галоўным арэалам вырошчвання аліўкавага дрэва ў наш час з'яўляюцца краіны Міжземнаморскага ўзбярэжжа. Асноўныя вытворцы пладоў алівы — Іспанія, Італія, Грэцыя, Турцыя.

17.4. Геаграфія вырошчвання цукраносных культур. Да цукраносных культур адносяцца цукровы трыснёг і цукровыя буракі.

с. 28

Цукровы трыснёг, радзімай якога лічыцца паўночна-ўсходняя частка Паўднёвай Азіі, — вельмі цеплалюбівая і вільгацелюбівая шматгадовая культура. Таму ён вырошчваецца ў межах субэкватарыяльнага, трапічнага і субтрапічнага паясоў і вільготнага мусоннага тыпаў клімату. Па памерах збору лідарамі з'яўляюцца Бразілія, Індыя і Кітай. Буйныя вытворцы таксама — Тайланд, Пакістан, Мексіка.

Цукровыя буракі — культура ўмеранага пояса, якая патрабавальная да агракліматычных умоў: любіць цяпло, святло і вільгаць. Асноўнымі вытворцамі цукровых буракоў з'яўляюцца Расія, Францыя, ЗША, а таксама Германія і Турцыя.



Мал. 52. Танізуючыя культуры: дрэвы какава (*а*), кававае дрэва (*б*), чайны куст (*в*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 28 **17.5. Геаграфія вырошчвання танізуючых культур.** Да ***танізуючых*** культур адносяцца кава, какава, чай (мал. 52). Гэта цеплалюбівыя і вільгацелюбівыя расліны, якія вырошчваюць у тых трапічных і субтрапічных абласцях зямнога шара, дзе выпадае шмат ападкаў. Яны маюць вельмі абмежаваныя арэалы.

Радзімай ***кававага дрэва*** лічыцца Афрыка, аднак асноўным вытворцам кавы з'яўляецца Паўднёвая Амерыка, краінай-лідарам — Бразілія. Другое месца ў свеце належыць В'етнаму, трэцяе — Калумбіі. Кава вырошчваецца таксама ў Інданезіі, Эфіопіі.

Арэал вытворчасці **какава-бабоў** з гістарычнай радзімы ў Паўднёвай Амерыцы перамясціўся ў Афрыку. Тут агракліматычныя ўмовы для дрэва какава былі блізкімі да ідэальных. У нашы дні на краіны Афрыкі прыходзіцца 1/2 сусветнай вытворчасці какава-бабоў (Кот-Д'івуар, Гана). Іх вырошчваюць таксама ў Азіі (Інданезія), у Паўднёвай Амерыцы (Бразілія, Эквадор, Калумбія).

Радзімай **чайнага куста** з'яўляецца Кітай. Чай ужо даўно стаў нацыянальным напоем у Кітаі, Індыі, Японіі. Абсалютнае лідарства ў вытворчасці чаю захоўвае Азія — 9/10 сусветнага аб'ёму. Найбуйнейшыя вытворцы — Кітай, Шры-Ланка, Індыя і афрыканская краіна Кенія.

с. 29 **17.6. Геаграфія вырошчвання бульбы.** Сельскагаспадарчыя культуры, у якіх на падземных сцёблах або бакавых каранях утвараюцца клубні, называюцца клубняплоднымі. Да іх адносяцца бульба, тапінамбур, батат, маніёк і інш. (мал. 53). Гэтыя культуры выкарыстоўваюцца ў ежу чалавекам (харчовыя), на корм жывёле (кармавыя) і для перапрацоўкі (тэхнічныя). Ва ўмераных шыротах з клубняплодных культур найбольшае значэнне мае бульба. Яна вырошчваецца паўсюдна і прызначана ў асноўным для мясцовага харчовага выкарыстання.



Мал. 53. Клубняплодныя культуры: бульба (*а*), батат (*б*), маніёк (*в*)

Найбуйнейшымі сусветнымі вытворцамі бульбы ў агульным аб'ёме вытворчасці з'яўляюцца Кітай, Індыя і Расія.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Сярод нехарчовых тэхнічных культур галоўнымі з'яўляюцца валакністыя культуры — бавоўнік, лён-даўгунец, джут, агава. Да харчовых тэхнічных культур адносяцца алейныя (сланечнік, рапс, соя, алейная пальма, аліўкавае дрэва), цукраносныя (цукровы трыснёг і цукровыя буракі), танізуючыя (кава, какава, чай). Найбольш разнастайная геаграфія вырошчвання алейных культур.

Праверым сябе. 1. Якія групы вылучаюцца ў складзе тэхнічных культур? 2. Якія тэхнічныя культуры адносяць да валакністых, алейных, цукраносных, танізуючых? 3. У якіх прыродных зонах вырошчваюцца асноўныя тэхнічныя культуры? 4. Якая геаграфія вырошчвання алейных культур? 5. Чаму танізуючыя культуры вырошчваюцца ў трапічным і субтрапічным кліматычных паясах?

Ад тэорыі да практыкі. Якія з тэхнічных культур вырошчваюць у вашай мясцовасці і чаму?

Для дапытлівых. З антычных часоў гэтае дрэва сімвалізавала мір і ўладу. Яно вядома як дрэва жыцця за яго вынослівасць. З яго атрымліваюць прадукт, які стагоддзямі сілкаваў, лячыў, абараняў, асвятляў. Аб якой тэхнічнай культуры ідзе гаворка? У якіх рэгіёнах і краінах яна вырошчваецца і выкарыстоўваецца ў цяперашні час?

§ 18. Геаграфія жывёлагадоўлі

Успамінаем. *Якія фактары ўплываюць на размяшчэнне галін сельскай гаспадаркі?*

Разважаем. *Чаму жывёлагадоўля, як і раслінаводства, з'яўляецца важнай галіной сельскай гаспадаркі?*

18.1. Жывёлагадоўля і яе структура. Другой і не менш важнай галіной развіцця сельскай гаспадаркі з'яўляецца жывёлагадоўля.

Жывёлагадоўля — гэта галіна сельскай гаспадаркі, якая займаецца развядзеннем сельскагаспадарчых жывёл з мэтай атрымання жывёлагадоўчай прадукцыі.

Жывёлагадоўля забяспечвае насельніцтва планеты такімі прадуктамі харчавання, як мяса, жывёльны тлушч, малако, яйкі. Прадукцыя гэтай галіны з'яўляецца сыравінай для харчовай (мяса і малако) і лёгкай прамысловасці (скура, шэрсць, мех, шоўк). З даўніх часоў чалавек выкарыстоўвае сельскагаспадарчых жывёл як цяглавую сілу (коні, вярблюды, алені). Акрамя таго, жывёлагадоўля дае сыравіну для

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

атрымання лекавых сродкаў (сыроватка, гармоны). У нашы дні жывёлагадоўля, як і раслінаводства, распаўсюджана паўсюдна. У структуры сусветнага зямельнага фонду лугі і пашы займаюць у два разы больш зямель, чым раллі. Жывёлагадоўля цесна звязана з раслінаводствам. Яна атрымлівае ад раслінаводства кармы для жывёл. У сваю чаргу, жывёлагадоўля забяспечвае раслінаводства арганічнымі ўгнаеннямі.

Сучасная жывёлагадоўля вельмі разнастайная, у яе складзе вылучаецца шмат падгалін (мал. 54). Вядучую ролю ў сусветнай жывёлагадоўлі адыгрывае развядзенне буйной рагатай жывёлы.


с. 30

18.2. Геаграфія жывёлагадоўлі. Агульнае сусветнае пагалоўе ***буйной рагатай жывёлы*** складае каля 1,5 млрд галоў, і засяроджана яно пераважна ў Амерыцы і Азіі (па 1/3 ад агульнага пагалоўя ў кожным рэгіёне). Сярод дзяржаў свету лідарамі па пагалоўі жывёлы з'яўляюцца *Бразілія, Індыя, Кітай*.



Мал. 54. Склад жывёлагадоўля

У залежнасці ад памераў і характару кармавой базы развядзенне буйной рагатай жывёлы мае тры асноўныя напрамкі: малочны, мясны і мясамалочны. Найбольш высокія патрабаванні да кармавой базы прад'яўляе буйная рагатая жывёла малочнага напрамку. Малочная жывёлагадоўля атрымала распаўсюджванне ў лясной і лесастэпавай зонах умеранага пояса, багатых на натуральныя лугі, дзе на працягу года ёсць сакавіты і разнастайны корм. У большай ступені яна характэрна для краін Паўночнай Амерыкі, Паўночнай, Заходняй і Усходняй Еўропы, Новай Зеландыі. У некаторых з іх кліматычныя ўмовы дазваляюць ажыццяўляць круглагадовы выпас жывёлы на пашах, у іншых (напрыклад, Фінляндыя, Нідэрланды, Данія, Беларусь, Расія) пашавае ўтрыманне спалучаецца са стойлавым у зімовы час (мал. 55). У Еўропе пераважае малочная і малочна-мясная жывёлагадоўля (ФРГ, Францыя, Вялікабрытанія). Тут вялікая ўвага аддаецца добраўпарадкаванню

Пагалоўе жывёлы — агульная колькасць галоў жывёлы — галоўны колькасны паказчык жывёлагадоўлі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 55. Выпас буйной рагатай жывёлы малочнага напрамку на натуральных лугах у Данii

натуральных кармавых угоддзяў, племянному адбору высокапрадукцыйных парод, механізацыі найбольш працаёмкіх работ, выкарыстанню электронікі. У выніку гэтага дасягнуты высокія паказчыкі прадукцыйнасці жывёлы (надоі кароў, тлустасць малака).

Мясная рагатая жывёла менш патрабавальная да кармоў, таму жывёлагадоўля мяснога напрамку характэрна для стэпавай зоны, засушлівых раёнаў умеранага і субтрапічнага кліматычных паясоў. Пераважае пашавы або адгонна-пашавы тып. Мясная жывёлагадоўля шырока развіта ў Бразіліі, Аргенціне, ЗША і Кітаі.



с. 30

18.3. Геаграфія свінагадоўлі. Для ***свінагадоўлі*** характэрная шырокая геаграфія. З 1 млрд сусветнага пагалоўя свіней больш за 40 % прыходзіцца на *Кітай*. Значнае пагалоўе свіней сканцэнтравана ў *ЗША* і *Бразіліі*. Свінагадоўля характарызуецца высокай прадукцыйнасцю, у многіх краінах яна пастаўлена на прамысловую аснову. Найбольш распаўсюджанымі ў свеце з'яўляюцца мясны і беконны напрамкі свінагадоўлі, ва Украіне і Беларусі — сальны. Свінагадоўля развіваецца паблізу буйных гарадоў і прамысловых цэнтраў, у густанаселеных раёнах, паколькі для адкорму свіней шырока выкарыстоўваюцца адходы харчовай прамысловасці і харчовыя астаткі. Свінагадоўля таксама размешчана паблізу раёнаў вырошчвання збожжавых культур, бульбы (мал. 56).



Мал. 56. На свінаводчай ферме

18.4. Геаграфія птушкагадоўлі. ***Птушкагадоўля*** — развядзенне свойскай птушкі (курэй, індычак, гусей, качак і інш.) — распаўсюджана ў свеце паўсюдна. З кожным годам попыт на мяса птушкі і яйкі павялічваецца. Асноўныя прычыны росту і развіцця птушкагадоўлі ў свеце — гэта прывабныя смакавыя і пажыўныя якасці мяса птушкі. Птушка валодае высокай прадукцыйнасцю і лёгка адаптуецца да сучасных тэхналогій вырошчвання (напрыклад, селекцыя, ветэрынарыя, энерга- і рэсурсазберагальныя тэхналогіі).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 30 Найбольш развіта птушкагадоўля ў Кітаі, ЗША, Інданезіі, Японіі. Доля мяса птушкі ў вытворчасці мяса ў свеце за апошнія 50 гадоў істотна ўзрасла на ўсіх мацерыках, за выключэннем Афрыкі, і складае больш за 30 %.

Важная частка птушкагадоўлі — вытворчасць яек. Таму існуюць два асноўныя напрамкі птушкагадоўлі: мясны і яечны. Мясная птушкагадоўля засяроджана пераважна ў ЗША і краінах Еўропы, а яечная — паўсюдна. У краінах, якія развіваюцца, разводзіць свойскую птушку практычна ўсё сельскае насельніцтва, таму самае вялікае яе пагалоўе ў Кітаі. У эканамічна развітых краінах створаны буйныя прадпрыемствы прамысловага тыпу для вытворчасці мяса птушкі і яек (мал. 57).



Мал. 57. Птушкаферма

с. 30 **18.5. Геаграфія авечкагадоўлі.** ***Авечкагадоўля*** атрымала развіццё ў раёнах з шырокімі натуральнымі пашамі (пераважна ў субтрапічных і трапічных шыротах) і размешчана паблізу прыродных зон стэпаў, пустынь і паўпустынь, а таксама да горных раёнаў. Агульнае сусветнае пагалоўе авечак ацэньваецца ў 1,2 млрд галоў. Асноўная яго частка прыходзіцца на Азію (1/3 сусветнага пагалоўя) і Аўстралію (1/5 сусветнага пагалоўя). Сярод краін пагалоўем авечак вылучаюцца *Кітай*, *Аўстралія* і *Індыя*.

У авечкагадоўлі атрымалі развіццё некалькі напрамкаў: шубны, танкарунны, паўтанкарунны і інш. Асноўнай прадукцыяй авечкагадоўлі з'яўляецца воўна. Танкарунныя авечкі характарызуюцца наяўнасцю аднароднай тонкай воўны высокай якасці, прыдатнай для вырабу найбольш каштоўных ваўняных вырабаў (мал. 58). Авечкі паўтанкаруннага напрамку маюць аднародную шэрснасць, якая складаецца з больш грубых пуховых валокнаў. Яна выкарыстоўваецца для вытворчасці як высакаякасных тканін, так і больш грубых (сукна). Палову сусветнай вытворчасці воўны забяспечваюць Аўстралія і Новая Зеландыя. Вялікая роля авечкагадоўлі таксама і ў забеспячэнні лёгкай



Мал 58. Іспанскі мерынос — парода авечак

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прамысловасці скурамі жывёл. У асобных краінах свету істотнае месца ў харчовым рацыёне насельніцтва займае бараніна (асабліва гэта характэрна для мусульманскіх краін Паўночнай Афрыкі і Заходняй Азіі).

З іншых відаў дзейнасці жывёлагадоўлі ў свеце атрымалі развіццё конегадоўля, вярблюдагадоўля, аленегадоўля, а таксама развядзенне тутавага шаўкапрада, пчалярства і зверагадоўля.

Абагульнім і запомнім. Галіна сельскай гаспадаркі, якая займаецца развядзеннем сельскагаспадарчых жывёл, называецца жывёлагадоўляй. Галоўнай прадукцыяй жывёлагадоўлі з'яўляецца мяса, малако, яйкі, жывёльныя тлушчы і інш. Жывёлагадоўля забяспечвае асобныя галіны прамысловасці сыравінай. Вядучую ролю ў сусветнай жывёлагадоўлі адыгрываюць развядзенне буйной рагатай жывёлы, свінагадоўля, птушкагадоўля і авечкагадоўля. Прыродныя ўмовы ўплываюць на развіццё асноўных напрамкаў жывёлагадоўлі.

Праверым сябе. 1. Якое значэнне мае жывёлагадоўля для чалавека? 2. Якая сувязь існуе паміж жывёлагадоўляй і раслінаводствам? 3. Назавіце асноўныя галіны жывёлагадоўлі. 4. У якіх раёнах разводзяць малочныя пароды буйной рагатай жывёлы? Чым гэта можна растлумачыць? 5. У якіх раёнах развіты мясны напрамак гадоўлі буйной рагатай жывёлы і чаму? 6. Якія асаблівасці геаграфіі свінагадоўлі і птушкагадоўлі? 7. Чаму авечкагадоўля не атрымала паўсюднага распаўсюджвання?

Ад тэорыі да практыкі. Сучасная жывёлагадоўля канцэнтруецца на буйных жывёлагадоўчых комплексах. Як іх размяшчэнне звязана з галінамі раслінаводства?

Абмяркуем. Чаму жывёлагадоўля з'яўляецца такім жа старажытным відам дзейнасці, як і раслінаводства?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 6. ПРАМЫСЛОВАСЦЬ



§ 19. Здабыўная прамысловасць

Успамінаем. *Якія асаблівасці размяшчэння розных па паходжанні карысных выкапняў?*

Разважаем. *Чаму ўдзельная вага здабыўной прамысловасці ў структуры прамысловай вытворчасці паступова памяншаецца?*

19.1. Склад здабыўной прамысловасці. Прамысловасць, як адзін з асноўных відаў гаспадарчай дзейнасці, падзяляецца на здабыўную прамысловасць і апрацоўчую прамысловасць.


Здабыўная прамысловасць — сукупнасць відаў дзейнасці ў складзе прамысловай вытворчасці, якія спецыялізуюцца на здабычы з зямных нетраў і першаснай перапрацоўцы разнастайных карысных выкапняў.

У структуры сучаснай сусветнай гаспадаркі на здабыўную прамысловасць прыходзіцца не больш за 10 % кошту вырабленай прадукцыі, а яе ўдзельная вага ў прамысловай вытворчасці пастаянна памяншаецца. Асноўная прычына гэтага — больш нізкі кошт вырабленай прадукцыі ў параўнанні з прадукцыяй апрацоўчай прамысловасці. Здабытыя карысныя выкапні выкарыстоўваюцца пераважна як сыравіна для апрацоўчай прамысловасці. Акрамя таго, у цяперашні час паўсюдна ўкараняюцца рэсурсазберагальныя тэхналогіі, якія дазваляюць затрачваць меншую колькасць сыравіны на атрыманне гатовай прадукцыі.

У складзе здабыўной прамысловасці вылучаюць дзве вялікія групы вытворчасцей: здабычу паліўна-энергетычных карысных выкапняў і здабычу іншых карысных выкапняў. Першая група ўключае здабычу вугалю, торфу, нафты і прыроднага газу, уранавай руды. Усе пералічаныя віды карысных выкапняў у далейшым выкарыстоўваюцца як сыравіна для атрымання паліва і розных відаў энергіі (цеплавой, электрычнай).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Склад другой групы здабыўной вытворчасці больш разнастайны. Сюды ўваходзіць здабыча рудных і нярудных карысных выкапняў. Здабыча рудных карысных выкапняў уключае здабычу руд чорных (жалеза, марганец, хром) і каляровых (алюміній, медзь, свінец, цынк, нікель, волава і інш.). Гэтыя руды з'яўляюцца сыравінай, якая выкарыстоўваецца ў чорнай і каляровай металургіі для атрымання металаў, іх сплаваў і розных відаў пракату (ліставога пракату, труб, дроту і інш.). Здабыча нярудных карысных выкапняў прадстаўлена здабычай сыравіны для хімічнай прамысловасці (калійныя солі, фасфарыты, сера) і для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў (мел, вапняк, пясок, гліна) (мал. 59).



Мал. 59. Склад здабыўной прамысловасці

19.2. Спосабы здабычы карысных выкапняў. Існуюць два асноўныя спосабы здабычы карысных выкапняў — адкрыты (кар'ерны, мал. 60) і закрыты (шахтавы, мал. 61). Адкрыты спосаб выкарыстоўваецца тады, калі радовішчы карысных выкапняў знаходзяцца блізка да зямной паверхні. У такім выпадку здымаюцца верхнія пласты глебы і пустой пароды, якія перакрываюць іх, і вядзецца здабыча карыснага выкапня. На месцы здабычы ўзнікаюць кар'еры, якія могуць мець велізарныя памеры. Адкрытым спосабам часцей за ўсё здабываюцца руды чорных і каляровых металаў, вугаль, будаўнічая сыравіна (пясок, вапнякі, будаўнічы камень).



Мал. 60. Алмазны кар'ер «Мір» у Якуціі



Мал. 61. У шахце па здабычы калійнай солі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Шахтавы (закрыты) спосаб выкарыстоўваецца для здабычы карысных выкапняў, што залягаюць на значных глыбінях ад зямной паверхні (ад некалькіх сотняў да 1–3 тыс. м). У гэтым выпадку на зямлі і пад зямлёй узводзяцца спецыяльныя збудаванні, якія дазваляюць весці здабычу карыснага выкапня і яго дастаўку на паверхню. Шахтавым спосабам здабываюцца солі, вугаль, руды чорных і каляровых металаў. Для здабычы вадкіх і газападобных карысных выкапняў бурацца свідравіны.

19.3. Геаграфія здабычы найважнейшых карысных выкапняў. Размяшчэнне прадпрыемстваў здабыўной прамысловасці залежыць ад размяшчэння мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Пры гэтым наяўнасць запасаў мінеральна-сыравінных рэсурсаў не заўсёды з'яўляецца дастатковай падставай для размяшчэння прадпрыемстваў здабыўной прамысловасці. *(Як вы думаеце, чаму?)* Таму не заўсёды тыя краіны, на тэрыторыі якіх сканцэнтраваны найбуйнейшыя запасы пэўных карысных выкапняў, з'яўляюцца сусветнымі лідарамі па іх здабычы і спажыванні. І наадварот, часта краіны, якія не валодаюць самымі вялікімі запасамі карысных выкапняў, уваходзяць у лік сусветных лідараў па іх здабычы.

с. 31–32

Асноўную частку кошту прадукцыі здабыўной прамысловасці (парадку 70 %) забяспечвае здабыча энергетычных карысных выкапняў (нафты, прыроднага газу, вугалю, урану). *(Чым, на ваш погляд, гэта абумоўлена? Выкарыстоўваючы матэрыял § 10, успомніце асаблівасці размяшчэння паліўных рэсурсаў і іх запасаў у свеце.)* Больш за ўсё ў свеце здабываецца вугалю — 7,5 млрд т у год. Лідарамі па яго здабычы з'яўляюцца Кітай (3,4 млрд т), Індыя і ЗША. Аб'ёмы гадавой здабычы нафты ў свеце складаюць 4,4 млрд т. Больш за ўсё нафты здабываецца ў Саудаўскай Аравіі, ЗША і Расіі. Здабыча прыроднага газу складае 3,7 трлн м^3. Краіны — лідары па здабычы — ЗША, Расія і Іран. Больш за ўсё ўранавых руд здабываецца ў Казахстане, Канадзе і Аўстраліі.

Значны ўклад у кошт прадукцыі здабыўной прамысловасці ўносіць здабыча руд чорных і каляровых металаў. *(Выкарыстоўваючы матэрыял § 10, успомніце асаблівасці размяшчэння рудных карысных выкапняў і іх запасы ў свеце.)* Найбольш маштабная здабыча жалезных руд — 2,4 млрд т у год. Сусветнымі лідарамі па іх здабычы з'яўляюцца Кітай (900 млн т), Аўстралія і Бразілія. Здабыча баксітаў, галоўнай сыравіны для вытворчасці алюмінію, перавышае 230 млн т (Аўстралія, Кітай, Бразілія). Штогод у свеце здабываецца каля 20 млн т медных руд (Чылі, ЗША, Перу).

З нярудных карысных выкапняў вылучаюцца аб'ёмамі здабычы фасфарыты — каля 250 млн т у год (Кітай, Марока, ЗША) — і калійныя солі — больш за 35 млн т (Канада, Расія, Беларусь).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Шматгаліновая здабыўная прамысловасць характэрная для невялікай колькасці краін: гэта буйныя па памерах тэрыторыі высокаразвітых краін (ЗША, Аўстралія, Канада), а таксама іншыя краіны з вялікімі памерамі тэрыторыі і значнымі маштабамі эканомікі (Кітай, Індыя, Бразілія, Расія). Менавіта для тэрыторыі гэтых краін характэрна спалучэнне шырокіх платформаў з паясамі старажытнай складкаватасці, у межах якой канцэнтраваны разнастайныя па паходжанні карысныя выкапні. Галоўнымі руднымі багаццямі сучаснага свету валодаюць Аўстралія, Канада, ПАР, Кітай, Бразілія. Для большасці ж краін свету характэрна развіццё толькі некаторых вытворчасцей, звязаных са здабычай сыравіны.

Абагульнім і запомнім. Здабыўная прамысловасць — сукупнасць відаў дзейнасці ў складзе прамысловай вытворчасці, якія спецыялізуюцца на здабычы з зямных нетраў разнастайных карысных выкапняў. Існуюць два асноўныя спосабы здабычы карысных выкапняў — адкрыты (кар'ерны) і закрыты (шахтавы). Шматгаліновая здабыўная прамысловасць характэрная для невялікай колькасці краін.

Праверым сябе. 1. Што такое здабыўная прамысловасць і якія віды дзейнасці яна ўключае? 2. Якія існуюць спосабы здабычы карысных выкапняў? 3. Якія асаблівасці размяшчэння прадпрыемстваў здабыўной прамысловасці? 4. Якія краіны з'яўляюцца сусветнымі лідарамі па здабычы асноўных відаў карысных выкапняў?

Ад тэорыі да практыкі. Як вы лічыце, ці з'яўляецца сам факт наяўнасці буйнога радовішча нафты на тэрыторыі краіны дастатковай умовай для яго прамысловай распрацоўкі? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Абмяркуем. Як вы лічыце, ці будзе ў найбліжэйшай будучыні адбывацца істотнае павелічэнне аб'ёмаў і змяненне геаграфіі здабычы асноўных карысных выкапняў? Адказ абгрунтуйце.

Здабыча нафты

§ 20. Энергетыка. Вытворчасць электраэнергіі

Успамінаем. *Якія віды прыродных энергетычных рэсурсаў вам вядомыя? Якія карысныя выкапні належаць да паліўна-энергетычных і чаму яны так называюцца?*

Разважаем. *У чым адрозненне паміж традыцыйнай і альтэрнатыўнай энергетыкай і чым абумоўлена неабходнасць развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі?*


20.1. Энергетыка. Склад энергетыкі. З курса фізікі 7-га класа вы ўжо ведаеце, што такое энергія і якія бываюць віды энергіі. Любая гаспадарчая дзейнасць чалавека заснавана на выкарыстанні двух асноўных відаў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

энергіі: цеплавой і электрычнай. Вытворчасцю гэтых відаў энергіі для патрэб грамадства і займаецца энергетыка. Энергетыка — гэта сукупнасць відаў гаспадарчай дзейнасці, якія забяспечваюць вытворчасць, пераўтварэнне і дастаўку спажыўцу розных відаў энергіі.

Вытворчасць цеплавой і электрычнай энергіі заснавана на выкарыстанні розных відаў прыроднай энергіі, якія называюцца першаснымі крыніцамі энергіі. Гэта можа быць энергія Сонца, ветру, вады, якая рухаецца, хімічных сувязей розных арганічных (вуглевадародных) злучэнняў: вугалю, нафты, прыроднага газу, драўніны. Задача энергетыкі — пераўтварыць энергію, засяроджаную ў прыродных крыніцах, у неабходную грамадству цеплавую (гарачая вада, пара) і электрычную энергію.

У складзе сучаснай энергетыкі вылучаюць два віды вытворчасцей — паліўную прамысловасць і электраэнергетыку (мал. 62).



Мал. 62. Склад энергетыкі

Прадпрыемствы паліўнай прамысловасці вырабляюць нафтапрадукты (бензін, газу, дызельнае паліва і інш.), кокс, ядзерныя матэрыялы. Яе прадукцыя (бензін, дызельнае паліва, газа) выкарыстоўваецца ў далейшым у якасці паліва для рухавікоў унутранага згарання, а таксама ў цеплаэнергетыцы (топачны мазут), атамнай энергетыцы (ядзерныя матэрыялы) і металургіі (кокс).

Электраэнергетыка аб'ядноўвае розныя тыпы прадпрыемстваў, якія на аснове выкарыстання прадукцыі паліўнай прамысловасці, а таксама розных прыродных крыніц энергіі вырабляюць і размяркоўваюць цеплавую (гарачая вада, пара) і электрычную энергію.

20.2. Вытворчасць электраэнергіі. Тыпы электрастанцый. Электрычная энергія — найбольш распаўсюджаны від энергіі, якую сучаснае грамадства выкарыстоўвае як у побыце, так і ў гаспадарчай дзейнасці. Найбольш істотным яе недахопам як прадукцыі з'яўляецца немагчымасць вырабляць у вялікіх аб'ёмах у запас. Таму ўся выпрабленая электрычная энергія павінна быць спажыта. Усяго ў свеце ў 2017 г. было выраблена каля 25 трлн кВт/г электраэнергіі. Вядучыя краіны — вытворцы электраэнергіі: ЗША, Кітай, Індыя.

У цяперашні час існуюць розныя тэхналогіі атрымання электрычнай энергіі. Тып прадпрыемстваў (электрастанцый), на якіх яе вырабляюць, залежыць ад таго, якая крыніца энергіі выкарыстоўваецца для атрымання электрычнай энергіі. Самымі распаўсюджанымі ў свеце з'яўляюцца цеплавыя электрастанцыі (ЦЭС) (мал. 63), на якіх выпрацоўваецца больш за 60 % усёй электраэнергіі. Пры спальванні мінеральнага паліва (вугаль,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прыродны газ, мазут) у топцы катла выдзяляецца цеплавая энергія. Пад яе ўздзеяннем вада, якая знаходзіцца ў катле, награваецца і ператвараецца ў пару. Пара пад вялікім ціскам падаецца на лопасці турбіны, злучанай з генератарам, дзе і выпрацоўваецца (генерыруецца) электрычны ток.


На гідраўлічных электрастанцыях (ГЭС) (мал. 64) для вытворчасці электрычнай энергіі выкарыстоўваецца энергія вады, якая рухаецца. Яна прыводзіць у рух лопасці турбіны, злучанай з генератарам, у якім выпрацоўваецца электрычны ток. Большасць ГЭС будуецца на буйных рэках. Для стварэння перападу ўзроўняў вады з мэтай надання вадзе большай скорасці на рэках узводзяцца высокія плаціны. Акрамя ГЭС плаціннага тыпу, існуюць таксама прыліўныя электрастанцыі. На ГЭС у сучасным свеце выпрацоўваецца каля 16 % усёй электраэнергіі.

Трэцім асноўным тыпам электрастанцый з'яўляюцца атамныя электрастанцыі (АЭС) (мал. 65). На АЭС выкарыстоўваецца спецыяльнае ядзернае паліва, якое атрымліваюць на аснове ўзбагачанага ўрану. У ядзерных рэактарах АЭС адбываецца кіраваная рэакцыя распаду радыеактыўных элементаў з выдзяленнем вялікай колькасці цеплавой энергіі, што выкарыстоўваецца для пераўтварэння вады ў пару. Далей пара падаецца на лопасці турбіны, злучанай з генератарам, у якім генерыруецца электрычная энергія. АЭС разам з ГЭС адносяцца да ліку найбольш магутных электрастанцый. Удзельная вага АЭС у вытворчасці электраэнергіі ў свеце прыкладна такая самая, як і ў ГЭС — каля 16 % (мал. 66).


Мал. 63. Цеплавая электрастанцыя


Мал. 64. Гідраўлічная электрастанцыя


Мал. 65. Атамная электрастанцыя



Мал. 66. Структура вытворчасці электраэнергіі ў свеце (%)

с. 33

20.3. Геаграфія цеплавой, атамнай і гідраэлектраэнергетыкі. Тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці электраэнергіі на розных тыпах электрастанцый аказваюць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вырашальны ўплыў на іх размяшчэнне. Найбольш распаўсюджаным тыпам электрастанцый з'яўляюцца ЦЭС.

Цеплавая энергетыка атрымала развіццё ў большасці краін свету. Паколькі мінеральнае паліва можа лёгка транспартавацца на значныя адлегласці, то ЦЭС характарызуюцца паўсюднасцю размяшчэння. Цеплавыя станцыі бываюць рознай магутнасці: ад невялікіх, разлічаных на забеспячэнне цяплом або электраэнергіяй асобных населеных пунктаў або прадпрыемстваў, да вельмі магутных. Найбольш буйныя ЦЭС пабудаваны ў раёнах здабычы вугалю (Кітай, ЗША, Расія, Індыя, Польшча), а таксама ў асноўных раёнах спажывання энергіі (у буйных населеных пунктах, прамысловых цэнтрах). Самая буйная ЦЭС у свеце знаходзіцца ў Кітаі.

Атамная энергетыка з'яўляецца высокатэхналагічнай вытворчасцю. Толькі краіны з высокім узроўнем развіцця навукі і тэхналогій здольныя ажыццяўляць узбагачэнне ўрану (вырабляць ядзернае паліва), будаваць ядзерныя рэактары, утылізаваць адходы ядзернай энергетыкі. Таму большасць АЭС пабудавана ў краінах з высокім узроўнем эканамічнага развіцця: ЗША, Японія, Францыя. Значнае развіццё атрымала атамная энергетыка ў Расіі і Кітаі. АЭС узводзяцца ў найбольш асвоеных раёнах гэтых краін, якія спажываюць вялікія аб'ёмы электраэнергіі. У шэрагу краін (Францыя, Бельгія) на АЭС вырабляецца асноўная частка электраэнергіі. АЭС з'яўляюцца магутнымі электрастанцыямі, некаторыя з іх уваходзяць у лік найбуйнейшых электрастанцый свету. Самая буйная АЭС у свеце — Касівадзакі-Карыва (Японія).

Размяшчэнне гідраэнергетыкі вызначаецца наяўнасцю гідраэнергетычных рэсурсаў. Найбольшым гідраэнергетычным патэнцыялам валодаюць горныя і буйныя паўнаводныя рэкі. Таму найбуйнейшыя ГЭС пабудаваны ў краінах, якія валодаюць такімі ўмовамі: Кітай, Расія, ЗША, Бразілія, Уругвай, Нарвегія. У некаторых з гэтых краін (Нарвегія, Бразілія) на ГЭС вырабляецца асноўная частка электраэнергіі. ГЭС адносяцца да ліку самых магутных электрастанцый. Найбуйнейшая ГЭС свету — «Саньея» («Тры цясніны») — размешчана ў маляўнічым раёне Трох цяснін на чацвёртай па даўжыні ў свеце рацэ Янцзы.

20.4. Уздзеянне энергетыкі на навакольнае асяроддзе. Вытворчасць цеплавой і электрычнай энергіі на ЦЭС, а таксама электрычнай энергіі на ГЭС і АЭС прынята называць традыцыйнай энергетыкай. Гэтыя тыпы электрастанцый існуюць адносна даўно і вырабляюць асноўную частку спажыванай сучасным грамадствам энергіі. Кожны з іх аказвае пэўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Цеплавую энергетыку лічаць адным з асноўных забруджвальнікаў атмасфернага паветра. Для выпрацоўкі электраэнергіі на ЦЭС спальваецца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

мінеральнае паліва — вугаль, прыродны газ, мазут. У выніку спальвання ўтвараюцца розныя газы (перш за ўсё CO_2), якія, трапляючы ў атмасферу, забруджваюць яе. Большасць гэтых газаў адносіцца да парніковых. Яны затрымліваюць цеплавое выпраменьванне каля паверхні Зямлі і спрыяюць змене клімату нашай планеты. Найбольш экалагічным з усіх відаў паліва з'яўляецца прыродны газ. *(Як вы думаеце, чаму?)* Таму ў многіх краінах свету ЦЭС пераходзяць з выкарыстання вугалю і мазуту на прыродны газ.

Галоўнай небяспекай развіцця атамнай энергетыкі для навакольнага асяроддзя з'яўляецца радыяцыйнае забруджванне. Яно можа адбывацца ў выпадку аварый на АЭС, а таксама пры ўтылізацыі і захаванні адходаў атамнай энергетыкі. Вынікам уздзеяння радыяцыі на жывыя арганізмы з'яўляецца ўзнікненне розных захворванняў і гібель. Таму асноўная задача ў развіцці атамнай энергетыкі — арганізацыя бяспекі функцыянавання АЭС. З-за шэрага аварый, якія адбыліся на АЭС у апошнія дзесяцігоддзі, многія краіны свету адмаўляюцца ад развіцця атамнай энергетыкі.

Уздзеянне гідраэнергетыкі на навакольнае асяроддзе звязана з будаўніцтвам плацін і стварэннем перад плацінамі буйных вадасховішчаў. Пры гэтым адбываецца затапленне вялікіх тэрыторый, што прыводзіць да знішчэння раслін і жывёл, што існуюць там. З гаспадарчага абароту выбываюць значныя плошчы зямель. *(Да якіх яшчэ ўздзеянняў на навакольнае асяроддзе, на ваш погляд, прыводзіць будаўніцтва буйных ГЭС?)*



Мал. 67. Сонечныя батарэі



Мал. 68. Ветраэнергетычныя ўстаноўкі

У цяперашні час з мэтай памяншэння адмоўнага ўздзеяння традыцыйнай энергетыкі на навакольнае асяроддзе развіваецца альтэрнатыўная энергетыка. Яна заснавана на выкарыстанні для вытворчасці электраэнергіі аднаўляльных прыродных крыніц энергіі — энергіі Сонца (геліяэнергетыка, мал. 67) і энергіі ветру (ветраэнергетыка, мал. 68).

Найбольш значных маштабаў альтэрнатыўная энергетыка дасягнула ў краінах з высокім узроўнем эканамічнага развіцця. Напрыклад, у Германіі ветраэнергетыка ў 2018 г. вырабіла столькі ж электраэнергіі, колькі ЦЭС, якія працуюць на вугалі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Энергетыка — гэта сукупнасць відаў дзейнасці, якія забяспечваюць вытворчасць (генерыраванне), пераўтварэнне (трансфармацыю) і дастаўку розных відаў энергіі спажыўцу. Аснову энергетыкі складаюць паліўная прамысловасць і электраэнергетыка, якія вырабляюць цеплавую і электрычную энергію. Большая частка электрычнай энергіі ў цяперашні час вырабляецца на ЦЭС, ГЭС і АЭС.

Праверым сябе. 1. Якія прыродныя крыніцы энергіі вам вядомыя? 2. Што такое энергетыка і якія віды гаспадарчай дзейнасці яна ўключае? 3. На якіх тыпах электрастанцый вырабляецца асноўная частка цеплавой і электрычнай энергіі? 4. Якія асаблівасці вытворчасці электраэнергіі на ЦЭС, ГЭС і АЭС? 5. Чым абумоўлена ўздзеянне традыцыйнай энергетыкі на навакольнае асяроддзе і якія яго наступствы? 6. У якіх краінах і чаму атрымала развіццё альтэрнатыўная энергетыка?

Ветравая электрастанцыя

Ад тэорыі да практыкі. Улічваючы прыродныя асаблівасці Беларусі, прапануйце варыянты найбольш перспектыўных для рэспублікі напрамкаў развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі.

Гідраўлічная электрастанцыя

Абмяркуем. Ці згодны вы з меркаваннем, што пераход на электрарухавікі ў аўтамабільным транспарце прывядзе да значнага скарачэння попыту на нафту і прадукты нафтаперапрацоўкі?

§ 21. Апрацоўчая прамысловасць. Металургія

Успамінаем. *Да якой сферы гаспадарчай дзейнасці адносіцца прамысловасць? Калі і з якой мэтай чалавек упершыню пачаў выкарыстоўваць металы?*


Разважаем. *Чаму металы на працягу доўгага перыяду часу з'яўляюцца для грамадства адным з асноўных канструкцыйных матэрыялаў?*

21.1. Апрацоўчая прамысловасць. Вы ўжо ведаеце, што ў складзе прамысловасці вылучаецца здабыўная прамысловасць і апрацоўчая прамысловасць.

Апрацоўчая прамысловасць — сукупнасць падгалін і відаў прамысловай дзейнасці, якія спецыялізуюцца на перапрацоўцы сыравіны і вырабе разнастайных сродкаў вытворчасці (металаў і іх сплаваў, хімічных валокнаў, машын, абсталявання) і прадметаў спажывання (адзення, абутку, прадуктаў харчавання).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сучасная апрацоўчая прамысловасць складае аснову матэрыяльнай вытворчасці і ўключае вялікую колькасць разнастайных відаў дзейнасці (мал. 69). Вырабленая прадукцыя мае велізарнае значэнне ў жыцці грамадства. Яна можа выкарыстоўвацца ў якасці канструкцыйных матэрыялаў для вырабу машын і абсталявання, узвядзення будынкаў і збудаванняў. Створаныя тут тэхнічныя сродкі палягчаюць працу людзей, робяць яе больш прадукцыйнай. Прадукцыя многіх апрацоўчых вытворчасцей непасрэдна выкарыстоўваецца чалавекам у паўсядзённым жыцці: адзенне, абутак, прадукты харчавання, лекі.



Мал. 69. Склад апрацоўчай прамысловасці

21.2. Металургія. Вытворчасць чорных і каляровых металаў. У паўсядзённым жыцці вы часта карыстаецеся вырабамі, зробленымі з металаў. *(Успомніце з курса хіміі, якія элементы адносяцца да металаў.)* Вытворчасцю металаў, іх сплаваў, а таксама металапракату (ліставога металу, труб, дроту, арматуры) займаецца металургія.

Прадукцыя металургіі з'яўляецца важным канструкцыйным матэрыялам, які шырока выкарыстоўваецца ў машынабудаванні і будаўніцтве. У склад металургіі ўваходзяць чорная і каляровая металургія. *(Успомніце, якія металы адносяцца да чорных, а якія — да каляровых. Якія ўласцівасці металаў абумовілі іх шырокае выкарыстанне ў якасці канструкцыйных матэрыялаў?)*

Сучасная чорная металургія ўяўляе з сябе сукупнасць вытворчасцей, якія выкарыстоўваюць разнастайныя тэхналогіі для атрымання прадукцыі з чорных металаў, а таксама іх сплаваў з іншымі металамі і пракату чорных металаў.

Асноўнай прадукцыяй чорнай металургіі з'яўляюцца сплавы жалеза з вугляродам — ***сталь*** і ***чыгун***. У чыгуне ўтрыманне вугляроду вышэйшае, чым у сталі, таму вырабы з чыгуну і сталі адрозніваюцца па сваіх уласцівасцях. Напрыклад, чыгун менш пластычны і больш далікатны, але лепш паддаецца ліццю, а сталь больш трывалая і лепш паддаецца апрацоўцы (зварцы, рэзанню, пракатцы, каванню).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Каляровая металургія аб'ядноўвае шматлікія прамысловыя вытворчасці, якія спецыялізуюцца на выпуску каляровых металаў і іх сплаваў, што шырока выкарыстоўваюцца ў якасці канструкцыйных матэрыялаў у машынабудаванні, у тым ліку ў вытворчасці электронікі і электратэхнікі, а таксама ў будаўніцтве.

У значных колькасцях у свеце выплаўляецца каля 70 відаў каляровых металаў. Поўны ці блізкі да яго набор вытворчасцей каляровай металургіі маюць толькі чатыры краіны — ЗША, Расія, Японія, ФРГ. Большасць жа краін спецыялізуецца на вытворчасці аднаго або некалькіх відаў каляровых металаў, часам на пэўнай тэхналагічнай стадыі іх вытворчасці.

21.3. Сыравіна і тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці металаў. Асноўнай сыравінай для вытворчасці металаў з'яўляюцца металічныя руды і металалом. Тэхналагічны працэс вытворчасці металаў уключае некалькі паслядоўных стадый: узбагачэнне руд, атрыманне канцэнтрату, выплаўленне металаў, атрыманне сплаваў і пракат металаў.

Сыравінай для чорнай металургіі ў сучасных умовах з'яўляюцца жалезная руда і лом чорных металаў. Сусветны аб'ём здабычы жалезнай руды перавышае 2 млрд т. *(Успомніце, якія краіны з'яўляюцца сусветнымі лідарамі па здабычы жалезнай руды.)* У якасці крыніцы вугляроду для вытворчасці чыгуну і сталі выкарыстоўваюцца кокс, які атрымліваюць з вугалю, або прыродны газ. Яны ж з'яўляюцца палівам для забеспячэння працэсу выплаўлення металу. Існуе некалькі асноўных спосабаў атрымання прадукцыі чорнай металургіі.

Першасны метал вырабляецца з руд, ***другасны метал*** — за кошт пераплаўлення лому.

с. 35

Выплаўленне чыгуну ажыццяўляецца ў доменных печах, куды загружаюцца спецыяльна падрыхтаваныя жалезная руда і кокс. Атрыманы доменным спосабам вадкі чыгун можа ў далейшым выкарыстоўвацца для атрымання сталі ў мартэнаўскіх печах (мартэнаўскі спосаб) або канвертарах (канвертарны спосаб). Аднак асноўныя аб'ёмы сталі ў сучасных умовах атрымліваюць спосабам выплаўлення ў электрычных печах. Пры гэтым у якасці зыходнай сыравіны тут могуць выкарыстоўвацца



Мал. 70. Віды пракату

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

не толькі спецыяльна падрыхтаваныя жалезная руда і чыгун, але і металалом. У далейшым са сталі атрымліваюць розныя віды пракату: лісцавы пракат, трубы, дрот, арматуру (мал. 70). Найбуйнейшым вытворцам чыгуну і сталі ў свеце з'яўляецца Кітай (каля 50 % сусветнай вытворчасці). Са значным адставаннем ад яго ідуць Японія, Індыя, ЗША.



Мал. 71. У цэху сталеплавільнага завода

Раней асноўную прадукцыю чорнай металургіі атрымлівалі на буйных металургічных камбінатах, дзе былі доменная, мартэнаўская або канвертарная і пракатная вытворчасці. У цяперашні час найбольш якасная прадукцыя вырабляецца пераважна на спецыялізаваных прадпрыемствах — сталеплавільных заводах (мал. 71).

Сучасная **каляровая металургія**, як і чорная, характарызуецца выпускам першаснага і другаснага металу. Пры гэтым роля другаснага металу ўсё больш узрастае. Сёння з яго выплаўляецца каля 30–40 % медзі і алюмінію, 50 % свінцу.

с. 35

«Галоўны» каляровы метал у сучасным свеце — ***алюміній***. Асноўная сыравіна для атрымання алюмінію — баксіты. Па здабычы баксітаў вылучаецца некалькі вядучых краін, якія адначасова з'яўляюцца найбуйнейшымі іх экспарцёрамі. Гэта Аўстралія (да 50 млн т, або 50 % сусветнага аб'ёму), Гвінея, Ямайка і Бразілія.

Баксіты спачатку перапрацоўваюцца ў гліназём на заводах, якія выкарыстоўваюць у вялікай колькасці мінеральнае паліва. Гліназём — добра транспартабельны прадукт. Ён пастаўляецца для далейшай перапрацоўкі на прадпрыемствы, дзе з яго атрымліваецца чарнавы алюміній. Гэта энергаёмістая вытворчасць, таму арыентуецца на крыніцы таннай энергіі. Чарнавы алюміній мае патрэбу ў ачыстцы ад прымешак, што дасягаецца з дапамогай метадаў, якія патрабуюць вялікай колькасці электраэнергіі. Таму такая вытворчасць канцэнтруецца ў раёнах і краінах з высокім узроўнем энергазабеспячэння (ЗША, Нарвегія, Францыя, Аўстралія, Расія). Чым чысцейшы алюміній, тым ён лягчэйшы і мякчэйшы. Асноўныя спажыўцы алюмінію — высокаразвітыя краіны Еўропы, ЗША, Японія, а таксама Кітай.

Медная прамысловасць — другая па значэнні галіна каляровай металургіі. Галоўным фактарам размяшчэння медзеплавільнай прамысловасці з'яўляецца наяўнасць сыравіны. На першым месцы ў свеце па вытворчасці медных канцэнтратаў знаходзіцца Чылі, затым ідуць ЗША і Канада.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Медныя канцэнтраты даволі транспартабельныя і часткова вывозяцца з краін, якія здабываюць медзь. Аднак асноўная іх частка перапрацоўваецца на месцы ў чарнавую медзь, якая ў далейшым транспартуецца ў раёны спажывання (высокаразвітыя краіны). Сусветная вытворчасць медзі — каля 10 млн т у год. Лідарства ў выплаўленні рафінiраванай медзі належыць Кітаю, Чылі, Перу, ЗША, у спажыванні — ЗША, Японіі, ФРГ і Кітаю.

Сярод іншых каляровых металаў маштабамі вытворчасці вылучаюцца ***цынк*** і ***свінец***, а таксама ***волава***. Да ліку перспектыўных металаў адносяцца ***магній*** і ***тытан***. Аднак іх вытворчасць стрымліваецца вельмі высокай энергаёмістасцю.

Вялікае значэнне ў сусветнай вытворчасці і спажыванні каляровых металаў маюць высакародныя металы, перш за ўсё золата, плаціна. Запасы золата, а таксама яго здабыча маюць шырокую геаграфію, аднак найбуйнейшымі яго вытворцамі з'яўляецца невялікая колькасць краін. Сярод іх ПАР, ЗША, Аўстралія, Канада, Кітай, Расія.

21.4. Фактары размяшчэння і геаграфія металургічнай вытворчасці. Галоўнымі фактарамі размяшчэння металургічных вытворчасцей з'яўляюцца сыравінны, спажывецкі, паліўны і энергетычны.

с. 35

Гістарычна прадпрыемствы чорнай металургіі размяшчаліся паблізу ад радовішчаў жалезнай руды (напрыклад, Латарынгія ў Францыі, Урал у Расіі) або вуглёў, якія каксуюцца (Рур у Германіі, Данбас ва Украіне), а таксама на скрыжаванні патокаў вугалю і жалезнай руды (у г. Дэтройце, вакол г. Чыкага ў ЗША). Такая традыцыйная арыентацыя па-ранейшаму захоўваецца ў многіх краінах і рэгіёнах свету (Расія, Кітай, ЗША, Украіна). Пазней адбылося зрушэнне прадпрыемстваў чорнай металургіі ў бок марскіх партоў, куды дастаўлялася танная і якасная імпартная сыравіна. Практычна ўсе заводы Японіі размешчаны паблізу ад марскіх узбярэжжаў. Гэта ж характэрна для металургіі ў Італіі, ФРГ, Францыі. У ЗША самы буйны металургічны завод таксама размешчаны на ўзбярэжжы ў г. Балтымары.

У цяперашні час шырокае развіццё атрымала размяшчэнне прадпрыемстваў чорнай металургіі ў раёнах спажывання металу — буйных цэнтрах машынабудавання. У якасці сыравіны на гэтых прадпрыемствах выкарыстоўваецца металалом.

На размяшчэнне прадпрыемстваў каляровай металургіі вызначальны ўплыў аказваюць тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці. У сувязі з нізкім утрыманнем металаў у рудзе пачатковыя стадыі вытворчасці (узбагачэнне, атрыманне чарнавых металаў), як правіла, арыентуюцца на крыніцы сыравіны. Канчатковыя ж стадыі вытворчасці (атрыманне рафінiраваных металаў і пракату) перамяшчаюцца ў раёны спажывання.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Апрацоўчая прамысловасць аб'ядноўвае віды дзейнасці, у якіх на аснове прамысловай перапрацоўкі зыходнай сыравіны вырабляюцца разнастайныя сродкі вытворчасці і прадметы спажывання. Металургія ўключае віды дзейнасці па вытворчасці чорных і каляровых металаў, іх сплаваў і гатовай прадукцыі ў выглядзе пракату. Сыравінай для металургічнай вытворчасці з'яўляюцца руды чорных і каляровых металаў, а таксама металалом. Да галоўных фактараў размяшчэння металургічных вытворчасцей адносяцца сыравінны, спажывецкі і паліўна-энергетычны.

Праверым сябе. 1. Якія віды дзейнасці ўваходзяць у склад апрацоўчай прамысловасці і якую прадукцыю яны вырабляюць? 2. У чым значэнне металургіі і якія вытворчасці ўваходзяць у яе склад? 3. Што з'яўляецца сыравінай для металургіі? 4. Якую прадукцыю вырабляе чорная і каляровая металургія і дзе яна выкарыстоўваецца? 5. У чым падабенства і адрозненне тэхналагічных працэсаў у чорнай і каляровай металургіі?

Вытворчасць сталі

Ад тэорыі да практыкі. Чаму чорная металургія Беларусі заснавана на выкарыстанні металалому?

Для дапытлівых. У XXI ст. узрос попыт на такія новыя металы, як літый, кобальт і інш. Як вы думаеце, чым гэта абумоўлена?

Вытворчасць алюмінію

§ 22. Машынабудаванне

Успамінаем. *Для якіх мэт выкарыстоўваецца прадукцыя металургіі?*

Разважаем. *Чаму машынабудаванне называюць авангарднай, або перадавой, галіной прамысловасці?*

22.1. Машынабудаванне: значэнне і віды вытворчасцей. Машынабудаванне аб'ядноўвае шматлікія віды дзейнасці, прадукцыяй якіх з'яўляюцца разнастайныя машыны, тэхнічныя прылады, а таксама абсталяванне да іх.

У сучасным азначэнні, якое з'явілася з развіццём электронікі, машынай з'яўляецца тэхнічны аб'ект, які складаецца з узаемазвязаных дэталей, вузлоў, прылад або механізмаў і выкарыстоўвае энергію для выканання пэўных функцый. Машыны выкарыстоўваюцца з мэтай памяншэння нагрузкі на чалавека або поўнай замены чалавека пры выкананні канкрэтнай задачы. Сёння няма ніводнага віду гаспадарчай дзейнасці, дзе б не выкарыстоўвалася прадукцыя машынабудавання. *(Прывядзіце прыклады выкарыстання прадукцыі машынабудавання на транспарце, у гандлі, медыцыне,*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адукацыі.) Узровень развіцця машынабудавання ў той ці іншай краіне ўплывае на ўзровень яе агульнага эканамічнага развіцця. У найбольш развітых у эканамічных адносінах краінах машынабудаванне з'яўляецца вядучай галіной апрацоўчай прамысловасці.

У складзе сучаснага машынабудавання вылучаюць тры асноўныя віды вытворчасцей: вытворчасць машын і абсталявання; вытворчасць транспартных сродкаў; вытворчасць электронікі і электратэхнікі (мал. 72).



Мал. 72. Склад машынабудавання

Найбольш складанай па структуры з'яўляецца ***вытворчасць машын***. Яна ўключае вытворчасць машын і абсталявання для сельскай і лясной гаспадаркі, розных галін прамысловасці (металургіі, хімічнай, лёгкай, харчовай). Сюды ж адносіцца станкабудаванне, вытворчасць бытавых прыбораў і іншыя віды вытворчасцей.

Не менш складаную структуру мае ***транспартнае машынабудаванне***. Яно ўключае аўтамабілебудаванне, суднабудаванне, вытворчасць авіяцыйнай і касмічнай тэхнікі, чыгуначных транспартных сродкаў. У кожнай з гэтых вытворчасцей таксама вылучаюцца свае напрамкі. Напрыклад, суднабудаванне ўключае вытворчасць марскіх і рачных суднаў, якія па прызначэнні падзяляюцца на пасажырскія і грузавыя (мал. 73).

Найбольш сучаснай у складзе машынабудавання з'яўляецца вытворчасць ***электратэхнікі, электроннага*** і ***аптычнага абсталявання***. Яна аб'ядноўвае вытворчасці па выпуску офіснага абсталявання, камп'ютараў, электрарухавікоў, генератараў, трансфарматараў, апаратуры для радыё, тэлебачання і сувязі, аптычных прыбораў і шмат чаго іншага. Гэта самая высокатэхналагічная і навукаёмістая прадукцыя машынабудавання. Хуткае развіццё гэтых вытворчасцей і высокі кошт вырабленай імі прадукцыі абумовілі іх вядучую ролю ў структуры сучаснага машынабудавання.


Мал. 73. На суднабудаўнічым заводзе

22.2. Сыравіна і тэхналагічныя асаблівасці машынабудаўнічай вытворчасці. Асноўнай сыравінай для машынабудавання традыцыйна з'яўляецца прадукцыя чорнай і каляровай металургіі: металы і іх сплавы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Першапачаткова гэта была пераважна сталь, у далейшым у транспартным машынабудаванні шырока стаў выкарыстоўвацца алюміній, у вытворчасці энергетычнага абсталявання — медзь. У цяперашні час, акрамя металаў, у тым ліку такіх, як нікель, ванадый, літый, кадмій і іншыя, шырокае прымяненне ў машынабудаванні знаходзіць прадукцыя хімічнай прамысловасці — разнастайныя палімерныя матэрыялы, у тым ліку пластмасы.

На буйным машынабудаўнічым прадпрыемстве (напрыклад, аўтамабільным, станкабудаўнічым заводзе) тэхналагічны працэс вытворчасці гатовай прадукцыі ўключае некалькі паслядоўных стадый: ліццё дэталей, механічную апрацоўку нарыхтовак (коўку, штампоўку), атрыманне гатовых дэталей, афарбоўку і нанясенне ахоўных пакрыццяў, зборку.



Мал. 74. Прамысловыя робаты на канвееры

Сучасныя машынабудаўнічыя прадпрыемствы характарызуюцца высокім узроўнем механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці. На іх практычна перастала выкарыстоўвацца ручная праца. Выключэнне складае канвеерная зборачная вытворчасць. Аднак і тут у эканамічна развітых краінах чалавека замяняюць робаты (мал. 74).

22.3. Фактары размяшчэння і геаграфія машынабудавання. На пачатковым этапе развіцця машынабудавання найважнейшымі фактарамі, якія ўплываюць на яго размяшчэнне, былі сыравінны фактар, фактар працоўных рэсурсаў і спажывецкі фактар. Таму найбольш буйныя цэнтры машынабудавання ўзнікалі ў густанаселеных прамыслова асвоеных раёнах з высокаразвітой металургіяй. Прыкладамі такіх цэнтраў могуць служыць г. Дэтройт у ЗША, г. Дортмунд у Германіі.

У цяперашні час сыравінны фактар па-ранейшаму аказвае ўплыў на развіццё цэлага шэрага металаёмістых машынабудаўнічых вытворчасцей: суднабудаванне, вытворчасць металургічнага абсталявання, чыгуначнай тэхнікі, асобных відаў станкоў. Роля фактару працоўных рэсурсаў найбольш значная ў тых вытворчасцях, дзе шырока прадстаўлены зборачны працэс (вытворчасць складанай бытавой тэхнікі, аўтамабілебудаванне, электроніка і электратэхніка). Пры гэтым у сучасным машынабудаванні асаблівае значэнне набывае высокі ўзровень кваліфікацыі працоўных рэсурсаў (мал. 75). *(Як вы думаеце, чаму?)*



Мал. 75. На заводзе Samsung Electronics (Рэспубліка Карэя)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пераважна на спажыўца арыентуецца ў сваім размяшчэнні вытворчасць масавай машынабудаўнічай прадукцыі (сельскагаспадарчай тэхнікі, бытавой тэхнікі, легкавых аўтамабіляў, персанальных камп'ютараў).

Найбольш сучасныя машынабудаўнічыя вытворчасці, звязаныя са стварэннем авіяцыйнай, ракетна-касмічнай тэхнікі, электронна-вылічальных машын, робатаў, з'яўляюцца высокатэхналагічнымі і навукаёмістымі. Таму на іх размяшчэнне вызначальны ўплыў аказвае фактар развіцця навукі і тэхналогій. Сусветныя лідары па вытворчасці такой прадукцыі — краіны з высокім узроўнем эканамічнага развіцця (ЗША, Японія, Германія).

с. 36

У цяперашні час машынабудаванне з'яўляецца вядучай галіной арацоўчай прамысловасці большасці высокаразвітых краін. Пры гэтым такія найбуйнейшыя эканамічна развітыя краіны, як ЗША, Японія, Германія, маюць шматгаліновае машынабудаванне. Невялікія эканамічна развітыя краіны (Аўстрыя, Швейцарыя, Нідэрланды і інш.) спецыялізуюцца на вытворчасці асобных відаў машынабудаўнічай прадукцыі: гадзіннікаў, аптычных прыбораў, медыцынскага абсталявання. Гэта прадукцыя прызначаецца пераважна для паставак на экспарт. Сярод краін, якія развіваюцца, найбольшых маштабаў машынабудаванне дасягнула ў Кітаі — сусветным лідары па вытворчасці аўтамабіляў, марскіх суднаў, многіх відаў бытавой тэхнікі.

Адной з найбольш маштабных галін сучаснага машынабудавання з'яўляецца аўтамабілебудаванне. Сусветнае аўтамабілебудаванне засяроджана ў трох асноўных рэгіёнах: азіяцкім, амерыканскім і заходнееўрапейскім. Краінамі — лідарамі па вытворчасці аўтамабіляў з'яўляюцца Кітай, ЗША, Японія.

Геаграфія сучаснага сусветнага суднабудавання характарызуецца істотным зрухам вытворчасці з развітых дзяржаў Еўропы і Паўночнай Амерыкі ў краіны Усходняй Азіі. Да сярэдзіны XX ст. сусветнымі лідарамі ў суднабудаванні былі еўрапейскія краіны: Вялікабрытанія, Швецыя, Нідэрланды. У цяперашні час больш за 90 % сусветнага суднабудавання засяроджана ў трох краінах: Кітаі, Японіі і Рэспубліцы Карэя. *(Як вы думаеце, якімі прычынамі быў абумоўлены такі тэрытарыяльны зрух у развіцці сусветнага суднабудавання?)*

Сучаснае станкабудаванне прадстаўлена вытворчасцю высокатэхналагічных металаапрацоўчых і дрэваапрацоўчых станкоў, кавальска-прэсавага і ліцейнага абсталявання, прамысловых робатаў (мал. 76). Лідарамі сусветнай вытворчасці



Мал. 76. Сучасны металаапрацоўчы станок

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

станкоў з'яўляюцца Кітай, Японія, Германія. Значных маштабаў дасягнула станкабудаванне ў ЗША, Італіі. У сусветнай вытворчасці прамысловых робатаў пазіцыі лідара займае Японія (каля 50 % сусветнай вытворчасці робатаў).

Абагульнім і запомнім. Сучаснае машынабудаванне аб'ядноўвае шматлікія віды дзейнасці, прадукцыяй якіх з'яўляюцца разнастайныя машыны, тэхнічныя прылады, а таксама абсталяванне да іх. У структуры сучаснага машынабудавання вылучаюць тры асноўныя віды вытворчасцей: вытворчасць машын і абсталявання; вытворчасць транспартных сродкаў; вытворчасць электронікі і электраабсталявання. На размяшчэнне машынабудавання вызначальны ўплыў аказваюць сыравінны фактар, фактар працоўных рэсурсаў, спажывецкі фактар, а таксама фактар развіцця навукі і тэхналогій.

Праверым сябе. 1. Якое значэнне машынабудавання ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей? 2. Якія асноўныя віды вытворчасцей уключае машынабудаванне? 3. Чаму ў сучасным машынабудаванні вядучую ролю адыгрывае вытворчасць электроннага і электратэхнічнага абсталявання? 4. Што з'яўляецца асноўнай сыравінай для большасці машынабудаўнічых вытворчасцей? 5. Якія тэхналагічныя асаблівасці вытворчасці машын і абсталявання і які ўплыў яны аказваюць на размяшчэнне машынабудавання?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы веды аб фактарах размяшчэння машынабудавання, паспрабуйце вызначыць, якія прадпрыемствы машынабудавання могуць атрымаць развіццё ў горадзе, што з'яўляецца буйным марскім портам.

Для дапытлівых. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначце, на якіх машынабудаўнічых вытворчасцях шырока выкарыстоўваюцца канвееры. У чым заключаюцца перавагі рабатызаваных вытворчасцей?

Зборка аўтамабіляў

§ 23. Хімічная прамысловасць

Успамінаем. *Якія карысныя выкапні выкарыстоўваюцца як сыравіна для хімічнай прамысловасці? Што ўяўляюць з сябе хімічныя працэсы?*

Разважаем. *Чаму хімічная прамысловасць разам з машынабудаваннем і энергетыкай лічыцца вядучай галіной апрацоўчай прамысловасці?*

23.1. Хімічная прамысловасць: значэнне і віды дзейнасці. Хімічная прамысловасць аб'ядноўвае шматлікія прамысловыя вытворчасці, у якіх з розных рэчываў на аснове выкарыстання хімічных працэсаў і тэхналогій ствараецца неабходная чалавеку прадукцыя.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Выкарыстанне хімічных працэсаў і тэхналогій дазваляе ператвараць адны рэчывы ў іншыя і атрымліваць разнастайную прадукцыю з неабходнымі чалавеку ўласцівасцямі: мінеральныя ўгнаенні, лекавыя прэпараты, ахоўныя пакрыцці, палімерныя матэрыялы і многае іншае. Прадукцыя хімічнай прамысловасці знаходзіць шырокае прымяненне ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей (мал. 77). Значная яе частка выкарыстоўваецца ў якасці канструкцыйных матэрыялаў (палімерныя матэрыялы, пластмасы), складаючы канкурэнцыю драўніне і металам. Сучасная сельская гаспадарка не можа абысціся без выпрабленых хімічнай прамысловасцю мінеральных угнаенняў, сродкаў барацьбы са шкоднікамі і хваробамі жывёл і раслін. Цяжка ўявіць жыццё сучаснага чалавека без прадукцыі бытавой хіміі: мыйных сродкаў, сродкаў асабістай гігіены.



Мал. 77. Прадукцыя хімічнай прамысловасці

Існуе некалькі падыходаў да класіфікацыі ўсёй разнастайнасці хімічных вытворчасцей. Звычайна іх падзяляюць на дзве асноўныя групы. Першую групу складаюць вытворчасці неарганічнай, або асноўнай, хіміі: вытворчасць мінеральных угнаенняў, неарганічных кіслот, каўстычнай соды, неарганічных фарбавальнікаў і г. д. У другую групу аб'ядноўваюцца вытворчасці хіміі арганічнага сінтэзу: вытворчасць сінтэтычных смол, хімічных валокнаў, палімерных матэрыялаў, пластмас і г. д. (мал. 78).



Мал. 78. Склад хімічнай прамысловасці

23.2. Сыравіна і фактары размяшчэння хімічных вытворчасцей. Для хімічнай прамысловасці характэрна выкарыстанне больш разнастайнай сыравіны ў параўнанні з іншымі відамі прамысловых вытворчасцей.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У якасці сыравіны тут могуць выкарыстоўвацца: выкапнёвая хімічная сыравіна, якая пастаўляецца здабыўной прамысловасцю (фасфатная сыравіна, калійныя солі, каменная соль, бром і г. д.); мінеральная вугляводародная сыравіна (нафта, прыродны газ, вугаль, сланцы); прадукцыя раслінага і жывёльнага паходжання (драўніна, збожжа і інш.); адходы вытворчасці каляровай і чорнай металургіі (коксавы газ, доменныя газы і інш.); вада, атмасферныя газы і іншыя прыродныя рэчывы.

Хімічныя тэхналогіі дазваляюць вырабляць адзін і той жа прадукт з розных крыніц сыравіны і, наадварот, выкарыстоўваць адну сыравіну для вытворчасці рознай прадукцыі. Напрыклад, хімічныя валокны можна атрымліваць з нафты, вугалю, драўніны. Нафту можна выкарыстоўваць для атрымання хімічных валокнаў, палімерных матэрыялаў, гумы.

Галоўнымі фактарамі размяшчэння хімічнай прамысловасці з'яўляюцца арыентацыя на сыравіну і энергію. На крыніцы сыравіны арыентуецца вытворчасць калійных угнаенняў, палімерных матэрыялаў, лакафарбавых вырабаў. Паблізу ад крыніц энергіі размяшчаюцца вытворчасці хімічных валокнаў.

У шэрагу выпадкаў вырашальнае значэнне пры выбары месца размяшчэння хімічных прадпрыемстваў мае наяўнасць значных водных рэсурсаў (вытворчасць сінтэтычных валокнаў). Наяўнасць працоўных рэсурсаў на сучасных высокаўтаматызаваных хімічных вытворчасцях адыгрывае прыкметна меншую ролю. У размяшчэнні асобных высокатэхналагічных вытворчасцей (вытворчасць лекаў, фарбавальнікаў, рэактываў, ядахімікатаў) вялікае значэнне маюць наяўнасць кваліфікацыі працоўных рэсурсаў і ўзровень развіцця хімічнай навукі (мал. 79). Не менш значным (асабліва для вытворчасці мінеральных угнаенняў) з'яўляецца спажывецкі фактар.



Мал. 79. Вытворчасць лекавых сродкаў

Найбольш маштабная і шматгаліновая хімічная прамысловасць характэрна для краін з высокім узроўнем эканамічнага развіцця. У гэтых краінах хімічная прамысловасць — другая па значнасці галіна апрацоўчай прамысловасці пасля машынабудавання. Найбуйнейшымі раёнамі хімічнай прамысловасці свету з'яўляюцца Паўночная Амерыка (ЗША), Заходняя Еўропа (Германія) і Усходняя Азія (Японія, Кітай).

23.3. Вытворчасць гумовых і пластмасавых вырабаў. Найважнейшыя матэрыялы, якія вырабляюцца хімічнай прамысловасцю, — гума і пластмасы. Асноўнай сыравінай для іх вытворчасці з'яўляецца нафта.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для атрымання гумы з нафты спачатку вырабляюць сінтэтычны каўчук, які характарызуецца эластычнасцю, воданепранікальнасцю і электраізаляцыйнымі ўласцівасцямі. З каўчуку атрымліваюць гуму, якая выкарыстоўваецца для вытворчасці аўтамабільных, авіяцыйных і веласіпедных шын (мал. 80), гуматэхнічных вырабаў (транспарцёрныя стужкі, прывадныя рамяні), а таксама гумовых падлогавых пакрыццяў і гумовага абутку. Асноўныя сусветныя вытворцы сінтэтычнага каўчуку і гумовых вырабаў — ЗША, Кітай, Японія.



Мал. 80. Прадукцыя прадпрыемства «Белшына» (г. Бабруйск, Рэспубліка Беларусь)

Пластмасы (пластыкі) — арганічныя матэрыялы, асновай якіх з'яўляюцца сінтэтычныя або прыродныя высокамалекулярныя злучэнні (палімеры). Выключна шырокае прымяненне маюць пластмасы на аснове сінтэтычных палімераў, якія атрымліваюцца з нафты, вугалю ці прыроднага газу.

Пластмасы і вырабы з пластмас дзякуючы каштоўным уласцівасцям шырока прымяняюцца ў машынабудаванні, лёгкай прамысловасці, сельскай гаспадарцы, медыцыне, у побыце (мал. 81). Сусветнымі лідарамі ў вытворчасці пластмас з'яўляюцца ЗША, Японія, Германія.



Мал. 81. Вырабы с пластмасы

23.4. Вытворчасць мінеральных угнаенняў. Развіццё сучаснай сельскай гаспадаркі немагчыма без прымянення вялікіх аб'ёмаў мінеральных угнаенняў, якія дазваляюць атрымліваць высокія ўраджаі асноўных сельскагаспадарчых культур. Хімічная прамысловасць вырабляе тры асноўныя віды мінеральных угнаенняў: азотныя, фосфарныя і калійныя (мал. 82). Кожная з гэтых вытворчасцей характарызуецца спецыфікай зыходнай сыравіны, пэўнай тэхналогіяй і асаблівасцямі размяшчэння.



Мал. 82. Віды мінеральных угнаенняў

Больш за ўсё ў свеце вырабляецца і спажываецца азотных угнаенняў (каля 120 млн т), паколькі злучэнні азоту найбольш неабходныя раслінам, асабліва ў перыяд іх росту. Зыходнай сыравінай для вытворчасці азотных угнаенняў з'яўляецца прыродны газ і атмасфернае паветра.

Найбуйнейшымі вытворцамі азотных угнаенняў з'яўляюцца краіны з вялікімі маштабамі сельскагаспадарчай вытворчасці: Кітай (больш

с. 37

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

за 30 % сусветнай вытворчасці), Індыя, ЗША. Сусветная вытворчасць фосфарных угнаенняў па аб'ёме значна саступае вытворчасці азотных угнаенняў. Для вытворчасці фосфарных угнаенняў выкарыстоўваюцца два віды прыроднай сыравіны — фасфарыты і апатыты. Дадзеная вытворчасць можа размяшчацца як у тых краінах і раёнах, дзе здабываецца фасфатная сыравіна, так і ў раёнах спажывання фосфарных угнаенняў. Сярод краін сусветнымі лідарамі па вытворчасці фосфарных угнаенняў з'яўляюцца Кітай, ЗША, Індыя.



Мал. 83. Калійныя ўгнаенні

Сыравінай для атрымання калійных угнаенняў (мал. 83) з'яўляюцца калійныя солі. Колькасць карыснага кампанента ў іх не перавышае 50 %, таму вытворчасць калійных угнаенняў арыентуецца на крыніцы сыравіны. *(Як вы думаеце, чаму?)* Сярод краін лідарамі па вытворчасці калійных угнаенняў з'яўляюцца Канада, Беларусь і Расія, якія валодаюць і найбуйнейшымі ў свеце запасамі калійных солей.

Абагульнім і запомнім. Хімічная прамысловасць аб'ядноўвае шматлікія прамысловыя вытворчасці, у якіх з розных зыходных рэчываў, на аснове выкарыстання хімічных працэсаў і тэхналогій ствараецца неабходная чалавеку прадукцыя. Галоўнымі фактарамі размяшчэння хімічнай прамысловасці з'яўляюцца арыентацыя на сыравіну, энергію і спажыўца. Найбольш маштабная і шматгаліновая хімічная прамысловасць характэрная для краін з высокім узроўнем эканамічнага развіцця.

Праверым сябе. 1. Якое значэнне прадукцыі хімічнай прамысловасці ў жыцці і гаспадарчай дзейнасці людзей? 2. Якія асноўныя вытворчасці ўваходзяць у склад хімічнай прамысловасці? 3. Што з'яўляецца сыравінай для хімічнай прамысловасці і якія хімічныя вытворчасці арыентуюцца ў размяшчэнні на сыравінны фактар? 4. Якія фактары, акрамя сыравіннага, уплываюць на размяшчэнне хімічнай прамысловасці? 5. У якіх краінах хімічная прамысловасць дасягнула найбольш высокага ўзроўню развіцця і чаму?

Ад тэорыі да практыкі. Вывучыце прадметы інтэр'еру вашай кватэры, бытавую тэхніку, прадметы гардэробу, асабістай гігіены. Якія з іх з'яўляюцца прадукцыяй хімічнай прамысловасці, у якой краіне яны зроблены?

Абмяркуем. Паспрабуйце вызначыць фактары, якія паўплывалі на размяшчэнне ў нашай рэспубліцы вытворчасці мінеральных угнаенняў, хімічных валокнаў, аўтамабільных шын, вырабаў з пластмасы.

Вытворчасць аўтамабільных шын

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 24. Лясная гаспадарка і лясная прамысловасць

Успамінаем. *Да якога віду прыродных рэсурсаў адносяцца лясныя рэсурсы і якія асаблівасці іх размяшчэння ў свеце?*

Разважаем. *Чаму, нягледзячы на развіццё металургіі і хімічнай прамысловасці, драўніна застаецца найважнейшым канструкцыйным матэрыялам у гаспадарчай дзейнасці людзей?*

24.1. Лясная гаспадарка. Лясы заўсёды з'яўляліся для чалавека важнай крыніцай разнастайных прыродных рэсурсаў. Асноўныя віды карыстання лесам: нарыхтоўка драўніны, збор грыбоў, ягад, лекавых раслін, а таксама адпачынак людзей. Актыўнае гаспадарчае выкарыстанне прыводзіць да дэградацыі лясоў і іх знішчэння. Таму яны маюць патрэбу ў ахове і аднаўленні. Дзейнасцю па ахове лясоў, іх аднаўленні пасля пажараў і высечак (пасадка лесу) займаецца ***лясная гаспадарка***. Прадпрыемствы лясной гаспадаркі ажыццяўляюць таксама асобныя віды лесанарыхтовак (у тым ліку высечкі лесу). Гэта могуць быць як санітарныя высечкі з мэтай выдалення хворых і пашкоджаных дрэў, так і высечкі догляду (прарэджванне лесапасадак).

Аднак найбольш маштабнымі з'яўляюцца высечкі лесу з мэтай нарыхтоўкі дзелавой драўніны — асноўнай сыравіны для лясной прамысловасці (мал. 84). Сусветнымі лідарамі па нарыхтоўцы дзелавой драўніны, якая ідзе на прамысловую перапрацоўку, з'яўляюцца ЗША, Расія, Канада, Бразілія і Кітай. У свеце нарыхтоўка дзелавой драўніны хвойных парод традыцыйна перавышае аб'ёмы нарыхтоўкі драўніны ліставых парод. *(Як вы думаеце, чаму?)* Сярод сусветных лідараў па нарыхтоўцы драўніны хвойных парод такія краіны, як ЗША, Канада і Расія. Больш за ўсё драўніны ліставых парод нарыхтоўваюць Бразілія і ЗША.




Мал. 84. Нарыхтоўка дзелавой драўніны

24.2. Лясная прамысловасць: значэнне і асноўныя віды вытворчасцей. У складзе апрацоўчай прамысловасці вылучаецца лясная прамысловасць — група вытворчасцей, зыходнай сыравінай для якіх з'яўляецца драўніна. Гэтыя вытворчасці займаюцца прамысловай нарыхтоўкай драўніны, а таксама яе апрацоўкай і перапрацоўкай. Да ліку вытворчасцей па апрацоўцы і перапрацоўцы драўніны адносяцца лесапілаванне, вытворчасць разнастайных вырабаў з дрэва (у тым ліку будаўнічых дэталей, фанеры,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

драўнянавалакністых і драўнянастружкавых пліт, запалак), вытворчасць цэлюлозы, паперы, кардону і іншай прадукцыі (мал. 85).



Мал. 85. Віды вытворчасці па апрацоўцы і перапрацоўцы драўніны



Мал. 86. У цэху па вытворчасці мэблі

Раней у склад лясной прамысловасці ўключалася таксама вытворчасць мэблі. Аднак у сучаснай вытворчасці мэблі, акрамя дрэва, шырока выкарыстоўваюцца металы, пластмасы і іншыя канструкцыйныя матэрыялы. Таму яна вылучаецца ў якасці самастойнага віду прамысловай вытворчасці (мал. 86).

Прадукцыя лясной прамысловасці знаходзіць шырокае прымяненне ў гаспадарчай дзейнасці і ў побыце чалавека. Драўляныя вырабы і канструкцыі выкарыстоўваюцца ў будаўніцтве. Кардон з'яўляецца распаўсюджаным матэрыялам для вытворчасці ўпакоўкі. Папяровая прадукцыя незаменная ў паліграфічнай прамысловасці і выдавецкай справе.

с. 38

24.3. Сыравіна і фактары размяшчэння вытворчасцей. Як мы ўжо ведаем, асноўнай сыравінай для лясной прамысловасці з'яўляецца драўніна. Бо́льшая частка дзелавой драўніны перапрацоўваецца ў тых жа краінах, дзе і нарыхтоўваецца: ЗША, Канада, Расія, Кітай, Фінляндыя, Швецыя. Пры гэтым цэнтры лесанарыхтовак і вытворчасці вырабаў з дрэва не заўсёды супадаюць. Буйныя лесапільныя заводы часта будуюць у месцах перасячэння транспартных шляхоў. *(Як вы думаеце, чаму?)* Некаторыя прадпрыемствы дрэваапрацоўчай прамысловасці размяшчаюць у густанаселеных раёнах, арыентуючыся на спажыўцоў прадукцыі (вытворчасць фанеры, запалак, бруса для будаўніцтва дамоў).

У многіх сучасных дрэваапрацоўчых вытворчасцях у вялікіх аб'ёмах выкарыстоўваецца хімічная прадукцыя. Напрыклад, клеявыя рэчывы ў вытворчасці фанеры, серная кіслата ў цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Таму некаторыя вытворчасці размяшчаюцца паблізу ад цэнтраў хімічнай прамысловасці.

24.4. Цэлюлозна-папяровая вытворчасць. Асноўным паказчыкам узроўню развіцця лясной прамысловасці з'яўляецца вытворчасць кардону і паперы (мал. 87). Гэта прадукцыя з'яўляецца вынікам больш глыбокай перапрацоўкі драўніны з выкарыстаннем хімічных тэхналогій, таму яе

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кошт значна вышэйшы, чым кошт прадукцыі механічнай апрацоўкі драўніны.

Перш чым вырабіць кардон і паперу, з драўніны атрымліваюць цэлюлозу — прыроднае палімернае злучэнне, якое з'яўляецца складовай часткай клеткавых абалонак усіх найвышэйшых раслін. Вытворчасць цэлюлозы характарызуецца высокай вадаёмістасцю і энергаёмістасцю. Таму размяшчаецца паблізу ад буйных крыніц вады і ў раёнах, добра забяспечаных энергетычнымі рэсурсамі.



Мал. 87. Вытворчасць паперы

с. 38

Па выпуску кардону і паперы ў свеце вылучаюцца тры рэгіёны: Паўночная Амерыка, асабліва ЗША (каля 75 млн т), Усходняя Азія (перш за ўсё Кітай і Японія), Заходняя Еўропа (са значнай вытворчасцю ў ФРГ і Скандынаўскіх краінах). Сярод краін безумоўным сусветным лідарам па вытворчасці кардону і паперы ў цяперашні час з'яўляецца Кітай (каля 100 млн т), які выпускае масавую, менш якасную папяровую прадукцыю. Папера высокай якасці вырабляецца пераважна ў эканамічна развітых краінах: Японіі, Канадзе, Германіі.

Абагульнім і запомнім. Лясная гаспадарка ўключае віды дзейнасці па ахове лясоў і іх аднаўленні. Лясная прамысловасць аб'ядноўвае вытворчасці па нарыхтоўцы дзелавой драўніны, яе апрацоўцы і пераапрацоўцы з мэтай атрымання разнастайнай прадукцыі: вырабаў з дрэва, запалак, кардону, паперы. Асноўнай сыравінай для лясной прамысловасці з'яўляецца драўніна. Галоўныя фактары размяшчэння лясной прамысловасці — сыравінны, транспартны і спажывецкі.

Праверым сябе. 1. У чым адрозненне лясной гаспадаркі ад лясной прамысловасці? 2. Якія вытворчасці ўваходзяць у склад лясной прамысловасці і якую сыравіну яны выкарыстоўваюць? 3. Чаму найважнейшым паказчыкам узроўню развіцця дрэваапрацоўчай прамысловасці ў краіне з'яўляецца вытворчасць кардону і паперы?

Ад тэорыі да практыкі. 1. Вызначце фактары, якія абумовілі размяшчэнне дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў у буйных гарадах Беларусі. 2. Выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка і карты атласа, вызначце галоўныя раёны размяшчэння прадпрыемстваў цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Якімі фактарамі тлумачыцца такое размяшчэнне?

Абмяркуем. Як вы думаеце, ці зможа скарачэнне выпуску друкаваных выданняў прывесці да істотнага памяншэння аб'ёмаў вытворчасці і спажывання паперы ў свеце?

Папяровая вытворчасць

Вытворчасць фанеры

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


§ 25. Лёгкая і харчовая прамысловасць

Успамінаем. *Што з'яўляецца прадукцыяй сельскай гаспадаркі і дзе яна выкарыстоўваецца?*

Разважаем. *Чаму асноўным фактарам размяшчэння прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці з'яўляецца спажывецкі?*

25.1. Лёгкая і харчовая прамысловасць: значэнне і віды вытворчасцей. Разгледжаныя раней віды прамысловай дзейнасці накіраваны на выраб або сыравіны (здабыўная прамысловасць), або разнастайных сродкаў вытворчасці (металы, тэхніку, хімікаты). Прамысловыя вытворчасці, якія вывучаюцца ў дадзеным параграфе, прызначаны для выпуску пераважна прадметаў канчатковага спажывання для людзей (адзенне, абутак, харчовыя прадукты).

Асноўнай сыравінай для лёгкай і харчовай прамысловасці з'яўляецца прадукцыя сельскай гаспадаркі. У лёгкай прамысловасці выкарыстоўваюцца натуральныя валокны раслінага (бавоўна, лён) і жывёльнага (шэрсць, шоўк) паходжання, скура жывёл. Сыравінай для харчовай прамысловасці з'яўляюцца малако, мяса сельскагаспадарчых жывёл, садавіна, агародніна. Таксама ў якасці сыравіны тут у вялікіх аб'ёмах выкарыстоўваецца прадукцыя хімічнай прамысловасці.



Мал. 88. Склад лёгкай прамысловасці

Галоўнымі вытворчасцямі ў складзе лёгкай прамысловасці з'яўляюцца тэкстыльная вытворчасць (уключаючы трыкатажную), швейная вытворчасць, а таксама вытворчасць скуры і абутку (мал. 88). Ёсць таксама вялікая колькасць іншых вытворчасцей: ювелірная справа, вытворчасць цацак, галантарэйных вырабаў і інш. Лёгкая прамысловасць мае высокі ўзровень тэхнічнай забяспечанасці. Аднак важнае месца ў ёй па-ранейшаму займаюць саматужная і рамесная вытворчасці, заснаваныя на выкарыстанні ручной працы (вытворчасць дываноў, разнастайных прадметаў турысцкага попыту).



Мал. 89. Склад харчовай прамысловасці

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У склад харчовай прамысловасці ўваходзяць мясная, малочная, рыбная, кандытарская, мукамольная, вытворчасць цукру, напіткаў і цэлы шэраг іншых вытворчасцей (мал. 89). Усе гэтыя віды дзейнасці перапрацоўваюць зыходную сыравіну ў разнастайныя прадукты харчавання.

25.2. Геаграфія тэкстыльнай і швейнай прамысловасці. Для большасці дзяржаў на розных этапах іх гістарычнага развіцця тэкстыльная і швейная вытворчасці з'яўляліся асновай апрацоўчай прамысловасці, таму яны атрымалі практычна паўсюднае развіццё. Аднак у размяшчэнні гэтых відаў дзейнасці адбываюцца значныя змены, звязаныя з іх пераарыентацыяй на танную працу. Назіраецца агульны зрух вытворчасці ў краіны з вялікімі рэзервамі малакваліфікаванай і таннай працоўнай сілы.

с. 39

Такія змены адбываюцца не толькі ў размяшчэнні швейнай і тэкстыльнай вытворчасцей, засяроджаных у асноўным у Кітаі і іншых краінах, якія развіваюцца, але і ў абутковай вытворчасці. Яна таксама перамяшчаецца з ЗША і краін Заходняй Еўропы ў Кітай, Індыю, Бразілію. У гэтыя ж краіны перамясцілася вытворчасць цацак, спорттавараў, ювелірных вырабаў.

Сучасная ***тэкстыльная прамысловасць*** прадстаўлена вытворчасцю трох асноўных відаў тканін — смесавых (з розных відаў хімічных і натуральных валокнаў), чыста баваўняных і трыкатажу (у асноўным з сінтэтычных валокнаў). Трыкатаж адрозніваецца ад тэкстыльнай тканіны спосабам вытворчасці. Тэкстыльнае валакно ткуць на ткацкіх станках, чаргуючы падоўжныя і папярочныя ніткі, а трыкатаж вяжуць, перапляталочы ніткі паміж сабой (мал. 90).



Мал. 90. Трыкатажныя вырабы

Акрамя таго, вырабляюцца ваўняныя, ільняныя і шаўковыя тканіны. Аб'ёмы іх вытворчасці ў цяперашні час значна скараціліся. *(Як вы думаеце, чаму?)* Штогод у свеце выпускаецца прыкладна 50 млрд м смесавых тканін, 40 млрд м баваўняных, 3 млрд м шарсцяных, яшчэ менш ільняных тканін і чыстага шоўку. Вытворчасць трыкатажу дасягае 30 млрд м.

Асноўная вытворчасць смесавых тканін засяроджана ў ЗША, Індыі і Японіі. Кітай і Індыя з'яўляюцца галоўнымі вытворцамі баваўняных тканін. Больш дарагія шарсцяныя тканіны вырабляюцца пераважна ў Заходняй Еўропе, а таксама ЗША і Японіі, у меншай ступені — у Кітаі і Індыі. Вытворчасць ільняных тканін цалкам засяроджана ў Еўропе. Акрамя Расіі, іх выпускаюць у Францыі, Бельгіі, Беларусі. Натуральны шоўк (дарагія «мастацкія» тканіны) вырабляецца пераважна ў Кітаі, Японіі і Індыі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Швейная прамысловасць (разам з харчовай) характарызуецца найбольш шырокай геаграфіяй вытворчасці і таксама перамяшчаецца ў краіны з таннай працоўнай сілай (мал. 91).



Мал. 91. Швейная вытворчасць у Бангладэш

25.3. Вытворчасць скуры і абутку. Важнай сыравінай для вытворчасці прадукцыі лёгкай прамысловасці з'яўляецца скура жывёл. Для гэтага яна праходзіць спецыяльную апрацоўку (мал. 92). Найбуйнейшымі вытворцамі скуры і вырабаў з яе з'яўляюцца краіны са значным пагалоўем сельскагаспадарчых жывёл. Да іх адносяцца як эканамічна развітыя краіны — ЗША, Францыя, Аўстралія, так і краіны, якія развіваюцца, — Кітай, Турцыя, Мексіка. Апрацаваная скура выкарыстоўваецца для вытворчасці адзення, сумак, рамянёў і іншых вырабаў. Аднак асноўным спажыўцом скуры з'яўляецца абутковая прамысловасць. Акрамя вырабленай скуры жывёл, у якасці сыравіны ў сучаснай абутковай прамысловасці выкарыстоўваецца штучная скура, тэкстыль і іншыя матэрыялы.



Мал. 92. Апрацоўка скуры

с. 39

У развіцці ***абутковай прамысловасці*** назіраюцца тыя ж тэндэнцыі, што і ў швейнай. Заканадаўцамі моды з'яўляюцца фірмы еўрапейскіх краін (Італіі, Аўстрыі), дзе застаюцца галаўныя прадпрыемствы (пастаўшчыкі мадэлей), а масавая вытворчасць перамясцілася ў краіны з таннай працай. Сёння на краіны Азіі прыходзіцца больш за 70 % сусветнай вытворчасці абутку. Найбуйнейшымі краінамі — вытворцамі абутку з'яўляюцца Кітай, Рэспубліка Карэя, Італія.

25.4. Геаграфія харчовай прамысловасці. Харчовая прамысловасць аб'ядноўвае віды дзейнасці, у якіх на аснове прамысловай перапрацоўкі пераважна сельскагаспадарчай прадукцыі (як раслінага, так і жывёльнага паходжання) вырабляюцца разнастайныя прадукты харчавання. Яна характарызуецца разнастайнасцю вытворчасцей, а таксама розным узроўнем іх тэхнічнай забяспечанасці.

У развіцці і размяшчэнні прадпрыемстваў харчовай прамысловасці выразна прасочваюцца дзве асноўныя арыентацыі — на крыніцы сыравіны і на спажыўца. Пры гэтым назіраюцца істотныя адрозненні паміж эканамічна развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, як у структуры вытворчасці і спажывання прадуктаў харчавання, так і ў спосабах іх вытворчасці.

Для эканамічна развітых краін характэрная буйнамаштабная вытворчасць разнастайных відаў харчовых прадуктаў. Па некаторых з іх яны

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з'яўляюцца вядучымі сусветнымі вытворцамі і экспарцёрамі. Але ў сувязі з узмацненнем руху за здаровы лад жыцця ў гэтых краінах адбываецца скарачэнне традыцыйных вытворчасцей (вінаробства, вытворчасць тытунёвых вырабаў, цукру, жывёльных тлушчаў).


с. 40

У краінах, якія развіваюцца, вялікае значэнне мае «дамашняя вытворчасць» прадуктаў харчавання. Такія галіны, як мясная, малочная, развіты вельмі слаба. Хуткімі тэмпамі развіваецца кансервавая прамысловасць, арыентаваная на рынак высокаразвітых краін, куды пастаўляюцца сокі, фруктовыя кансервы, у меншай ступені — мясныя і рыбныя вырабы.

Найбуйнейшай галіной харчовай прамысловасці ў свеце з'яўляецца цукровая. З агульнай вытворчасці цукру 2/3 складае трысняговы цукар, а 1/3 — бураковы. Значная частка цукру паступае на сусветны рынак. Найбуйнейшыя экспарцёры трысняговага цукру — Бразілія, Куба, Тайланд, а бураковага — Францыя, Нідэрланды, ФРГ. Вытворчасцю бураковага цукру вылучаюцца таксама Расія і Украіна. Найбуйнейшымі імпарцёрамі цукру з'яўляюцца ЗША, Японія, краіны Заходняй Еўропы.

Абагульнім і запомнім. Лёгкая і харчовая прамысловасць аб'ядноўваюць шматлікія віды прамысловай дзейнасці, у якіх ствараюцца разнастайныя прадметы спажывання людзей: адзенне, абутак, прадукты харчавання. Размяшчэнне прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці адбываецца пад уплывам двух галоўных фактараў — сыравіннага і спажывецкага. Асноўнымі вытворцамі масавай прадукцыі тэкстыльнай, швейнай і абутковай прамысловасці ў цяперашні час з'яўляюцца краіны, якія развіваюцца.

Праверым сябе. 1. Што з'яўляецца асноўнай сыравінай для вытворчасці прадукцыі лёгкай і харчовай прамысловасці? 2. Чым тлумачыцца шырокая геаграфія размяшчэння прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці? 3. Якія змены адбыліся ў размяшчэнні прадпрыемстваў тэкстыльнай, швейнай і абутковай прамысловасці і чым яны абумоўлены?

Ад тэорыі да практыкі. На падставе розных крыніц інфармацыі ўстанавіце, якія прадпрыемствы харчовай прамысловасці вашага горада (раёна) вырабляюць прадукцыю пераважна з мясцовай сыравіны.

Абмяркуем. Якія з пералічаных вытворчасцей харчовай прамысловасці ў размяшчэнні арыентуюцца на сыравінны або спажывецкі фактары: вытворчасць цукру, хлебабулачных вырабаў, сыру, малака, рыбных кансерваў, сокаў, каўбасных вырабаў, кандытарскіх вырабаў?

Вытворчасць ільняной тканіны

Вытворчасць адзення

Вытворчасць абутку

Вытворчасць хлебабулачных вырабаў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 7. СФЕРА ПАСЛУГ



§ 26. Сфера паслуг: структура і асаблівасці размяшчэння

Успамінаем. *Якая прадукцыя ствараецца відамі дзейнасці, што ўваходзяць у сферу матэрыяльнай вытворчасці?*

Разважаем. *Чаму ў структуры сусветнага ВУП сфера паслуг па кошце прадукцыі пачала пераважаць над сферай матэрыяльнай вытворчасці?*

26.1. Віды паслуг і структура сферы паслуг. Вы ўжо ведаеце, што віды дзейнасці, якія адносяцца да сферы матэрыяльнай вытворчасці, накіраваны на стварэнне прадукцыі ў форме рэчыва і энергіі. Усё гэта рэальная прадукцыя, якую можна, напрыклад, перавозіць, вырабляць у адным месцы, а выкарыстоўваць у іншым. Таму ўсе віды дзейнасці матэрыяльнай вытворчасці часам называюць рэальным сектарам гаспадарчай дзейнасці людзей.

Прадукцыяй відаў дзейнасці, якія ўваходзяць у сферу паслуг, з'яўляюцца дзеянні, накіраваныя на задавальненне разнастайных матэрыяльных і духоўных патрэб чалавека. Наколькі разнастайныя патрэбы чалавека, настолькі разнастайныя і віды дзейнасці, якія ўваходзяць у сферу паслуг. Развіццё сферы паслуг цесна звязана з развіццём матэрыяльнай вытворчасці. Вызначальны ўплыў на фарміраванне сучаснай сферы паслуг аказаў сацыяльны і навукова-тэхнічны прагрэс.

Вытворчасць вялікіх аб'ёмаў прадукцыі ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці патрабавала абмену ёю і спрыяла развіццю гандлю. Каб абмяняць прадукцыю, неабходна перамясціць яе з аднаго месца ў іншае. Для гэтага трэба было развіваць транспарт і транспартныя паслугі. Гандаль быў звязаны з грашовымі разлікамі, што спрыяла развіццю фінансавых, банкаўскіх паслуг. Вытворчасць вялікай колькасці тэхнікі патрабавала яе абслугоўвання і рамонту. Таму, напрыклад, узнікалі паслугі па рамонце аўтамабіляў. Развіццё навукі і ўскладненне ведаў аб навакольным свеце спрыяла развіццю адукацыі. У сувязі з развіццём машыннай вытворчасці і ростам прадукцыйнасці працы павялічыўся дабрабыт людзей. У іх

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з'явілася больш вольнага часу, што садзейнічала развіццю паслуг у сферы адпачынку. Пад уплывам усяго пералічанага колькасць відаў дзейнасці ў сферы паслуг пастаянна павялічвалася, а сама сфера паслуг па кошце прадукцыі пераўзышла матэрыяльную вытворчасць. У цяперашні час прынята вылучаць каля дзесяці асноўных відаў дзейнасці ў сферы паслуг (мал. 93) (гл. форзац 1).



Мал. 93. Склад сферы пауслуг

Паслугі транспарту і сувязі накіраваны на забеспячэнне перавозак грузаў і пасажыраў, а таксама на перадачу інфармацыі. Гандаль уключае дзейнасць па пераразмеркаванні матэрыяльнай прадукцыі паміж вытворцамі і спажыўцом. Гандаль бывае аптовы і рознічны (мал. 94). Фінансавая дзейнасць звязана з назапашваннем і пераразмеркаваннем грашовых рэсурсаў (мал. 95). У адукацыі аказваюцца паслугі па перадачы ведаў. У галіне аховы здароўя яны накіраваны на забеспячэнне здароўя чалавека, лячэнне хвароб (мал. 96).

Попыт на пэўныя віды паслуг у свеце істотна адрозніваецца. Адпаведна адрозніваюцца і іх маштабы, а таксама кошт. Суадносіны маштабаў паслуг па іх відах дазваляюць вызначыць структуру сферы паслуг. Вядучае месца ў ёй займаюць транспарт і сувязь, гандаль, фінансавая дзейнасць.



Мал. 94. У магазіне рознічнага гандлю



Мал. 95. У аперацыйнай зале банка



Мал. 96. Ва ўстанове аховы здароўя

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

26.2. Асаблівасці развіцця і размяшчэння сферы паслуг. Развіццё і размяшчэнне сферы паслуг абумоўлена асаблівасцямі паслугі як віду дзейнасці. Паслуга — гэта адно або некалькі дзеянняў. Яе нельга аказаць у запас, дзеянні выконваюцца там і тады, калі ў іх узнікае неабходнасць. Паслуга неаддзельная ад таго, хто яе аказвае, таму для яе атрымання неабходна звярнуцца да непасрэднага вытворцы паслугі. Якасць паслуг з'яўляецца непастаяннай і залежыць ад шматлікіх фактараў. Напрыклад, на якасць транспартных паслуг істотны ўплыў могуць аказаць умовы надвор'я.

З улікам пералічаных асаблівасцей адбываецца размяшчэнне прадпрыемстваў сферы паслуг. Калі прадпрыемствы матэрыяльнай вытворчасці могуць размяшчацца ў адным месцы, а іх прадукцыя потым дастаўляецца ва ўсе краіны свету, то прадпрыемствы сферы паслуг імкнуцца наблізіцца да спажыўца, каб яму было зручна атрымліваць тую ці іншую паслугу. Так, буйныя банкі ствараюць шматлікія аддзяленні і філіялы ў розных краінах і населеных пунктах. Прадуктовыя магазіны, аптэкі, цырульні, майстэрні па рамонце адзення і абутку размяшчаюцца ў крокавай даступнасці ад спажыўца. *(Прывядзіце іншыя прыклады набліжэння прадпрыемстваў сферы паслуг да спажыўца.)*

Найбольш значных маштабаў сфера паслуг дасягнула ў эканамічна развітых краінах. Для гэтых краін характэрныя вялікая разнастайнасць відаў паслуг і густая сетка прадпрыемстваў і арганізацый сферы паслуг. У краінах, якія развіваюцца, сфера паслуг сканцэнтравана пераважна ў буйных гарадах. Для жыхароў сельскай мясцовасці гэтых краін многія віды паслуг з'яўляюцца недаступнымі або якасць іх аказання вельмі нізкая.

26.3. Роля сферы паслуг у сучаснай гаспадарцы. Сфера паслуг адыгрывае вызначальную ролю ў структуры сучаснай сусветнай гаспадаркі і нацыянальных гаспадарак большасці краін свету. У структуры ВУП эканамічна развітых краін доля сферы паслуг складае 70 % і больш, а ў большасці краін, якія развіваюцца, знаходзіцца на ўзроўні 50 %. У гэтых відах дзейнасці сёння занятая асноўная частка эканамічна актыўнага насельніцтва. У перспектыве віды дзейнасці сферы паслуг будуць станавіцца ўсё больш разнастайнымі, іх роля ў гаспадарчай дзейнасці людзей усіх краін будзе ўзрастаць.

Для некаторых краін віды дзейнасці сферы паслуг маюць важнае экспартнае значэнне. Напрыклад, для нашай рэспублікі, дзякуючы яе выгаднаму геаграфічнаму становішчу, значнымі з'яўляюцца даходы ад экспарту транспартных паслуг. Праз тэрыторыю нашай краіны ажыццяўляецца перавозка грузаў і пасажыраў з Еўропы ў Расію і краіны Азіі. Перавозчыкі з гэтых краін аплачваюць тыя транспартныя паслугі, якія аказваюцца ім на нашай тэрыторыі, у тым ліку плацяць за карыстанне нашымі транспартнымі шляхамі. Асновай эканомікі многіх краін з'яўляецца аказанне турысцкіх або банкаўскіх паслуг (Багамскія астравы, Кіпр).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Паслуга — гэта адно або некалькі дзеянняў, накіраваных на задавальненне разнастайных матэрыяльных і нематэрыяльных патрэб чалавека. Асноўнымі відамі дзейнасці ў сферы паслуг з'яўляюцца транспарт і сувязь, гандаль і фінансавая дзейнасць. Галоўнай асаблівасцю развіцця і размяшчэння відаў дзейнасці сферы паслуг з'яўляецца іх набліжэнне да спажыўца. Найбольш высокага ўзроўню сфера паслуг дасягнула ў эканамічна развітых краінах.

Праверым сябе. 1. Што такое паслуга і якія віды дзейнасці ўключае сфера паслуг? 2. У чым заключаюцца асноўныя адрозненні прадукцыі сферы паслуг ад прадукцыі матэрыяльнай вытворчасці? 3. Якія віды дзейнасці з'яўляюцца вядучымі ў структуры сферы паслуг і чаму? 4. Якая галоўная асаблівасць размяшчэння відаў дзейнасці сферы паслуг? 5. У якіх краінах і чаму сфера паслуг атрымала найбольшае развіццё?

Ад тэорыі да практыкі. Пералічыце віды сваіх дзеянняў, якія неабходна будзе здзейсніць, аказваючы наступныя паслугі: транспартныя перавозкі пасажыраў, паслугі цырульні, паслугі па рамонце абутку, гасцінічныя паслугі, рэстаранныя паслугі. Прадукцыю якіх відаў прамысловай дзейнасці вы будзеце выкарыстоўваць для аказання гэтых паслуг?

Абмяркуем. Як вы лічыце, якія віды паслуг могуць быць аўтаматызаваны, а ў аказанні якіх паслуг яшчэ доўга будзе задзейнічаны чалавек?

§ 27. Транспарт

Успамінаем. *Якая галіна прамысловасці займаецца вытворчасцю транспартных сродкаў?*

Разважаем. *Чаму ў структуры сферы паслуг транспарт з'яўляецца вядучым відам дзейнасці?*

27.1. Транспарт і яго значэнне. Развіццё гаспадаркі любой краіны цяжка ўявіць без сучасных відаў транспарту.

Транспарт — гэта від дзейнасці ў складзе сферы паслуг, які займаецца перавозкамі грузаў і пасажыраў.

Для эфектыўнай працы транспарту неабходныя: транспартныя сродкі (аўтамабілі, самалёты, марскія судны); аб'екты транспартнай інфраструктуры (транспартныя шляхі, аэрапорты, марскія парты, вакзалы) (мал. 97); транспартныя арганізацыі, якія выконваюць працу па перавозках грузаў і пасажыраў (напрыклад, авіяцыйная кампанія «Белавія» або Мінскі метрапалітэн).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 97. Транспартная інфраструктура: транспартныя шляхі (*а*), аэрапорт (*б*), марскі порт (*в*)

Значэнне транспарту заключаецца ў тым, што ён забяспечвае ўзаемадзеянне вытворцаў прадукцыі і паслуг і іх спажыўцоў. Транспарт — гэта своеасаблівая крывяносная сістэма гаспадаркі. Ад узроўню яго развіцця залежаць маштабы і ўзровень развіцця ўсіх астатніх відаў гаспадарчай дзейнасці. Здабытая сыравіна і сельскагаспадарчая прадукцыя дастаўляюцца для наступнай перапрацоўкі на прадпрыемствы апрацоўчай прамысловасці. Гатовая прадукцыя дастаўляецца на прадпрыемствы гандлю. Насельніцтва з дапамогай транспарту перамяшчаецца да месца працы. Людзі выкарыстоўваюць транспарт для паездак да месцаў адпачынку і г. д. Вялікая роля транспарту ў развіцці міжнародных адносін, асабліва міжнароднага гандлю і міжнароднага турызму.


Існуе цэлы шэраг паказчыкаў, якія дазваляюць меркаваць аб маштабах і ўзроўні развіцця транспарту ў той ці іншай краіне. Да іх ліку адносяцца агульная колькасць транспартных сродкаў і ўзровень забяспечанасці імі. Напрыклад, па агульнай колькасці самалётаў лідарам сярод краін свету з'яўляюцца ЗША. Найбольшая колькасць аўтамабіляў у разліку на 1000 чалавек характэрна для высокаразвітых краін — ЗША, Аўстраліі, Люксембурга.

Важнымі паказчыкамі развіцця транспарту з'яўляюцца працягласць і гушчыня транспартных шляхоў. Па працягласці большасці відаў транспартных шляхоў сусветным лідарам з'яўляюцца ЗША, а па гушчыні аўтамабільных дарог (даўжыня транспартных шляхоў на 1000 км^2 тэрыторыі) — высокаразвітыя еўрапейскія краіны (Бельгія, Нідэрланды, Германія). Яшчэ адзін важны паказчык развіцця транспарту — аб'ём выкананай транспартнай работы. Напрыклад, колькасць грузаў і пасажыраў, перавезеных тым ці іншым відам транспарту за год.

На развіццё сучаснага транспарту вялікі ўплыў аказваюць дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Адбываецца павелічэнне прапускной здольнасці транспартных шляхоў, паляпшаюцца скорасныя характарыстыкі транспартных сродкаў, расце камфортнасць пасажырскага транспарту і грузападымальнасць (ёмістасць) грузавога. Усе гэтыя змены накіраваны на тое, каб як мага хутчэй даставіць усё большую колькасць грузаў і пасажыраў з аднаго месца нашай планеты ў іншае.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

27.2. Віды транспарту і іх асаблівасці. Існуюць розныя падыходы да вылучэння відаў транспарту. Адзін з іх заснаваны на ўліку асаблівасцей геаграфічнага асяроддзя, у якім ажыццяўляюцца пракладка транспартных шляхоў і перавозкі грузаў і пасажыраў. Выходзячы з гэтага, вылучаецца сухапутны, водны і паветраны транспарт (мал. 98).



Мал. 98. Віды транспарту

Сухапутны від транспарту ажыццяўляе перавозкі па сушы. Ён дзеліцца на наземны і падземны. Да сухапутнага віду транспарту адносяцца: аўтамабільны, чыгуначны і трубаправодны. Для працы ўсіх гэтых відаў транспарту неабходна пракласці спецыяльныя транспартныя шляхі: аўтамабільныя дарогі і чыгункі, трубаправоды. У кожнага з наземных відаў транспарту ёсць свае перавагі і недахопы.

Аўтамабільны транспарт найбольш эфектыўны пры перавозцы грузаў і пасажыраў на невялікія і сярэднія адлегласці (мал. 99). Галоўныя яго перавагі — манеўранасць (дастаўка «ад брамы да брамы») і высокія скорасныя характарыстыкі. Да недахопаў адносяцца малая ёмістасць і ўплыў на навакольнае асяроддзе. Аўтамабільны транспарт з'яўляецца адной з асноўных крыніц забруджвання атмасфернага паветра ў населеных пунктах.



Мал. 99. Транспартны паток на аўтамагістралі

Чыгуначны транспарт выкарыстоўваецца пераважна для перавозак грузаў на сярэднія і далёкія адлегласці. Таксама ён адыгрывае важную ролю ў перавозках пасажыраў унутры гарадоў і на сярэднія адлегласці (мал. 100).



Мал. 100. Чыгуначны транспарт: наземны (*а*), падземны (*б*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 101. Трубаправод

Асноўныя перавагі чыгуначнага транспарту — вялікая ёмістасць і параўнальна нізкі кошт перавозак. Аднак ён саступае аўтамабільнаму транспарту ў манеўранасці і скорасных характарыстыках. У апошні час у сувязі з развіццём скорасных чыгунак роля чыгуначнага транспарту ў перавозках пасажыраў узрастае. ***Трубаправодны транспарт*** выкарыстоўваецца для транспарціроўкі нафты (нафтаправоды) і прыроднага газу (газаправоды) (мал. 101). Асноўныя яго перавагі — незалежнасць ад умоў надвор'я, бесперапыннасць дзеяння, магчымасць транспарціроўкі грузаў у вялікіх аб'ёмах.



Мал. 102. Водны транспарт: рачны (*а*), марскі (*б*)

Водны транспарт ажыццяўляе перавозкі грузаў і пасажыраў па акваторыі рэк, азёр, мораў і акіянаў. Адпаведна ён дзеліцца на ***ўнутраны водны*** (рачны і азёрны) і ***марскі*** (акіянічны) (мал. 102). Перавозка грузаў і пасажыраў ажыццяўляецца з дапамогай плывучых транспартных сродкаў — суднаў. Для функцыянавання воднага транспарту не патрабуецца пракладкі спецыяльных транспартных шляхоў.

Для абслугоўвання суднаў, выканання пагрузачных і разгрузных работ узводзяцца парты. Галоўныя перавагі воднага транспарту — нізкі кошт перавозак і магчымасць перавозіць вялікія аб'ёмы грузаў. Да недахопаў адносяцца невысокая скорасць перавозак і залежнасць ад умоў надвор'я.

У цяперашні час водны транспарт выкарыстоўваецца пераважна для перавозкі грузаў. Асабліва вялікая яго роля ў гандлі паміж краінамі розных кантынентаў. Марскі транспарт з'яўляецца сусветным лідарам у міжнародных грузаперавозках. Для перавозкі грузаў выкарыстоўваюцца судны рознага тыпу: наліўныя (танкеры) для перавозкі нафты, сухагрузы і інш. Найбольшае значэнне ў сучасным водным транспарце маюць судны-кантэйнеравозы. Іх выкарыстанне дазваляе ажыццяўляць хуткую перагрузку грузаў на іншыя віды транспарту (чыгуначны, аўтамабільны) і значна скарачае час дастаўкі грузаў. Вялікае значэнне ў скарачэнні часу перавозкі грузаў паміж партамі розных акіянаў маюць марскія каналы. Найбольш важныя з іх — Суэцкі і Панамскі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паветраны (авіяцыйны) транспарт ажыццяўляе перавозкі пасажыраў і грузаў па паветры з дапамогай разнастайных тыпаў лятальных апаратаў, пераважна самалётаў (мал. 103).





Мал. 103. Перавозка пасажыраў (*а*) і грузаў (*б*) паветраным транспартам

Для абслугоўвання паветраных перавозак узводзяцца аэрапорты. Найбуйнейшыя пасажырскія аэрапорты свету знаходзяцца ў гарадах Атланта (ЗША), Пекін (Кітай), Дубай (ААЭ).

Асноўная перавага авіяцыйнага транспарту — высокая скорасць і магчымасць дастаўляць грузы і пасажыраў у цяжкадаступныя для іншых відаў транспарту раёны. Да яго недахопаў адносяцца адносная дарагоўля і неабходнасць узаемадзеяння з іншымі відамі транспарту, паколькі большасць буйных аэрапортаў размяшчаецца за межамі гарадоў.

Па прызначэнні перавозак вылучаюць грузавы і пасажырскі транспарт. З усіх відаў транспарту толькі трубаправодны ў цяперашні час выкарыстоўваецца выключна для перавозкі грузаў. Водны транспарт з'яўляецца пераважна грузавым, а авіяцыйны — пасажырскім. Аўтамабільны і чыгуначны ў роўнай ступені выкарыстоўваюцца для перавозкі як грузаў, так і пасажыраў.

27.3. Геаграфія асноўных відаў транспарту. Узровень развіцця транспарту ў розных рэгіёнах і краінах шмат у чым вызначаецца ўзроўнем іх эканамічнага развіцця.

Найбольш высокі ўзровень развіцця ўсіх відаў транспарту характэрны для краін Еўропы (Германія, Францыя, Вялікабрытанія), Паўночнай Амерыкі (ЗША, Канада), некаторых краін Азіі (Японія, Рэспубліка Карэя) і Аўстраліі. У гэтых краінах, як правіла, высокая гушчыня асноўных транспартных шляхоў і забяспечанасць насельніцтва транспартнымі сродкамі. Транспартныя шляхі раўнамерна размешчаны па ўсёй тэрыторыі, што спрыяе высокай транспартнай мабільнасці насельніцтва.

У краінах, якія развіваюцца, транспарт развіваецца вельмі нераўнамерна. У шэрагу гэтых краін ёсць найбуйнейшыя ў свеце марскія парты і аэрапорты (Кітай, Індыя, Бразілія), пракладзены сучасныя скорасныя дарогі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У той жа час вельмі нізкімі застаюцца гушчыня аўтамабільных дарог і чыгунак і забяспечанасць насельніцтва транспартнымі сродкамі. Асабліва гэта характэрна для краін Афрыкі, Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі.

с. 41–45

Сусветнае лідарства па агульнай працягласці транспартных шляхоў займаюць як эканамічна развітыя краіны, так і краіны, якія развіваюцца, з вялікай тэрыторыяй, вялікімі маштабамі эканомікі і значнай колькасцю насельніцтва. Найбольшую працягласць аўтамабільных дарог маюць ЗША, Індыя і Кітай. Сусветнымі лідарамі па даўжыні чыгунак з'яўляюцца ЗША, Расія і Кітай. Самая працяглая сетка трубаправодаў — у ЗША, Расіі і Канадзе. Па даўжыні водных шляхоў лідзіруюць Кітай, Расія і Бразілія.

Абагульнім і запомнім. Транспарт — гэта від дзейнасці ў складзе сферы паслуг, які займаецца перавозкамі, г. зн. перамяшчэннем у прасторы, грузаў і пасажыраў. Асноўнымі відамі транспарту з'яўляюцца сухапутны, водны і паветраны. У склад сухапутнага транспарту ўваходзяць аўтамабільны, чыгуначны і трубаправодны. Найбольшага ўзроўню развіцця ўсе віды транспарту дасягнулі ў эканамічна развітых краінах.

Праверым сябе. 1. Якое значэнне транспарту як віду дзейнасці і што ўваходзіць у яго склад? 2. Якія паказчыкі выкарыстоўваюцца для характарыстыкі транспарту? 3. На якія віды дзеліцца транспарт? 4. Якімі перавагамі і недахопамі характарызуецца кожны з відаў транспарту? 5. Якая агульная заканамернасць развіцця і размяшчэння транспарту?

Ад тэорыі да практыкі. Уявіце, што вам трэба даставіць невялікую партыю скорапсавальнага грузу з Беларусі ў Польшчу. Якім відам транспарту вы для гэтага скарыстаецеся?

Абмяркуем. Як вы думаеце, у чым перавагі электрыфікаваных чыгунак? Ці з'яўляецца актуальным гэты напрамак для развіцця чыгуначнага транспарту ў Беларусі?

§ 28. Геаграфія турызму і гандлю

Успамінаем. *Што з'яўляецца вынікам відаў дзейнасці сферы паслуг?*

Разважаем. *Чым абумоўлена значнае павелічэнне маштабаў і пашырэнне геаграфіі турызму ў сучасным свеце?*

28.1. Геаграфія турызму. У сваім штодзённым жыцці вы часта чуеце такія словы, як «падарожжа», «турызм», «адпачынак». А ці ёсць паміж імі розніца?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Турызм — гэта часовыя выезды (падарожжы) людзей у іншую краіну ці мясцовасць, адрозную ад месца іх пастаяннага пражывання.

Людзі, якія ажыццяўляюць гэтыя выезды, называюцца турыстамі.

Галоўная ўмова для таго, каб падарожжа называлася турызмам, — яно не павінна рабіць сваёй мэтай зарабляне грошай. Турысты не зарабляюць грошы, а трацяць іх на атрыманне рознага роду паслуг. Усе віды дзейнасці, звязаныя з абслугоўваннем турыстаў, г. зн. з аказаннем ім разнастайных паслуг, называюцца турызмам у шырокім сэнсе гэтага слова. Ён уключае транспартнае абслугоўванне турыстаў, гасцінічны сэрвіс, паслугі харчавання, вытворчасць і продаж сувеніраў і многае іншае. Часта ўсе гэтыя віды дзейнасці называюць турысцкім бізнесам, або турысцкай індустрыяй. Аказаннем турысцкіх паслуг займаюцца спецыяльныя турысцкія кампаніі (турфірмы).

Віды турызму вылучаюцца ў залежнасці ад мэт падарожжаў турыстаў. Самым распаўсюджаным з'яўляецца турызм з мэтай адпачынку, або рэкрэацыйны турызм. Акрамя таго, вылучаюцца пазнавальны (экскурсійны), аздараўленчы, гастранамічны, спартыўны, паломніцкі (да рэлігійных святыняў), настальгічны (на гістарычную радзіму продкаў) і іншыя віды турызму (мал. 104). У цяперашні час актыўна развіваецца дзелавы турызм, які ажыццяўляецца з мэтай наладжвання дзелавых кантактаў, наведвання розных кангрэсаў, канферэнцый, выстаў, семінараў.



Мал. 104. Віды турызму

Для таго каб тэрыторыю наведвалі турысты, яна павінна мець разнастайныя прыродныя і культурныя аб'екты або вылучацца правядзеннем мерапрыемстваў, якія ўяўляюць цікавасць для адпачынку людзей, іх пазнавальнай дзейнасці і дзелавой актыўнасці. Сукупнасць уласцівасцей тэрыторыі, якія забяспечваюць развіццё турызму, называюць *турысцкім патэнцыялам*. Найбольш высокім турысцкім патэнцыялам валодаюць тэрыторыі са спрыяльнымі для адпачынку прыроднымі ўмовамі, з наяўнасцю значных гістарычных і культурных аб'ектаў, развітой турысцкай інфраструктурай (гасцініцамі, рэстаранамі).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Калі турысцкія паездкі ажыццяўляюцца ўнутры краіны — гэта ўнутраны турызм, калі ў іншыя краіны — міжнародны. У апошнія гады ў свеце значна расце папулярнасць міжнароднага турызму і павялічваецца колькасць міжнародных турыстаў. Шмат у чым гэта абумоўлена ростам дабрабыту насельніцтва і развіццём транспарту, асабліва авіяцыйнага.

Найважнейшымі паказчыкамі развіцця міжнароднага турызму з'яўляюцца колькасць турыстаў, якія наведалі тую ці іншую краіну, і даходы ад турызму. Краінамі, якія больш за іншыя ў 2017 г. наведвалі турысты, былі Францыя (89 млн замежных турыстаў), Іспанія (82 млн), ЗША (73 млн). Сусветнымі лідарамі па прыбытках ад турызму з'яўляюцца ЗША (211 млрд дол.), Іспанія (68 млрд дол.) і Францыя (61 млрд дол.).



Мал. 105. На аптовым складзе прадукцыі



Мал. 106. Дастаўка малака на малаказавод

28.2. Геаграфія гандлю. Гандаль — від гаспадарчай дзейнасці, накіраваны на ажыццяўленне куплі-продажу, абмену тавараміа, а таксама звязаныя з гэтым працэсы: дастаўка тавараў, непасрэднае абслугоўванне пакупнікоў і г. д. Гандаль выступае своеасаблівым пасрэднікам паміж вытворцамі і спажыўцамі прадукцыі. Для гандлю таварамі ствараюцца спецыяльныя гандлёвыя прадпрыемствы, пляцоўкі, біржы. Гандаль паслугамі ажыццяўляецца прадпрыемствамі па аказанні паслуг непасрэдна ў момант іх аказання.

У залежнасці ад маштабаў продажу і прызначэння прадукцыі гандаль таварамі дзеліцца на рознічны і аптовы (мал. 105). Прыкладам аптовага гандлю можа быць продаж металу металургічным заводам прадпрыемству машынабудавання або продаж малака сельскагаспадарчым прадпрыемствам малочнаму заводу (мал. 106).

28.3. Адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Як і турызм, гандаль бывае ўнутраным і міжнародным. Найбольшых маштабаў унутраны гандаль дасягае ў буйных эканамічна развітых краінах. Гэта абумоўлена ёмістым унутраным рынкам гэтых краін, г. зн. вялікім попытам на самую разнастайную прадукцыю і высокай пакупніцкай здольнасцю насельніцтва. У краінах, якія развіваюцца, маштабы

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ўнутранага гандлю не надта вялікія з-за адсталасці ў эканамічным развіцці і нізкіх даходаў насельніцтва.

У міжнародным гандлі таварамі вядучая роля таксама належыць краінам з высокім узроўнем эканамічнага развіцця. Яны пастаўляюць на сусветны рынак больш дарагую гатовую прадукцыю. Краіны, якія развіваюцца, гандлююць пераважна сыравінай або больш таннай гатовай прадукцыяй, прызначанай для масавага попыту.

Эканамічна развітыя краіны з'яўляюцца сусветнымі лідарамі не толькі па кошце асобных відаў паслуг, але і па іх экспарце. Так, Вялікабрытанія і ЗША — буйныя экспарцёры інфармацыйных паслуг, Швейцарыя — адзін з сусветных лідараў па аказанні банкаўскіх паслуг, Францыя і Іспанія — прызнаныя лідары ў сферы міжнароднага турызму.

Некаторыя краіны, якія развіваюцца, таксама спецыялізуюцца на аказанні асобных відаў паслуг і з'яўляюцца іх экспарцёрамі. Перш за ўсё гэта адносіцца да турысцкіх, транспартных, банкаўскіх паслуг. Аднак дадзеныя віды паслуг развіваюцца тут дзякуючы інвестыцыям з эканамічна развітых краін, і іх развіццё кантралюецца замежнымі кампаніямі. У цэлым жа па ўзроўні развіцця сферы паслуг краіны, якія развіваюцца, істотна саступаюць эканамічна развітым краінам.

Абагульнім і запомнім. Усе віды дзейнасці, звязаныя з абслугоўваннем турыстаў, называюцца турызмам. Найважнейшымі паказчыкамі развіцця міжнароднага турызму з'яўляюцца колькасць турыстаў, якія наведалі тую ці іншую краіну, і даходы ад турызму. Гандаль уключае віды гаспадарчай дзейнасці, накіраваныя на ажыццяўленне куплі-продажу, абмену таварамі і паслуг. Найбольш высокі ўзровень развіцця ўнутранага і знешняга гандлю характэрны для эканамічна развітых краін.

Праверым сябе. 1. Што такое турызм і каго прынята лічыць турыстам? 2. Якія віды турызму вылучаюцца? 3. Якія фактары спрыяюць развіццю міжнароднага турызму? 4. У якіх краінах турызм атрымаў найбольшае развіццё і чаму? 5. Што такое гандаль? 6. Чым аптовы гандаль адрозніваецца ад рознічнага? 7. Якія асаблівасці геаграфіі гандлю?


Ад тэорыі да практыкі. Якія віды турызму могуць атрымаць развіццё ў вашай мясцовасці (населеным пункце, раёне)?

Абмяркуем. Мяркуецца, што ў сувязі з бурным развіццём інтэрнэт-гандлю, з'яўленнем магазінаў-аўтаматаў, увядзеннем безнаяўных разлікаў знікне прафесія прадаўца. Ці згодны вы з такімі прагнозамі? Абгрунтуйце свой адказ.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

РАЗДЗЕЛ II. РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД СВЕТУ

ТЭМА 8. ЕЎРОПА



§ 29. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Еўропы. Краіны Паўночнай Еўропы. Вялікабрытанія

Успамінаем. *Што такое рэгіён?*

Разважаем. *Якія перавагі і недахопы для гаспадарчага развіцця краіны мае астраўное становішча?*

29.1. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Еўропы. Краіны Паўночнай Еўропы. У адпаведнасці з класіфікацыяй ААН у Еўропе вылучаюцца чатыры рэгіёны: Паўднёвая Еўропа, Заходняя Еўропа, Усходняя Еўропа і Паўночная Еўропа. У аснову вылучэння рэгіёнаў пакладзены геаграфічны прынцып. Улічваецца таксама культурная блізкасць краін, агульнасць іх гістарычнага развіцця. У Паўднёвую Еўропу ўваходзяць у асноўным паўастраўныя міжземнаморскія дзяржавы. Асноўная роля сярод іх належыць Італіі, *Іспаніі* (*Мадрыд*), *Грэцыі* (*Афіны*) і *Партугаліі* (*Лісабон*). Заходняя Еўропа ўключае найбольш развітыя ў эканамічных адносінах краіны Еўропы. Лідарамі тут з'яўляюцца Германія і Францыя. Абсалютная большасць гэтых краін уваходзіць у склад Еўрапейскага саюза. Да Усходняй Еўропы аднесены пераважна былыя сацыялістычныя краіны, а таксама дзяржавы, якія ўтварыліся ў выніку распаду СССР. Сярод іх вылучаюцца Польшча і Украіна. У гэты рэгіён уключаецца і Расія.

Рэгіён Паўночная Еўропа абмываецца водамі двух акіянаў — Атлантычнага і Паўночнага Ледавітага. У яго склад уваходзіць 10 краін. Частка з іх размешчана на самым буйным паўвостраве Еўропы — *Скандынаўскім*.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 51

Большасць краін рэгіёна знаходзіцца на ўзбярэжжы Балтыйскага і Паўночнага мораў. *(Выкарыстоўваючы карту атласа, вызначце асаблівасці геаграфічнага становішча кожнай з краін рэгіёна.)*

29.2. Вялікабрытанія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Для характарыстыкі адносін паміж эканоміка-геаграфічнымі аб'ектамі, якія вывучае сацыяльна-эканамічная геаграфія, выкарыстоўваецца паняцце «эканоміка-геаграфічнае становішча».

Эканоміка-геаграфічнае становішча (ЭГС) — размяшчэнне эканоміка-геаграфічнага аб'екта адносна іншых эканоміка-геаграфічных аб'ектаў, якія могуць аказваць уплыў на яго гаспадарчае развіццё.

ЭГС характэрна для ўсіх эканоміка-геаграфічных аб'ектаў: прамысловых прадпрыемстваў, марскіх партоў, населеных пунктаў, краін, рэгіёнаў. Характарызуючы ЭГС аб'екта, можна высветліць уплыў на яго гаспадарчае развіццё іншых аб'ектаў. Ён можа быць як станоўчым, так і адмоўным, адпаведна ЭГС можа быць выгадным ці не вельмі выгадным.

Вялікабрытанія — астраўная дзяржава ў паўночна-ўсходняй частцы Атлантычнага акіяна. На сушы Вялікабрытанія мяжуе толькі з адной дзяржавай — Ірландыяй. Ад мацерыковай часткі Еўропы краіна аддзелена пралівам Ла-Манш. Найбліжэйшыя суседзі на мацерыку — Францыя і Бельгія. Суседства Вялікабрытаніі з эканамічна развітымі краінамі Еўропы дазваляе актыўна супрацоўнічаць з імі ў эканоміцы, палітыцы, культуры.

Размяшчэнне Вялікабрытаніі на астравах спрыяе развіццю марскога транспарту і выхаду да міжнародных марскіх гандлёвых шляхоў. Тунэль, пракладзены ў самым вузкім месцы праліва Ла-Манш, злучае Вялікабрытанію з мацерыком. Гэта істотна паляпшае яе ЭГС.

Тэрыторыя краіны знаходзіцца ў межах паясоў старажытнай складкаватасці. Яе рэльеф уяўляе з сябе чаргаванне невысокіх гор і раўнін. У нетрах краіны ёсць запасы каменнага вугалю, жалезных руд. На шэльфе *Паўночнага мора* адкрыты радовішчы нафты і прыроднага газу.

Умераны марскі клімат з вялікай колькасцю ападкаў спрыяльны для гаспадарчай дзейнасці людзей. Адна з найбуйнейшых рэк Вялікабрытаніі — Тэмза. У яе басейне пражывае каля 20 % насельніцтва краіны і размешчана сталіца дзяржавы — *г. Лондан* (мал. 107).



Мал. 107. На вуліцах Лондана

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

29.3. Насельніцтва. Колькасць насельніцтва Вялікабрытаніі складае 66,4 млн чалавек. Дэмаграфічныя працэсы падобныя на агульнаеўрапейскія. Нязначны натуральны прырост насельніцтва (3 ‰) забяспечваецца высокай нараджальнасцю сярод імігрантаў, удзельная вага якіх пастаянна расце. У краіне высокая працягласць жыцця насельніцтва (каля 80 гадоў) і доля людзей сталага ўзросту. Узровень урбанізацыі складае 80 %. Асноўная частка гараджан канцэнтруецца ў буйных агламерацыях — Лонданскай і Манчэстэрскай. У этнічным складзе насельніцтва пераважаюць англічане (больш за 80 %). Абсалютная большасць вернікаў — пратэстанты (англікане). У Вялікабрытаніі высокая сярэдняя шчыльнасць насельніцтва (каля 265 чал./км^2).

29.4. Гаспадарка. Вялікабрытанія ўваходзіць у групу найбольш развітых у эканамічных адносінах краін свету. Вядучую ролю ў эканоміцы адыгрывае сфера паслуг, на якую прыходзіцца больш за 70 % ВУП краіны. Удзельная вага прамысловасці ў структуры ВУП складае 21 %, сельскай гаспадаркі — менш за 1 %. У шматгаліновай прамысловасці пераважаюць сучасныя галіны: навукаёмістае машынабудаванне, хімічныя вытворчасці. Сельская гаспадарка адрозніваецца высокім узроўнем прадукцыйнасці працы і выкарыстаннем інтэнсіўных тэхналогій.

Энергетыка Вялікабрытаніі практычна цалкам грунтуецца на ўласных паліўных рэсурсах. Па запасах першасных крыніц энергіі (нафта, вугаль, прыродны газ) яна займае 1-е месца ў Еўропе (без Расіі). Больш за 60 % нафты, якая здабываецца з радовішчаў на шэльфе Паўночнага мора, паступае на экспарт. Добрая забяспечанасць паліўнымі рэсурсамі прадвызначыла вядучую ролю ЦЭС у электраэнергетыцы Вялікабрытаніі.

Металургія, якой у свой час належала вырашальная роля ў структуры прамысловасці, сёння страціла сваё значэнне. Выкарыстанне пераважна імпартнай сыравіны абумовіла перамяшчэнне прадпрыемстваў чорнай металургіі ў прыморскія раёны. Алюмініевая прамысловасць сканцэнтравана паблізу ГЭС у Шатландыі. Машынабудаванне забяспечвае каля 40 % кошту прадукцыі апрацоўчай прамысловасці. Развіта вытворчасць электронікі і электратэхнікі. Брытанскія кампаніі спецыялізуюцца на вытворчасці сродкаў сувязі, турбін і электрарухавікоў. У ліку найбольш развітых галін — хімічная прамысловасць. Найбуйнейшымі эканамічнымі цэнтрамі Вялікабрытаніі з'яўляюцца Лондан, Манчэстэр, Бірмінгем.

У сельскай гаспадарцы Вялікабрытаніі пераважае жывёлагадоўля: разводзяць буйную рагатую жывёлу мяса-малочнага напрамку, развіты беконная свінагадоўля, птушкагадоўля і авечкагадоўля. Раслінаводства, якое вырабляе пераважна кармы, займае падпарадкаванае ў адносінах да

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

жывёлагадоўлі становішча. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі знаходзіцца 70 % тэрыторыі краіны. З іх каля 30 % — гэта пашы, а больш за 60 % — ралля. Прыкладна 1/3 ворных угоддзяў занятая сеянымі травамі і столькі ж — збожжавымі культурамі (пшаніца, ячмень, авёс).

Сфера паслуг — аснова сучаснай брытанскай гаспадаркі. Становішча лідара ў ёй займае фінансавая дзейнасць, якая вызначае спецыялізацыю краіны ў сістэме міжнародных эканамічных адносін. Лонданская фондавая біржа — адна з найбуйнейшых і найстарэйшых біржаў Еўропы і адзін з найбольш вядомых сусветных рынкаў каштоўных папер (мал. 108). Вялікабрытанія ажыццяўляе 10 % сусветнага экспарту паслуг — банкаўскіх, страхавых, кансультацыйных, а таксама ў галіне камп'ютарнага праграмавання.





Мал. 108. Лонданская фондавая біржа: будынак біржы (*а*); у гандлёвай зале (*б*)

На развіццё транспарту Вялікабрытаніі вызначальны ўплыў аказала яе астраўное становішча. Вядучую ролю адыгрывае марскі транспарт, які забяспечвае 90 % усіх грузаперавозак як унутры краіны, так і ў гандлі з іншымі краінамі. Для марскога транспарту Вялікабрытаніі характэрныя маштабныя кабатажныя перавозкі грузаў і пасажыраў. Найбуйнейшыя марскія парты Вялікабрытаніі размешчаны ў гарадах Лондан, Ліверпуль, Саўтгэмптан.

Кабатажныя перавозкі — плаванне грузавых і пасажырскіх суднаў паміж марскімі партамі адной і той жа дзяржавы.

Міжнародныя пасажырскія перавозкі забяспечваюцца пераважна авіяцыйным транспартам. Перавозкі грузаў і пасажыраў унутры краіны ажыццяўляюцца аўтамабільным і ў меншай ступені чыгуначным транспартам. Роля чыгуначнага транспарту ў перавозцы пасажыраў істотна ўзрасла пасля будаўніцтва Еўратунэля, які злучыў Вялікабрытанію з французскім узбярэжжам мацерыка (мал. 109).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 109. Еўратунэль: будаўніцтва тунэля (1993 г.) (*а*), скоры поезд у тунэлі (*б*)

Своеасаблівасць прыроды і гісторыка-культурныя славутасці прыцягваюць у краіну шматлікіх турыстаў. Большасць з іх наведваюць Лондан і багатую на ўнікальныя прыродныя аб'екты і гістарычныя помнікі Шатландыю.

Абагульнім і запомнім. У Еўропе вылучаюцца чатыры сацыяльна-эканамічныя рэгіёны: Паўднёвая Еўропа, Заходняя Еўропа, Усходняя Еўропа і Паўночная Еўропа. ЭГС краіны — гэта яе знаходжанне адносна розных геаграфічных аб'ектаў, якія аказваюць уплыў на гаспадарчае развіццё дадзенай краіны. Галоўнай рысай ЭГС Вялікабрытаніі з'яўляецца астраўное становішча. Для насельніцтва Вялікабрытаніі характэрныя нізкі натуральны прырост і працэсы старэння. Асноўная частка ВУП краіны ствараецца відамі дзейнасці сферы паслуг.

Праверым сябе. 1. Якія сацыяльна-эканамічныя рэгіёны вылучаюцца ў Еўропе? 2. Назавіце краіны, якія ўваходзяць у склад рэгіёна Паўночная Еўропа. 3. Што такое эканоміка-геаграфічнае становішча? 4. Якімі асаблівасцямі характарызуецца ЭГС Вялікабрытаніі? 5. Якія асаблівасці дэмаграфічных працэсаў у Вялікабрытаніі? 6. Якія віды дзейнасці адыгрываюць вядучую ролю ў гаспадарцы краіны? 7. Што такое кабатажныя перавозкі?

Ад тэорыі да практыкі. Вызначце, які ўплыў аказваюць Паўночна-Атлантычнае цячэнне і заходні перанос паветраных мас на паўсядзённае жыццё жыхароў Вялікабрытаніі.

Для дапытлівых. Тунэль пад Ла-Маншам (Еўратунэль) злучае кантынентальную Еўропу з Вялікабрытаніяй чыгуначным злучэннем. Дзякуючы тунэлю стала магчыма прыбыць у Лондан, адправіўшыся з Парыжа, праз 2 гадзіны 15 мінут. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якая перадгісторыя ўзнікнення тунэля. Як выглядае Еўратунэль у параўнанні з іншымі найбуйнейшымі збудаваннямі падобнага роду, якія рэкорды яму належаць?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 30. Фінляндыя, Швецыя, Данія, Ісландыя, Нарвегія



Успамінаем. *Якія краіны ўваходзяць у склад рэгіёна Паўночная Еўропа?*



Разважаем. *Чаму для ўсіх краін Паўночнай Еўропы характэрны высокі ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця?*

30.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Фінляндыя* (*Хельсінкі*), *Швецыя* (*Стакгольм*), *Данія* (*Капенгаген*), *Ісландыя* (*Рэйк'явік*), *Нарвегія* (*Осла*) уваходзяць у склад рэгіёна Паўночная Еўропа. Прыморскае становішча з'яўляецца найважнейшай рысай ЭГС гэтых краін, якая аказала вызначальны ўплыў на іх гаспадарку.

Большую частку Скандынаўскага паўвострава займаюць горы. Раўнінныя раёны Фінляндыі адпавядаюць Балтыйскаму шчыту старажытнай Усходне-Еўрапейскай платформы. Ісландыя размешчана на вулканічным востраве. Нетры Скандынаўскага паўвострава ўтрымліваюць разнастайныя рудныя карысныя выкапні. У нарвежскай зоне шэльфа Паўночнага мора сканцэнтраваны буйныя запасы нафты і прыроднага газу.

Паўночнае размяшчэнне краін аказвае ўплыў на іх клімат. Зіма на большай частцы тэрыторыі рэгіёна доўгая і халодная, а лета — кароткае і прахалоднае. Аднак зімой суровасць клімату прыкметна мякчэе пад уплывам Паўночна-Атлантычнага цячэння. Шматлікія цыклоны з Атлантыкі дзякуючы заходняму пераносу прыносяць на кантынент шмат ападкаў і аказваюць ацяпляльны ўплыў на рэгіён. Рэкі шматлікія і паўнаводныя. Схілы Скандынаўскіх гор пакрыты хвойнымі лясамі. На поўдні яны саступаюць месца шыракалістым і змешаным лясам. Раўнінныя тэрыторыі Швецыі і Фінляндыі — самая лясістая частка Еўропы.

30.2. Дэмаграфічныя асаблівасці краін. Агульная колькасць насельніцтва краін — каля 28 млн чалавек. Больш за ўсё жыхароў у Швецыі — 10,2 млн чалавек, менш за ўсё ў Ісландыі — 0,4 млн чалавек. Тэмпы росту колькасці насельніцтва нізкія, нараджальнасць толькі нязначна перавышае смяротнасць. Для ўсіх краін актуальная праблема старэння нацыі. Па працягласці жыцця (больш за 80 гадоў) яны ўваходзяць у групу сусветных лідараў. Як следства, у гэтых краінах вельмі высокая (18 %) удзельная вага людзей старэйшых за 65 гадоў.

Этнічны склад насельніцтва аднастайны (больш за 90 % складаюць карэнныя жыхары). Аднак у буйных гарадах шматлікія выхадцы з іншых краін Еўропы, Азіі і Афрыкі. Асноўная частка вернікаў насельніцтва адносіцца да пратэстантаў.

Большасць краін з'яўляецца слабазаселенымі. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — ад 3 чал./км^2 у Ісландыі да 21 чал./км^2 у Швецыі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Выключэнне складае густанаселеная Данія — 125 чал./км^2. Асноўная частка насельніцтва канцэнтруецца на поўдні ўздоўж узбярэжжаў Балтыйскага і Паўночнага мораў. Унутраныя горныя раёны і запалярныя тэрыторыі — найменш заселеныя ў Еўропе. Для ўсіх краін характэрны высокі ўзровень урбанізацыі. У гарадах пражывае 94 % насельніцтва Ісландыі, 84 % — Швецыі, 74 % — Нарвегіі і 65 % — Фінляндыі. Пераважаюць невялікія гарады з насельніцтвам меншым за 100 тыс. чалавек. Насельніцтвам больш за 1 млн чалавек вылучаюцца толькі гарадскія агламерацыі, якія сфарміраваліся вакол *Капенгагена* і *Стакгольма*. Большасць гарадоў размешчана на ўзбярэжжы. Сельскае насельніцтва жыве на хутарах, адзіночных фермах або ў невялікіх рыбацкіх пасёлках (мал. 110).



Мал. 110. Рыбацкі пасёлак у Нарвегіі

30.3. Гаспадарка. Асаблівасці галіновай структуры. На спецыялізацыю гаспадаркі Нарвегіі і Ісландыі вызначальны ўплыў аказалі берагі мора, багатыя на рэсурсы рыбы і марскога звера. На гаспадарчае развіццё Фінляндыі і Швецыі — велічныя хвойныя лясы, якія пакрываюць тэрыторыі краін. Багацце нетраў дазволіла Швецыі стаць буйным экспарцёрам жалезнай руды. Раўнінны рэльеф, мяккі клімат і сакавітыя лугі Даніі з'яўляюцца ідэальнымі ўмовамі для развіцця ў гэтай краіне жывёлагадоўлі. Рыбалоўства ў Нарвегіі і Ісландыі, здабыча жалезнай руды ў Швецыі, лесапілаванне ў Фінляндыі, жывёлагадоўля ў Даніі — галіны міжнароднай спецыялізацыі. Аднак з другой паловы XX ст. ім ужо не належыць вызначальная роля ў гаспадарцы гэтых краін. Для іх характэрная эканоміка постіндустрыяльнага тыпу. Больш за 70 % ВУП краін фарміруецца ў сферы паслуг: навука, адукацыя і медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, гандаль, грамадскае харчаванне. На прамысловасць прыходзіцца каля 25 % ВУП, на сельскую гаспадарку — не больш за 5 %. Усе краіны ўваходзяць у групу найбольш эканамічна развітых краін свету.



Мал. 111. Здабыча нафты ў шэльфе Паўночнага мора

30.4. Прамысловасць. Краіны, за выключэннем Нарвегіі, бедныя на паліўныя рэсурсы. У яе шэльфавай зоне распрацоўваюцца буйныя радовішчы нафты і прыроднага газу (мал. 111). Па аб'ёмах іх здабычы Нарвегія лідзіруе ў Еўропе і з'яўляецца буйным экспарцёрам. Багатыя гідраэнергетычныя рэсурсы рэгіёна спрыяюць развіццю гідраэнергетыкі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У Нарвегіі на ГЭС выпрацоўваецца больш за 90 % спажыванай электраэнергіі. У Швецыі, багатай на ўранавыя руды, каля 50 % электраэнергіі вырабляецца на АЭС. Ва ўсіх краінах вялікая ўвага аддаецца развіццю альтэрнатыўнай энергетыкі.

Вядучая галіна апрацоўчай прамысловасці — ***машынабудаванне***. Найбольш маштабнае яно ў Швецыі, якая вырабляе аўтамабілі, электроніку і электратэхніку, станкі, абсталяванне для цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Ва ўсіх краінах, акрамя Ісландыі, прадстаўлена суднабудаванне.

Высокімі тэмпамі развіваецца ***каляровая металургія***, заснаваная на выкарыстанні таннай гідраэнергіі і асобных відаў мясцовай руднай сыравіны. Нарвегія — буйны вытворца першаснага алюмінію, Швецыя — медзі, свінцу і цынку, Фінляндыя — медзі, нікелю, хрому. Традыцыйнай галіной шведскай прамысловасці застаецца ***чорная металургія***, заснаваная на здабычы мясцовых жалезных руд.

с. 54–55

Вялікі ўклад у эканамічнае развіццё Фінляндыі, Швецыі і Нарвегіі ўносяць прадпрыемствы ***лясной***, ***дрэваапрацоўчай*** і ***цэлюлозна-папяровай прамысловасці***. Па аб'ёмах лесанарыхтовак, вытворчасці піламатэрыялаў, паперы і кардону Швецыя і Фінляндыя традыцыйна ўваходзяць у 10 вядучых краін свету. Галоўнымі эканамічнымі цэнтрамі рэгіёна з'яўляюцца сталічныя гарады.

30.5. Сельская гаспадарка. ***Жывёлагадоўля*** — галоўная галіна сельскай гаспадаркі краін Паўночнай Еўропы. Яна забяспечвае каля 70 % вытворчасці ўсёй таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі. Аснову жывёлагадоўлі складае развядзенне высокапрадукцыйнай буйной рагатай жывёлы малочнага і мяснога напрамкаў. Паўсюдна развіта беконная свінагадоўля і птушкагадоўля. У Ісландыі і Нарвегіі захавалася традыцыйнае для рэгіёна развядзенне авечак. У паўночных раёнах Нарвегіі і Фінляндыі насельніцтва займаецца аленегадоўляй.

Больш высокім узроўнем развіцця ***раслінаводства*** вылучаецца Данія. Тут вырошчваецца азімая пшаніца, бульба. У прыгарадных раёнах прадстаўлена садоўніцтва і агародніцтва. З іншых напрамкаў раслінаводства вылучаецца вырошчванне тэхнічных культур: цукровых буракоў у Даніі і лёну-даўгунцу ў Фінляндыі. У Ісландыі значных маштабаў дасягнула парнікова-цяплічная гаспадарка, заснаваная на выкарыстанні вады гарачых крыніц (мал. 112). ***Рыбалоўства*** — адзін з найстаражытнейшых заняткаў народаў Паўночнай Еўропы. Вядзецца лоўля селядца, траскі, макрэлі і крэветак.



Мал. 112. Цяплічная гаспадарка ў Ісландыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

30.6. Транспарт і знешні гандаль. Турызм. Вядучую ролю ў транспартных сістэмах усіх краін адыгрывае марскі транспарт. Нарвегія ўваходзіць у лік краін свету, якія валодаюць самым магутным гандлёвым флотам. Паміж галоўнымі партамі краін рэгіёна і суседніх дзяржаў наладжаны рэгулярныя паромныя пераправы, якія ажыццяўляюць перавозкі пасажыраў (мал. 113).



Мал. 113. Паромная пераправа паміж партамі рэгіёна

Аснову экспарту краін складаюць нафта і нафтапрадукты, піламатэрыялы, цэлюлоза і папера, прадукцыя машынабудавання (судны і аўтамабілі), жалезная руда, а таксама харчовыя тавары (рыба і рыбапрадукты, алей, сыры, напоі).

Маляўнічыя ландшафты, высокі ўзровень жыцця і палітычная стабільнасць робяць краіны Паўночнай Еўропы аднымі з найбольш прывабных для развіцця ***міжнароднага турызму***.

Абагульнім і запомнім. Для насельніцтва краін характэрныя нізкі натуральны прырост і працэсы старэння. Асноўная частка ВУП краін фарміруецца ў сферы паслуг. У прамысловасці краін рэгіёна вялікае значэнне маюць традыцыйныя галіны, звязаныя з выкарыстаннем прыродных рэсурсаў.

Праверым сябе. 1. На якія прыродныя рэсурсы багатыя краіны рэгіёна і якія традыцыйныя галіны гаспадаркі атрымалі тут развіццё? 2. Якія асаблівасці дэмаграфічных працэсаў у краінах рэгіёна? 3. Чым абумоўлена развіццё ў Нарвегіі алюмініевай прамысловасці? 4. Чаму жывёлагадоўля адыгрывае вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы краін рэгіёна?

Ад тэорыі да практыкі. Даведайцеся ў сваіх сваякоў і сяброў, з якой прадукцыяй, вырабленай у Швецыі, Нарвегіі, Данііі, яны знаёмыя.

Абмяркуем. Як вы лічыце, ці захаваюцца ў агляднай будучыні традыцыйныя галіны гаспадаркі краін Паўночнай Еўропы ў сувязі з узрастаннем патрабаванняў да аховы навакольнага асяроддзя?

§ 31. Літва, Латвія, Эстонія

Успамінаем. *Якімі асаблівасцямі характарызуецца эканоміка-геаграфічнае становішча краін Паўночнай Еўропы?*

Разважаем. *Які ўплыў на спецыялізацыю гаспадаркі аказвае прыморскае становішча?*

31.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Літва*, *Латвія* і *Эстонія* — невялікія па памерах тэрыторыі

с. 56

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

краіны Паўночнай Еўропы на ўсходнім узбярэжжы Балтыйскага мора (прыбалтыйскія дзяржавы, або краіны Балтыі). Латвія і Літва — непасрэдныя суседзі Беларусі. Клімат умераны марскі, спрыяльны для вядзення сельскай гаспадаркі. Больш за 40 % тэрыторыі пакрыта лясамі. З мінеральна-сыравінных рэсурсаў запасамі сланцаў вылучаецца Эстонія. На ўзбярэжжы Балтыйскага мора вядзецца здабыча бурштыну (мал. 114).



Мал. 114. Бурштын — «слёзы мора»

Прыморскае становішча, прыродныя ўмовы, суседства з рознымі па ўзроўні эканамічнага развіцця краінамі абумовілі гаспадарчую спецыялізацыю краін Балтыі. Праз іх тэрыторыю праходзяць найважнейшыя транспартныя шляхі паміж краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы, акваторыямі Балтыйскага і Паўночнага мораў. Паромныя пераправы найбольш кароткім шляхам злучаюць прыбалтыйскія дзяржавы з краінамі Паўночнай Еўропы, Польшчай і Германіяй.

31.2. Насельніцтва. Агульная колькасць насельніцтва ў трох краінах — каля 6 млн чалавек (Літва — 2,8 млн, Латвія — 1,9 млн, Эстонія — 1,3 млн). Дэмаграфічная сітуацыя ва ўсіх краінах характарызуецца як неспрыяльная. Ужо доўгі час адбываецца натуральнае змяншэнне насельніцтва (смяротнасць перавышае нараджальнасць). Назіраецца таксама міграцыйны адток насельніцтва. У выніку колькасць насельніцтва ўсіх трох краін скарачаецца. Сярэдняя шчыльнасць па еўрапейскіх мерках невысокая — 30–40 чал./км^2. Размешчана насельніцтва нераўнамерна: найбольш шчыльна заселены ўзбярэжжа і тэрыторыі вакол сталіц. Усюды высокі — каля 70 % — узровень урбанізацыі. Найбуйнейшымі па колькасці гарадамі з'яўляюцца сталіцы: *Рыга*, *Вільнюс* і *Талін*. У нацыянальным складзе пераважаюць этнічныя групы, якія далі назвы краінам: у Літве літоўцы складаюць 83 %, у Эстоніі эстонцы — 70 %, у Латвіі латышы — каля 60 %. Для ўсіх краін характэрны працэс старэння насельніцтва.

32.3. Гаспадарка. Эканамічныя рэформы, ажыццёўленыя пасля распаду СССР, спрыялі пераўтварэнню Латвіі, Літвы і Эстоніі ў дзяржавы з постіндустрыяльнай структурай гаспадаркі. У сектары паслуг ствараецца каля 70 % ВУП гэтых краін. Вышэй за ўсё доля прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў Літве (адпаведна 31 і 6 %).

с. 57 **Прамысловасць.** ***Энергетыка*** краін грунтуецца на мясцовай (гаручыя сланцы) і прывазной (нафта, нафтапрадукты, прыродны газ) сыравіне. Эстонія, якая выкарыстоўвае гаручыя сланцы, па вытворчасці электраэнергіі на душу насельніцтва знаходзіцца на ўзроўні развітых

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

краін Еўропы. У энергетыцы Латвіі вялікая роля гідраэлектрастанцый, пабудаваных на р. Даўгаве. У Літве дзейнічае ГЭС на р. Нямунас. Узровень развіцця ***хімічнай прамысловасці*** больш высокі ў Літве, дзе яна грунтуецца на прывазных прыродным газе і апатытах і прадуктах нафтаперапрацоўкі. Вырабляюцца азотныя і фосфарныя ўгнаенні, пластмасы і вырабы з іх. У Эстоніі пры вытворчасці азотных угнаенняў і фарбавальнікаў выкарыстоўваюць мясцовыя сланцы. Развіта бытавая хімія, у Латвіі — фармацэўтыка.

с. 56

Сучаснае ***машынабудаванне*** пераважна неметалаёмістае. Прадукцыя машынабудавання — радыётэхніка, прыборы і абсталяванне для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Вядуцца суднабудаванне і суднарамонт. ***Дрэваапрацоўчая*** і ***цэлюлозна-папяровая прамысловасць*** спецыялізуюцца на вытворчасці мэблі, паперы, будаўнічых вырабаў і канструкцый з дрэва. Прадукцыя ***лёгкай прамысловасці*** разнастайная — тэкстыльныя, трыкатажныя, швейныя вырабы, абутак. Ва ўсіх буйных гарадах Латвіі вырабляюць ільняныя тканіны. У ***харчовай прамысловасці*** развіты мясная, малочная і рыбная галіны. Лоўля рыбы вядзецца ў Балтыйскім моры і Атлантычным акіяне. Галоўнымі эканамічнымі цэнтрамі краін з'яўляюцца сталічныя гарады — Рыга, Талін, Вільнюс.



Мал. 115. На малочнай ферме ў Латвіі

Сельская гаспадарка краін Балтыі фермерскага тыпу з прыватным землеўладаннем. Вядучая галіна — ***жывёлагадоўля*** — спецыялізуецца на развядзенні буйной рагатай жывёлы малочнага (мал. 115), малочна-мяснога напрамкаў і свінагадоўлі (у тым ліку беконнай). Пагалоўе свіней перавышае пагалоўе буйной рагатай жывёлы. Па вытворчасці малака на душу насельніцтва краіны займаюць пазіцыі лідараў у свеце. Раслінаводства спецыялізуецца на вытворчасці кармавых, збожжавых і тэхнічных культур, гародніны. Каля 50 % пасяўных плошчаў адведзена пад кармавыя культуры. Са збожжавых апрацоўваюць ячмень і пшаніцу.

У Латвіі і Літве шырока распаўсюджаны пасевы лёну-даўгунцу і цукровых буракоў. Паўсюдна вырошчваюць бульбу і гародніну.

Прыбалтыка — гэта своеасаблівы турысцкі рэгіён. Да турысцкіх рэсурсаў Латвіі варта аднесці перш за ўсё Рыгу, Юрмалу і Сігулду. Вільнюс — сталіца Літвы, найбуйнейшы горад рэспублікі, прамысловы і культурны цэнтр. Важным яго архітэктурным ансамблем з'яўляецца Стары горад з вежай Гедыміна на Замкавай гары (мал. 116).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 116. Від на гістарычныя цэнтры сталіц краін Балтыі:
Талін (*а*); Рыга (*б*); Вільнюс (*в*)

Абагульнім і запомнім. Найважнейшай асаблівасцю эканоміка-геаграфічнага становішча Літвы, Латвіі і Эстоніі з'яўляецца шырокі выхад гэтых краін да Балтыйскага мора. Для дэмаграфічнага развіцця краін характэрныя натуральнае змяншэнне насельніцтва і агульнае памяншэнне яго колькасці. Аснову ВУП краін рэгіёна складаюць віды дзейнасці сферы паслуг. У гаспадарцы краін важную ролю адыгрываюць галіны, звязаныя з морам: суднабудаванне, рыбная прамысловасць, марскі транспарт, турызм.

Праверым сябе. 1. У чым асаблівасць геаграфічнага становішча Літвы, Латвіі і Эстоніі? 2. Якія асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі ў краінах Балтыі? 3. Які ўплыў на размяшчэнне насельніцтва і спецыялізацыю гаспадаркі аказвае прыморскае становішча рэгіёна? 4. Якія галіны складаюць аснову прамысловай вытворчасці краін Балтыі? 5. Якімі асаблівасцямі характарызуецца сельская гаспадарка краін Балтыі?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы карты атласа, растлумачце, чаму перавага ў экспарце грузаў з Беларусі аддаецца партам краін Балтыі, а не Расіі ці Украіны.

§ 32. Краіны Заходняй Еўропы. Германія

Успамінаем. *Якія асаблівасці федэратыўнай формы палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржаў?*

Разважаем. *Якое значэнне для Германіі мела аб'яднанне ў 1990 г. ФРГ, ГДР і Заходняга Берліна?*

32.1. Краіны Заходняй Еўропы. У склад рэгіёна Заходняя Еўропа ўваходзяць найбольш развітыя ў сацыяльна-эканамічных адносінах краіны. Для іх характэрная гаспадарка постіндустрыяльнага тыпу. За кошт відаў дзейнасці сферы паслуг фарміруецца больш за 70 % ВУП гэтых краін.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вядучымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца машынабудаванне і хімічная прамысловасць. Інтэнсіўная сельская гаспадарка характарызуецца высокім узроўнем механізацыі і прадукцыйнасці працы.

Постіндустрыяльная гаспадарка — гаспадарка краіны, рэгіёна або свету, у якой вядучая роля ў фарміраванні ВУП належыць відам дзейнасці, што адносяцца да сферы паслуг.

Заходняя Еўропа — адзін з найбольш урбанізаваных рэгіёнаў свету. Дэмаграфічныя працэсы характарызуюцца нізкім натуральным прыростам насельніцтва, высокай працягласцю жыцця. Удзельная вага людзей ва ўзроставай групе да 15 гадоў скарачаецца, а ва ўзросце пасля 64 гадоў — узрастае.

32.2. ЭГП, прыродныя ўмовы і рэсурсы Германіі. Паўночнае ўзбярэжжа *Германіі* абмываюць воды Паўночнага і Балтыйскага мораў. Паўднёвая мяжа праходзіць у глыбіні Еўропы па перадгор'ях Альпаў. *(Па карце атласа вызначце памежныя дзяржавы.)*

с. 50

Значныя памеры тэрыторыі, умерана марскі клімат, які на ўсходзе краіны пераходзіць ва ўмерана кантынентальны, спалучэнне раўніннага і горнага рэльефу абумовілі разнастайнасць прыродных умоў і рэсурсаў Германіі. Нетры краіны багатыя на радовішчы вугалю (*Рурскі басейн*), каменнай солі. Краіна забяспечана рэсурсамі паверхневых і падземных вод. Каля 30 % тэрыторыі пакрыта лясамі. Глебы спрыяльныя для вырошчвання разнастайных сельскагаспадарчых культур.



Мал. 117. Імігранты ў Берліне

32.3. Насельніцтва. Па колькасці насельніцтва (83 млн чалавек) Германія займае 1-е месца ў Еўропе (без Расіі). На працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў смяротнасць (11 ‰) пастаянна перавышала нараджальнасць (9 ‰) і каэфіцыент натуральнага прыросту насельніцтва ў Германіі быў адмоўным (–2 ‰). Агульная колькасць насельніцтва Германіі расце за кошт прытоку імігрантаў (мал. 117).

Этнічны склад насельніцтва Германіі аднастайны: больш за 90 % жыхароў краіны — немцы. Пераважная рэлігія — хрысціянства, прыкладна ў роўных прапорцыях прадстаўлены пратэстанты (галоўным чынам лютэране) і католікі. Германія — адна з найбольш густанаселеных краін Еўропы. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва складае 230 чал./км^2. *(Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначце раёны з падвышанай шчыльнасцю насельніцтва і растлумачце прычыны іх утварэння.)*

с. 51

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Узровень урбанізацыі складае больш за 80 %. Гарады *Берлін* (3,5 млн чал.), Гамбург (1,6 млн) і Мюнхен (1,2 млн чал.) з'яўляюцца ядрамі найбуйнейшых агламерацый. У мегалаполісе Рэйн-Рур пражывае каля 11 млн чалавек (мал. 118).



Мал. 118. Схема мегалаполіса Рэйн-Рур

с. 58

32.4. Гаспадарка. Германія — высокаразвітая краіна з гаспадаркай постіндустрыяльнага тыпу. У структуры ВУП удзельная вага сферы паслуг складае 78 %, прамысловасці — 20 %, сельскай гаспадаркі — 2 %. Вядучае месца ў матэрыяльнай вытворчасці займае прамысловасць. Германія — адзін з сусветных лідараў па вытворчасці і экспарце прадукцыі арганічнай хіміі, станкоў, аўтамабіляў. Больш за 30 % прамысловай прадукцыі экспартуецца. Гаспадарчы комплекс краіны моцна інтэграваны ў еўрапейскую эканоміку.

У прамысловасці Германіі вядучая роля належыць апрацоўчай вытворчасці. Найбольшай маштабнасцю і комплекснасцю структуры характарызуецца ***машынабудаванне***, каля 40 % прадукцыі якога экспартуецца. Нямецкае аўтамабілебудаванне па аб'ёмах вытворчасці саступае толькі амерыканскаму (ЗША), японскаму і кітайскаму (мал. 119). Германія ўпэўнена займае 2-е месца ў свеце як па экспарце (13 %), так і па імпарце (7 %) прадукцыі шматгаліновай ***хімічнай прамысловасці***. Доўгі час яна развівалася на аснове вугальнай сыравіны, таму вытворчасці азотных угнаенняў, выбуховых рэчываў, сінтэтычных смол, каўчуку, пластмас размешчаны ў раёнах здабычы вугалю. Развіццё нафтахіміі абумовіла зрух вытворчасцей да мора.



Мал. 119. Аўтамабілебудаванне ў Германіі:
галоўны офісны будынак «БМВ» у Мюнхене (*а*); зборачны канвеер (*б*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 59 У сувязі з памяншэннем мінеральна-сыравінных рэсурсаў, а таксама ўзмацненнем экалагічных патрабаванняў да прамысловай вытворчасці ў краіне практычна зніклі жалезарудныя, медная, уранавая галіны, скарацілася здабыча вугалю. Гэтыя працэсы прывялі да ўзнікнення эканамічных і сацыяльных праблем у старых прамысловых раёнах, адным з якіх быў Рур.

Улады краіны распрацавалі комплекс мер па мадэрнізацыі вядучых галін, іх тэхнічнай пераасnашчанасці. У канцы 80-х гг. XX ст. 60 % усіх занятых у Руры былі звязаны з невытворчай сферай. Гэты раён, які перажыў своеасаблівую «рэанімацыю», цяпер знаходзіцца ў стадыі «выздараўлення». Перспектывы яго далейшага развіцця звязаны з сучаснай, арыентаванай на выпуск высакаякасных сталей, чорнай металургіяй, навукаёмістым машынабудаваннем, фармацэўтычнай прамысловасцю.

с. 58–59 *(Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначце яшчэ галіны прамысловасці, якія атрымалі развіццё ў Германіі, і асаблівасці іх размяшчэння.)* Найбуйнейшымі эканамічнымі цэнтрамі Германіі з'яўляюцца гарады Берлін, Гамбург, Мюнхен і Кёльн.

У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 35 % зямель і вырабляецца каля 2 % ВУП краіны. Асноўную (70 %) частку прадукцыі сельскай гаспадаркі вырабляе ***жывёлагадоўля***, якая спецыялізуецца на развядзенні буйной рагатай жывёлы пераважна малочнага напрамку. Развіта свінагадоўля. Па пагалоўі свіней краіна лідзіруе ў Еўропе. Жывёлагадоўля практычна цалкам задавальняе патрэбы краіны ў мясной і малочнай прадукцыі.

Раслінаводства адыгрывае падпарадкавальную ролю і спецыялізуецца пераважна на вытворчасці кармоў: кармавых караняплодаў, кукурузы на зялёны корм, кармавых траў. Сярод збожжавых дамінуюць жыта, пшаніца, авёс, ячмень. Спецыяльныя гатункі ячменю вырошчваюць для вытворчасці піва.

Сярод іншых напрамкаў вылучаецца вытворчасць цукровых буракоў, бульбы. Баварыя — найбуйнейшы ў свеце раён хмелеводства. З алейных культур вырошчваюць рапс, сланечнік. На захадзе і поўдні Германіі развіта вінаградарства.

Транспарт, гандаль і турызм. Германія валодае густой і раўнамерна размеркаванай транспартнай сеткай. Цэнтральнае становішча ў Еўропе, інтэнсіўнасць гаспадарчых сувязей з суседнімі краінамі вызначаюць вялікую долю трансгранічных перавозак. Пры такіх перавозках грузы і пасажыры перамяшчаюцца праз тэрыторыю Германіі ў іншыя краіны. У сумарным грузаабароце лідзіруе аўтамабільны транспарт. Далей ідуць чыгуначны, унутраны водны і трубаправодны. У пасажыраабароце дамінуе аўтамабільны транспарт.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Германія займае 3-е месца ў свеце пасля ЗША і Кітая па аб'ёме знешняга гандлю. Яе доля ў сусветным экспарце тавараў складае 10 %. У структуры экспарту пераважае прадукцыя машынабудавання і хімічнай прамысловасці. У імпарце, акрамя гатовай прадукцыі, вялікая ўдзельная вага нафты і газу, металургічнай сыравіны, прадуктаў харчавання.

Турыстаў з усяго свету прыцягваюць помнікі архітэктуры і культурныя каштоўнасці гарадоў Германіі (Лейпцыг, Дрэздэн, Берлін), маляўнічыя ландшафты прыморскіх і горных раёнаў.

Абагульнім і запомнім. У склад рэгіёна Заходняя Еўропа ўваходзяць найбольш развітыя ў сацыяльна-эканамічных адносінах краіны. ЭГП Германіі характарызуецца цэнтральным становішчам у Еўропе. У постіндустрыяльнай эканоміцы Германіі вядучая роля належыць сферы паслуг, а ў прамысловасці — машынабудаванню і хімічнай вытворчасці.

Праверым сябе. 1. У чым выгаднасць эканоміка-геаграфічнага становішча Германіі? 2. Якія асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі ў Германіі? 3. Якія змены адбываюцца ў галіновай структуры прамысловасці Германіі і чым яны абумоўлены? 4. Чым тлумачыцца пераважна жывёлагадоўчая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Германіі?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначце, з якіх рэгіёнаў свету Германія атрымлівае неабходныя для яе гаспадарчага развіцця паліўныя рэсурсы — нафту і прыродны газ?

Абмяркуем. Германію часта называюць «лакаматывам» еўрапейскай эканомікі. Якія, на ваш погляд, ёсць падставы для такога сцвярджэння?

§ 33. Францыя

Успамінаем. *У якіх краінах значнае развіццё атрымала атамная энергетыка?*

Разважаем. *Які ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі краіны можа аказваць вялікая па памерах тэрыторыя і разнастайныя прыродныя ўмовы?*

33.1. ЭГС, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Тэрыторыя Францыі шырокім масівам распасціраецца на захадзе Еўропы. Палова межаў краіны — марскія, яны адкрываюць ёй выхады да вод Атлантычнага акіяна і Міжземнага мора, а палова — сухапутныя. На сушы суседзямі Францыі з'яўляюцца высокаразвітыя ў эканамічных адносінах краіны Заходняй

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і Паўднёвай Еўропы. Па памерах тэрыторыі Францыя саступае ў Еўропе толькі Украіне (без уліку Расіі).

Францыя — раўнінная краіна. Значная частка тэрыторыі знаходзіцца ў межах старажытнага складкаватага пояса, якому адпавядаюць невысокія горныя масівы. Самы шырокі з іх — Цэнтральны Французскі масіў. Паўднёвы ўсход знаходзіцца ў межах маладога складкаватага пояса. У размешчаных тут Альпах праходзяць межы Францыі з Італіяй і Швейцарыяй. У нетрах краіны ёсць радовішчы ўрану, руд чорных і каляровых металаў (баксітаў, медзі, волава), каменнай солі, фасфарытаў, іншых карысных выкапняў.

Клімат умераны марскі, які на ўсходзе пераходзіць ва ўмерана кантынентальны. На паўднёвым узбярэжжы клімат субтрапічны. Рэкі Францыі адносяцца да басейна Атлантычнага акіяна і бяруць свой пачатак пераважна ў горных раёнах. Усе яны, уключаючы Рэйн, злучаны паміж сабой сістэмай каналаў і ў якасці ўнутраных водных шляхоў маюць вялікае значэнне для эканомікі Францыі. Каля 30 % тэрыторыі краіны займаюць лясы. Астатняя частка — пераважна сельскагаспадарчыя ўгоддзі з урадлівымі глебамі.

33.2. Насельніцтва Францыі складае 65 млн чалавек. Па гэтым паказчыку ў Еўропе яна саступае толькі Германіі і супастаўная з Вялікабрытаніяй. Нізкі, але станоўчы каэфіцыент натуральнага прыросту насельніцтва (3 ‰) абумоўлены высокай нараджальнасцю сярод шматлікіх імігрантаў з былых калоній. Удзельная вага асоб замежнага паходжання, якія не з'яўляліся грамадзянамі Францыі на момант нараджэння, перавышае 10 %.

Для краіны характэрны высокі ўзровень урбанізацыі. Гараджане складаюць 77 % насельніцтва. Найбольш буйнымі агламерацыямі з'яўляюцца Парыж, Марсель, Ліён і Ліль. У Вялікім Парыжы пражывае каля 11 млн чалавек (17 % насельніцтва краіны). Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва ў параўнанні з многімі еўрапейскімі краінамі невысокая — 110 чал./км^2. Каля 80 % насельніцтва складаюць французы, астатнія 20 % — нацыянальныя меншасці (брэтонцы, карсіканцы, эльзасцы) і імігранты. Абсалютная большасць вернікаў — католікі.


с. 60

33.3. Гаспадарка краіны мае постіндустрыяльную галіновую структуру. На сферу паслуг прыходзіцца 80 % ВУП краіны. У шматгалінавай прамысловасці (18 % ВУП) вядучая роля належыць машынабудаванню і хімічнай прамысловасці. У сельскай гаспадарцы ствараецца 2 % ВУП. Францыя ўваходзіць у групу найбольш эканамічна развітых краін свету.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прамысловасць. ***Энергетыка*** Францыі функцыянуе ва ўмовах востра-га недахопу ўласных паліўных рэсурсаў. Аднак наяўнасць буйных запасаў уранавай сыравіны спрыяла развіццю атамнай электраэнергетыкі. На АЭС выпрацоўваецца 77 % электраэнергіі.

Металургія, якая некалі мела вырашальнае значэнне ў структуры прамысловасці, сёння яго страціла. Выкарыстанне пераважна імпартнай сыравіны абумовіла зрух вытворчасці ў прыморскія раёны. Буйныя металургічныя камбінаты працуюць у партовых цэнтрах — Дзюнкерка і ў раёне Марселя.

Каля 40 % кошту прадукцыі апрацоўчай прамысловасці забяспечвае машынабудаванне. Вядучую ролю ў ім адыгрывае транспартнае машынабудаванне, якое спецыялізуецца на вытворчасці аўтамабіляў, авіяцыйнай і ракетнай тэхнікі, у меншай ступені — суднаў. Найбуйнейшыя цэнтры размешчаны ў Ліёнскай і Парыжскай агламерацыях. Па вытворчасці прадукцыі авіяракетнай прамысловасці (цэнтры Тулуза, Бардо, Буржэ) Францыя лідзіруе ў Еўропе (мал. 120).



Мал. 120. Авіяцыйны завод у Тулузе

У лік найбольш развітых галін уваходзіць ***хімічная*** прамысловасць. Францыя — адзін з найбуйнейшых у свеце вытворцаў хімічнай і нафтахімічнай прадукцыі, у тым ліку каўстычнай соды, сінтэтычнага каўчуку, пластмас, мінеральных угнаенняў, фармацэўтычных тавараў. Вялікай вядомасцю на сусветным рынку карыстаюцца французская парфумерыя і касметыка. Галоўныя эканамічныя цэнтры Францыі — гарады Парыж, Марсель, Ліён, Тулуза.

Сельская гаспадарка. Францыя — адзін з найбуйнейшых у Еўропе вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Яна ўваходзіць у групу сусветных лідараў па пагалоўі буйной рагатай жывёлы, свіней, птушкі, вытворчасці малака, яек, мяса. У структуры сельскай гаспадаркі Францыі суадносіны раслінаводства і жывёлагадоўлі прыкладна роўныя.

У ***раслінаводстве*** вядучай з'яўляецца збожжавая гаспадарка. Занальнае размяшчэнне характэрнае для пасеваў пшаніцы, кукурузы і ячменю. Значныя пасевы бульбы і цукровых буракоў, па вытворчасці якіх Францыя — сусветны лідар. Асноўны раён іх вытворчасці — Паўночна-Французская нізіна, тут жа размяшчаецца і большасць цукровых заводаў. Паўсюдна развіта агародніцтва і пладаводства. Францыі належыць 2-е месца ў свеце па вытворчасці вінных гатункаў вінограду. Галоўны раён вінаградарства — Лангедок. Асноўная частка ўраджаю выкарыстоўваецца ў вінаробстве. Марачныя віны вырабляюцца ў раёне Бардо, у Шампані, даліне ракі Луары.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Галоўная галіна ***жывёлагадоўлі*** — развядзенне буйной рагатай жывёлы мяса-малочнага напрамку. Развіты птушкагадоўля, свінагадоўля і конегадоўля.

33.4. Геаграфія і развіццё сферы паслуг. Найбольшае значэнне ў сферы паслуг краіны мае фінансавая дзейнасць. Па ўзроўні канцэнтрацыі банкаўскай дзейнасці Францыя ўваходзіць у лік вядучых сусветных дзяржаў. З 50 найбуйнейшых банкаў свету шэсць французскія.



Мал. 121. Парыж з вышыні птушынага палёту

Адной з найбольш развітых і збалансаваных у свеце з'яўляецца транспартная сістэма Францыі. Ва ўнутраных пасажыра- і грузаперавозках лідзіруюць аўтамабільны і чыгуначны транспарт. Большасць гарадоў звязаны паміж сабой сеткай высакаскорасных магістралей. Найбуйнейшым транспартным вузлом краіны з'яўляецца Парыж (мал. 121). Ад яго ў радыяльным напрамку разыходзяцца найважнейшыя аўтамабільныя і чыгуначныя шляхі, якія злучаюць Парыж з найбуйнейшымі гарадамі Францыі і сталіцамі іншых еўрапейскіх дзяржаў. У Парыжы знаходзяцца і найбуйнейшыя міжнародныя аэрапорты. Марскі і авіятранспарт абслугоўваюць пераважна знешнія сувязі. Галоўныя марскія парты — Гаўр, Бардо, Марсель. Імпарт вялікіх аб'ёмаў нафты і газу абумовіў развіццё разгалінаванай сістэмы трубаправодаў.



мал. 122. Блакітны Бераг. Ніца

Францыя — сусветны лідар па развіцці ***турызму***. Штогод яе наведвае больш за 80 млн замежных турыстаў, якія накіроўваюцца на французскае Міжземнамор'е, французскія Альпы і ў Парыж — найбуйнейшы цэнтр не толькі замежнага, але і ўнутранага турызму. Галоўны міжземнаморскі турысцка-рэкрэацыйны раён Францыі — Французская Рыўера, або Блакітны Бераг (участак узбярэжжа, які працягнуўся на 2300 км ад Тулона да Ментоны каля франка-італьянскай мяжы) (мал. 122).

Абагульнім і запомнім. Асаблівасцю ЭГС Францыі з'яўляецца наяўнасць працяглых участкаў марской і сухапутнай мяжы і суседства з эканамічна высокаразвітымі краінамі. Для краіны характэрныя высокі ўзровень урбанізацыі і пражыванне значнай часткі насельніцтва ў Парыжскай агламерацыі. Асноўная частка ВУП краіны ствараецца ў сферы паслуг. Францыя з'яўляецца сусветным лідарам у развіцці міжнароднага турызму.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым сябе. 1. Якімі асаблівасцямі характарызуецца ЭГС Францыі? 2. Чым абумоўлена разнастайнасць прыродных умоў і рэсурсаў краіны? 3. Які ўплыў на дэмаграфічныя працэсы ў краіне аказвае міжнародная міграцыя насельніцтва? 4. Чым абумоўлена развіццё ў Францыі атамнай энергетыкі? 5. Якія фактары абумовілі еўрапейскае лідарства Францыі ў вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі? 6. Якое значэнне ў гаспадарчым развіцці Францыі мае сфера паслуг?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы атлас, вызначце, з якімі найбуйнейшымі гарадамі Францыі і іншых дзяржаў звязаны Парыж аўтамабільнымі і чыгуначнымі магістралямі.

Для дапытлівых. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначце заморскія тэрыторыі Францыі і ў якіх рэгіёнах свету яны знаходзяцца.

§ 34. Краіны Паўднёвай Еўропы. Італія

Успамінаем. *З курса гісторыі ўспомніце, які ўплыў аказалі народы і дзяржавы Міжземнамор'я на станаўленне і развіццё чалавечай цывілізацыі.*

Разважаем. *Якія станоўчыя і адмоўныя рысы для размяшчэння насельніцтва і гаспадарчай дзейнасці мае горны характар тэрыторыі?*

34.1. Краіны Паўднёвай Еўропы. Рэгіён Паўднёвая Еўропа часта называюць еўрапейскім Міжземнамор'ем. Краіны, якія ўваходзяць у яго, размешчаны на буйных паўастравах (Пірэнейскім, Апенінскім, Балканскім) і астравах, што абмываюцца водамі Міжземнага мора. Рэгіён размяшчаецца ў субтрапічным геаграфічным поясе. Бар'ерам высокіх гор яго тэрыторыя адгароджана ад кантынентальнай Еўропы. Ад Азіі і Афрыкі рэгіён аддзяляюць вузкія пралівы Дарданэлы, Басфор і Гібралтарскі. Для ўсіх краін характэрны горны рэльеф. Асаблівасці геаграфічнага становішча адыгралі важную ролю ў гісторыі Паўднёвай Еўропы. Краіны моцна адрозніваюцца адна ад адной маштабамі і ўзроўнем гаспадарчага развіцця.

34.2. Італія. ЭГС, прыродныя ўмовы і рэсурсы. ЭГС ***Італіі*** характарызуецца прыморскім становішчам большай часткі тэрыторыі і блізкасцю да менш развітых у эканамічных адносінах краін Паўночнай Афрыкі. Сухапутныя межы з еўрапейскімі краінамі (Францыяй, Швейцарыяй, Аўстрыяй, Славеніяй) праходзяць у асноўным па цяжкадаступных горных раёнах. Перавагі горнага рэльефу абумовілі рассяленне насельніцтва і фарміраванне буйных гаспадарчых цэнтраў у асноўным у далінах рэк і ўздоўж марскога ўзбярэжжа.

Італія не валодае значнымі запасамі мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Маюцца радовішчы свінцу, цынку, жалезнай руды, баксітаў. Вядзецца здабыча серы, каменнай солі. Найбольш шырока прадстаўлена сыравіна

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў: вапнякі і мармур. Нетры краіны бедныя на гаручыя карысныя выкапні.

Міжземнаморскі клімат спрыяе вырошчванню субтрапічных сельскагаспадарчых культур, у тым ліку вінаграду. У спалучэнні з горным рэльефам і прыморскім становішчам ён стварае выдатныя ўмовы для развіцця турызму. Уплыў Міжземнага мора на клімат краіны ўзмацняецца Альпамі, якія з'яўляюцца бар'ерам для паўночных і заходніх вятроў.

34.3. Насельніцтва. Агульная колькасць насельніцтва краіны — 61 млн чалавек. Па этнічным складзе насельніцтва Італія аднанацыянальная краіна. Удзельная вага італьянцаў у агульнай колькасці насельніцтва перавышае 90 %. Практычна ўсе вернікі — католікі. На тэрыторыі сталіцы Італіі, Рыма, знаходзіцца дзяржава Ватыкан з рэзідэнцыяй папы рымскага — духоўнага лідара ўсіх католікаў свету (мал. 123).



Мал. 123. Плошча Святога Пятра (Ватыкан)



Мал. 124. Паданская раўніна (Італія)

Для краіны характэрны нізкі натуральны прырост насельніцтва. Сярэдняя працягласць жыцця высокая і набліжаецца да 80 гадоў. Гараджанамі з'яўляюцца больш за 90 % насельніцтва. Значная іх частка жыве ў невялікіх гарадах, многія з якіх заснаваны ў старажытнасці. Багацце помнікаў гісторыі і архітэктуры прыцягвае сюды турыстаў з усяго свету.

Італія — краіна з высокай шчыльнасцю насельніцтва (каля 200 чал./км^2) і нераўнамерным яго размяшчэннем па тэрыторыі. Найбольш заселенымі з'яўляюцца ўрадлівая Паданская раўніна і Прыморскія нізіны (мал. 124).

34.4. Гаспадарка. Італія ўваходзіць у групу краін з найбольш высокім узроўнем эканамічнага развіцця. Для яе характэрная эканоміка постіндустрыяльнага тыпу. У сферы паслуг ствараецца больш за 70 % ВУП краіны, у прамысловасці — 27 %, у сельскай гаспадарцы — 3 %.

На фарміраванне структуры **прамысловасці** Італіі і яе размяшчэнне істотны ўплыў аказвае адсутнасць буйных запасаў нафты і прыроднага газу, а таксама вычэрпванне ўласных радовішчаў рудных карысных

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

выкапняў. Патрэбы энергетыкі ў мінеральным паліве забяспечваюць пастаўкі з краін Паўночнай Еўропы, Расіі, Паўночнай Афрыкі і Заходняй Азіі.

Асноўная частка электраэнергіі вырабляецца на ЦЭС. У горных раёнах атрымала развіццё гідраэлектраэнергетыка, на Апенінскім паўвостраве актыўна выкарыстоўваецца сонечная энергія. Частка электраэнергіі, якой не хапае, набываецца ў суседніх Германіі і Францыі. У партовых гарадах, куды дастаўляецца імпартная нафта, пабудаваны буйныя прадпрыемствы ***нафтаперапрацоўкі*** і ***нафтахіміі***. Тут жа размешчаны асноўныя прадпрыемствы ***чорнай металургіі***. Італія займае 2-е месца сярод краін Еўрапейскага саюза (пасля Германіі) па аб'ёмах выплаўлення сталі.

с. 52

Вядучай галіной прамысловасці з'яўляецца ***машынабудаванне***, аснова якога — аўтамабілебудаванне і станкабудаванне. Высокімі тэмпамі развіваюцца электроніка і электратэхніка, прыборабудаванне. Сусветную вядомасць маюць маркі італьянскіх халадзільнікаў і пральных машын, камп'ютараў і аргтэхнікі. Традыцыйна ў эканоміцы Італіі вялікае значэнне маюць ***лёгкая*** і ***харчовая прамысловасць***. Краіна з'яўляецца буйным вытворцам баваўняных і ваўняных тканін, трыкатажу, адзення і абутку, мэблі, ювелірных вырабаў. Харчовая прамысловасць спецыялізуецца на вытворчасці макаронаў, аліўкавага алею, вінаградных він, агародніннных і фруктовых кансерваў, сокаў. Багатыя сыравінныя запасы спрыяюць развіццю вытворчасці ***будаўнічых матэрыялаў*** і цэменту. Значная частка прадукцыі (абліцовачная плітка, мармур) экспартуецца. Найбуйнейшымі эканамічнымі цэнтрамі Італіі з'яўляюцца гарады Рым, Мілан, Турын.



Мал. 125. Сельскагаспадарчыя культуры: вінаград (*а*); аліва (*б*)

Сельская гаспадарка. Вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы краіны адыгрывае ***раслінаводства***. Міжземнаморскі клімат і штучнае арашэнне дазваляюць вырошчваць самыя разнастайныя сельскагаспадарчыя культуры. А наяўнасць па суседстве шырокага еўрапейскага рынку збыту спрыяе іх вытворчасці ў вялікіх аб'ёмах. Найбольш характэрныя культуры — алівы (масліны) і вінаград (мал. 125).

Паўсюдна вырошчваюць разнастайную гародніну і садавіну. Субтрапічныя культуры (інжыр, цытрусавыя) экспартуюцца. Збожжавыя (пшаніца, ячмень, рыс), бабовыя і бахчавыя культуры вырошчваюць пераважна

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

для ўласных патрэб. З тэхнічных культур найбольшае значэнне маюць цукровыя буракі і тытунь.

У краіне прадстаўлены ўсе асноўныя галіны ***жывёлагадоўлі***: развядзенне буйной і дробнай (авечак, коз) рагатай жывёлы, свіней, птушкі. Для ўрадлівых нізін, перш за ўсё Падanскай, характэрна інтэнсіўная стойлавая жывёлагадоўля. Тут, а таксама ў прыгарадных зонах, вядзецца малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля і птушкагадоўля. Развіццё сельскай гаспадаркі стрымлівае востры дэфіцыт зямельных рэсурсаў, а жывёлагадоўлі — недахоп кармавых рэсурсаў.

Транспарт. Італія размешчана на скрыжаванні важных міжнародных транспартных шляхоў, якія праходзяць праз Міжземнае мора. Таму ў знешніх (больш за 70 % грузаабароту) і ва ўнутраных (кабатажных) грузавых перавозках вялікая роля належыць марскому транспарту. Ва ўнутраных перавозках грузаў і пасажыраў вядучыя пазіцыі займае аўтамабільны транспарт. Галоўная аўтамагістраль — «аўтастрада Сонца» — звязвае Турын і Мілан з самым паўднёвым горадам паўвострава — Рэджадзі-Калабрыя. Праз пабудаваныя ў гарах тунэлі ажыццяўляюцца сувязі з кантынентальнымі раёнамі Еўропы.

Турызм. Прыродныя, гістарычныя і культурныя славутасці Італіі прыцягваюць шматлікіх турыстаў з усяго свету. На іх абслугоўванне арыентавана сфера паслуг. Італія ўваходзіць у пяцёрку краін — лідараў у свеце па наведванні міжнароднымі турыстамі. Штогод краіну ў турысцкіх мэтах наведвае больш за 40 млн чалавек. У Італіі знаходзяцца 53 аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта 5 % ад іх агульнай колькасці ў свеце (мал. 126).

Для Італіі, як і для многіх краін Еўропы, характэрна істотнае адрозненне ва ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця паміж рознымі часткамі краіны. Прамысловая Поўнач на працягу доўгага часу адыгрывае вядучую ролю ў эканоміцы краіны. Яна значна апярэджвае ў сваім развіцці пераважна аграрны Поўдзень. На поўначы Італіі размешчаны



Мал. 126. Аб'екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА у Італіі:
гістарычны цэнтр Фларэнцыі (*а*); Венецыя (*б*); гістарычны цэнтр Рыма (*в*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры — *Мілан, Турын, Генуя*, якія ўтвараюць своеасаблівы «прамысловы трохвугольнік». Тут вырабляецца больш як 2/5 усёй прамысловай прадукцыі, сканцэнтраваны самыя сучасныя галіны: аўтамабілебудаванне, электроніка, хімічная прамысловасць.

Прамысловасць Поўдня Італіі прадстаўлена прадпрыемствамі па вытворчасці тэкстыльнай, швейнай прадукцыі, прадуктаў харчавання. Як вывад, для поўдня краіны характэрны больш высокі ўзровень беспрацоўя, тут ніжэйшы ўзровень жыцця насельніцтва. У апошнія гады ў Італіі праводзіцца палітыка па выраўноўванні ўзроўняў эканамічнага развіцця Поўначы і Поўдня. У паўднёвых партовых гарадах на базе прывазной сыравіны пабудаваны буйныя нафтаперапрацоўчыя і металургічныя камбінаты.

Абагульнім і запомнім. Краіны Паўднёвай Еўропы размешчаны на буйных паўастравах і астравах, абмываных водамі Міжземнага мора. ЭГС Італіі характарызуецца прыморскім становішчам большай часткі тэрыторыі і блізкасцю да менш развітых у эканамічных адносінах краін Паўночнай Афрыкі. Для насельніцтва Італіі характэрныя нізкі натуральны прырост і высокая сярэдняя працягласць жыцця. Вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы краіны адыгрывае раслінаводства. Галіной міжнароднай спецыялізацыі Італіі з'яўляецца турызм.

Праверым сябе. 1. Назавіце галоўныя рысы ЭГС, прыродных умоў і рэсурсаў краін Паўднёвай Еўропы. 2. Якія асаблівасці этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва Італіі? 3. Якія галіны прамысловасці атрымалі развіццё ў Італіі? 4. Чаму буйныя прадпрыемствы апрацоўчай прамысловасці размяшчаюцца ў партовых гарадах? 5. На вытворчасці якой прадукцыі спецыялізуецца сельская гаспадарка Італіі?

Ад тэорыі да практыкі. Улічваючы беднасць Італіі на паліўна-энергетычныя рэсурсы і асаблівасці прыроды краіны, прапануйце найбольш перспектыўныя напрамкі развіцця яе энергетыкі.

Абмяркуем. На працягу стагоддзяў у краінах Паўднёвай Еўропы эміграцыя пераважала над іміграцыяй. У эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў адбывалася масавая эміграцыя ў заморскія краіны. Затым — у больш развітыя ЗША, Канаду, Аўстралію, у краіны Заходняй і Паўночнай Еўропы. Інтэнсіўныя былі ўнутраныя міграцыі — з слабаразвітых сельскагаспадарчых абласцей у буйныя прамысловыя раёны і цэнтры. Цяпер сітуацыя змянілася. У пошуках працы і лепшага жыцця ў краіны рэгіёна накіраваліся імігранты з Паўночнай Афрыкі, Усходняй Еўропы і Блізкага Усходу. Барацьба з нелегальнай іміграцыяй — адна з самых вострых праблем у рэгіёне. Якім вам бачыцца вырашэнне гэтай праблемы?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 35. Краіны Усходняй Еўропы. Польшча

Успамінаем. *Якія падзеі абумовілі значнае павелічэнне колькасці незалежных дзяржаў у Еўропе ў канцы XX ст.?*

Разважаем. *Які ўплыў на гаспадарчае развіццё краіны аказвае суседства з больш магутнай па маштабах эканомікі і ўзроўні развіцця дзяржавай?*

35.1. Краіны Усходняй Еўропы. У склад рэгіёна Усходняя Еўропа ўваходзіць 10 краін, уключаючы Расію. Гэтыя краіны аб'ядноўвае не толькі агульнасць геаграфічнага становішча, але і падабенства гістарычнага развіцця. Пасля адмовы ад сацыялістычнага шляху развіцця ва ўсіх краінах Усходняй Еўропы праводзіліся эканамічныя рэформы, вынікі якіх для гаспадарчага развіцця аказаліся неаднолькавымі. Таму для рэгіёна характэрны істотныя адрозненні ва ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця.

35.2. Польшча. ЭГС, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Польшча* (сталіца *Варшава*) размешчана паміж Германіяй на захадзе, Расіяй, Літвой, Беларуссю і Украінай — на ўсходзе. На поўначы яна шырока (амаль 500 км) выходзіць да Балтыйскага мора, а на поўдні — па сярэднявысотных Судэтах і Карпатах — мяжуе з унутрыкантынентальнымі Чэхіяй і Славакіяй. Праз тэрыторыю Польшчы праходзяць найважнейшыя транс'еўрапейскія камунікацыйныя калідоры, якія злучаюць Расію, Беларусь і Украіну з Заходняй Еўропай, а дзяржавы Паўночнай і Паўднёвай Еўропы — паміж сабой. Чэхія і Славакія шырока выкарыстоўваюць польскія парты на Балтыцы для знешняга гандлю.

35.3. Насельніцтва. Па колькасці насельніцтва (38,4 млн чал.) Польшча займае 3-е месца ў рэгіёне пасля Расіі і Украіны. Для краіны характэрныя вельмі нізкі натуральны прырост насельніцтва і паступовае яго старэнне. Асаблівасць Польшчы — аднастайны этнічны склад насельніцтва: больш за 90 % жыхароў краіны — палякі. Астатнюю частку складаюць этнічныя меншасці (дыяспары), якія кампактна пражываюць на памежных тэрыторыях (беларусы, літоўцы, немцы). Беларуская дыяспара ў Польшчы — адна з найбольш шматлікіх. Абсалютная большасць вернікаў — католікі (мал. 127).



Мал. 127. Ясна Гура ў Чэнстахове — галоўны каталіцкі цэнтр Польшчы

Па ўзроўні ўрбанізацыі (62 %) Польшча саступае большасці еўрапейскіх дзяржаў (у тым ліку Беларусі). Палова гараджан — жыхары вялікіх гарадоў. Дзесяць найбуйнейшых

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

агламерацый — Варшаўская, Верхнесілезская (Катавіцкая), Кракаўская, Гданьска-Гдыньская і іншыя канцэнтруюць 25 % насельніцтва краіны.

35.4. Гаспадарка. Эканоміка Польшчы — адна з найбольш дынамічных у Еўропе. На яе развіцці адбілася правядзенне рынкавых рэформаў і ўступленне ў Еўрапейскі саюз. У структуры ВУП Польшчы асноўную ролю адыгрывае сфера паслуг — 70 %. Удзельная вага прамысловасці складае 25 %, сельскай гаспадаркі — каля 5 %.


с. 63

Вядучыя галіны **прамысловасці** — машынабудаванне, чорная і каляровая металургія, паліўная, хімічная і лёгкая. Польшча займае адно з першых месцаў у свеце па вытворчасці рыбалоўных суднаў, таварных і пасажырскіх вагонаў, цеплавозаў і электравозаў. Большасць машынабудаўнічых прадпрыемстваў з'яўляецца даччынымі падраздзяленнямі вядучых заходніх кампаній.

У энергетыцы Польшчы асаблівае месца займае вугальная прамысловасць. Па здабычы каменнага вугалю Польшча лідзіруе ў Еўропе. Асноўны каменнавугальны басейн — Верхнесілезскі. На вугалі грунтуецца электраэнергетыка. Уся спажываная краінай нафта — імпартная. Частка нафты і прыроднага газу паступае па трубаправодах з Расіі.

Польшча з'яўляецца буйным вытворцам прадукцыі ***чорнай металургіі***. Галоўныя металургічныя камбінаты размешчаны на поўдні Польшчы ў гарадах Катавіцкай агламерацыі. Жалезная руда імпартуецца з Расіі, Украіны і Бразіліі. Значная частка сталі выплаўляецца з металалому. ***Каляровая металургія*** прадстаўлена свінцова-цынкавай і меднай галінамі. Па выплаўленні рафінiраванай медзі і серабра Польшча — еўрапейскі лідар.

У ***машынабудаванні*** вядучыя пазіцыі належаць транспартнаму машынабудаванню, выпускаюцца легкавыя і грузавыя аўтамабілі, марскія судны, лакаматывы і вагоны. Асноўныя прадпрыемствы размяшчаюцца ў буйных гарадах — Варшаве, Познані. Легкавыя аўтамабілі вырабляюць прадпрыемствы вядомых фірмаў («Фіят», «Фольксваген», «Опель» і інш.). Суднабудаванне сканцэнтравана на поўначы краіны, у Гдыні, Шчэціне, Гданьску.

Хімічная прамысловасць грунтуецца на ўласнай сыравіне (вугалі, прыроднай серы, каменнай солі). Вырабляе серную кіслату, фосфарныя і азотныя ўгнаенні, лекавыя сродкі. Вядучая галіна ***лёгкай*** прамысловасці — тэкстыльная, канцэнтруецца ў раёне г. Лодзь. Прадукцыя швейнай і абутковай прамысловасці пастаўляецца на знешнія рынкі. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры Польшчы — *Варшава*, Кракаў, Лодзь.

Сельская гаспадарка. Польшча з'яўляецца адным з еўрапейскіх лідараў па плошчы раллі і вытворчасці многіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Асноўныя яе вытворцы — сялянскія і фермерскія гаспадаркі. Вядучая

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

галіна сельскай гаспадаркі — ***жывёлагадоўля***. Свінагадоўля забяспечвае каля паловы вытворчасці ўсёй прадукцыі жывёлагадоўлі. Значную ролю адыгрывае развядзенне буйной рагатай жывёлы і птушкагадоўля (вытворчасць курыных яек). У ***раслінаводстве*** вядучае месца займае вытворчасць збожжавых культур — пшаніцы і жыта. Вялікія плошчы занятыя пад ячмень і авёс, кармавыя культуры, бульбу, рапс, цукровыя буракі. Польшча пастаўляе на экспарт мясапрадукты і жывую скаціну, клубніцы і іншыя ягады, яблыкі, гародніну, цукар, бульбу, сокі і іншыя напоі.

Па грузаабароце вядучае месца займае чыгуначны ***транспарт***, асноўная частка якога прыходзіцца на перавозкі вугалю. Высокі ўзровень электрыфікаванасці чыгунак. Галоўны чыгуначны вузел — Верхнесілезскі (г. Катавіцы) — злучаны чыгуначнымі магістралямі з найбуйнейшымі гарадамі краіны і марскімі партамі (рыс. 128). Тэрыторыю Польшчы ва ўсіх напрамках перасякаюць важныя транс'еўрапейскія аўтамабільныя магістралі. Аўтамабільнаму транспарту належыць важная роля ва ўнутраных грузавых і пасажырскіх перавозках, знешнегандлёвых сувязях з еўрапейскімі краінамі.

Паскорана развіваецца ***міжнародны турызм***. Найбольш прывабныя для адпачынку горныя раёны Польшчы, узбярэжжа Балтыйскага мора, гістарычныя цэнтры (Кракаў, Варшава, Люблін) (мал. 129). Развіваецца аграрны (сельскі) турызм.



Мал. 128. Грузавы порт (Гданьск)



Мал. 129. Галоўная рыначная плошча ў Кракаве

Абагульнім і запомнім. Ва Усходнюю Еўропу ўваходзяць былыя сацыялістычныя краіны, а таксама еўрапейскія дзяржавы, якія ўтварыліся пасля распаду СССР. Важнай рысай ЭГС Польшчы з'яўляецца выгаднае транспартнае размяшчэнне. Польшча — адзін з найбуйнейшых у Еўропе вытворцаў многіх відаў прамысловай прадукцыі. У вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі краіны ўносяць найбольшы ўклад шматлікія сялянскія і фермерскія гаспадаркі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым сябе. 1. Якія краіны ўваходзяць у склад Усходняй Еўропы? 2. Назавіце асаблівасці ЭГС Польшчы. 3. Які ўплыў на спецыялізацыю прамысловасці Польшчы аказвае фактар прыродных рэсурсаў? 4. Якая роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы Польшчы? 5. Што спрыяе развіццю ў Польшчы міжнароднага турызму?

Ад тэорыі да практыкі. Якую прадукцыю можа імпартаваць з Польшчы Беларусь?

Абмяркуем. Якія перавагі атрымала Польшча ад уступлення ў ЕС?

§ 36. Украіна

Успамінаем. *Якія прыродныя ўмовы аказваюць найбольшы ўплыў на развіццё сельскай гаспадаркі?*

Разважаем. *Якімі прычынамі можа быць абумоўлена значнае скарачэнне колькасці насельніцтва ў краіне?*

36.1. ЭГС, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Украіна* размешчана на паўднёвым усходзе Еўропы і мяжуе з Расіяй, Беларуссю, Малдовай, Польшчай, Славакіяй, Венгрыяй і Румыніяй. Такое суседскае становішча абумоўлівае важнае транзітнае значэнне Украіны. Праз яе тэрыторыю праходзяць самыя кароткія сухапутныя і паветраныя шляхі, якія злучаюць краіны, размешчаныя ў раёне Балтыйскага і Чорнага мораў, а Расію — з краінамі Усходняй, Заходняй і Паўднёвай Еўропы.

Пераважна раўнінная тэрыторыя краіны размяшчаецца ў межах Усходне-Еўрапейскай платформы. Яе нетры багатыя на разнастайныя карысныя выкапні. У Крыварожскім і Нікапальскім басейнах засяроджаны жалезныя і марганцавыя руды. На ўсходзе краіны знаходзіцца Данецкі каменнавугальны басейн. Шырока распаўсюджана хімічная і будаўнічая сыравіна: каменная соль, фасфарыты, сера, вапнякі.

Клімат умерана кантынентальны. З поўначы на поўдзень назіраецца ярка выяўленая змена прыродных зон. Праз усю краіну з усходу на захад шырокай паласой распасціраецца зона лесастэпу і стэпу, пад якой сфарміраваліся ўрадлівыя каштанавыя глебы і чарназёмы. Чарназёмы займаюць больш за 60 % тэрыторыі краіны. Найбуйнейшая рака Украіны Дняпро — трэцяя па даўжыні і плошчы басейна рака Еўропы пасля Волгі і Дуная.

36.2. Насельніцтва. Агульная колькасць насельніцтва Украіны — 42 млн чалавек. Ва Украіне адзін з самых нізкіх у Еўропе каэфіцыентаў нараджальнасці — 10 ‰ і вельмі высокі каэфіцыент смяротнасці — 14 ‰. Доўгі час у краіне назіраецца натуральнае змяншэнне насельніцтва, а таксама адбываецца яго старэнне. Працягласць жыцця ніжэйшая, чым

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

у большасці еўрапейскіх краін (у мужчын 66 гадоў, у жанчын — 76). Таму ўдзельная вага жанчын вышэйшая, чым мужчын, — 54 %.

У нацыянальным складзе насельніцтва пераважаюць украінцы — 78 %. Рускія — другая па колькасці этнічная група (17 % насельніцтва). Беларусы, малдаване, венгры, румыны, палякі пражываюць у памежных абласцях. Асноўная частка вернікаў насельніцтва — праваслаўныя хрысціяне.

Насельніцтва даволі раўнамерна размешчана па тэрыторыі. Ва Украіне пераважаюць гараджане (каля 70 %). Найбольш высокі ўзровень урбанізацыі ў Данецкай вобласці (каля 90 %). Асаблівасцю ўрбанізацыі ва Украіне з'яўляецца канцэнтрацыя гарадскога насельніцтва ў буйных гарадах і гарадскіх агламерацыях. Найбуйнейшыя з іх агламерацыі Кіева, Харкава, Дняпра, Адэсы.


с. 64

36.3. Гаспадарка Украіны мае шматгаліновы характар. Яе аснову складае сфера паслуг, на якую прыходзіцца 65 % ВУП краіны.

У прамысловасці ствараецца каля 25 % кошту ВУП. Вядучая роля ў ёй належыць галінам, якія базіруюцца на здабычы і перапрацоўцы мінеральнай сыравіны (паліўная, электраэнергетыка, металургія). Значнымі аб'ёмамі вытворчасці вылучаецца сельская гаспадарка, удзельная вага якой у ВУП краіны дасягае 10 %. Украіна ўваходзіць у групу краін з сярэднім узроўнем эканамічнага развіцця.

Прамысловасць. Аснову энергетыкі Украіны складае вугальная прамысловасць. Аб'ёмы здабычы ўласнай нафты і прыроднага газу нязначныя і забяспечваюць патрэбы эканомікі толькі на 10–20 %. Краіна з'яўляецца буйным імпарцёрам гэтых відаў сыравіны. Асноўная частка электраэнергіі выпрацоўваецца на буйных ЦЭС. Прыкладна 40 % вытворчасці забяспечваюць чатыры атамныя электрастанцыі: Ровенская, Хмяльніцкая, Паўднёва-Украінская і Запарожская. На ГЭС вырабляецца каля 5 % электраэнергіі. Каскад з васьмі ГЭС створаны на Дняпры (мал. 130).


Мал. 130. ДнепраГЭС

Чорная металургія — вядучая галіна прамысловасці, якая забяспечвае больш за 15 % кошту выпрабленай у краіне прадукцыі. Яна мае важнае экспартнае значэнне. Галіна грунтуецца на буйных запасах каменных вуглёў Данбаса, якія каксуюцца, жалезных і марганцавых руд.

Машынабудаванне спецыялізуецца на вытворчасці абсталявання для металургіі, энергетыкі, галін здабыўной прамысловасці. У партовых

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 131. Прадукцыя вагонабудаўнічага завода (г. Крэмянчуг, Палтаўская вобл.)

гарадах знаходзяцца буйныя суднабудаўнічыя верфі і суднарамонтныя заводы. Шырока прадстаўлены прадпрыемствы па вытворчасці чыгуначнага рухомага саставу (мал. 131) (цеплавозаў, электравозаў, грузавых вагонаў, цыстэрн), сельскагаспадарчага машынабудавання, станкабудавання, прыборабудавання, аўтамабілебудавання. Шматгаліновымі цэнтрамі машынабудавання з'яўляюцца Кіеў і Харкаў.

Хімічная прамысловасць прызначана для вырабу азотных, фасфатных, калійных ўгнаенняў. Нафтахімічныя прадпрыемствы спецыялізуюцца на выпуску шын, гуматэхнічных вырабаў, хімічных валокнаў. Усімі асноўнымі вытворчасцямі прадстаўлена ***лёгкая прамысловасць***. Прадпрыемствы ***харчовай прамысловасці*** цесна звязаны з сельскай гаспадаркай і размяшчаюцца практычна ва ўсіх буйных населеных пунктах. Галоўныя эканамічныя цэнтры Украіны — Кіеў, Харкаў, Днепр, Адэса.

Сельская гаспадарка. Украіна мае спрыяльныя і разнастайныя прыродныя ўмовы для развіцця сельскай гаспадаркі. У ёй у роўнай ступені атрымалі развіццё ***раслінаводства*** і ***жывёлагадоўля***. Па аб'ёмах вытворчасці збожжа, цукровых буракоў, мяса, малака краіна ўваходзіць у лік вядучых еўрапейскіх вытворцаў. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць каля 70 % тэрыторыі, больш за 80 % з іх — ралля. Вырошчваюцца збожжавыя культуры, галоўнымі сярод якіх з'яўляюцца пшаніца і ячмень, тэхнічныя (цукровыя буракі, сланечнік, тытунь), бульба, гародніна, вінаград.

Размяшчэнне сельскай гаспадаркі мае ярка выражаны занальны характар. У Палессі развіты мяса-малочная жывёлагадоўля і свінаводства ў спалучэнні з вырошчваннем ільну, бульбы і збожжавых. Лесастэпавая зона спецыялізуецца на вырошчванні цукровых буракоў, збожжавых культур (пераважна пшаніцы), мяса-малочнай жывёлагадоўлі і свінагадоўлі. Тут жа засяроджаны абсалютная большасць цукровых заводаў, буйныя прадпрыемствы малочнай, мясной, мукамольна-крупяной прамысловасці. У стэпавай зоне збожжавая гаспадарка (пшаніца, кукуруза), вырошчванне сланечніку і цукровых буракоў спалучаюцца з развядзеннем буйной рагатай жывёлы малочна-мяснога напрамку і свінагадоўляй. У Крыме і Закарпацці вінаградарства і садоўніцтва, вырошчванне тытуню і гародніны спалучаюцца з авечкагадоўляй і птушкагадоўляй. Тут развіты плодаагародніннакансервавая і вінаробная вытворчасці, вытворчасць алею.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Транспарт. Ва Украіне атрымалі развіццё ўсе асноўныя віды транспарту. У грузаперавозках галоўная роля належыць чыгуначнаму транспарту. Тэрыторыю Украіны перасякаюць магістралі, якія злучаюць Расію і азіяцкія дзяржавы з краінамі Паўднёвай і Заходняй Еўропы, а балтыйскія дзяржавы — з партамі Чорнага мора. Праз тэрыторыю Украіны праходзяць магістральныя нафта- і газаправоды з Расіі ў Еўропу. Важнае месца ў забеспячэнні знешняга гандлю належыць марскому транспарту. Найбольш буйныя марскія парты размешчаны ў Адэсе, Чарнаморску, Мікалаеве, Херсоне, Марыупалі.



Мал. 132. Кіева-Пячорская лаўра

Адным з відаў дзейнасці сферы паслуг ва Украіне, які найбольш дынамічна развіваецца, з'яўляецца ***турызм***. Турыстаў прыцягвае багатая археалагічная і рэлігійная гісторыя краіны, яе культура і прырода. Аб'ектамі Сусветнай спадчыны ва Украіне з'яўляюцца Сафійскі сабор (Кіеў), Кіева-Пячорская лаўра (мал. 132), гістарычны цэнтр Львова, букавыя лясы Карпат. Для развіцця міжнароднага турызму выкарыстоўваюцца курорты Чорнага і Азоўскага мораў, мінеральныя крыніцы Карпат.

Абагульнім і запомнім. Прыродныя ўмовы і рэсурсы Украіны спрыяльныя для развіцця шматгаліновай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Дэмаграфічную сітуацыю ў краіне характарызуюць натуральнае змяншэнне насельніцтва і яго міграцыйны адток. У галіновай структуры прамысловасці вялікую ролю мае чорная металургія і машынабудаванне. Украіна з'яўляецца адным з найбуйнейшых у Еўропе вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Праверым сябе. 1. Назавіце асаблівасці прыродных умоў і рэсурсаў Украіны. 2. Якія прычыны скарачэння колькасці насельніцтва Украіны? 3. Якія галіны прамысловасці атрымалі ва Украіне пераважнае развіццё і чаму? 4. Якая ўзаемасувязь існуе паміж прыроднымі ўмовамі і спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі Украіны? 5. Якімі прычынамі абумоўлена развіццё турызму ва Украіне?

Ад тэорыі да практыкі. Якія існуюць варыянты памяншэння залежнасці гаспадаркі краіны ад паставак нафты і прыроднага газу з Расіі?

Абмяркуем. Якім чынам, на ваш погляд, выхадцы з Украіны могуць удзельнічаць у вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем краіны? Ці магчыма вяртанне эмігрантаў і іх нашчадкаў ва Украіну?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 9. РАСІЙСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ



§ 37. Расія на палітычнай карце свету


Успамінаем. *Чым можа быць абумоўлена федэратыўная форма палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы?*

Разважаем. *У чым перавагі і недахопы вялікай па памерах тэрыторыі дзяржавы?*

37.1. Тэрыторыя і эканоміка-геаграфічнае становішча. Па плошчы тэрыторыі, якая складае больш за 17 млн км^2 (12,6 % заселенай сушы), Расія — самая вялікая краіна свету.

Большая частка тэрыторыі Расіі размешчана паміж 50-й паралеллю і палярным кругам Паўночнага паўшар'я. Таму яе можна называць паўночнай краінай. У Расіі самыя працягласць ў свеце межы — каля 60 тыс. км, у тым ліку сухапутныя — 20,3 тыс. км, марскія — каля 40 тыс. км (мал. 133). Яна мяжуе з 16 дзяржавамі (з Японіяй і ЗША межы марскія). *(Па карце вызначце, з якімі рэгіёнамі і краінамі Еўропы і Азіі мяжуе Расія.)*

с. 48



Мал. 133. Працягласць меж Расійскай Федэрацыі

Расія — прыморская дзяржава. Яе тэрыторыю абмываюць воды 12 мораў, якія належаць тром акіянам — Атлантычнаму, Паўночнаму Ледавітаму і Ціхаму.

Расія — краіна дзвюх частак свету. У Еўропе яна займае вялікую частку Усходне-Еўрапейскай раўніны і Урал. У Азіі — Перадкаўказзе, паўночныя схілы Вялікага Каўказа, Сібір і Далёкі Усход, выходзячы да Ціхага акіяна. На еўрапейскую частку прыходзіцца 1/4 тэрыторыі і 4/5 насельніцтва краіны, на азіяцкую — 3/4 і 1/5 адпаведна.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У міжнародных адносінах Расія — праваперaемніца былога СССР. Яна пастаянны член Савета Бяспекі ААН, уваходзіць у найважнейшыя міжнародныя арганізацыі (СГА, МВФ і інш.).

37.2. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне Расійскай Федэрацыі. Сярод федэратыўных дзяржаў свету Расія вылучаецца найбольш складаным адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаваннем. У яе склад уваходзяць 83 раўнапраўныя суб'екты: 21 рэспубліка, 4 аўтаномныя акругі, 1 аўтаномная вобласць, 9 краёў, 46 абласцей і 2 гарады федэральнага значэння — Масква і Санкт-Пецярбург. Уся тэрыторыя Расійскай Федэрацыі падзелена на 8 федэральных акруг. *(Знайдзіце іх на карце.)*

с. 68

37.3. Геаграфічныя перадумовы развіцця міждзяржаўных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Распад СССР меў шэраг негатыўных наступстваў для эканамічнага развіцця Расіі. Напрыклад, знешнегандлёвыя адносіны даводзіцца ажыццяўляць праз тэрыторыю новых дзяржаў. Таму найважнейшай геапалітычнай задачай Расіі з'яўляецца ўмацаванне пазіцый у краінах блізкага замежжа.

Важным вынікам супрацоўніцтва Расіі з постсавецкімі дзяржавамі з'явілася стварэнне Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), у якую ўвайшлі шэсць краін, уключаючы Беларусь. Асноўная задача гэтай арганізацыі — абарона на калектыўнай аснове незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту дзяржаў, якія ў яе ўваходзяць.

У мэтах наладжвання больш цесных эканамічных адносін быў створаны Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС). ЕАЭС з'яўляецца міжнароднай арганізацыяй, якая ставіць сваёй мэтай стварэнне ўмоў для свабоднага руху тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы на тэрыторыі краін, якія ў яе ўваходзяць. У склад ЕАЭС уваходзяць Арменія, Беларусь, Казахстан, Кіргізія і Расія.



Мал. 134. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі

Найбольш цесныя міждзяржаўныя адносіны склаліся ў Расіі з Беларуссю. У 1997 г. быў падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі (з 26 студзеня 2000 г. афіцыйная назва Саюза — Саюзная дзяржава) (мал. 134). Галоўная мэта Саюзнай дзяржавы — паступовае фарміраванне адзінай палітычнай, эканамічнай, ваеннай, мытнай, валютнай, юрыдычнай, гуманітарнай і культурнай прасторы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Развіццё рознабаковых міждзяржаўных адносін Беларусі з Расіяй абумоўлена шэрагам геаграфічных фактараў. Найважнейшым з іх з'яўляецца працяглая агульная мяжа і блізкасць Беларусі да найбуйнейшых эканамічных цэнтраў Расіі — Масквы і Санкт-Пецярбурга. Праз тэрыторыю Беларусі пралягаюць найважнейшыя транспартныя калідоры, якія злучаюць Расію з краінамі Заходняй Еўропы.

Эканамічныя сувязі, якія склаліся ў перыяд існавання СССР, абумовілі моцную залежнасць эканомікі Беларусі ад паставак энерганосьбітаў і сыравіны з Расійскай Федэрацыі. У сваю чаргу, Расія была і застаецца асноўным рынкам збыту прадукцыі беларускага машынабудавання, хімічнай, лёгкай і харчовай прамысловасці. У цяперашні час на долю Расіі прыходзіцца больш за 40 % экспарту Беларусі і амаль 60 % яе імпарту.

Абагульнім і запомнім. Асаблівасцямі ЭГС Расіі з'яўляюцца самая працяглая ў свеце дзяржаўная мяжа, наяўнасць вялікай колькасці суседніх дзяржаў, выхад да акваторыі мораў трох акіянаў. Расія — найбольш складана ўладкаваная федэратыўная дзяржава, якая складаецца з 83 раўнапраўных суб'ектаў федэрацыі. Геаграфічнымі перадумовамі для развіцця міждзяржаўных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй з'яўляюцца наяўнасць працяглай агульнай мяжы, адзінства транспартнай інфраструктуры, эканамічныя сувязі, якія склаліся і садзейнічаюць актыўнаму гандлю паміж краінамі.

Праверым сябе. 1. Якія асаблівасці эканоміка-геаграфічнага становішча Расіі? 2. Які ўплыў на эканамічнае развіццё Расіі аказвае яе суседства з вялікай колькасцю дзяржаў? 3. Якая спецыфіка адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення Расіі? 4. Якімі геаграфічнымі перадумовамі абумоўлена развіццё міждзяржаўных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначце ўплыў на развіццё вашага раёна, населенага пункта міждзяржаўных сувязей Беларусі і Расіі.

Абмяркуем. У Расіі вядзецца праца па ўзбуйненні і скарачэнні колькасці суб'ектаў федэрацыі (першапачаткова іх было 89). Напрыклад, у 2005 г. Пермская вобласць і Комі-Пярмяцкая аўтаномная акруга аб'ядналіся ў Пермскі край, у 2007 г. Таймырскі і Эвенкійскі аўтаномныя акругі ўвайшлі ў склад Краснаярскага краю. Як вы думаеце, чым абумоўлены такія змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні краіны? Ці магчыма далейшае скарачэнне колькасці суб'ектаў федэрацыі ў складзе Расіі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 38. Насельніцтва Расіі. Дэмаграфічныя працэсы



Успамінаем. *Для якіх краін характэрнае натуральнае змяншэнне насельніцтва і якімі прычынамі яно абумоўлена?*



Разважаем. *Ці аказвае ўплыў на эканамічнае развіццё краіны нераўнамернае размяшчэнне насельніцтва?*

38.1. Дынаміка колькасці і натуральнага прыросту насельніцтва. Для Расіі на працягу доўгага часу была характэрная адмоўная дынаміка колькасці насельніцтва. З 1993 да 2009 г. яно няўхільна памяншалася, скарачаючыся са 149 да 143 млн чалавек. У наступныя гады адбылося нязначнае павелічэнне колькасці насельніцтва ў асноўным за кошт знешняй міграцыі. На пачатак 2019 г. у Расіі пражывала 147,3 млн чалавек.

Галоўнымі прычынамі скарачэння колькасці насельніцтва былі нізкая нараджальнасць і высокая смяротнасць, абумоўленыя пагаршэннем эканамічнай сітуацыі ў краіне пасля распаду СССР. Каэфіцыент нараджальнасці быў мінімальным у 1999 г. — 8,3 ‰, а каэфіцыент смяротнасці максімальным у 2003 г. — 16,4 ‰, натуральны прырост насельніцтва ў гэтыя гады быў адмоўным (–6,0 ‰).

У цяперашні час намецілася паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі. У перыяд з 2012 да 2015 г. паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці практычна зраўняліся і знаходзіліся на ўзроўні 13 ‰. У асобныя гады нараджальнасць нават перавышала смяротнасць. Аднак у 2017 г. смяротнасць насельніцтва зноў перавысіла нараджальнасць, склаўшы адпаведна 12,4 ‰ і 11,5 ‰. Высокай смяротнасцю шмат у чым абумоўлена адносна нізкая працягласць жыцця насельніцтва. У мужчын з 1992 да 2008 г. яна знаходзілася на ўзроўні 60 гадоў, у жанчын складала 72 гады. У цяперашні час сярэдняя працягласць жыцця вырасла да 67 гадоў у мужчын і 77 гадоў у жанчын. Асноўнымі прычынамі адносна нізкай нараджальнасці з'яўляюцца скарачэнне ўдзельнай вагі сельскага насельніцтва, змяненне становішча жанчыны ў грамадстве, павышэнне ўзросту ўступлення ў шлюб, а таксама асаблівасці полаўзроставай структуры насельніцтва.

38.2. Полаўзроставая структура насельніцтва Расіі. Удзельная вага жанчын у агульнай колькасці насельніцтва Расіі вышэйшая, чым мужчын, і складае 53 %. На ўзроставую структуру насельніцтва Расіі вызначальны ўплыў аказваюць нізкая нараджальнасць і паступовае павелічэнне працягласці жыцця людзей. Вынікам гэтага з'яўляецца памяншэнне ўдзельнай вагі людзей маладзейшых за працаздольны ўзрост (каля 18 %) і ўзрастанне

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

долі насельніцтва старэйшага за працаздольны ўзрост (больш 20 %). У Расіі адзін з самых нізкіх у свеце паказчыкаў суадносін людзей працаздольнага ўзросту і пенсіянераў. На аднаго пенсіянера прыходзіцца 2,4 занятых. У ЗША гэты паказчык складае 4,4.

38.3. Нацыянальны і рэлігійны склад насельніцтва. Расія — адна з найбольш шматнацыянальных дзяржаў свету. Тут пражываюць прадстаўнікі больш як 180 этнічных груп, якія адносяцца да розных моўных сем'яў (мал. 135). Большасць насельніцтва, каля 81 %, складаюць рускія. Вылучаецца яшчэ шэсць этнічных груп насельніцтва, колькасць якіх перавышае 1 млн чалавек, — татары (3,9 %), украінцы (1,4 %), башкіры (1,1 %), чувашы (1 %), чачэнцы (1 %) і армяне (0,9 %).



Мал. 135. Свята «Дзень нацыянальнасцей Расіі»

с. 69

Шматнацыянальны склад насельніцтва знайшоў адлюстраванне ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным ладзе Расіі. З 83 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі 32 — гэта нацыянальныя ўтварэнні. У некаторых з іх тытульнае насельніцтва з'яўляецца пераважным. Напрыклад, у Чачэнскай Рэспубліцы ўдзельная вага чачэнцаў складае 94 %. У многіх нацыянальных утварэннях удзельная вага тытульных этнасаў значна ніжэйшая за 50 %. Так, удмурты складаюць толькі каля 30 % насельніцтва Удмуртыі.

Самая распаўсюджаная рэлігія сярод вернікаў-расіян — хрысціянства (каля 80 %). У складзе хрысціян пераважаюць праваслаўныя, шматлікія таксама пратэстанты і католікі. Татары, башкіры, многія паўночнакаўказскія народы вызнаюць іслам. Доля мусульман сярод вернікаў складае каля 10 %. Бураты, тувінцы, калмыкі з'яўляюцца прыхільнікамі будызму.

с. 69

38.4. Размяшчэнне насельніцтва Расіі. Вялікія памеры тэрыторыі Расіі, разнастайнасць яе прыродных умоў абумовілі крайнюю нераўнамернасць размяшчэння насельніцтва. У своеасаблівым трохвугольніку Санкт-Пецярбург — Сочы — Іркуцк, які займае 1/3 тэрыторыі краіны, засяроджана 93 % насельніцтва. Гэта тэрыторыя называецца зонай суцэльнага засялення, або галоўнай паласой рассялення. Астатнія

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2/3 тэрыторыі, якія ахопліваюць паўночныя раёны Расіі, значную частку Сібіры, Далёкі Усход, утвараюць зону ачаговага засялення: тут пражывае ўсяго 7 % насельніцтва краіны. У еўрапейскай частцы Расіі пражывае 81 % расіян, у азіяцкай — 19 %. *(Растлумачце асаблівасці геаграфічнага размеркавання насельніцтва ў Расіі.)*

Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва складае 8,5 чал./км^2. Пры гэтым у еўрапейскай частцы яна дасягае 27 чал./км^2, а ў азіяцкай — менш за 3 чал./км^2. Самая высокая шчыльнасць насельніцтва ў Цэнтральнай Расіі (г. Масква і Маскоўская вобласць) — больш за 300 чал./км^2, а найменшая — у Чукоцкай аўтаномнай акрузе — менш за 0,07 чал./км^2.

Расія — дзяржава з высокім узроўнем урбанізацыі. Доля гарадскога насельніцтва складае 81 %. Значная частка гараджан жыве ў вялікіх гарадах. У 15 гарадах Расіі колькасць насельніцтва перавышае 1 млн чалавек. Вакол гарадоў-мільянераў утварыліся буйныя гарадскія агламерацыі.


Вялікі ўплыў на дынаміку колькасці насельніцтва Расіі і яго размеркаванне па тэрыторыі аказвае міграцыя (унутраная і знешняя). За першую палову 90-х гг. XX ст. у Расію з дзяржаў, якія ўтварыліся пасля распаду СССР, пераехала амаль 3 млн чалавек. Прычына — абвастрэнне ў гэтых краінах міжнацыянальных адносін, змяненне там сацыяльнага статусу рускамоўнага насельніцтва, пагаршэнне эканамічнага становішча і масавае беспрацоўе.

У цяперашні час у Расію штогод прыбывае каля 300 тыс. імігрантаў пераважна з постсавецкіх дзяржаў, а таксама з Кітая і іншых азіяцкіх дзяржаў. Значна меншыя маштабы эміграцыі — менш за 100 тыс. чалавек. Як правіла, расіяне эмігрыруюць у эканамічна развітыя краіны Еўропы і Амерыкі (Германію, ЗША, Канаду і інш.), Ізраіль. За кошт перавышэння іміграцыі над эміграцыяй штогадовы міграцыйны прырост насельніцтва складае ад 200 да 300 тыс. чалавек.

Замяшчальная міграцыя — гэта знешняя міграцыя, якая кампенсуе натуральнае змяншэнне насельніцтва і яго эміграцыйны адток.

Унутраная міграцыя характарызуецца перамяшчэннем насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады, а таксама з невялікіх гарадоў у буйныя гарадскія цэнтры. Значная частка насельніцтва выязджае з менш развітых у эканамічным сэнсе раёнаў (Сібіры і Далёкага Усходу). Максімальныя міграцыі адзначаліся ў 2013 г. (мал. 136).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 136. Унутраныя міграцыйныя патокі ў Расіі ў 2013 г. (у тыс. чал.)

Абагульнім і запомнім. Для Расіі на працягу доўгага перыяду часу была характэрная адмоўная дынаміка колькасці насельніцтва, абумоўленая нізкай нараджальнасцю і высокай смяротнасцю. У полаўзроставай структуры насельніцтва ўдзельная вага жанчын вышэйшая, чым мужчын, суадносіны людзей маладога і сталага ўзросту прыкладна аднолькавая. Расія — адна з найбольш шматнацыянальных дзяржаў свету. Больш за 80 % насельніцтва складаюць рускія, а найбольш распаўсюджанай рэлігіяй з'яўляецца праваслаўе. Насельніцтва размешчана па тэрыторыі краіны вельмі нераўнамерна.

Праверым сябе. 1. Якія асаблівасці дынамікі насельніцтва ў Расіі? 2. Чаму ў полаўзроставай структуры насельніцтва ўдзельная вага жанчын вышэйшая, чым мужчын, а суадносіны насельніцтва ва ўзросце да 15 гадоў і старэйшага за 65 гадоў прыкладна аднолькавыя? 3. Растлумачце прычыны нераўнамернага размяшчэння насельніцтва па тэрыторыі Расіі. 4. Назавіце асноўныя прычыны знешніх і ўнутраных міграцый насельніцтва Расіі. 5. Што такое замяшчальная міграцыя і якія асаблівасці яе праявы ў Расіі?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы інфармацыю пра асаблівасці размяшчэння насельніцтва на тэрыторыі Расіі ў розных частках краіны, вызначце рэгіёны, для якіх замяшчальная міграцыя мае найбольшае значэнне.

Для дапытлівых. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія тры новыя гарады ўвайшлі ў лік мільянераў пасля апошняга перапісу насельніцтва і вызначце асноўныя прычыны павелічэння колькасці насельніцтва ў гэтых гарадах.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 39. Геаграфія прамысловасці Расіі

Успамінаем. *Якія віды дзейнасці адносяцца да здабыўной, а якія — да апрацоўчай прамысловасці?*

Разважаем. *Ці з'яўляецца наяўнасць буйных запасаў прыродных рэсурсаў абавязковай умовай высокага ўзроўню эканамічнага развіцця краіны?*

39.1. Прыродна-рэсурсны патэнцыял. Здабыўная прамысловасць. Сукупнасць усіх відаў прыродных рэсурсаў пэўнай тэрыторыі, якія прайшлі эканамічную ацэнку, называецца яе прыродна-рэсурсным патэнцыялам. Для Расіі як краіны, якая займае вялікую тэрыторыю і размешчаная ў розных геаграфічных паясах, характэрна наяўнасць разнастайных прыродных рэсурсаў.

Краіна валодае значнымі запасамі паліўна-энергетычных рэсурсаў. Па запасах прыроднага газу яна — безумоўны сусветны лідар. Вялікія запасы нафты, каменнага і бурага вугалю. Але паліўныя рэсурсы неспрыяльна размешчаны ў адносінах да іх спажыўцоў. Галоўныя спажыўцы знаходзяцца ў еўрапейскай частцы Расіі, а больш за 80 % рэсурсаў прыходзіцца на Сібір і Далёкі Усход (мал. 137). Найбуйнейшыя нафтагазаносныя правінцыі — *Заходне-Сібірская, Волга-Уральская* і *Цімана-Пячорская*.

Расія разам з Саудаўскай Аравіяй і ЗША з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам нафты ў свеце. Асноўныя радовішчы нафты і цэнтры здабычы знаходзяцца ў Заходняй Сібіры. Па аб'ёмах здабычы прыроднага газу Расія дзеліць 1-е месца з ЗША. Раёны здабычы газу, як правіла, супадаюць з раёнамі нафтаздабычы. Каля 90 % яго здабываюць на газавых радовішчах у Заходняй Сібіры. Найбуйнейшыя радовішчы — Урэнгойскае, Ямбургскае, Мядзведжае і інш.

Асноўныя вугальныя басейны, як і нафтагазаносныя, знаходзяцца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. Паўднёва-Якуцкі, Тунгускі і Ленскі



Мал. 137. Здабыча нафты ў Заходняй Сібіры



Мал. 138. Здабыча вугалю ў Пячорскім басейне

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вугальныя басейны — найбуйнейшыя ў свеце, аднак у цяперашні час практычна не выкарыстоўваюцца. Вялікая роля ў здабычы вугалю належыць Кузнецкаму, *Канска-Ачынскаму* і *Пячорскаму басейнам* (мал. 138). Значная частка здабытага вугалю адпраўляецца на экспарт.

Па разведаных запасах жалезнай руды Расія займае 1-е месца ў свеце. Больш за 60 % усіх разведаных запасаў жалезных руд засяроджана ў еўрапейскай частцы Расіі (Курская магнітная анамалія). Па здабычы жалезнай руды Расія займае 5-е месца ў свеце пасля Кітая, Бразіліі, Аўстраліі і Індыі. Большая частка жалезнай руды здабываецца адкрытым спосабам.

Сыравіна для алюмініевай прамысловасці (баксіты і нефеліны) здабываецца на Урале, у Ленінградскай вобласці, на Кольскім паўвостраве і ў Сібіры. На Кольскім паўвостраве вядзецца здабыча медных руд, у Нарыльску — нікелевых, на Далёкім Усходзе — алавяных. Расія адносіцца да сусветных лідараў па запасах і здабычы золата.

с. 70–71

Большасць прадпрыемстваў, якія вырабляюць фасфатныя ўгнаенні, выкарыстоўвае апатыты Кольскага паўвострава, якія здабываюцца ў Хібінах. Вытворчасць калійных угнаенняў засяроджана на Урале (*Салікамск* і *Бярэзнікі*) і грунтуецца на калійных солях Верхнекамскага радовішча.

Багаццем краіны з'яўляюцца лясныя рэсурсы. Асноўныя раёны лесанарыхтовак знаходзяцца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. Большая частка драўніны для прамысловай перапрацоўкі (75 %) нарыхтоўваецца на поўначы еўрапейскай часткі краіны, на Урале і ў Сібіры. На здабыўную прамысловасць прыходзіцца каля 35 % кошту прадукцыі прамысловай вытворчасці, яна ж дае каля 70 % даходаў ад экспарту.

39.2. Апрацоўчая прамысловасць. Вядучыя галіны апрацоўчай прамысловасці і іх геаграфія. Удзельная вага апрацоўчай прамысловасці ў структуры прамысловай вытворчасці Расіі складае 65 %. Вядучую ролю ў ёй адыгрываюць паліўная прамысловасць (вытворчасць нафтапрадуктаў), машынабудаванне, харчовая прамысловасць, металургічная вытворчасць, а таксама хімічная прамысловасць.

Чорная і каляровая металургія забяспечваюць 15 % аб'ёму прамысловай вытворчасці. Чорная металургія развіваецца пераважна на ўласных сыравінных рэсурсах. Асноўная вытворчасць чыгуну, сталі, праката засяроджана на прадпрыемствах трох галоўных металургічных баз Расіі — *Уральскай*, *Цэнтральнай* і *Сібірскай*. Прадпрыемствы, якія працуюць на металаломе, размяшчаюцца ў буйных цэнтрах машынабудавання (Валгаград, Масква, Ніжні Ноўгарад і інш.).

Каляровая металургія Расіі ўключае мноства разнастайных вытворчасцей. Краіна займае 2-е месца ў свеце па вытворчасці алюмінію. Большая

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

частка алюмініевых заводаў прымеркавана да ГЭС (Валгаград, Брацк, Краснаярск). Найбуйнейшыя прадпрыемствы па вытворчасці медзі знаходзяцца ў Манчагорску (Кольскі паўвостраў) і *Нарыльску*. Свінцова-цынкавая вытворчасць прымеркавана да раёнаў здабычы поліметалічных руд (Паўночны Каўказ, Кузбас, Забайкалле, Прымор'е). На базе мясцовай сыравіны ў Манчагорску, Орску (Урал), Нарыльску развіваецца *нікелевая* прамысловасць. Галоўны цэнтр *алавянай* прамысловасці — Новасібірск.

Машынабудаванне займае 2-е месца ў структуры апрацоўчай прамысловасці Расіі — каля 20 %. Аснову сучаснага машынабудавання Расіі складае вытворчасць транспартных сродкаў. Прадпрыемствы аўтамабільнай галіны выпускаюць легкавыя і грузавыя аўтамабілі, аўтобусы і тралейбусы. Вытворчасць легкавых аўтамабіляў вядзецца ў Паволжы (*Ніжні Ноўгарад*, Ульянаўск, *Тальяці*, Іжэўск), у Маскве. Там жа, а таксама ў *Набярэжных Чаўнах*, выпускаюць грузавыя аўтамабілі (мал. 139).

Чыгуначны рухомы састаў вырабляюць у Бранску, Санкт-Пецярбургу, Цверы. У Мыцішчах (пад Масквой) выпускаюць вагоны для метрапалітэна. Суднабудаванне і суднарамонт канцэнтруюцца ў буйных марскіх і рачных партах — Санкт-Пецярбургу, Ніжнім Ноўгарадзе, Хабараўску, Мурманску і інш. Авіябудаўнічая галіна, якая выпускае грамадзянскія і ваенныя самалёты, сканцэнтравана ў буйных прамысловых цэнтрах (Масква, Казань, Варонеж, Саратаў і інш.). Найбуйнейшымі цэнтрамі па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі з'яўляюцца Растоў-на-Доне, Варонеж. Станкабудаванне і вытворчасць энергетычнага абсталявання атрымала развіццё ў Санкт-Пецярбургу, Новасібірску, а горна-шахтавага абсталявання — у Кемераве і Краснаярску.

Удзельная вага ***хімічных вытворчасцей*** у структуры апрацоўчай прамысловасці не перавышае 10 %. Значных маштабаў на базе ўласных сыравінных рэсурсаў дасягнула вытворчасць усіх відаў мінеральных угнаенняў. Прадпрыемствы арганічнай хіміі працуюць на базе вуглевадарод-





Мал. 139. Вытворчасць грузавых аўтамабіляў — КАМАЗ (г. Набярэжныя Чаўны) і легкавых аўтамабіляў — ВАЗ (г. Тальяці)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

най сыравіны (нафты, газу, каменнага вугалю), а таксама перапрацоўкі драўніны. Прадпрыемствы па выпуску пластмас размяшчаюцца ў Паволжы (Казань, Валгаград), на Урале (Уфа, Екацерынбург), у Цэнтральным раёне (Масква, Уладзімір). Сінтэтычны каўчук і гуматэхнічныя вырабы (у тым ліку шыны) вырабляюць на прадпрыемствах Омска, Яраслаўля (нафтахімія), Краснаярска (лесахімія). На выпуску хімічных валокнаў спецыялізуюцца заводы ў Цверы, Барнауле, Краснаярску.

Харчовая прамысловасць па кошце прадукцыі займае 3-е месца сярод усіх галін апрацоўчай прамысловасці Расіі — 19 %.

Асноўнымі галінамі з'яўляюцца мяса-малочная, мукамольна-крупяная і рыбная. Найбольшае развіццё харчовая прамысловасць атрымала ў раёнах высокай канцэнтрацыі насельніцтва і буйной сельскагаспадарчай вытворчасці (напрыклад, Масква, Краснадарскі край).

Лясная прамысловасць. Больш за 70 % усіх лесаматэрыялаў спажываецца ў еўрапейскай Расіі, а асноўныя эксплуатацыйныя лясы знаходзяцца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. Буйныя лесапільныя вытворчасці, прадпрыемствы па механічнай апрацоўцы драўніны размешчаны ў месцах падыходу чыгунак да лесасплаўных шляхоў (Омск, Новасібірск, Краснаярск), у вусцях буйных рэк (*Архангельск*, Ігарка), уздоўж чыгуначных шляхоў (Самара, Саратаў). Значная частка дзелавой драўніны і прадукцыі лесапілавання пастаўляецца на экспарт. Прадпрыемствы цэлюлозна-папяровай прамысловасці размешчаны на поўначы еўрапейскай часткі, на Урале, у Паволжы. Магутныя камбінаты створаны ў Сібіры (Краснаярск, *Брацк*, Байкальск).

39.3. Геаграфія вытворчасці электраэнергіі. На вытворчасці электраэнергіі Расія займае 4-е месца ў свеце пасля Кітая, ЗША і Індыі. Асноўная роля ў яе вытворчасці належыць цеплавым электрастанцыям (ЦЭС), якія працуюць на танным вугалі і прыродным газе (65 % выпрабленай электраэнергіі). Найбуйнейшыя ЦЭС размешчаны як у азіяцкай, так і ў еўрапейскай частцы краіны.

Гідраэлектрастанцыі пабудаваны на буйных рэках і забяспечваюць вытворчасць 15 % электраэнергіі. Найбольш значнымі з'яўляюцца Ангара-Енісейскі і Волжска-Камскі каскады ГЭС (мал. 140). На дзесяці дзейных АЭС таксама вырабляецца 15 % электраэнергіі краіны. Самымі магутнымі АЭС з'яўляюцца Ленінградская, Курская, Калінінская. Усе буйныя АЭС размешчаны ў еўрапейскай частцы Расіі.



Мал. 140. Саяна-Шушанская ГЭС на рацэ Енісей — самая магутная гідраэлектрастанцыя ў Расіі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Прыродна-рэсурсны патэнцыял Расіі характарызуецца вялікай разнастайнасцю прыродных рэсурсаў і іх значнымі запасамі. У здабыўной прамысловасці Расіі вядучую ролю адыгрывае здабыча паліўных рэсурсаў. Галінамі спецыялізацыі ў апрацоўчай прамысловасці Расіі з'яўляюцца вытворчасць нафтапрадуктаў, харчовая прамысловасць, машынабудаванне і металургія. Галоўная асаблівасць размяшчэння прамысловай вытворчасці Расіі — значны тэрытарыяльны разрыў паміж раёнамі здабычы сыравіны і цэнтрамі яе перапрацоўкі і спажывання гатовай прадукцыі.

Праверым сябе. 1. Якія асаблівасці прыродна-рэсурснага патэнцыялу Расіі? 2. Якую ролю адыгрывае здабыўная прамысловасць у прамысловай вытворчасці Расіі? 3. Якія галіны лідзіруюць у структуры апрацоўчай прамысловасці і чаму? 4. Якія асноўныя адрозненні ў размяшчэнні галін здабыўной і апрацоўчай прамысловасці ў Расіі? 5. Якія асаблівасці размяшчэння асноўных тыпаў электрастанцый у Расіі і чым яны абумоўлены?

Ад тэорыі да практыкі. Расія экспартуе амаль 50 % нафты і прыроднага газу, якія здабываюцца ў краіне. Асноўнымі пакупнікамі гэтай прадукцыі з'яўляюцца краіны Еўропы, у тым ліку Беларусь, а таксама Кітай. Выкарыстоўваючы інфармацыю аб асноўных цэнтрах здабычы нафты і прыроднага газу ў Расіі, разлічыце адлегласць, на якую ажыццяўляецца транспарціроўка гэтай прадукцыі. Да якіх вынікаў, на ваш погляд, гэта прыводзіць?

Для дапытлівых. Па вытворчасці некаторых відаў прадукцыі здабыўной і апрацоўчай прамысловасці Расія ўваходзіць у лік краін — сусветных лідараў. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначце, якія гэта віды прадукцыі. Вызначце, у галінах здабыўной або апрацоўчай прамысловасці яны вырабляюцца. Растлумачце прычыны лідарства Расіі ў вытворчасці дадзеных відаў прадукцыі.

§ 40. Геаграфія сельскай гаспадаркі і транспарту Расіі

Успамінаем. *Якія галіны з'яўляюцца асноўнымі ў складзе раслінаводства і жывёлагадоўлі?*

Разважаем. *Чаму транспарт з'яўляецца адным з вядучых відаў дзейнасці ў структуры сферы паслуг?*

40.1. Асаблівасці развіцця і размяшчэння сельскай гаспадаркі. Занальная спецыялізацыя. Прыродныя ўмовы Расіі ў цэлым спрыяльныя для развіцця шматгаліновай сельскай гаспадаркі. У Расіі знаходзіцца 10 % усіх ворных зямель свету. На долю сельскагаспадарчых угоддзяў прыходзіцца 13 % ад агульнай плошчы Расіі (у тым ліку на раллю —

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8 %). Па плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў краіна займае 3-е месца ў свеце пасля ЗША і Кітая.

У структуры ВУП краіны ўдзельная вага сельскай гаспадаркі складае 4 %. Вядучая роля ў сельскай гаспадарцы належыць раслінаводству, на якое прыходзіцца 55 % вырабленай прадукцыі. Расія з'яўляецца адным з сусветных лідараў па вытворчасці збожжа, цукровых буракоў, насення сланечніку, бульбы і мяса.


с. 72

У сувязі з вялізнымі памерамі тэрыторыі на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі Расіі вялікі ўплыў аказваюць прыродныя ўмовы. З поўначы на поўдзень са зменай прыродных зон змяняецца і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.



Занальная спецыялізацыя сельскай гаспадаркі — гэта абумоўленая занальным характарам прыродных умоў спецыялізацыя сельскай гаспадаркі на вытворчасці пэўных відаў прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі.

У зоне тундры і лесатундры галоўныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі — аленевыя пашы. Земляробства тут практычна не вядзецца. Аснова сельскай гаспадаркі — аленегадоўля. Развіты паляўнічыя промыслы. У зоне тайгі пераважае жывёлагадоўля, а земляробства носіць ачаговы характар — развіваецца па далінах рэк. Поўдзень тайгі і зона змешаных лясоў — паласа няўстойлівага земляробства. Тут вырошчваюць непатрабавальныя да цяпла культуры (лён, кармавыя травы, жыта, ячмень, авёс, бульбу, гародніну) і разводзяць буйную рагатую жывёлу малочнага і мясамалочнага напрамкаў. Развіта свінагадоўля і птушкагадоўля.

У лесастэпах пераважнае развіццё атрымала раслінаводства. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі тут занята 50 % тэрыторыі. Вырошчваюць збожжавыя (пшаніца, ячмень, жыта), тэхнічныя (цукровыя буракі, сланечнік) і кармавыя культуры, бульбу, гародніну. Жывёлагадоўля прадстаўлена развядзеннем буйной рагатай жывёлы, свінагадоўляй і птушкагадоўляй.

Галоўнай зонай для развіцця збожжавай гаспадаркі Расіі з'яўляюцца стэпы. У еўрапейскай частцы стэпавай зоны вырошчваюць пшаніцу, кукурузу, у Заходняй Сібіры — яравую пшаніцу, на Далёкім Усходзе — сою. На пашах засушлівых стэпаў разводзяць буйную рагатую жывёлу пераважна мяснога напрамку і авечак.

У паўпустынях Паволжа і Калмыкіі развіта авечкагадоўля мясашэрснага напрамку, у горных раёнах (Каўказ, Алтай, Саяны) — горнапашавая жывёлагадоўля.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

40.2. Асаблівасці развіцця і галіны раслінаводства. Аснову ***раслінаводства*** Расіі складае збожжавая гаспадарка. Пад збожжавыя культуры адводзіцца каля 60 % пасяўных плошчаў, у тым ліку пад пшаніцу — 34 %, ячмень — 11 %, авёс — 4 %, кукурузу — 3 %. Астатнюю частку пасяўных зямель займаюць кармавыя (21 %), тэхнічныя культуры (16 %), бульба і агароднінныя культуры (4 %). Па вытворчасці ячменю, аўса і жыта Расія займае 1-е месца ў свеце, а па валавым зборы збожжавых культур (больш за 100 млн т) — 4-е (пасля Кітая, ЗША і Індыі).

У Расіі сфарміраваны чатыры асноўныя раёны збожжавай гаспадаркі — Паўночны Каўказ, поўдзень Сібіры, Цэнтральна-Чарназёмны раён і Паўднёвы Урал. Вядучая збожжавая культура — пшаніца (каля 70 млн т).

Асноўныя пасевы сканцэнтраваны ў лесастэпавай і стэпавай зонах. Кукурузу вырошчваюць на поўдні Расіі на збожжа, у сярэдняй паласе — як кармавую культуру.

Галоўныя тэхнічныя культуры — сланечнік і цукровыя буракі. Сланечнік вырошчваюць там, дзе і пшаніцу. Тут размяшчаюцца і прадпрыемствы па вытворчасці алею. Вытворчасць цукровых буракоў і іх перапрацоўка сканцэнтраваны ў чарназёмных абласцях Еўрапейскай Расіі і на Паўночным Каўказе. На паўночным захадзе, поўначы і ў цэнтры еўрапейскай Расіі вырошчваюць лён-даўгунец, у паўднёвых раёнах краіны — чай (Краснадарскі край) і тытунь. Расія займае 3-е месца ў свеце па вытворчасці бульбы. Асноўныя раёны яе вырошчвання — захад і цэнтр еўрапейскай часткі краіны. Агародніцтва сканцэнтравана ў прыгарадных зонах вялікіх гарадоў і на Паўночным Каўказе. У паўднёвых раёнах еўрапейскай часткі Расіі вырошчваюцца плады і ягады, у тым ліку вінаград.

40.3. Геаграфія развядзення жывёл. Асноўнай галіной ***жывёлагадоўлі*** ў Расіі з'яўляецца развядзенне буйной рагатай жывёлы малочнага і мясного напрамкаў. Малочная жывёлагадоўля распаўсюджана ў лясной зоне, лепш забяспечанай сакавітымі кармамі, а мясная — у больш засушлівых лесастэпавых і стэпавых раёнах. Паўсюдна развіты свінагадоўля і птушкагадоўля.

Авечкагадоўля мяса-шэрснага напрамку атрымала развіццё ў засушлівых раёнах Паволжа і Калмыкіі, а таксама ў горных раёнах (Каўказ). У Бураціі, Калмыкіі, Туве, на Алтаі спецыялізуюцца на развядзенні коней, у Башкірыі — на пчалярстве. На Крайняй Поўначы развіта аленегадоўля, а ў Сібіры і на Далёкім Усходзе — пушны промысел (мал. 141).

40.4. Сфера паслуг. Транспарт. У эканоміцы Расіі атрымалі развіццё ўсе асноўныя віды дзейнасці сферы паслуг. Іх удзельная вага ў ВУП краіны пастаянна ўзрастае і ў цяперашні час складае больш за 65 %. Сярод

Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Мал. 141. Галіны жывёлагадоўлі розных прыродных зон Расіі

відаў паслуг найбольшы ўклад у фарміраванне ВУП уносяць гандаль, транспарт і сувязь.

Для Расіі характэрныя значныя кантрасты і тэрытарыяльныя адрозненні ў забяспечанасці відамі паслуг насельніцтва розных суб'ектаў федэрацыі, а таксама гарадскога і сельскага насельніцтва. Найбольш высокі ўзровень забяспечанасці паслугамі характэрны для гарадоў-мільянераў. Лідарам па маштабах аказання ўсіх асноўных відаў паслуг з'яўляецца Масква.

Транспартная сістэма краіны характарызуецца развіццём усіх асноўных відаў транспарту, значнай працягласцю транспартных шляхоў і крайняй нераўнамернасцю іх размяшчэння па тэрыторыі.

40.5. Асаблівасці развіцця і размяшчэння асноўных відаў транспарту. Вялікія памеры тэрыторыі і развіццё сыравінных галін прамысловасці абумоўліваюць важную ролю чыгуначнага транспарту ў эканоміцы краіны. На яго прыходзіцца больш за 45 % грузаабароту ўсіх відаў транспарту і 24 % — пасажыраабароту. Па даўжыні чыгунак (каля 175 тыс. км) Расія займае 2-е месца ў свеце (пасля ЗША). Больш за 50 % жалезных дарог электрыфікавана. Найбольш густая чыгуначная сетка ў цэнтры еўрапейскай часткі краіны. Радыяльна разбежныя ад Масквы дарогі звязваюць яе з найбуйнейшымі гарадамі Расіі і іншых дзяржаў свету. У Сібіры сетка чыгунак радзейшая і мае пераважна шыротны напрамак. Важную ролю адыгрывае Транссібірская магістраль: *Чалябінск — Новасібірск — Краснаярск — Іркуцк — Хабараўск — Уладзівасток* (мал. 142). Яна з'яўляецца складовай часткай транскантынентальнай чыгункі Масква — Уладзівасток, якая дазваляе транспартаваць грузы найкарацейшым шляхам з акваторыі Ціхага акіяна ў Заходнюю Еўропу (кантэйнерны мост «Уладзівасток — Брэст»).

Аўтамабільны транспарт абслугоўвае ў асноўным мясцовыя грузавыя і пасажырскія перавозкі. Яму належыць 1-е месца ў структуры пасажыраабароту. Па працягласці аўтамабільных дарог (1,5 млн км) Расія займае

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 142. Транссібірская магістраль

5-е месца ў свеце. Аднак іх сярэдняя шчыльнасць нізкая — 34 км на 1000 км^2. Па забяспечанасці сеткай аўтамабільных дарог вылучаюцца тры зоны. Першая, Еўрапейская, характарызуецца адносна развітой сеткай дарог пераважна з цвёрдым пакрыццём. Шчыльнасць дарог — каля 100 км на 1000 км^2. Сучасныя аўтастрады злучаюць найбуйнейшыя гарады гэтай зоны. Другая зона ахоплівае поўдзень Расіі. Сетка аўтамабільных дарог тут нераўнамерная, а шчыльнасць блізкая да сярэдняй па краіне. У трэцяй зоне (вялікая частка Сібіры і Далёкага Усходу) сетка дарог рэдкая, многія з іх выкарыстоўваюцца толькі сезонна, частка тэрыторыі пазбаўлена транспартных шляхоў.

Прыморскае становішча абумовіла значэнне марскога транспарту ў абслугоўванні знешнегандлёвых сувязей і перавозцы грузаў паміж расійскімі партамі розных акваторый. Галоўныя марскія парты Расіі: на Балтыйскім моры — *Калінінград*, Санкт-Пецярбург, на Чорным — *Новарасійск* (галоўны нафтаналіўны порт), на Азоўскім — Таганрог. Вялікае значэнне *Мурманска* (Баранцава мора), Архангельска (Белае мора), Находкі і Уладзівастока (Японскае мора). Большасць буйных рэк Расіі суднаходныя (каля 100 тыс. км рачных суднаходных шляхоў), што спрыяе развіццю ўнутранага воднага транспарту.

Трубаправодны транспарт забяспечвае падачу нафты і прыроднага газу ад асноўных раёнаў іх здабычы ва ўсходніх раёнах краіны да месцаў перапрацоўкі і спажывання на захадзе, а таксама экспартныя пастаўкі. Агульная працягласць магістральных трубаправодаў перавышае 250 тыс. км.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


с. 73

Важнае месца ва ўнутраных перавозках пасажыраў на вялікія адлегласці і ў міжнародных зносінах займае авіяцыйны транспарт. Сетка авіяліній звязвае ўсе найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры краіны паміж сабой, з буйнымі гарадамі Еўропы і свету. Выключна вялікая роля авіяцыйнага транспарту ў груза- і пасажыраперавозках у цяжкадаступныя раёны Поўначы, Сібіры і Далёкага Усходу.



Абагульнім і запомнім. Для сельскай гаспадаркі Расіі характэрная занальная спецыялізацыя раслінаводства і жывёлагадоўлі. Аснову раслінаводства складае збожжавая гаспадарка, у жывёлагадоўлі вядучую ролю адыгрываюць развядзенне буйной рагатай жывёлы, птушкагадоўля і свінагадоўля. Удзельная вага сферы паслуг у ВУП краіны складае 65 %. Транспартная сістэма краіны характарызуецца развіццём усіх асноўных відаў транспарту, значнай працягласцю транспартных шляхоў і крайняй нераўнамернасцю іх размяшчэння па тэрыторыі.



Праверым сябе. 1. Чым абумоўлены занальны характар спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Расіі? 2. Якімі асаблівасцямі характарызуецца збожжавая гаспадарка ў розных зонах сельскагаспадарчай спецыялізацыі? 3. Якая галіна адыгрывае вядучую ролю ў жывёлагадоўлі? 4. Якія віды дзейнасці сферы паслуг атрымалі ў Расіі найбольшае развіццё? 5. Якія асаблівасці транспартнай сеткі Расіі?



Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы веды аб спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Расіі, вызначце, якая прадукцыя раслінаводства гэтай краіны можа пастаўляцца ў Беларусь.



Абмяркуем. Агульная працягласць аўтамабільных дарог Расіі складае 1,5 млн км. Для параўнання, працягласць аўтамабільных дарог у Японіі 1,2 млн км. Па розных ацэнках, для паспяховага эканамічнага развіцця Расіі неабходна, каб працягласць сеткі аўтамабільных дарог складала больш за 2 млн км. Як вы лічыце, якія рэгіёны Расіі ў найбольшай ступені маюць патрэбу ў развіцці сеткі аўтамабільных дарог?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 10. АЗІЯ



§ 41. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Азіі. Краіны Усходняй Азіі. Японія

Успамінаем. *Для якіх краін характэрны высокі ўзровень урбанізацыі?*

Разважаем. *У чым перавагі і недахопы астраўнога становішча дзяржавы?*

41.1. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Азіі. Азія — самая вялікая частка свету як па тэрыторыі, так і па колькасці насельніцтва. Плошча (разам з астравамі) — каля 43,4 млн км^2. Насельніцтва — 4,3 млрд чалавек (больш за 60 % насельніцтва Зямлі).

Па класіфікацыі ААН у Азіі вылучаецца пяць рэгіёнаў: Усходняя Азія, Паўднёва-Усходняя Азія, Паўднёвая Азія, Цэнтральная Азія і Заходняя Азія.

Усходняя Азія — адзін з самых магутных па маштабах эканамічнага развіцця рэгіёнаў не толькі ў Азіі, але і ва ўсім свеце. Кітай і Японія, якія размясціліся ў гэтым рэгіёне, уваходзяць у лік сусветных лідараў па памерах ВУП і цэлым шэрагу іншых эканамічных паказчыкаў.

У Паўднёва-Усходняй Азіі ў найбольшай ступені выяўляецца неаднароднасць сацыяльна-эканамічнага развіцця азіяцкіх краін. Размешчаныя пераважна на паўастравах і астравах краіны рэгіёна моцна адрозніваюцца адна ад другой па формах дзяржаўнага ладу, этнічным і рэлігійным складзе насельніцтва, узроўні эканамічнага развіцця, маштабах гаспадарчай дзейнасці. Лідарам па ўзроўні развіцця ў рэгіёне з'яўляецца Сінгапур, а найбольшыя маштабы эканомікі ў Інданезіі (7-е месца па памерах ВУП). У лік самых бедных краін свету ўваходзяць Усходні Тымор і М'янма.

Паўднёвая Азія з'яўляецца адным з найбольш населеных і бедных рэгіёнаў свету. Ключавую ролю ў рэгіёне адыгрывае Індыя — трэцяя па памерах ВУП краіна ў свеце.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У Цэнтральную Азію ўваходзіць пяць дзяржаў: Казахстан, Туркменістан, Таджыкістан, Узбекістан і Кіргізія. Гэта адзіны рэгіён у Азіі, які не мае выхаду да акіяна.

Заходняя Азія ўключае найбольшую колькасць краін сярод усіх азіяцкіх рэгіёнаў і з'яўляецца адным з самых палітычна нестабільных рэгіёнаў свету. Найбуйнейшыя па маштабах эканамічнага развіцця краіны тут — Турцыя і Саудаўская Аравія. У большасці краін рэгіёна асноўнай рэлігіяй з'яўляецца іслам. Эканоміка многіх краін заснавана на здабычы нафты і прыроднага газу.

41.2. Японія. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Японія* — дзяржава на ўсходзе Азіі, размешчана на шматлікіх астравах. Найбліжэйшымі мацерыковымі суседзямі Японіі з'яўляюцца Кітай, Расія, Рэспубліка Карэя і Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка (КНДР). *(Назавіце астравы, якія ўваходзяць у склад архіпелага, моры і пралівы, якія аддзяляюць архіпелаг ад кантынента.)*

с. 74

Японскія астравы з'яўляюцца часткай Ціхаакіянскага «вогненнага кальца». Горны рэльеф займае 95 % тэрыторыі Японіі (мал. 143). Асаблівасцю тэрыторыі з'яўляецца беднасць на мінеральна-сыравінныя рэсурсы.



Мал. 143. Вулкан Фудзіяма

Клімат умераны і субтрапічны мусонны. Астраўное становішча, цячэнні каля ўзбярэжжа абумоўліваюць праяўленне ў клімаце Японіі ярка выяўленых марскіх рыс. Летні мусон прыносіць шмат ападкаў. Горныя рэкі шматлікія і паўнаводныя, а лясы пакрываюць 2/3 тэрыторыі краіны.

41.3. Насельніцтва. Дэмаграфічныя асаблівасці. Па колькасці насельніцтва (127 млн чал.) Японія займае 11-е месца ў свеце. Нараджальнасць у краіне — адна з самых нізкіх, а працягласць жыцця — адна з самых высокіх у свеце — 82 гады (78 гадоў для мужчын і 85 — для жанчын). Натуральны прырост адмоўны. Адбываецца старэнне насельніцтва. Ва ўзроставай структуры ўдзельная вага людзей, маладзейшых за 15 гадоў, складае 13 %, а старэйшых за 64 гады — 23 %. Жанчыны колькасна пераважаюць над мужчынамі (мал. 144).



Мал. 144. Японская сям'я ў нацыянальных касцюмах

Больш за 99 % насельніцтва складаюць японцы. Асноўныя рэлігіі — будызм, сінтаізм

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і канфуцыянства. Японія — адна з найбольш густазаселеных краін свету. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 335 чал./км^2. Насельніцтва па тэрыторыі размешчана вельмі нераўнамерна. Найбольш шчыльна заселена Ціхаакіянскае ўзбярэжжа: тут на 40 % тэрыторыі краіны пражывае 2/3 насельніцтва і сканцэнтравана асноўная частка эканамічнага патэнцыялу. У горных раёнах Хансю, на поўначы Хакайда шчыльнасць значна ніжэйшая за сярэднюю. У гарадах жыве 78 % жыхароў. У Японіі сфарміравалася некалькі буйных агламерацый, якія ўтвараюць адзін з найбуйнейшых сусветных мегалаполісаў — Такайда, які канцэнтруе 48 % насельніцтва краіны — больш за 60 млн чалавек (мал. 145). Усяго ў краіне 12 гарадоў з колькасцю насельніцтва больш за 1 млн чалавек, у тым ліку сталіца — *г. Токіа*.



Мал. 145. Мегалаполіс Такайда

41.4. Гаспадарка. Геаграфія сферы паслуг і прамысловай вытворчасці. Гаспадарка Японіі мае тыповую постіндустрыяльную структуру. Удзельная вага сферы паслуг у ВУП перавышае 70 %, на прамысловасць прыходзіцца 28 % і на сельскую гаспадарку — каля 1 %. У сферы паслуг атрымалі развіццё ўсе асноўныя віды дзейнасці, уключаючы гандаль, фінансавую дзейнасць і транспартныя паслугі.

Значныя маштабы гаспадарчай дзейнасці, залежнасць ад імпарту сыравіны і арыентацыя прамысловай вытворчасці на экспарт абумовілі выключную ролю знешняга гандлю ў эканоміцы Японіі. Па аб'ёме экспарту яна займае 4-е месца ў свеце, саступаючы толькі Кітаю, ЗША і Германіі.

Астраўное становішча, высокая шчыльнасць насельніцтва і вялікія маштабы эканомікі спрыяюць развіццю транспарту як аднаго з асноўных відаў дзейнасці сферы паслуг. Аўтамабільны транспарт ажыццяўляе 70 % пасажыраперавозак і больш за 50 % — грузаперавозак. У Японіі адзін з самых высокіх у свеце паказчыкаў шчыльнасці аўтадарог — 3 км на 1 км^2. Усе гарады з насельніцтвам больш за 500 тыс. чалавек злучаны сеткай скорасных аўтамагістралей. Другое месца па пасажыраперавозках займае чыгуначны транспарт (мал. 146). Ён забяспечвае перамяшчэнне ўнутры агламерацый і паміж астраўнымі тэрыторыямі.



Мал. 146. Цягнік высакаскараснай чыгуначнай сеткі «Сінкансэн»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гандлёвы флот абслугоўвае ўсе знешнегандлёвыя сувязі Японіі. Па яго ёмістасці краіна — другая ў свеце. Найбуйнейшыя марскія парты: Ціба, Кобэ, Ёкагама, Нагоя, Осака, Кітакюсю.

У структуры **прамысловасці** Японіі лідзіруюць навукаёмістыя, высокатэхналагічныя вытворчасці. Па аб'ёмах прамысловай вытворчасці Японія саступае толькі ЗША і Кітаю.

Для ***энергетыкі*** характэрна пастаяннае зніжэнне ролі нафты як крыніцы паліва і павелічэнне ўвагі да альтэрнатыўных крыніц энергіі: сонечнай энергіі і энергіі ветру. Па аб'ёмах вытворчасці электраэнергіі краіна займае 5-е месца ў свеце. На ЦЭС вырабляецца 60 % усёй электраэнергіі, на АЭС — прыкладна 30 %.

с. 77

У апрацоўчай прамысловасці пераважаюць сучасныя навукаёмістыя вытворчасці. Доля матэрыялаёмістых галін (хімічнай, чорнай і каляровай металургіі, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і інш.) паступова скарачаецца. У сувязі з арыентацыяй на прывазную сыравіну большасць прадпрыемстваў апрацоўчай прамысловасці канцэнтруецца на ціхаакіянскім узбярэжжы ў межах Ціхаакіянскага прамысловага пояса.

Чорная металургія прадстаўлена пераважна пераробнымі вытворчасцямі, якія працуюць на металаломе. Па выплаўленні сталі Японія займае 2-е месца ў свеце. У межах Ціхаакіянскага прамысловага пояса сканцэнтравана ***хімічная прамысловасць***. Яна развіваецца на аснове нафтапераапрацоўкі і накіравана на выраб сінтэтычнага каўчуку, хімічных валокнаў, пластмасы і інш. Асноўныя цэнтры — гарады Такійскай агламерацыі: Кавасакі, Ёкагама.

Вядучай галіной прамысловасці з'яўляецца ***машынабудаванне***. Яго прадпрыемствы вырабляюць больш за 40 % прамысловай прадукцыі краіны. Прадстаўлены як традыцыйныя, экспартна арыентаваныя галіны (суднабудаванне, аўтамабілебудаванне, станкабудаванне), так і новыя навукаёмістыя (электроніка, прыборабудаванне, вытворчасць робататэхнікі). Пазіцыі лідара ў свеце займае японскае суднабудаванне. Галоўныя цэнтры суднабудавання — Ёкагама, Кобэ, Нагасакі.

Японія — адзін з лідараў сусветнага аўтамабілебудавання. Найважнейшыя цэнтры — Таёта, Хірасіма, гарады Такійскай агламерацыі. Прадпрыемствы ***лёгкай***, ***дрэваапрацоўчай***, ***харчовай прамысловасці*** раўнамерна размеркаваны па тэрыторыі краіны і арыентаваны на мясцовую (вытворчасць харчовых прадуктаў) і прывазную (цэлюлозна-папяровая вытворчасць) сыравіну. Японія — найбуйнейшы пасля Кітая і ЗША вытворца паперы і кардону, пятая краіна ў свеце па вытворчасці піламатэрыялаў. Асноўныя эканамічныя цэнтры Японіі — Токіа, Ёкагама, Осака.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

41.5. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Развіццё аквакультуры. На сельскую гаспадарку Японіі прыходзіцца 4 % занятага насельніцтва і каля 1 % ВУП краіны. Землі, якія апрацоўваюцца, займаюць усяго 14 % тэрыторыі краіны. Больш як палова гэтых угоддзяў — заліўныя палі, што выкарыстоўваюцца для рысаводства. Амаль 70 % гаспадарак — малазямельныя, якія не перавышаюць 2 га. Сельская гаспадарка спецыялізуецца выключна на вытворчасці харчовай прадукцыі, забяспечваючы на 90 % патрэбы краіны ў рысе, на 65–95 % — у гародніне, садавіне, морапрадуктах, мясных і малочных прадуктах. Абмежаванасць зямельных угоддзяў стрымлівае развіццё жывёлагадоўлі. Дамінуе высокаінтэнсіўнае раслінаводства.

Вялікае значэнне ў харчаванні японцаў маюць морапрадукты. У сярэднім жыхар Японіі штогод спажывае 170 кг рыбы, што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам сярод краін у свеце. Больш за 400 суднаў рыбалоўнага флоту вядуць промысел у розных раёнах Сусветнага акіяна, 1/4 улову забяспечваюць прыбярэжныя воды. Па ўлове морапрадуктаў краіна ўваходзіць у пяцёрку сусветных лідараў (мал. 147). Абмежаванні на лоўлю рыбы ў водах Сусветнага акіяна вымусілі японцаў актыўна займацца аквакультурай.

Аквакультура — развядзенне і вырошчванне водных арганізмаў (рыб, ракападобных, малюскаў, водарасцей) у натуральных і штучных вадаёмах, а таксама на спецыяльна створаных марскіх плантацыях.





Мал. 147. Лоўля і продаж рыбы і морапрадуктаў

Абагульнім і запомнім. У Азіі вылучаецца пяць сацыяльна-эканамічных рэгіёнаў, найбольш развітым з якіх з'яўляецца Усходняя Азія. Японія — астраўная дзяржава ва Усходняй Азіі, тэрыторыя якой характарызуецца высокім узроўнем сейсмічнай актыўнасці. У гаспадарцы Японіі вядучую ролю адыгрывае сфера паслуг, а прамысловасць спецыялізуецца на вытворчасці навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі. Вядучай галіной сельскай гаспадаркі з'яўляецца раслінаводства.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым сябе. 1. Якія сацыяльна-эканамічныя рэгіёны вылучаюцца ў Азіі? 2. Назавіце галоўныя дэмаграфічныя асаблівасці Японіі. 3. Якую ролю адыгрывае сфера паслуг у гаспадарцы краіны? 4. Якія галіны прамысловасці атрымалі найбольшае развіццё ў Японіі і чаму? 5. Чаму раслінаводства адыгрывае вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы Японіі? 6. Што такое аквакультура і чым абумоўлена яе развіццё ў Японіі?

Ад тэорыі да практыкі. Вызначце, з якой прадукцыяй і якіх японскіх кампаній вы сустракаецеся ў сваім паўсядзённым жыцці: у побыце, на вуліцы, у магазінах. Чым, на ваш погляд, абумоўлена прысутнасць менавіта гэтай прадукцыі на беларускім рынку?

Абмяркуем. Доўгі час Японія абмяжоўвала знешнія міграцыі ў краіну. Шмат у чым гэтым былі абумоўленыя высокі ўзровень занятасці насельніцтва і нізкае беспрацоўе. Аднак нядаўна забарона на знешнія працоўныя міграцыі была адменена. Як вы думаеце, чым абумоўлена такое рашэнне?

§ 42. Кітай

Успамінаем. *Які ўплыў на развіццё гаспадарчай дзейнасці аказвае высокі ўзровень забяспечанасці працоўнымі рэсурсамі?*

Разважаем. *Якімі прычынамі абумоўлена тэрытарыяльная нераўнамернасць сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і якія шляхі яе пераадолення?*

42.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. ***Кітай*** — адна з найбуйнейшых па плошчы тэрыторыі і першая па колькасці насельніцтва краіна свету. Ён займае шырокія прасторы Усходняй Азіі і шырокім фронтам выходзіць да ўзбярэжжа Ціхага акіяна. Кітай мае адну з самых працяглых у свеце сухапутных меж (22,5 тыс. км) і мяжуе з 14 дзяржавамі. Працяглая марская мяжа дазваляе развіваць актыўныя гандлёвыя адносіны з Японіяй і іншымі краінамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна. *(Пакажыце на карце тэрыторыю краіны. Якія моры абмываюць яе ўзбярэжжа?)*

с. 74

Прыродныя ўмовы Кітая вельмі разнастайныя. Рэльеф краіны — гэта спалучэнне высокіх горных сістэм і шырокіх раўнін. Самае вялікае па плошчы нагор'е свету (2 млн км^2) — Тыбецкае — знаходзіцца на паўднёвым захадзе краіны і размяшчаецца на вышыні каля 4,5 тыс. м над узроўнем мора, а вяршыні яго хрыбтоў дасягаюць 6 тыс. м. Велізарную тэрыторыю на ўсходзе краіны займае Вялікая Кітайская раўніна. *(Якія тэктанічныя структуры складаюць тэрыторыю краіны?)*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На поўначы і захадзе Кітая клімат умераны рэзка кантынентальны. Тут пануюць пустыні, паўпустыні і стэпы. Рэкі рэдкія і кароткія. На ўсходняй, больш увільготненай частцы Тыбецкага нагор'я бяруць пачатак найбуйнейшыя рэкі Азіі — Янцзы і Хуанхэ.

У субтрапічным мусонным клімаце пануюць лясы. На поўначы гэта змешаныя іглічна-шыракалістыя лясы з карэйскага кедра, піхты, дуба, ясеня. Больш на поўдзень паяўляюцца лаўр, магнолія і лясы становяцца вечназялёнымі. Кітай з'яўляецца адным з сусветных лідараў па разнастайнасці лясных парод дрэў і хмызнякоў.

Кітай — адна з краін, найбольш багатых на карысныя выкапні. Тут здабываюць каменны вугаль, нафту, магніевыя і жалезныя руды, медзь, графіт, волава, сурму, ртуць, малібдэн, марганец, свінец, цынк, золата і інш.

42.2. Насельніцтва. Дэмаграфічныя асаблівасці. Кітай — самая населеная краіна ў свеце. Тут пражывае каля 1394 млн чалавек, або 18 % жыхароў Зямлі. З 70-х гг. XX ст. дзяржава праводзіла дэмаграфічную палітыку, накіраваную на зніжэнне нараджальнасці. У выніку чаго нараджальнасць у цяперашні час знізілася да 12,5 ‰ пры смяротнасці ў 7,5 ‰. Гэта забяспечыла натуральны прырост насельніцтва на 5 ‰. У Кітаі пераважаюць мужчыны (51 %), што характэрна для краін з вялікай удзельнай вагой моладзі. Каля 60 % насельніцтва знаходзіцца ў працаздольным узросце. Кітай валодае самай вялікай у свеце колькасцю працоўных рэсурсаў. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын складае 73 гады, жанчын — 77 гадоў.

У этнічнай структуры насельніцтва пераважаюць кітайцы (91 %). Паскоранае эканамічнае развіццё абумовіла хуткую ўрбанізацыю Кітая — доля гарадскога насельніцтва каля 55 %. Больш за 90 % гарадоў засяроджана на ўсходзе краіны. Большасць гараджан пражывае ў гарадах-мільянерах, іх больш за 60 (мал. 148). Размешчана насельніцтва вельмі нераўнамерна. Сярэдняя яго шчыльнасць складае каля 145 чал./км^2. Але калі на поўдні Вялікай Кітайскай раўніны яна ўзрастае да 500–650, то ў Тыбеце — памяншаецца да 1,5 чал./км^2.



Мал. 148. Шанхайская агламерацыя

42.3. Гаспадарка. Прамысловасць і сельская гаспадарка. Кітай — краіна, якая развіваецца, з эканомікай індустрыяльна-аграрнага тыпу.

У структуры ВУП краіны ўдзельная вага галін сферы паслуг складае 50 %, прамысловасці — 42 %, сельскай гаспадаркі — 8 %.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 78 Прамысловасць — найважнейшы від гаспадарчай дзейнасці Кітая, які найбольш дынамічна развіваецца. Нароўні з традыцыйнымі галінамі (тэкстыльнай, вугальнай, чорнай і каляровай металургіяй) у КНР атрымалі развіццё нафтаздабыўная, нафтаперапрацоўчая, хімічная, фармацэўтычная, аўтамабільная, авіяцыйная, касмічная і электронная.

Ключавая роля ў дынамічным развіцці эканомікі краіны належыць *энергетыцы*. Яна грунтуецца на ўласных, пераважна вугальных, рэсурсах. Па здабычы вугалю краіна займае 1-е месца ў свеце. Хутка растуць аб'ёмы здабычы нафты. Кітай з'яўляецца сусветным лідарам па выпрацоўцы электраэнергіі. Больш за 70 % яе вырабляецца на ЦЭС, самыя буйныя з якіх працуюць у прамысловых паўночна-ўсходніх раёнах краіны. Каля 20 % электраэнергіі вырабляюць ГЭС, найбуйнейшая з якіх *«Санься»* (мал. 149).



Мал. 149. «Санься» («Тры цясніны») — найбуйнейшая ГЭС у свеце

Большасць ГЭС пабудавана на р. Янцзы, у тым ліку «Санься», найбуйнейшая ў свеце (магутнасць 17,7 тыс. МВт). Узвядзенне ГЭС на раўнінных рэках суправаджаецца масавым перасяленнем людзей і пераносам цэлых гарадоў. Эксплуатуюцца яны комплексна — для вытворчасці электраэнергіі, водазабеспячэння, арашэння, абароны ад паводак.

Металургія прадстаўлена маштабнай вытворчасцю чорных і каляровых металаў. Значныя запасы вуглёў, якія каксуюцца, жалезных і марганцавых руд прадвызначылі развіццё чорнай металургіі пераважна на ўласнай сыравіне. На аснове выкарыстання ўласнай сыравіны (баксітаў, медных, алавяных руд, ртуці, сурмы, рэдказямельных металаў, золата і серабра) наладжана вытворчасць каляровых металаў. Кітай займае 1-е месца ў свеце па здабычы жалезных руд, выплаўцы чыгуну, сталі, вытворчасці сталёвых труб, а таксама па вытворчасці алюмінію.

Вялікая разнастайнасць прадукцыі і памеры вытворчасці характэрныя для ***машынабудавання***. Адна з галоўных яго галін — станкабудаванне. Па вытворчасці станкоў, разнастайнасці іх тыпаў і відаў Кітай уваходзіць у лік сусветных лідараў. Чыгуначнае машынабудаванне прымеркавана да найбуйнейшых металургічных прадпрыемстваў і чыгуначных вузлоў. У партах у вусцях найбуйнейшых рэк знаходзяцца цэнтры марскога суднабудавання, якія выпускаюць сухагрузы, танкеры,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

кантэйнеравозы, рэфрыжэратары і г. д. Аўтамабілебудаўнічая галіна спецыялізуецца на вытворчасці легкавых, грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Электратэхнічная прамысловасць вырабляе электраабсталяванне для ўсіх галін прамысловасці, сельскай гаспадаркі і бытавога прызначэння. Асноўныя цэнтры размешчаны на ўзбярэжжы.

Кітай уваходзіць у лік найбуйнейшых сусветных вытворцаў бытавой тэхнікі: халадзільнікаў, пральных машын, радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў (1-е месца ў свеце), магнітафонаў, гадзіннікаў, электронна-вылічальных машын, сродкаў сувязі, прыбораў і вымяральнай апаратуры і інш.

Хімічная прамысловасць. На ўласных сыравінных рэсурсах грунтуецца вытворчасць мінеральных угнаенняў (азотных і фосфарных), сернай кіслаты. Кітай займае 1-е месца ў свеце па выпуску хімічных валокнаў. Асноўная частка іх выкарыстоўваецца кітайскай тэкстыльнай прамысловасцю. Большасць прадпрыемстваў прымеркавана да цэнтраў нафтахіміі (Шанхай, *Пекін*, Нанкін і інш.).

Самы ёмісты ў свеце ўнутраны рынак, танныя працоўныя рэсурсы і сыравінная база абумовілі развіццё ***лёгкай*** прамысловасці. У тэкстыльнай, швейнай, трыкатажнай вытворчасцях выкарыстоўваюць пераважна натуральную сыравіну (бавоўну). Развіты гарбарна-абутковая, фарфорава-фаянсавая галіны, вытворчасць дываноў, народныя промыслы. Кітай — сусветны лідар у вытворчасці прадуктаў харчавання: чаю, раслінных (арахісавы, соевы, баваўняны) алеяў, напояў. Асноўныя эканамічныя цэнтры краіны — Шанхай, Пекін, Чунцын.

У **сельскай гаспадарцы** вядучую ролю адыгрывае ***раслінаводства***. Гэта абумоўлена размяшчэннем краіны ў трох кліматычных паясах, што дазваляе вырошчваць шырокі набор культур. Аснову раслінаводства складае збожжавая гаспадарка. Па валавым зборы збожжа Кітай лідзіруе ў свеце. Галоўная збожжавая і харчовая культура — рыс. Яго сеюць усюды, дзе магчыма арашэнне. Асноўныя раёны — даліны Янцзы і Хуанхэ. Збіраюць два, а часам і тры ўраджаі ў год.

Кітай — сусветны лідар па зборы пшаніцы, асноўныя пасевы якой знаходзяцца ў даліне Хуанхэ. Ён займае 1-е месца ў свеце па зборах бавоўны: на бавоўнік прыходзіцца 2/3 пасеваў тэхнічных культур. Галоўная алейная культура — арахіс. На поўдні размяшчаюцца плантацыі цукровага трыснягу і тытуню, на паўночным усходзе — буракоў, на поўдзень ад Янцзы і на в. Хайнань — чайныя плантацыі.

Асноўная галіна ***жывёлагадоўлі*** — свінагадоўля. Пагалоўе свіней, па якім Кітай лідзіруе ў свеце, сканцэнтравана ў асабістых гаспадарках. Кітай — сусветны лідар па пагалоўі авечак. Разводзяць буйную рагатую

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

жывёлу, коз, развіта птушкагадоўля, шаўкаводства. Для рыбаводства выкарыстоўваюцца рысавыя палі.

42.4. Транспарт і знешнеэканамічныя сувязі. У грузаабароце лідзіруюць водны і чыгуначны транспарт. Водны прадстаўлены марскімі міжнароднымі і кабатажнымі перавозкамі і ўнутраным рачным транспартам. У далёкіх грузаперавозках вялікая роля належыць чыгуначнаму транспарту, у аддаленых і цяжкадаступных раёнах — аўтамабільнаму.

Кітай — сусветны лідар па аб'ёме знешняга гандлю. Пры гэтым экспарт значна перавышае імпарт. У знешнім гандлі галоўныя партнёры — ЗША і Японія.

с. 79

42.5. Нераўнамернасць тэрытарыяльнага развіцця. Свабодныя эканамічныя зоны. Адна з галоўных асаблівасцей эканомікі Кітая — нераўнамернасць тэрытарыяльнага развіцця. Найбуйнейшыя гаспадарчыя цэнтры, у якіх сканцэнтравана асноўная частка насельніцтва і вырабляецца вялікая частка прамысловай прадукцыі, сканцэнтраваны на ўсходзе ўздоўж марскіх узбярэжжаў. Для прыцягнення замежных інвестыцый тут былі створаны свабодныя эканамічныя зоны (СЭЗ). Для замежных і нацыянальных прадпрымальнікаў у іх прадугледжваюцца падатковыя і мытныя льготы.

Свабодныя эканамічныя зоны — гэта тэрыторыі, якія характарызуюцца адмысловымі ўмовамі вядзення гаспадарчай дзейнасці, што адрозніваюцца ад астатняй часткі краіны.

Шырокія ўнутраныя раёны застаюцца пераважна аграрнымі і моцна адстаюць па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прамысловая вытворчасць тут прадстаўлена ў асноўным здабыўнымі галінамі. З мэтай павышэння ўзроўню развіцця ўнутраных і заходніх раёнаў краіны ў Кітаі распрацавана праграма «Адзін пояс і адзін шлях». Яна прадугледжвае развіццё сухапутных шляхоў паміж Еўропай і Кітаем пад агульнай назвай Новы шаўковы шлях (мал. 150).



Мал. 150. Транснацыянальныя маршруты «Адзін пояс і адзін шлях»

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Эканоміка-геаграфічнае становішча Кітая характарызуецца наяўнасцю вялікай колькасці суседніх дзяржаў і шырокім выхадам да мораў Ціхага акіяна. Кітай — самая населеная дзяржава свету, якая валодае найбольшай колькасцю працоўных рэсурсаў. У гаспадарцы Кітая вядучую ролю адыгрывае прамысловасць. Краіна з'яўляецца сусветным лідарам па вытворчасці асноўных відаў прамысловай прадукцыі. Галоўная галіна сельскай гаспадаркі — раслінаводства.

Праверым сябе. 1. На якія карысныя выкапні багатыя нетры краіны і чаму? 2. Якія асаблівасці сучаснай дэмаграфічнай сітуацыі ў Кітаі? 3. Якія галіны прамысловасці атрымалі ў Кітаі найбольшае развіццё і якія асаблівасці іх размяшчэння? 4. Чаму раслінаводства з'яўляецца асноўнай галіной сельскай гаспадаркі і якая яго спецыялізацыя? 5. Чым абумоўлена нераўнамернасць тэрытарыяльнага развіцця Кітая і якія шляхі яе пераадолення?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначце, якія буйныя праекты на тэрыторыі Беларусі былі рэалізаваны або рэалізуюцца з прыцягненнем кітайскіх інвестыцый.

Абмяркуем. Як вы думаеце, які ўплыў на развіццё міжнароднага турызму можа аказаць рост дабрабыту насельніцтва Кітая?

§ 43. Краіны Паўднёвай Азіі. Індыя

Успамінаем. *Якія прычыны абумоўліваюць федэратыўную форму палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы?*

Разважаем. *Ці можа рэлігія аказваць уплыў на гаспадарчую дзейнасць людзей?*

43.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Індыя* — адна з найбуйнейшых па памерах тэрыторыі і другая па колькасці насельніцтва краіна свету. Яна размешчана на крайнім поўдні мацерыка Еўразія. Галоўныя рысы эканоміка-геаграфічнага становішча Індыі — складанасць сухапутных сувязей з суседнімі краінамі і нізкі ўзровень іх эканамічнага развіцця, а таксама шырокі выхад краіны да Індыйскага акіяна.

Большая частка тэрыторыі — гэта шырокія раўніны, якія адпавядаюць старажытнай Індыйскай платформе. Краіна багатая на мінеральна-сыравінныя рэсурсы. Тут сканцэнтраваны радовішчы жалезных, марганцавых і хромавых руд, баксітаў, золата, лушчаку, графіту, урану, алмазаў і каменнага вугалю.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На большай частцы тэрыторыі Індыі клімат субэкватарыяльны мусонны. Галоўная яго асаблівасць — яркае праяўленне мусоннай цыркуляцыі паветраных мас з чаргаваннем сухога і вільготнага перыядаў. Па тэрыторыі краіны працякаюць рэкі Інд і Ганг.

Пастаянна цёплы клімат (летам тэмпературы вышэйшыя за +28 °С, зімой, як правіла, не апускаюцца ніжэй за +16 °С), вялікая колькасць вільгаці, геаграфічная ізаляванасць тэрыторыі спрыялі багаццю раслінага свету Індыі. Алювіяльныя глебы Інда-Гангскай раўніны і вулканічныя глебы на плато Дэкан характарызуюцца высокай натуральнай урадлівасцю (мал. 151). Лясы пакрываюць толькі 20 % тэрыторыі Індыі.



Мал. 151. Інда-Гангская нізіна

43.2. Дэмаграфічныя асаблівасці. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва. **На колькасці насельніцтва — 1371,3 млн чалавек — Індыя практычна зраўнялася з Кітаем.** Павелічэнню колькасці насельніцтва садзейнічае высокая нараджальнасць, якая складае 20 ‰, і нізкая смяротнасць — 6 ‰. Штогод насельніцтва Індыі павялічваецца на 16 млн чалавек. Удзельная вага жыхароў да 15 гадоў складае 29 %, а пасля 64 гадоў — 6 %. Мужчын больш, чым жанчын.

Індыя — самая шматнацыянальная краіна свету. Большасць суб'ектаў федэрацыі — штатаў — вылучана па этнічнай прыкмеце. Найбольш распаўсюджаная рэлігія — індуізм. Яго прыхільнікамі з'яўляецца 80 % вернікаў (мал. 152). Каля 10 % жыхароў вызнае іслам. Прадстаўлены таксама хрысціянства, будызм і іншыя рэлігіі.



Мал. 152. Індуісцкі храм Акшардхам

Па характары рассялення Індыя — тыповая аграрная краіна. Большая частка насельніцтва пражывае ў сельскай мясцовасці. Сярэдняя яго шчыльнасць — каля 880 чал./км^2. Удзельная вага гараджан у агульнай колькасці насельніцтва не перавышае 35 %. Большасць з іх — жыхары некалькіх дзясяткаў агламерацый, найбуйнейшымі з якіх з'яўляюцца Мумбаі, *Дэлі*, Бангалор і Калката. У сельскай гаспадарцы занята больш за 60 % працаздольнага насельніцтва, у прамысловасці — каля 16 %.

43.3. Гаспадарка. Асаблівасці развіцця і размяшчэння прамысловасці. Індыя — індустрыяльна-аграрная краіна, якая развіваецца, у яе эканоміцы вялікую ролю адыгрывае сельская гаспадарка. Пры гэтым яна

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

займае 3-е месца ў свеце па аб'ёме ВУП, уваходзіць у лік вядучых вытворцаў найважнейшых відаў прадукцыі (сталі, збожжа, тэкстылю і інш.). Індыя — адзін з сусветных лідараў па аб'ёме прамысловай вытворчасці. У структуры ВУП краіны на сферу паслуг прыходзіцца 53 %, на прамысловасць — 30 %, на сельскую гаспадарку — 17 %.

У прамысловасці вядучая роля належыць машынабудаванню, хоць традыцыйна вялікае значэнне надаецца лёгкай і харчовай галінам. Па вытворчасці электраэнергіі на душу насельніцтва Індыя на адным з апошніх месцаў у свеце. Энергетыка грунтуецца пераважна на вугалі. Значнае развіццё ў краіне атрымалі атамная энергетыка і гідраэнергетыка.

Індыя з'яўляецца буйным вытворцам прадукцыі чорнай і каляровай металургіі. ***Чорная металургія*** грунтуецца на ўласнай сыравіне. Прадпрыемствы размяшчаюцца каля радовішчаў вугалю, які каксуецца, жалезных руд (Бхілаі) і ў марскіх партах Бенгальскага заліва. Па аб'ёме гадавога выплаўлення сталі Індыя ўваходзіць у дзясятку сусветных лідараў. Аснову ***каляровай металургіі*** складае алюмініевая прамысловасць, якая развіваецца на мясцовай сыравіне.

У шматгаліновым ***машынабудаванні*** хутка развіваюцца сучасныя вытворчасці. Прадпрыемствы выпускаюць металарэзныя станкі, энергетычнае абсталяванне, цеплавозы, вагоны, судны, аўтамабілі, сельскагаспадарчую і авіяцыйную тэхніку. Створана касмічная прамысловасць, якая вырабляе штучныя спадарожнікі Зямлі, ракетаносьбіты. Індыя — адзін з сусветных лідараў у развіцці электронікі і інфармацыйных тэхналогій. На базе сеткі тэхнапаркаў створана магутная база па выпуску камп'ютарных праграм, мікрапрацэсараў, персанальных камп'ютараў, якія карыстаюцца попытам у эканамічна развітых краінах (мал. 153).



Мал. 153. У навуковай лабараторыі (Мумбаі)

с. 80

У ***хімічнай*** прамысловасці вылучаецца вытворчасць мінеральных угнаенняў. На базе нафтахімічных комплексаў выпускаюць сінтэтычныя смолы, пластмасы, сінтэтычны каўчук. Сінтэтычныя валокны служаць сыравінай для тэкстыльнай вытворчасці — асноўнай галіны ***лёгкай прамысловасці.*** Індыя — трэцяя ў свеце па вытворчасці яе прадукцыі. Баваўняныя вытворчасці знаходзяцца на захадзе і поўдні. Развіты шаўковая, джутавая і ваўняная галіны, дыванаткацтва. Каля 40 % прадукцыі даюць дробныя прадпрыемствы саматужнага тыпу, хатнія промыслы. Асноўныя эканамічныя цэнтры Індыі — Мумбаі, Дэлі, Бангалор, Калката.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

43.4. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Дзякуючы развіццю сельскай гаспадаркі Індыя цалкам забяспечвае сябе збожжам і з'яўляецца адным з сусветных лідараў па вытворчасці чаю, садавіны, малака, цукровага трыснягу, рысу, пшаніцы, гародніны, тытуню. Аднак сельская гаспадарка Індыі захоўвае шматлікія рысы адсталасці: выкарыстоўваюцца традыцыйныя метады земляробства, ручная праца. У ім занята 60 % насельніцтва, але на яго долю прыходзіцца толькі 17 % ВУП краіны.

Раслінаводства вырабляе больш за 80 % сельскагаспадарчай прадукцыі. Яго аснову складае земляробства. У Індыі два сельскагаспадарчыя сезоны — летні і зімовы — і адбываюцца два пасевы. Па валавых зборах рысу Індыя займае 2-е месца ў свеце пасля Кітая. Пасевы прымеркаваны да рачных дэльтаў і алювіяльных раўнін. У больш засушлівых унутраных раёнах вырошчваюць пшаніцу, кукурузу, ячмень, сорга. Галоўныя тэхнічныя культуры — бавоўнік, джут, чайны куст, цукровы трыснёг, алейныя (арахіс). Па вытворчасці чаю Індыя саступае толькі Кітаю, а па вытворчасці цукру — Бразіліі (мал. 154).



Мал. 154. Збор чаю

Слабая кармавая база і рэлігійныя погляды індыйцаў абмяжоўваюць развіццё таварнай ***жывёлагадоўлі***. Развіта птушкагадоўля, авечкагадоўля. Ва ўмовах дэфіцыту мясной прадукцыі вялікая роля рыбалоўства.

Абагульнім і запомнім. Індыя — адна з найбуйнейшых па памерах тэрыторыі і другая па колькасці насельніцтва краіна свету. Для насельніцтва Індыі характэрныя высокі натуральны прырост, складаны этнічны склад і нізкі ўзровень урбанізацыі. У прамысловасці вядучая роля належыць машынабудаванню. У сельскай гаспадарцы дамінуе раслінаводства, якое спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых (рыс, пшаніца, кукуруза) і тэхнічных (бавоўнік, чай, цукровы трыснёг) культур.

Праверым сябе. 1. Назавіце галоўныя рысы прыроды Індыі. 2. На якія карысныя выкапні багатыя нетры краіны? 3. Якія асаблівасці сучаснай дэмаграфічнай сітуацыі ў Індыі? 4. Якія галіны прамысловасці атрымалі ў Індыі найбольшае развіццё і якія асаблівасці іх размяшчэння? 5. Чаму раслінаводства з'яўляецца асноўнай галіной сельскай гаспадаркі і якая яго спецыялізацыя?

Ад тэорыі да практыкі. Якую прадукцыю прамысловасці і сельскай гаспадаркі вы маглі б прывезці ў якасці падарункаў сваім сябрам пасля турпаездкі ў Індыю?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Абмяркуем. Кітай і Індыя — дзве найбольш населеныя краіны свету. Улады гэтых краін ужо доўгі час праводзяць палітыку, накіраваную на зніжэнне нараджальнасці. У Кітаі гэтая палітыка дала свае вынікі, а ў Індыі — не. Як вы думаеце, чаму?

§ 44. Краіны Цэнтральнай Азіі: Казахстан, Узбекістан, Таджыкістан, Туркменістан, Кыргызстан



Успамінаем. *Для краін якога тыпу характэрна высокая ўдзельная вага здабыўной прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў структуры ВУП?*



Разважаем. *Якія вынікі для гаспадарчага развіцця краін мае іх размяшчэнне ў цэнтральнай частцы буйнога мацерыка?*

44.1. Склад тэрыторыі. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Дзяржавы Цэнтральнай Азіі — *Казахстан, Туркменістан, Узбекістан, Кыргызстан* і *Таджыкістан* — займаюць шырокія раўніны і горныя тэрыторыі ў цэнтры Азіі. Асаблівасцю эканоміка-геаграфічнага становішча гэтых краін з'яўляецца аддаленасць ад марскіх і акіянічных узбярэжжаў.

Кыргызстан і Таджыкістан — невялікія па плошчы горныя краіны. На высокія горы (Памір, Цянь-Шань) і нагор'і прыходзіцца больш за 90 % іх тэрыторыі. Туркменістан і Узбекістан па плошчы амаль удвая большыя, на іх тэрыторыях пераважаюць раўніны. У Казахстане — самай паўночнай дзяржаве Цэнтральнай Азіі і адной з найбуйнейшых на мацерыку — рэльеф больш разнастайны. На захадзе размяшчаюцца шырокія нізінныя раўніны, на ўсходзе — сярэднягор'і, а на паўднёвых і паўднёва-ўсходніх ускраінах — хрыбты найвышэйшых горных сістэм Цэнтральнай Азіі.

Па запасах прыроднага газу, вугалю, баксітаў, фасфарытаў, золата, сурмы, ртуці, уранавых руд гэтыя краіны ўваходзяць у лік сусветных лідараў. *(Чым тлумачыцца багацце рэгіёна на мінеральна-сыравінныя рэсурсы?)*

Клімат у рэгіёне ўмераны кантынентальны на поўначы і субтрапічны кантынентальны на поўдні. Тыповыя ландшафты — паўпустыні і пустыні. Толькі на поўначы, у Казахстане, распаўсюджаны стэпы. Лясы (хвойныя і шыракалістыя) і лугі сустракаюцца выключна на паўночных і заходніх схілах высакагор'яў, якія затрымліваюць вільгаць заходняга пераносу. Унутраныя воды размеркаваны па тэрыторыі вельмі нераўнамерна. Большая частка рэгіёна адносіцца да басейна ўнутранага сцёку.

Важнай рысай геаграфічнага становішча Казахстана і Туркменістана з'яўляецца шырокі выхад да Каспійскага мора. На яго шэльфе вядзецца распрацоўка радовішчаў нафты і прыроднага газу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 75

44.2. Насельніцтва. Дэмаграфічныя працэсы ў краінах рэгіёна маюць як рысы падабенства, так і істотныя адрозненні. Найбольшая колькасць насельніцтва ва Узбекістане — 33 млн чалавек. У Казахстане пражывае каля 18 млн, у Туркменістане, Кыргызстане і Таджыкістане колькасць насельніцтва не перавышае 10 млн чалавек. У цэлым для ўсіх краін характэрная высокая нараджальнасць (каля 20 ‰). Пры нізкай смяротнасці (6–7 ‰) гэта забяспечвае высокі натуральны прырост насельніцтва. Для рэгіёна характэрная нізкая сярэдняя шчыльнасць насельніцтва і крайняя нераўнамернасць яго размяшчэння.

Узровень урбанізацыі ў рэгіёне невысокі. Толькі ў Казахстане гарадское насельніцтва колькасна пераважае над сельскім, складаючы 57 %. Найменш урбанізаваны Таджыкістан — у гарадах пражывае ўсяго 27 % жыхароў. Большая частка гараджан дадзенага рэгіёна жыве ў буйных гарадах. Самымі вялікімі па колькасці насельніцтва гарадамі ва ўсіх краінах, за выключэннем Казахстана, з'яўляюцца сталіцы (мал. 155). У рэгіёне два гарады-мільянеры — Ташкент і Алматы (былая сталіца Казахстана). Сучасныя гарады, якія ўзніклі ў раёнах здабычы і перапрацоўкі карысных выкапняў, суседнічаюць са старажытнымі. Самыя вядомыя са старажытных гарадоў — Самарканд і Бухара. Усе дзяржавы шматнацыянальныя, але асноўную частку насельніцтва складаюць тытульныя этнасы. Пераважнай рэлігіяй сярод вернікаў з'яўляецца іслам.



Мал. 155. Сталіцы дзяржаў рэгіёна:
Нур-Султан (*а*); Ташкент (*б*); Бішкек (*в*); Душанбэ (*г*); Ашхабад (*д*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

44.3. Гаспадарка. У эканоміцы краін рэгіёна важную ролю адыгрывае сельская гаспадарка. Толькі ў Казахстане і Туркменістане ў кошце ВУП яе доля ніжэйшая, чым прамысловасці. У прамысловасці дамінуюць галіны паліўна-энергетычнага комплексу (газавая, нафтавая, электраэнергетыка), каляровая металургія, лёгкая, харчовая прамысловасць. ***Сельская гаспадарка*** спецыялізуецца пераважна на ***раслінаводстве***. Магчымасці яе развіцця моцна абмяжоўвае кантынентальны засушлівы клімат. На поўначы Казахстана і ў перадгор'ях, дзе клімат больш мяккі, вырошчваюць галоўную збожжавую культуру — пшаніцу. На значных тэрыторыях земляробства магчыма толькі пры ўмове штучнага арашэння — ірыгацыі (мал. 156).



Мал. 156. Арашальны канал



Мал. 157. Збор бавоўны

с. 82

На паліўных землях культывуюць рыс і тэхнічныя культуры, галоўная сярод якіх — бавоўнік (мал. 157). Па пасяўных плошчах і валавым зборы бавоўны-сырца Узбекістан уваходзіць у лік сусветных лідараў. У аазісах, міжгорных далінах і перадгор'ях вырошчваюць агародніннyя (у тым ліку бахчавыя) культуры, развіта садоўніцтва (абрыкосы, персікі) і вінаградарства. Інтэнсіўнае арашэнне, якое доўгі час праводзілася з парушэннем тэхнічных патрабаванняў, — прычына сур'ёзных экалагічных праблем рэгіёна: абмялення Аральскага мора, засалення глеб, апустыньвання, зніжэння біялагічнай разнастайнасці.

с. 83

Абмяленне Аральскага мора спарадзіла не толькі экалагічныя, але і сацыяльна-эканамічныя праблемы. Скараціліся рыбныя рэсурсы мора, закрыўся рыбны промысел. Населеныя пункты, якія знаходзіліся на берагах Арала, апынуліся сярод нежывой пустыні.

За межамі зоны земляробства развіваецца пашавая ***жывёлагадоўля***. У пустынях разводзяць авечак і коз, аднагорбых вярблюдаў, у гарах — мяса-шэрсныя пароды авечак, буйную рагатую жывёлу і коней, на Паміры — якаў. Малочная жывёлагадоўля і птушкагадоўля развіваюцца ў прыгарадных зонах буйных гарадоў. Буйную рагатую жывёлу разводзяць на поўначы Казахстана. У раёнах арашальнага земляробства развіта шаўкаводства.

Прамысловасць усіх краін спецыялізуецца на перапрацоўцы ўласнай прадукцыі сельскай гаспадаркі і мінеральнай сыравіны. Яе аснову

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ва ўсіх, акрамя Казахстана, краінах складае ***лёгкая прамысловасць***. Ажыццяўляецца першасная перапрацоўка бавоўны-сырца, воўны і шоўку, якія паступаюць на экспарт. Экспартнае значэнне мае вытворчасць смушак (скурак ягнят). Традыцыйным з'яўляецца выраб дываноў (у тым ліку ручны).

Асаблівае значэнне ў гаспадарцы краін рэгіёна маюць паліўная прамысловасць і энергетыка. Па здабычы нафты лідзіруе Казахстан, тут жа вядзецца вуглездабыча. У Казахстане, Узбекістане і Туркменістане большую частку электраэнергіі вырабляюць ЦЭС. Нафта, прыродны газ і каменны вугаль экспартуюцца. У Таджыкістане і Кыргызстане асноўным вытворцам электраэнергіі з'яўляюцца ГЭС. Электраэнергетыка забяспечвае развіццё энергаёмістых галін каляровай металургіі.

Вядучая роля ў ***металургіі*** належыць вытворчасці каляровых металаў, якая развіваецца на ўласных сыравінных і энергетычных рэсурсах.

У гэтую галіну актыўна прыцягваюцца замежныя інвестыцыі. Развіваецца вытворчасць ***хімічнай*** прадукцыі: мінеральных угнаенняў, неарганічных кіслот, лакаў і фарбаў і інш. ***Машынабудаванне*** развіта толькі ў Казахстане і Узбекістане. Яго галоўная спецыялізацыя — вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі, абсталявання для лёгкай і горназдабыўной прамысловасці, нафтаздабычы. Асноўнымі эканамічнымі цэнтрамі ўсіх краін з'яўляюцца сталічныя гарады — *Ташкент, Ашхабад, Бішкек, Нур-Султан, Душанбэ*, а таксама Алматы.

Аснову ***транспартнай сістэмы*** складае сетка трансазіяцкіх чыгуначных і аўтамабільных дарог і магістральных трубаправодаў. Вялікую працягласць маюць аўтамабільныя дарогі. У горных раёнах многія з іх выкарыстоўваюцца толькі сезонна. Па сістэме магістральных нафта- і газаправодаў туркменскі і ўзбекскі газ пастаўляюцца ў Таджыкістан, Кыргызстан, Казахстан, Расію, Украіну і іншыя краіны.

Важнае значэнне ў гаспадарчым развіцці ўсіх краін мае знешні гандаль. Галоўнымі знешнегандлёвымі партнёрамі з'яўляюцца Расія, Кітай, Турцыя, Іран, Пакістан, краіны Заходняй Еўропы і ЗША.

Абагульнім і запомнім. Эканоміка-геаграфічнае становішча краін рэгіёна характарызуецца аддаленасцю ад мораў і акіянаў, суседствам з Расіяй і Кітаем. У краінах рэгіёна назіраецца высокі натуральны прырост насельніцтва, вельмі нераўнамернае яго размяшчэнне па тэрыторыі і нізкі ўзровень урбанізацыі. У структуры ВУП большасці краін рэгіёна высокай застаецца ўдзельная вага здабыўной прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым сябе. 1. Назавіце асноўныя асаблівасці эканоміка-геаграфічнага становішча краін рэгіёна. 2. Які ўплыў на гаспадарчую дзейнасць у рэгіёне аказваюць прыродныя ўмовы і рэсурсы? 3. Якімі агульнымі рысамі характарызуюцца дэмаграфічныя працэсы ў краінах рэгіёна? 4. Якія галіны гаспадаркі атрымалі ў рэгіёне найбольшае развіццё і чаму? 5. Назавіце галоўныя экалагічныя праблемы рэгіёна. У чым іх прычыны?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы інфармацыю аб спецыялізацыі сельскай гаспадаркі краін Цэнтральнай Азіі, вызначце, якая прадукцыя раслінаводства і жывёлагадоўлі з гэтых краін можа выкарыстоўвацца ў якасці сыравіны для прамысловых прадпрыемстваў Беларусі або рэалізоўвацца на харчовых рынках нашай краіны.

Для дапытлівых. Доўгі час існавала праблема з вызначэннем прававога статусу Каспійскага мора пры асваенні яго рэсурсаў і вырашэнні экалагічных праблем. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначце, што гэта за праблема і як яна вырашылася.

§ 45. Краіны Заходняй Азіі: Азербайджан, Арменія, Грузія

Успамінаем. *Які ўплыў на гаспадарчую дзейнасць людзей аказвае горны характар тэрыторыі?*

Разважаем. *Якімі прычынамі можа быць абумоўлена ўзнікненне міжэтнічных і міжрэлігійных канфліктаў?*

45.1. Склад тэрыторыі. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Дзяржавы Закаўказзя — *Грузія*, *Азербайджан* і *Арменія* — займаюць паўночную частку рэгіёна Заходняя Азія. Асаблівасцю іх эканоміка-геаграфічнага становішча з'яўляецца размяшчэнне паміж акваторыямі Чорнага і Каспійскага мораў. Праз гэтую тэрыторыю праходзяць транзітныя шляхі з Азіі ў Еўропу. На поўначы дзяржавы мяжуюць з Расіяй, на поўдні — з Турцыяй і Іранам. Назва рэгіёна абумоўлена працяглым знаходжаннем яго тэрыторыі ў складзе Расійскай імперыі, а потым СССР. Калі глядзець з боку Расіі, то рэгіён знаходзіцца на поўдзень ад галоўнага хрыбта Вялікага Каўказа, г. зн. за Каўказам.



Мал. 158. Вялікі Арарат

Дзяржавы размяшчаюцца ў межах горных сістэм Каўказа і Армянскага нагор'я. Гара Казбек на Каўказе дасягае 5033 м, а гара Арагац на армянскім

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

нагор'і — 4090 м (найвышэйшы пункт нагор'я — вулкан Вялікі Арарат, які знаходзіцца ў Турцыі, — 5165 м) (мал. 158). Для рэгіёна характэрная высокая сейсмічнасць.

Нетры краін рэгіёна багатыя на карысныя выкапні. На Прыкаспійскай нізіне ў Азербайджане выяўлены буйныя радовішчы нафты і прыроднага газу, на тэрыторыі Грузіі — марганцавых руд, у Арменіі — медна-малібдэнавых руд, будаўнічага каменю. На ўсёй тэрыторыі рэгіёна шматлікія радовішчы мінеральных вод.

Рэльеф і геаграфічнае размяшчэнне спрыяюць разнастайнасці клімату. На захадзе — на чарнаморскім узбярэжжы — клімат субтрапічны вільготны. Лета спякотнае (+24 °С). За год тут выпадае каля 1800 мм ападкаў. У высакагор'ях Каўказа і на Армянскім нагор'і клімат больш суровы, з халоднай зімой — да −15 °С. На схілах хрыбтоў, асабліва вясной і на пачатку лета, выпадае шмат ападкаў (да 1000 мм). Ледніковыя воды сілкуюць шматлікія бурныя рэкі, самыя буйныя з якіх — Кура і Аракс. Найбуйнейшае возера — Севан.

45.2. Насельніцтва. Дэмаграфічныя асаблівасці. Этнапалітычныя праблемы. Насельніцтва кожнай краіны Закаўказзя характарызуецца сваімі асаблівасцямі. Па колькасці і натуральным прыросце насельніцтва лідзіруе Азербайджан. У Грузіі і Арменіі паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці прыкладна аднолькавыя, таму натуральнага прыросту насельніцтва практычна не адбываецца, у асобныя гады назіраецца нават яго змяншэнне. На колькасць насельніцтва ўсіх дзяржаў вялікі ўплыў аказалі міграцыі, звязаныя з міжэтнічнымі канфліктамі. Вялікая колькасць этнічных армян выехала з Азербайджана, а азербайджанцаў — з Арменіі. Ва ўнутраныя раёны Грузіі эмігравалі этнічныя грузіны з Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Значная колькасць армян, азербайджанцаў і грузін пражывае за межамі сваіх краін.

Полаўзроставая структура насельніцтва характарызуецца колькаснай перавагай жанчын над мужчынамі. Шмат у чым гэта абумоўлена большай працягласцю жыцця жанчын — каля 78 гадоў. Працягласць жыцця мужчын складае ў сярэднім 70–72 гады. Павелічэнне працягласці жыцця і скарачэнне нараджальнасці вядуць да паступовага старэння насельніцтва.

Узровень урбанізацыі ва ўсіх краінах невысокі: у Арменіі — каля 65 %, у Азербайджана і Грузіі — каля 55–57 %. Самыя буйныя гарады — сталіцы. У кожнай з іх пражывае больш за мільён жыхароў. Закаўказзе характарызуецца высокай шчыльнасцю насельніцтва, аднак яно размяшчаецца па тэрыторыі вельмі нераўнамерна. Так, у Арменіі больш за 50 % насельніцтва засяроджана ў Ерэванскай агламерацыі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Этнічны склад насельніцтва краін аднародны. Тытульныя этнасы складаюць у Арменіі і Азербайджане больш за 90 %, у Грузіі — каля 85 %. Армяне і грузіны з'яўляюцца хрысціянамі. Пераважная частка жыхароў Азербайджана прытрымліваецца ісламу.

У перыяд знаходжання ў складзе СССР на тэрыторыі дзяржаў Закаўказзя былі аўтаномныя ўтварэнні, населеныя прадстаўнікамі розных этнічных груп. У Азербайджане — Нагорны Карабах, населены армянамі, у Грузіі — Паўднёвая Асеція, Абхазія. Пасля атрымання закаўказскімі дзяржавамі незалежнасці на гэтых тэрыторыях утварыліся не прызнаныя большасцю краін свету дзяржавы. Працэс іх узнікнення суправаджаўся ўзброенымі канфліктамі, у тым ліку міждзяржаўнымі.

с. 81

45.3. Спецыялізацыя гаспадаркі краін рэгіёна. У гаспадарцы Азербайджана высокая ўдзельная вага прамысловасці, аснову якой складаюць нафтаздабыча і нафтаперапрацоўка (мал. 159).



Мал. 159. Здабыча нафты на шэльфе Каспійскага мора

У Грузіі і Арменіі пераважае сфера паслуг, а вядучымі галінамі матэрыяльнай вытворчасці з'яўляюцца сельская гаспадарка і звязаная з ёй харчовая прамысловасць.

Сельская гаспадарка Закаўказзя мае пераважна ***раслінаводчую*** спецыялізацыю. Аднак у структуры сельскагаспадарчых угоддзяў пераважаюць пашы, у асноўным горныя. Развіццё земляробства стрымліваецца недахопам прыдатных для апрацоўкі зямель. Самымі шырокімі пасяўнымі плошчамі валодае Азербайджан. Апрацоўваюць на іх збожжавыя (пшаніца) і тэхнічныя (бавоўнік) культуры. Вырошчваюць тытунь, чай, цытрусавыя, вінаград і пладовыя культуры (гранат, інжыр, айва і інш.). Азербайджан з'яўляецца найбуйнейшым пастаўшчыком ранняй агародніны ў Расію.

У прычарнаморскіх раёнах Грузіі вырошчваюць чай і цытрусавыя. На ўсходзе краіны і ў Арменіі галоўныя галіны — вінаградарства і садоўніцтва. У ***жывёлагадоўлі*** Грузіі і Азербайджана дамінуюць мяса-малочная жывёлагадоўля і мяса-шэрсная авечкагадоўля. Жывёлагадоўля Арменіі спецыялізуецца на развядзенні буйной рагатай жывёлы малочна-мяснога напрамку і авечкагадоўлі. Галіной спецыялізацыі прыкаспійскіх раёнаў Азербайджана з'яўляецца рыбалоўства. У Грузіі і Азербайджане развіта шаўкаводства, у Арменіі — свінагадоўля, ва ўсіх краінах — птушкагадоўля.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 160. Вытворчасць дываноў ручным спосабам

На перапрацоўцы ўласнай прадукцыі раслінаводства спецыялізуецца ***харчовая прамысловасць*** краін рэгіёна. У Арменіі вырабляюць віны і каньякі, мінеральную ваду, пладовыя кансервы. У Грузіі і Азербайджане, акрамя плодакансервавай, развіты вытворчасці чаю і тытуню, вінаробства і рыбная прамысловасць. На мясцовай сыравіне развіваецца і ***лёгкая прамысловасць***. Яе аснову складае тэкстыльная, якая вырабляе баваўняныя, шаўковыя і ваўняныя тканіны. Паўсюдна прадстаўлена гарбарна-абутковая вытворчасць, у Азербайджане і Арменіі — вытворчасць дываноў, у тым ліку ручным спосабам (мал. 160).

Выключнае значэнне ў эканоміцы ўсіх краін маюць галіны ***паліўна-энергетычнай прамысловасці***. У Азербайджане, дзе яны забяспечваюць каля 70 % кошту прамысловай прадукцыі, асноўную частку электраэнергіі вырабляюць ЦЭС, якія працуюць на мазуце і прыродным газе. У Грузіі і Арменіі вялікая роля ГЭС. У Арменіі дзейнічае адзіная ў рэгіёне Армянская АЭС.

Ва ўсіх краінах ёсць металургічныя вытворчасці. Чорная металургія развіваецца ў Грузіі. ***Каляровая металургія*** ў Азербайджане прадстаўлена алюмініевай прамысловасцю, у Арменіі — медна-малібдэнавай. Прадпрыемствы ***машынабудавання*** выпускаюць транспартныя сродкі, прамысловае абсталяванне, сельскагаспадарчыя машыны. Вядучыя цэнтры ў Азербайджане — Баку і Гянджа, у Грузіі — Тбілісі, Кутаісі і Батумі, у Арменіі — Ерэван. ***Хімічная*** прамысловасць прадстаўлена прадпрыемствамі нафтахіміі ў Азербайджане. Разнастайнасцю сыравіны абумоўлена развіццё прамысловасці ***будаўнічых матэрыялаў***. Мармур здабываюць і апрацоўваюць у Азербайджане і Арменіі. Асноўнымі эканамічнымі цэнтрамі ўсіх краін з'яўляюцца сталічныя гарады — *Баку, Тбілісі* і *Ерэван*.

Ва ўсіх краінах ва ўнутраных пасажырскіх перавозках галоўная роля належыць аўтамабільнаму транспарту, у міжнародных — авіяцыйнаму. Вялікае значэнне Закаўказскай чыгункі, якая праходзіць уздоўж Каспійскага і Чорнага мораў і злучае Баку з Сухумі і ўвесь рэгіён — з Расіяй. Праз усё Закаўказзе праходзяць нафтаправод Баку — Батумі і газаправод Карадаг — Агстафа. Будуецца нафтаправод праз тэрыторыю Грузіі ў Турцыю і далей — да Міжземнага мора.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Традыцыйнай галіной гаспадаркі ўсіх краін з'яўляецца турызм, перш за ўсё рэкрэацыйны. У рэгіёне створаны і функцыянуюць разнастайныя курорты: кліматычныя прыморскія, бальнеалагічныя, пабудаваныя каля мінеральных крыніц, гарналыжныя. Найбольш вядомыя курорты ў Грузіі — Батумі, Баржомі. У Арменіі турыстаў прыцягвае возера Севан. У Азербайджане асноўныя курорты сканцэнтраваны на ўзбярэжжы Каспійскага мора — Баку, Ленкарань.

Абагульнім і запомнім. Дзяржавы Закаўказзя — Грузія, Азербайджан і Арменія — займаюць паўночную частку рэгіёна Заходняя Азія і размяшчаюцца ў межах горных сістэм Каўказа. Для насельніцтва кожнай краіны характэрныя свае асаблівасці, абумоўленыя гістарычнымі, этнічнымі і рэлігійнымі адрозненнямі. У структуры ВУП Азербайджана высокая ўдзельная вага паліўнай прамысловасці. У Грузіі і Арменіі найважнейшымі галінамі гаспадарчай спецыялізацыі з'яўляюцца сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць. Ва ўсіх краінах рэгіёна актыўна развіваецца рэкрэацыйны турызм, ствараюцца курортныя зоны міжнароднага ўзроўню.

Праверым сябе. 1. Назавіце галоўныя асаблівасці эканоміка-геаграфічнага становішча краін рэгіёна. 2. Які ўплыў на гаспадарчую дзейнасць у рэгіёне аказвае горны характар тэрыторыі? 3. Якія агульныя і адметныя рысы характэрныя для насельніцтва краін Закаўказзя? 4. Пералічыце галіны гаспадарчай спецыялізацыі краін Закаўказзя і растлумачце адрозненні ў галіновай структуры прамысловасці гэтых краін. 5. Чым абумоўлена развіццё турызму ў краінах Закаўказзя?

Ад тэорыі да практыкі. Уявіце, што ваша сям'я збіраецца правесці адпачынак на курорце і плануе займацца актыўным адпачынкам: катацца на горных лыжах, здзяйсняць марскія прагулкі, вывучаць раслінны і жывёльны свет, знаёміцца з народнымі рамёствамі. Маглі б вы выбраць для гэтых мэт адну з дзяржаў Закаўказзя? Які курорт у гэтай дзяржаве вы рэкамендавалі б сваім бацькам?

Для дапытлівых. Акрамя этнапалітычных праблем, у краінах Закаўказзя існуюць і экалагічныя праблемы. Адна з іх — паніжэнне ўзроўню вады ў возеры Севан. Возера Севан — адзіная буйная крыніца прэснай вады ў Арменіі. Інтэнсіўнае выкарыстанне вод возера прывяло да яго абмялення і забруджвання. У мэтах падтрымання ўзроўню вады ў возеры былі пабудаваны спецыяльныя тунэлі для перакідання ў Севан вады з іншых азёр і вадасховішчаў. Выкарыстоўваючы розныя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія яшчэ экалагічныя праблемы існуюць у краінах Закаўказзя і як яны вырашаюцца.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 11. ПАЎНОЧНАЯ І ЦЭНТРАЛЬНАЯ АМЕРЫКА



§ 46. Паўночная і Цэнтральная Амерыка. Палітычная карта. Насельніцтва

Успамінаем. *Што такое ўрбанізацыя і агламерацыя?*

Разважаем. *Чаму ў Карыбскім басейне захавалася вялікая колькасць залежных тэрыторый?*

46.1. Сацыяльна-эканамічныя рэгіёны Амерыкі. Пры вылучэнні сацыяльна-эканамічных рэгіёнаў у Амерыцы ўлічваецца гісторыя засялення гэтай часткі свету і фарміравання дзяржаў. Па класіфікацыі ААН у Амерыцы вылучаюцца чатыры рэгіёны: Паўночная Амерыка, Цэнтральная Амерыка, Карыбскі басейн і Паўднёвая Амерыка. Першыя тры з іх знаходзяцца ў межах мацерыка Паўночная Амерыка, а чацвёрты ўключае краіны, размешчаныя на мацерыку Паўднёвая Амерыка. Краіны Цэнтральнай Амерыкі, Карыбскага басейна і Паўднёвай Амерыкі прынята аб'ядноўваць у агульны рэгіён Лацінская Амерыка. Такая назва звязана з тым, што абсалютная большасць гэтых краін была раней калоніямі Іспаніі і Партугаліі. Таму тут афіцыйна выкарыстоўваюцца іспанская і партугальская мовы, якія адносяцца да раманскай моўнай групы (якія паходзяць ад латыні).

с. 84

46.2. Паўночная і Цэнтральная Амерыка, Карыбскі басейн. Палітычная карта. На палітычнай карце рэгіёнаў налічваецца 23 дзяржавы, большасць з якіх па форме палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання з'яўляюцца ўнітарнымі. Аднак самыя буйныя па плошчы — ЗША, Канада і Мексіка — маюць федэратыўную форму ўладкавання. Для большасці дзяржаў рэгіёнаў характэрная рэспубліканская форма праўлення, якую яны абралі пасля атрымання незалежнасці. Канада, Беліз і шэраг дзяржаў Карыбскага басейна з'яўляюцца каралеўствамі ў складзе Садружнасці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У Карыбскім басейне захавалася вялікая колькасць залежных тэрыторый. Пераважна гэта валоданні Вялікабрытаніі (Бермудскія астравы, Віргінскія астравы), у меншай ступені — Францыі (Марцініка), ЗША (Пуэрта-Рыка) і Нідэрландаў. Залежнасць ад высокаразвітых дзяржаў дае гэтым тэрыторыям пэўную палітычную і эканамічную выгаду.

Па асаблівасцях эканамічнага развіцця краіны рэгіёнаў дзеляцца на дзве групы. Першую складаюць найбольш развітыя ў эканамічных адносінах краіны — ЗША і Канада — з постіндустрыяльным тыпам эканомікі, дзе вядучую ролю адыгрывае сфера паслуг. Шматгаліновая прамысловасць і сельская гаспадарка гэтых краін накіраваны на выраб разнастайнай прадукцыі, якая ў вялікіх аб'ёмах паступае на экспарт. Другая група — краіны, што развіваюцца, яна вельмі неаднастайная. Асаблівае становішча ў гэтай групе займае Мексіка — буйная краіна, якая развіваецца і валодае значнымі запасамі мінеральных рэсурсаў са шматгаліновай прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Па паказчыках эканамічнага развіцця Мексіка набліжаецца да групы вядучых эканамічна развітых краін свету.



Мал.. 161. Бананавая ферма (Коста-Рыка) (*а*); Панамскі канал (Панама) (*б*)

Невялікія краіны Цэнтральнай Амерыкі, якія развіваюцца, спецыялізуюцца на асобных галінах прамысловасці (здабыча і перапрацоўка карысных выкапняў, лесанарыхтоўкі), сельскай гаспадаркі (вытворчасць кавы, бананаў) або сферы паслуг (турызм, транспартныя паслугі). Некаторыя з іх (Коста-Рыка, Панама) характарызуюцца даволі высокім узроўнем жыцця насельніцтва (мал. 161).

Аснову эканомікі шматлікіх астраўных дзяржаў і залежных тэрыторый Карыбскага басейна, як правіла, складае адна або некалькі галін гаспадаркі. Пераважнае развіццё тут атрымалі сельская гаспадарка, турызм і асобныя прамысловыя вытворчасці.

46.3. Насельніцтва. Агульная колькасць насельніцтва ў рэгіёнах перавышае 590 млн чалавек. Асноўную частку яго складаюць жыхары ЗША, Мексікі і Канады. У сувязі са значнымі адрозненнямі краін рэгіёнаў па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця дэмаграфічныя працэсы ў іх таксама розныя. У ЗША і Канадзе натуральны прырост насельніцтва нізкі — каля 3 ‰. У дзяржавах Цэнтральнай Амерыкі пры высокай нараджальнасці (каля 20 ‰) і нізкай смяротнасці (5‰) натуральны прырост насельніцтва застаецца высокім — 15 ‰.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Да адкрыцця еўрапейцамі мацярык быў заселены мноствам індзейскіх плямён. Адны з іх (хайда, нутка) займаліся паляваннем і збіральніцтвам дзікіх пладоў, іншыя (атапаскі, алганкіны) — паляваннем і рыбалоўствам. Асноўным заняткам эскімосаў і алеутаў быў зверабойны промысел. З канца XV ст. пачынаецца фарміраванне сучаснага белага насельніцтва Паўночнай Амерыкі, а з XVII ст. на мацерыку з'яўляюцца прадстаўнікі экватарыяльнай расы.

Большая частка сучаснага насельніцтва Паўночнай Амерыкі (ЗША, Канада), якое з'яўляецца нашчадкамі перасяленцаў з Вялікабрытаніі, размаўляе на англійскай мове і ў рэлігійным плане адносіцца да пратэстантаў. У Цэнтральнай Амерыцы і краінах Карыбскага басейна пераважае іспанамоўнае насельніцтва, якое прытрымліваецца каталіцкага веравызнання. У Канадзе, пераважна ў правінцыі Квебек, нашчадкі перасяленцаў з Францыі размаўляюць на французскай мове.

Штогод у ЗША і Канаду прыбываюць сотні тысяч імігрантаў з усяго свету. Значная іх частка ў той ці іншай ступені захоўвае родную мову і культуру. Унутраныя міграцыі звязаны са зменай працы і месца жыхарства.

с. 85

Для краін рэгіёнаў характэрныя істотныя адрозненні ў размяшчэнні насельніцтва і ўзроўні ўрбанізацыі. Найбольш высокая шчыльнасць насельніцтва (больш за 200 чал./км^2) у краінах Карыбскага басейна і Цэнтральнай Амерыкі. У Мексіцы, ЗША і Канадзе гэты паказчык значна ніжэйшы, што абумоўлена вялікімі памерамі тэрыторыі і разнастайнасцю прыродных умоў.

У Канадзе і ЗША больш за 80 % насельніцтва пражывае ў гарадах. У Цэнтральнай Амерыцы і Карыбскім басейне ўзровень урбанізацыі не перавышае 70 % і моцна адрозніваецца па краінах. На Багамскіх астравах гараджане складаюць больш за 80 %, а ў Грэнадзе, Гандурасе, Гватэмале — каля 50 %.

Для Паўночнай Амерыкі характэрная высокая шчыльнасць гарадскіх паселішчаў, якія ўтвараюць найбуйнейшыя ў свеце гарадскія агламерацыі і мегалаполісы.

Мегалаполіс — найбольш буйная форма рассялення, якая ўтвараецца пры зрастанні гарадскіх агламерацый.

Найбуйнейшай гарадской агламерацыяй у Паўночнай Амерыцы з'яўляецца Н'ю-Ёрк, а ў Цэнтральнай Амерыцы — Мехіка. У кожнай з іх пражывае больш за 20 млн чалавек. Найбуйнейшы мегалаполіс Амерыкі — Паўночна-Усходні,



Мал. 162. Мегалаполіс Басваш

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

або Босваш, — знаходзіцца на тэрыторыі ЗША з колькасцю насельніцтва больш за 50 млн чалавек (мал. 162). Ён працягнуўся ад Бостана да Вашынгтона, уключаючы Н'ю-Ёркскую агламерацыю.

Абагульнім і запомнім. Па класіфікацыі ААН у Амерыцы вылучаюцца чатыры рэгіёны: Паўночная Амерыка, Цэнтральная Амерыка, Карыбскі басейн і Паўднёвая Амерыка. Сярод суверэнных дзяржаў у рэгіёнах Паўночная Амерыка, Цэнтральная Амерыка і Карыбскі басейн пераважаюць унітарныя рэспублікі. На палітычнай карце Цэнтральнай Амерыкі захоўваюцца шматлікія залежныя тэрыторыі. Для Паўночнай і Цэнтральнай Амерыкі характэрная высокая шчыльнасць гарадскіх паселішчаў, якія ўтвараюць найбуйнейшыя ў свеце гарадскія агламерацыі і мегалаполісы.

Праверым сябе. 1. Якія сацыяльна-эканамічныя рэгіёны вылучаюцца ў Амерыцы? 2. Чаму ў Паўночнай і Цэнтральнай Амерыцы пераважаюць дзяржавы з рэспубліканскай формай праўлення? 3. Якія дзяржавы ў Паўночнай і Цэнтральнай Амерыцы з'яўляюцца федэрацыямі і чаму? 4. Краіны якіх рэгіёнаў і чаму аб'ядноўваюць у рэгіён Лацінская Амерыка? 5. Якія асаблівасці ўрбанізацыі ў краінах рэгіёнаў і што такое мегалаполіс?

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы карту атласа, вызначце, для якіх раёнаў Паўночнай Амерыкі характэрная найбольш высокая шчыльнасць насельніцтва. Растлумачце прычыны нераўнамернага размяшчэння насельніцтва ў Паўночнай Амерыцы.

Абмяркуем. Як вы думаеце, чаму шэраг дзяржаў Амерыкі, прызнаючы брытанскага манарха кіраўніком дзяржавы, не адмаўляюцца ад манархічнай формы праўлення і не становяцца рэспублікамі?

§ 47. Краіны Паўночнай Амерыкі. Злучаныя Штаты Амерыкі

Успамінаем. *Што такое занальная спецыялізацыя сельскай гаспадаркі?*

Разважаем. *Чаму ЗША доўгі час застаюцца сусветнымі лідарамі па маштабах і ўзроўні эканамічнага развіцця?*

47.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы ЗША. Асаблівасць геаграфічнага становішча *ЗША* — размяшчэнне практычна ўсёй тэрыторыі краіны (за выключэннем Аляскі і Гавайскіх астравоў) у цэнтральнай частцы кантынента (мал. 163). На поўначы ЗША маюць працяглую сухапутную мяжу з Канадай, на поўдні — з Мексікай. На ўсходзе і захадзе ўзбярэжжа ЗША абмываюць воды двух акіянаў —

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Атлантычнага і Ціхага. Такое становішча спрыяе развіццю эканамічных сувязей з дзяржавамі Усходняга і Заходняга паўшар'яў. Выхад Аляскі да Паўночнага Ледавітага акіяна робіць ЗША адной з буйных арктычных дзяржаў. Сталіца ЗША — *г. Вашынгтон*.



Мал. 163. Гаваі — астраўны штат ЗША

ЗША — адна з нямногіх дзяржаў свету, якія валодаюць буйнымі запасамі ўсіх асноўных відаў прыродных рэсурсаў: зямельных, водных, лясных, разнастайных карысных выкапняў. Важнае значэнне для гаспадарчага развіцця ЗША маюць лясы і водныя рэсурсы.

Галоўная рыса рэльефу мацерыковай часткі краіны — мерыдыянальнае размяшчэнне асноўных яго формаў. Тэрыторыя ЗША падзяляецца на высакагорную, пераважна засушлівую заходнюю частку (Кардыльеры) і ў асноўным раўнінную вільготную ўсходнюю (Прыатлантычную). Цэнтр краіны займаюць шырокія ўнутраныя раўніны (Цэнтральныя і Вялікія). Асаблівасці прыроды ўплываюць на характар клімату і глебава-раслінага покрыва, на размеркаванне насельніцтва і размяшчэнне транспартнай сеткі, на спецыялізацыю гаспадаркі.

47.2. Насельніцтва. Дэмаграфічныя асаблівасці. На фарміраванне сучаснага насельніцтва ЗША аказалі ўплыў міграцыйныя працэсы, якія адбываліся ў XIX–XX стст. За гэты перыяд у краіну прыбыло каля 60 млн чалавек. Да пачатку XX ст. сярод імігрантаў пераважалі выхадцы з краін Заходняй і Паўночнай Еўропы — «старая іміграцыя». На мяжы XIX–XX стст. узмацніўся паток перасяленцаў з краін Паўднёвай і Усходняй Еўропы (Італіі, Венгрыі, Расіі — «новая іміграцыя»). Пазней міграцыя адбывалася пераважна з дзяржаў Лацінскай Амерыкі і Азіі. На долю імігрантаў прыходзіцца каля 30 % агульнага прыросту насельніцтва ЗША.

Агульная колькасць насельніцтва ЗША каля 330 млн чалавек. Для краіны характэрны станоўчы натуральны прырост насельніцтва (каля 3 ‰) і высокая сярэдняя працягласць жыцця — 79 гадоў. Нягледзячы на высокую ўдзельную вагу дзяцей (каля 20 %), назіраецца паступовае старэнне амерыканскай нацыі. Удзельная вага людзей старэйшых за 65 гадоў складае 15 %.

Расавы і этнічны склад насельніцтва ў ЗША цесна звязаныя. Гэта дазваляе вылучаць некалькі асноўных расава-этнічных груп. Каля 72 % жыхароў краіны адносіцца да этнічных груп, якія прадстаўляюць белую расу. Пераважна гэта нашчадкі выхадцаў з Еўропы. На афраамерыканцаў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прыходзіцца 12,5 % насельніцтва. Выхадцы з краін Азіі складаюць прыкладна 5 %, а амерыканскія індзейцы і карэнныя жыхары Аляскі — менш за 1 %. Расава-этнічныя асаблівасці адбіліся на рэлігійнай структуры насельніцтва (мал. 164).



Мал. 164. Рэлігійная структура насельніцтва ЗША (%)

ЗША — высокаўрбанізаваная краіна, гарадское насельніцтва складае 82 %. Налічваецца каля 40 гарадскіх агламерацый з насельніцтвам больш за 1 млн чалавек у кожнай, дзе сканцэнтравана больш за 50 % насельніцтва краіны. Найбуйнейшыя агламерацыі склаліся вакол гарадоў-мільянераў — Н'ю-Ёркская, Лос-Анджэлеская, Чыкагская, Сан-Францыская. Асноўная частка сельскага насельніцтва па родзе сваёй дзейнасці не звязана з сельскай гаспадаркай і пражывае ў горнапрамысловых пасёлках, цэнтрах лесараспрацовак, прыдарожных сэрвісных пунктах і да т. п.

Большая частка насельніцтва сканцэнтравана ў трох асноўных раёнах: Прыатлантычным (узбярэжжа Атлантычнага акіяна), Прыазёрным (тэрыторыя вакол Вялікіх азёр) і Каліфарнійскім. Насельніцтва ЗША характарызуецца высокай міграцыйнай рухомасцю.


с. 88

47.3. Гаспадарка. Прамысловасць. ЗША ўваходзяць у групу найбольш развітых краін свету з эканомікай постіндустрыяльнага тыпу. У структуры ВУП удзельная вага сферы паслуг складае 80 %, прамысловасці — 19 %, сельскай гаспадаркі — каля 1 %.

Асновай для развіцця прамысловасці ЗША з'яўляецца ***энергетыка***. Па аб'ёме здабыўной нафты ЗША разам з Саудаўскай Аравіяй і Расіяй утвараюць тройку сусветных лідараў. Імпарт нафты, якой не хапае для спажывання, ажыццяўляецца пераважна з Мексікі, Канады і Венесуэлы. ЗША займаюць 2-е месца ў свеце (пасля Кітая) па аб'ёмах вытворчасці і спажывання вугалю. Узрастае здабыча прыроднага газу (1-е месца ў свеце). ЗША — найбуйнейшы ў свеце (пасля Кітая) вытворца і спажывец электраэнергіі, асноўная частка якой выпрацоўваецца на ЦЭС.

Традыцыйнай галіной для прамысловасці ЗША з'яўляецца ***чорная металургія***, якая грунтуецца на буйных запасах жалезнай руды і вуглёў, якія каксуюцца. Гістарычна ў ЗША сфарміраваліся тры галоўныя раёны чорнай металургіі: Прыазёрны (*Чыкага* і *Дэтройт*), Паўночна-Апалачскі і Прыатлантычны. У першым выкарыстоўваюцца жалезныя руды з мясцовых радовішчаў. Паўночна-Апалачскі раён сфарміраваўся на мясцовых вуглях, якія каксуюцца (Пітсбург). Уздоўж Атлантычнага ўзбярэжжа размяшчаюцца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадпрыемствы, якія працуюць пераважна на імпартнай рудзе (Балтымар, Філадэльфія). ***Каляровая металургія*** засяроджана на Захадзе, дзе выкарыстоўваюцца мясцовыя рэсурсы і танная гідраэлектраэнергія. Практычна ўся алюмініевая прамысловасць працуе на прывазной сыравіне.

Хімічная прамысловасць ЗША займае 1-е месца ў свеце па кошце выпрацаванай прадукцыі, значную долю якой складаюць сінтэтычны каўчук і гуматэхнічныя вырабы, хімічныя валокны і пластмасы. Паўсюдна вырабляюцца мінеральныя ўгнаенні і створана высокага ўзроўню фармацэўтычная прамысловасць.

У ***машынабудаванні*** ЗША занята 2/5 усіх працоўных у прамысловай вытворчасці краіны і ствараецца каля 40 % кошту прадукцыі апрацоўчых галін. Машынабудаванне ЗША адрозніваецца высокай навукаёмістасцю і прадукцыйнасцю працы. Вядучую ролю адыгрывае транспартнае машынабудаванне, а ў яго складзе — аўтамабілебудаванне. Па вытворчасці аўтамабіляў ЗША займаюць 2-е месца ў свеце, саступаючы толькі Кітаю. Авіяракетна-касмічная прамысловасць спецыялізуецца на вытворчасці ваеннай і грамадзянскай прадукцыі. Найбуйнейшым сусветным вытворцам самалётаў з'яўляецца карпарацыя «Боінг» (мал. 165). Асноўныя прадпрыемствы галіны сканцэнтраваны ў штатах Каліфорнія (*Лос-Анджэлес*) і Вашынгтон (Сіэтл), а таксама ў Х'юстане і Бостане.



Мал. 165. Фінальная зборка Боінга-747

ЗША лідзіруюць па вытворчасці электратэхнічнага абсталявання, ЭВМ і іншай электроннай прадукцыі. Вядучая кампанія — «Ай-Бі-Эм» (IBM). Найважнейшыя цэнтры электроннай прамысловасці — Чыкага, Н'ю-Ёрк, Філадэльфія, Бостан, Сан-Францыска.

Высокага ўзроўню развіцця дасягнулі ў ЗША ***харчовая*** і ***лёгкая прамысловасць***. ЗША — найбуйнейшы ў свеце вытворца мясной і малочнай прадукцыі, напояў, кандытарскіх вырабаў. У лёгкай прамысловасці вядучае месца займае тэкстыльная прамысловасць (поўдзень ЗША).

47.4. Геаграфія і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Удзельная вага сельскай гаспадаркі ў эканоміцы ЗША нязначная (каля 1 % ВУП краіны). Аднак па агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі ЗША саступаюць толькі Кітаю.

Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — ***раслінаводства***. Па кошце выпрацаванай прадукцыі яно апераджае жывёлагадоўлю, што не характэрна для эканамічна развітых краін. У раслінаводстве дамінуе збожжавая гаспадарка (вытворчасць кукурузы і пшаніцы). Па валавым зборы збожжа ЗША

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

займаюць 2-е месца ў свеце пасля Кітая, а па вытворчасці кукурузы — 1-е месца. ЗША з'яўляюцца найбуйнейшым у свеце экспарцёрам кукурузы і пшаніцы. Вырошчваюцца таксама соя, разнастайныя кармавыя і тэхнічныя (бавоўна, тытунь) культуры, развіта садоўніцтва.



Мал. 166. Фермерская гаспадарка

У ***жывёлагадоўлі*** ЗША пераважаюць мясная і малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля і птушкагадоўля (мал. 166). Гэтыя галіны характарызуюцца высокім узроўнем спецыялізацыі. Птушкагадоўля — самая індустрыялізаваная галіна жывёлагадоўлі. ЗША — найбуйнейшы ў свеце вытворца і экспарцёр мяса птушкі.

Галоўная асаблівасць размяшчэння сельскай гаспадаркі ЗША — наяўнасць спецыялізаваных жывёлагадоўча-раслінаводчых раёнаў (паясоў). Вылучаюцца пшанічны (Вялікія раўніны), кукурузны (поўнач Цэнтральных раўнін), малочны (паўночны ўсход і прыазёрныя штаты), баваўняны (паўднёвыя штаты) і іншыя паясы.

47.5. Сфера паслуг. Транспарт і знешні гандаль. Удзельная вага сферы паслуг у ВУП краіны складае 80 %. Найбольш значнымі маштабамі вылучаюцца аперацыі з нерухомасцю, гандаль, фінансавыя паслугі, транспарт. ЗША — прызнаны сусветны лідар у сферы навукі і вышэйшай адукацыі.

Значэнне ***транспарту*** абумоўлена вялізнымі памерамі тэрыторыі, маштабамі гаспадарчай дзейнасці, мабільнасцю жыхароў краіны. У перавозках грузаў унутры краіны галоўную ролю адыгрывае чыгуначны транспарт. Па агульнай даўжыні чыгунак ЗША займаюць 1-е месца ў свеце. Найбольш густая чыгуначная сетка на поўначы. Тут жа знаходзіцца найбуйнейшы чыгуначны вузел ЗША — Чыкага. Аўтамабільны транспарт забяспечвае асноўныя перавозкі пасажыраў унутры краіны. Сетка аўтамабільных дарог раўнамерная і характарызуецца высокай якасцю.



Мал. 167. Марскі порт Х'юстан

Трубаправодны транспарт адрозніваецца самай разгалінаванай сеткай у свеце. Найбуйнейшыя нафтаправоды злучаюць поўдзень ЗША (Тэхас) з усімі буйнымі прамысловымі раёнамі краіны.

Знешні гандаль краіны ў асноўным абслугоўваецца марскім транспартам. Па аб'ёме марскіх перавозак ЗША займаюць 2-е месца ў свеце (пасля Японіі). Краіна валодае самым магутным у свеце флотам суднаў-кантэйнеравозаў. У ЗША

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

налічваецца каля 100 буйных партоў, галоўныя з іх — Х'юстан (мал. 167), Новы Арлеан, Н'ю-Ёрк.

У ЗША захоўвае значэнне ўнутраны водны транспарт. Па Місісіпі перавозяць збожжа, будаўнічыя матэрыялы, мінеральную сыравіну. Вялікія азёры выкарыстоўваюцца для перавозкі жалезнай руды, вугалю, лесу. Па іх ажыццяўляецца гандаль з Канадай.

Авіяцыйны транспарт — прыярытэтны ва ўнутраных і знешніх пасажыраперавозках. У ЗША самы буйны ў свеце парк самалётаў грамадзянскай авіяцыі і найбольшая колькасць дзейных аэрапортаў. Асноўныя авіявузлы — Н'ю-Ёрк, Чыкага, Лос-Анджэлес.

ЗША — сусветны лідар па аб'ёмах унутранага і знешняга гандлю. Асноўную частку знешнегандлёвага абароту краіны складаюць экспарт і імпарт тавараў. Пры гэтым імпарт тавараў істотна перавышае экспарт. У знешнім гандлі таксама вялікая доля экспарту і імпарту паслуг (каля 25 %), пры гэтым экспарт паслуг перавышае іх імпарт. Галоўныя крыніцы экспарту тавараў — машыны і абсталяванне.

Абагульнім і запомнім. ЗША — найбуйнейшая па колькасці насельніцтва і найбольш развітая ў эканамічных адносінах краіна Паўночнай Амерыкі. У постіндустрыяльнай гаспадарцы ЗША вядучая роля належыць сферы паслуг і навукаёмістым галінам прамысловасці. Адметнымі рысамі сельскай гаспадаркі з'яўляюцца высокая прадукцыйнасць працы і яго матэрыяльна-тэхнічная аснашчанасць. Краіна з'яўляецца лідарам сусветнага знешняга гандлю. Важную ролю ў знешніх эканамічных сувязях адыгрывае экспарт паслуг.

Праверым сябе. 1. Якімі асаблівасцямі характарызуецца эканоміка-геаграфічнае становішча ЗША? 2. Чым абумоўлена разнастайнасць прыродных умоў і рэсурсаў краіны? 3. Якія расава-этнічныя групы вылучаюцца сярод насельніцтва ЗША? 4. Якія галоўныя асаблівасці размяшчэння насельніцтва па тэрыторыі краіны? 5. Назавіце галіны міжнароднай спецыялізацыі ЗША ў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці.

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы карту атласа, вызначце, з якімі дзяржавамі для ЗША пераважным з'яўляецца ажыццяўленне знешняга гандлю праз парты на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна, а з якімі — праз ціхаакіянскія парты?

Абмяркуем. Адной з праблем для ЗША з'яўляецца нелегальная міграцыя з Мексікі і іншых краін Лацінскай Амерыкі. У мэтах яе прадухілення ў ЗША прадпрымаецца цэлы шэраг мер, у тым ліку вядзецца будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай. Як вы думаеце, якія негатыўныя наступствы для эканомікі ЗША мае нелегальная міграцыя? Ці ёсць у яе станоўчыя бакі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 48. Канада

Успамінаем. *Што такое Садружнасць нацый і якія дзяржавы называюцца каралеўствамі Садружнасці?*

Разважаем. *Чаму ў галіновай структуры ВУП Канады ўдзельная вага здабыўной прамысловасці і сельскай гаспадаркі больш высокая, чым у іншых высокаразвітых краінах?*

48.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Канада* займае значную частку Паўночнаамерыканскага кантынента і выходзіць да трох акіянаў (мал. 168). На сушы Канада мяжуе толькі з ЗША. Наяўнасць на поўдні і паўночным захадзе сухапутных меж з ЗША — найбольш развітой дзяржавай свету — абумовіла моцную эканамічную залежнасць Канады ад суседняй краіны. Выхад да Ціхага і Атлантычнага акіянаў садзейнічае наладжванню гандлёвых адносін з вялікай колькасцю краін. Сталіца Канады — *г. Атава*.



Мал. 168. Канада — краіна з самай доўгай берагавой лініяй у свеце

Тэрыторыя Канады багатая на запасы руд каляровых металаў (нікель, медзь, цынк, свінец), жалезнай руды, урану, нафты і прыроднага газу, калійных солей, азбесту, вугалю. Асабліва багатае на карысныя выкапні Лаўрэнційскае ўзвышша. Тут знаходзіцца ўнікальная рудная зона: радовішчы жалеза, нікелю, серабра, урану. Радовішчы распрацоўваюцца ў асноўным адкрытым спосабам. Канада з'яўляецца найбуйнейшым пастаўшчыком мінеральнай сыравіны ў ЗША і іншыя індустрыяльна развітыя краіны.

Больш за 40 % тэрыторыі краіны займае тайга. Па запасах драўніны і прэснай вады краіна знаходзіцца на 3-м месцы ў свеце. Вялікае значэнне маюць рэсурсы пушнога звера і прамысловай рыбы (ласось, селядзец, палтус, траска). Аднак суровы клімат на большай частцы тэрыторыі Канады абцяжарвае гаспадарчую дзейнасць людзей.

48.2. Насельніцтва і асаблівасці дэмаграфічнага развіцця. Колькасць насельніцтва ў Канадзе — 37 млн чалавек. Для Канады характэрны падобныя з ЗША дэмаграфічныя працэсы. Назіраецца нізкі натуральны прырост насельніцтва, высокая працягласць жыцця, колькасная перавага жанчын над мужчынамі і паступовае старэнне насельніцтва. Як і ў ЗША, іміграцыя абумовіла складаны этнічны і рэлігійны склад насельніцтва.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У адрозненне ад ЗША Канада вылучаецца вельмі нізкай шчыльнасцю насельніцтва (3,7 чал./км^2) і вельмі нераўнамерным яго размяшчэннем. Больш за 90 % жыхароў засяроджана ў прыгранічнай з ЗША паласе на поўдні краіны. У гарадах пражывае каля 81 % насельніцтва, пры гэтым каля 30 % гараджан засяроджана ў гарадах-мільянерах — Таронта (мал. 169), Манрэалі, Ванкуверы.



Мал. 169. Таронта — найбуйнейшы горад Канады

48.3. Гаспадарка. Галіны прамысловасці. Канада — высокаразвітая ў эканамічных адносінах краіна з эканомікай постіндустрыяльнага тыпу. У структуры ВУП на сферу паслуг прыходзіцца 71 %. Удзельная вага прамысловасці ў структуры ВУП краіны складае 27 %, пры гэтым 9 % прыходзіцца на здабыўную прамысловасць. Доля сельскай гаспадаркі — 2 %. Асаблівасцю гаспадаркі з'яўляецца значная роля горназдабыўной, лясной і дрэваапрацоўчай галін, энергетыкі і сельскай гаспадаркі.

Аснова эканомікі Канады — энергетыка. Па гадавым аб'ёме здабычы прыроднага газу Канада знаходзіцца на 5-м месцы ў свеце. Большая частка электраэнергіі выпрацоўваецца на ГЭС. Частку нафты, прыроднага газу і электраэнергіі Канада экспартуе ў ЗША.

Асноўная прадукцыя ***горназдабыўной прамысловасці*** — руды каляровых металаў (золата, цынк, медзь, нікель), жалезная руда, уран, калійныя солі, вугаль. Канада займае 1-е месца ў свеце па вытворчасці ўранавага канцэнтрату і здабычы калійных солей (поўдзень Канады). Аснову апрацоўчай прамысловасці складае машынабудаванне. Развіты сельскагаспадарчае і энергетычнае машынабудаванне, вытворчасць абсталявання для горназдабыўной і лясной прамысловасці. ***Металургія*** прадстаўлена пераважна выплаўкай каляровых металаў. Большасць вытворчасцей (нікелевая, медная і інш.) працуе на мясцовай сыравіне. Чорная металургія — вытворчасць чыгуну і сталі — сканцэнтравана на Атлантычным узбярэжжы. Найбуйнейшыя нафтаперапрацоўчыя заводы знаходзяцца ў *Ванкуверы*, Манрэалі, Эдмантане. Канада з'яўляецца найбуйнейшым усветным экспарцёрам калійных і азотных угнаенняў.



с. 87

Канада — вядучая лесапрамысловая дзяржава свету. Па экспарце піламатэрыялаў і паперы яна займае 1-е месца ў свеце. Асноўная частка цэлюлозна-папяровай вытворчасці сканцэнтравана паблізу ГЭС на рацэ Святога Лаўрэнція. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры Канады — *Таронта, Манрэаль*, Атава.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

48.4. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Сельская гаспадарка — складовая частка высокаразвітога аграрнага бізнесу краіны. На яе прыходзіцца 2 % ВУП Канады. Асноўнымі вытворцамі прадукцыі з'яўляюцца фермерскія гаспадаркі — высокаспецыялізаваныя прадпрыемствы, пераважна збожжавыя і жывёлагадоўчыя з мясной і малочнай спецыялізацыяй.

У галіновай структуры сельскай гаспадаркі пераважае жывёлагадоўля. Большая частка апрацаваных зямель сканцэнтравана на поўдні, у стэпавай зоне. Тут спецыялізуюцца на збожжавай гаспадарцы, пашавай мясной жывёлагадоўлі і мяса-шэрснай авечкагадоўлі. Канада ўваходзіць у першую дзясятку краін свету па валавой вытворчасці збожжа. У цэнтральных раёнах пераважае шматгаліновая жывёлагадоўля, развіваецца малочная гаспадарка і пладаводства. Канада з'яўляецца буйным экспарцёрам пшаніцы і алею.



Мал. 170. Рака Святога Лаўрэнція — буйная водная артэрыя Паўночнай Амерыкі

48.5. Геаграфія транспарту. У Канадзе развіты ўсе віды транспарту, для яе характэрна значная працягласць транспартных шляхоў. У апошнія дзесяцігоддзі найбольш хуткімі тэмпамі развіваўся аўтамабільны, трубаправодны і авіяцыйны транспарт. Нягледзячы на паступовае зніжэнне ролі чыгуначнага транспарту, ён па-ранейшаму дамінуе ва ўнутраных перавозках масавых грузаў. Вялікае значэнне ва ўнутраных грузаперавозках маюць водныя шляхі, найперш Вялікія азёры і рака Святога Лаўрэнція (мал. 170). Найбольш густая транспартная сетка на поўдні краіны, у памежных з ЗША раёнах.

Абагульнім і запомнім. Велізарныя памеры тэрыторыі, разнастайныя і багатыя прыродныя рэсурсы, выгаднае геаграфічнае становішча па суседстве з ЗША і параўнальна невялікая колькасць насельніцтва абумовілі спецыфіку галіновай структуры гаспадаркі Канады. Значную ролю ў гаспадарцы краіны адыгрываюць галіны, арыентаваныя на экспарт прадукцыі — горназдабыўная, лясная і дрэваапрацоўчая прамысловасць, энергетыка і сельская гаспадарка.

Праверым сябе. 1. Назавіце асаблівасці эканоміка-геаграфічнага становішча Канады. 2. Пералічыце асноўныя віды прыродных рэсурсаў краіны. 3. Што агульнага ў фарміраванні насельніцтва ЗША і Канады? 4. Які ўплыў аказваюць прыродныя ўмовы і рэсурсы на галіновую структуру прамысловасці і сельскай гаспадаркі Канады? 5. Якая міжнародная спецыялізацыя Канады ў прамысловай вытворчасці і сельскай гаспадарцы?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы матэрыял навучальнага дапаможніка, вызначце, якія віды прадукцыі будуць пераважаць у экспарце Канады і якія краіны могуць быць яе асноўнымі гандлёвымі партнёрамі.



Абмяркуем. У адрозненне ад ЗША ў Канадзе распрацавана і рэалізуецца шмат міграцыйных праграм, разлічаных на прыцягненне розных катэгорый імігрантаў. Чым абумоўлена такая міграцыйная палітыка?

§ 49. Краіны Цэнтральнай Амерыкі. Мексіка



Успамінаем. *Хто такія метысы? Якія рэгіёны і краіны ўваходзяць у склад Лацінскай Амерыкі?*



Разважаем. *Чаму па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця Мексіка значна саступае ЗША і Канадзе?*

49.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Мексіка* займае выгаднае становішча, знаходзячыся паміж Ціхім акіянам і Мексіканскім залівам, які адносіцца да акваторыі Атлантычнага акіяна. На поўначы яна мае працяглую (больш за 3 тыс. км) сухапутную мяжу з ЗША. На поўдні мяжуе з краінамі Цэнтральнай Амерыкі, якія развіваюцца.

Большую частку тэрыторыі Мексікі займаюць нагор'і і ўнутраныя пласкагор'і, каля трэцяй часткі тэрыторыі дзяржавы занята раўнінамі. Найбольш буйная раўніна размяшчаецца на паўвостраве, які носіць назву Юкатан. Усе нізіны ў асноўным размешчаны ўздоўж узбярэжжа Ціхага акіяна і Мексіканскага заліва. Краіна багатая на карысныя выкапні. Да руднага пояса ўздоўж узбярэжжа Ціхага акіяна прымеркаваны радовішчы поліметалічных і медных руд, ртуці. На тэрыторыі Мексікі разведаны буйныя радовішчы серабра, свінцу, цынку, золата і ўрану. Самай каштоўнай мінеральнай сыравінай краіны з'яўляюцца нафта і прыродны газ, радовішчы якіх сканцэнтраваны ў паўднёвых штатах і на шэльфе Мексіканскага заліва.

Клімат краіны засушлівы. Унутраныя раёны, дзе пражывае асноўная частка насельніцтва і засяроджана гаспадарчая дзейнасць, адчуваюць пастаянны дэфіцыт вады. На ўзбярэжжы Мексіканскага заліва захаваліся трапічныя лясы. *(У якіх прыродных зонах размешчана Мексіка?)*

49.2. Насельніцтва. Дэмаграфічныя асаблівасці. Колькасць насельніцтва Мексікі складае больш за 130 млн чалавек і штогод павялічваецца прыкладна на 2 млн жыхароў. Для краіны характэрныя высокія тэмпы натуральнага прыросту насельніцтва. Нараджальнасць складае 19 ‰, а смяротнасць знаходзіцца на ўзроўні 6 ‰. Гэта дазваляе Мексіцы заставацца адной з «маладых» краін свету. Каля 27 % жыхароў краіны — дзеці да 15 гадоў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 171. Мехіка

Асноўную частку насельніцтва краіны складаюць метысы, якія гавораць на іспанскай мове. Сярод вернікаў пераважаюць католікі. Прадстаўнікі карэннага насельніцтва — індзейцы — сканцэнтраваны пераважна ў паўднёвых штатах. Самыя буйныя народнасці — ацтэкі, мая, сапатэкі, тараскі. Большая частка насельніцтва пражывае ў цэнтральных штатах. Амаль 70 % жыхароў засяроджана на Мексіканскім нагор'і на вышыні больш за 1000 м над узроўнем мора. Асабліва вылучаецца раён сталіцы краіны *г. Мехіка*, дзе сфарміравалася сталічная агламерацыя, якая налічвае больш за 20 млн чалавек, — адна з найбуйнейшых у свеце (мал. 171).

У гарадах пражывае 75 % насельніцтва. Сельскія паселішчы аддзелены адно ад аднаго шырокімі бязлюднымі прасторамі. Гарады, размешчаныя ўздоўж мяжы з ЗША, цесна звязаны з эканомікай суседняй дзяржавы.

с. 89

49.3. Гаспадарка. Прамысловасць. Па маштабах гаспадарчай дзейнасці Мексіка адносіцца да ліку вядучых краін свету. Аднак паказчык ВУП на душу насельніцтва застаецца пакуль яшчэ нізкім, што дазваляе лічыць Мексіку краінай, якая развіваецца, з эканомікай індустрыяльна-аграрнага тыпу. Пра гэта ж сведчыць і галіновая структура ВУП Мексікі. На сферу паслуг у ёй прыходзіцца 63 %, прамысловасць — 33 %, сельскую гаспадарку — 4 %.

Краіна валодае шматгаліновай прамысловасцю, якая базуецца на багатай сыравіннай базе і вялікіх рэзервах таннай працоўнай сілы. Аснову для развіцця мексіканскай энергетыкі складаюць нафта і прыродны газ. Большая частка электраэнергіі выпрацоўваецца на ЦЭС.

У Мексіцы на прамысловай аснове дзейнічаюць геатэрмальныя і сонечныя станцыі.

Галоўныя галіны апрацоўчай прамысловасці — ***нафтаперапрацоўчая*** і ***нафтахімічная***, ***машынабудаванне*** і ***металургія***. Буйныя нафтаперапрацоўчыя цэнтры сфарміраваліся на ўзбярэжжы Мексіканскага заліва.

Машынабудаванне — другая па значнасці галіна прамысловасці пасля нафтахімічнай. Вылучаецца аўтамабілебудаванне, у якім пануюць замежныя кампаніі, вырабляецца чыгуначны рухомы састаў, сельскагаспадарчая тэхніка. Мексіка ўваходзіць у лік вядучых сусветных вытворцаў станкоў і абсталявання. Асноўныя эканамічныя цэнтры Мексікі — Мехіка, Пуэбла-дэ-Сарагоса, Гвадалахара.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

49.4. Сельская гаспадарка. На большай частцы тэрыторыі Мексікі неспрыяльныя прыродныя ўмовы для вядзення сельскай гаспадаркі. Каля 40 % тэрыторыі займаюць пустыні і паўпустыні, яшчэ столькі ж — горы і лясы. Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — ***раслінаводства***. Кукуруза і фасоля з'яўляюцца галоўнымі харчовымі культурамі (мал. 172). Вырошчваюць пшаніцу, цукровы трыснёг, трапічную садавіну (цытрусавыя, манга, ананасы, папаю), каву. ***Жывёлагадоўля*** прадстаўлена ў асноўным развядзеннем буйной рагатай жывёлы мяснога напрамку. Па пагалоўі буйной рагатай жывёлы Мексіка займае 9-е месца ў свеце. У прыбярэжных раёнах атрымала развіццё рыбалоўства.



Мал. 172. Збор ураджаю кукурузы ў Мексіцы

49.5. Транспарт. Асноўная роля ў перавозках грузаў і пасажыраў належыць аўтамабільнаму транспарту (паўночная і цэнтральная часткі краіны). Галоўныя чыгуначныя магістралі перасякаюць краіну з поўначы на поўдзень і звязваюць гарады Мексікі з ЗША. Мексіка знаходзіцца на скрыжаванні паветраных шляхоў з Паўночнага паўшар'я ў Паўднёвае. Густая сетка нафта- і газаправодаў злучае месцы здабычы з цэнтрамі перапрацоўкі і спажывання.

Абагульнім і запомнім. Мексіка — краіна, якая валодае значным прыродна-рэсурсным і дэмаграфічным патэнцыялам і адной з найбольш дынамічных ў развіцці эканомік у свеце. Дзякуючы высокаму натуральнаму прыросту насельніцтва Мексіка ўваходзіць у лік найбольш «маладых» краін свету. Прамысловасць характарызуецца шматгаліновай структурай і значнымі маштабамі вытворчасці. Вядучай галіной сельскай гаспадаркі з'яўляецца раслінаводства.

Праверым сябе. 1. Назавіце асаблівасці эканоміка-геаграфічнага становішча Мексікі. 2. На якія карысныя выкапні багатыя нетры краіны? 3. У чым асноўнае адрозненне дэмаграфічнай сітуацыі ў Мексіцы і ў ЗША? 4. Якія галіны спецыялізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі Мексікі?

Ад тэорыі да практыкі. Зрабіце прагноз, як зменіцца колькасць насельніцтва Мексікі праз 20 гадоў, калі натуральны прырост у краіне захаваецца на цяперашнім узроўні. Ці зможа Мексіка па колькасці насельніцтва абысці ЗША?

Абмяркуем. У апошнія гады назіраецца тэндэнцыя паступовага перамяшчэння прамысловых прадпрыемстваў з цэнтральных раёнаў Мексікі да ўзбярэжжа. Як вы думаеце, чым гэта абумоўлена?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 12. ПАЎДНЁВАЯ АМЕРЫКА



§ 50. Палітычная карта і насельніцтва Паўднёвай Амерыкі

Успамінаем. *Чаму Паўднёвую Амерыку называюць мацерыком прыродных рэкордаў і якія з іх вы ведаеце?*

Разважаем. *Чаму насельніцтва большасці краін Паўднёвай Амерыкі размаўляе на іспанскай мове?*

50.1. Палітычная карта Паўднёвай Амерыкі фарміравалася на працягу доўгага часу. Можна вылучыць асноўныя этапы яе ўтварэння: да еўрапейскай каланізацыі; каланіяльны; паслякаланіяльны і сучасны (этап пасля Другой сусветнай вайны). *(Успомніце, калі і кім была адкрыта Амерыка.)* Археалагічныя даследаванні даказваюць існаванне ў дакалумбавай Амерыцы некалькіх цывілізацый: наска, мачэ, уары, чыму, інкі (мал. 173).



Мал. 173. Старажытны горад інкаў

с. 91

Пасля адкрыцця Амерыкі еўрапейскія краіны Іспанія і Партугалія падзялілі паміж сабой тэрыторыю мацерыка. Партугалія атрымала ў валоданне ўсходнія тэрыторыі, Іспанія — заходнія. Этап еўрапейскай каланізацыі суправаджаўся знішчэннем карэннага насельніцтва (індзейскіх плямёнаў) і яго культуры. Завяршыўся каланіяльны этап да канца XVII ст. У выніку распачатай у XVIII ст. доўгай і кровапралітнай барацьбы з іспанскімі і партугальскімі каланізатарамі народы большасці краін Паўднёвай Амерыкі да пачатку XIX ст. заваявалі незалежнасць. Палітычная ўлада многіх краін была няўстойлівай, а тэрытарыяльныя спрэчкі нярэдка суправаджаліся войнамі. Чацвёрты этап, які пачаўся ў сярэдзіне XX ст., прывёў да фарміравання сучаснай палітычнай карты рэгіёна. Да канца XX ст. практычна ўсе краіны сталі незалежнымі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У цяперашні час у межах Паўднёвай Амерыкі размешчана 12 дзяржаў і тры залежныя тэрыторыі. Толькі дзве дзяржавы рэгіёна з'яўляюцца ўнутрыкантынентальнымі, а дзве залежныя тэрыторыі — астраўнымі. *(Вызначце па карце, якія дзяржавы рэгіёна не маюць выхаду да акіянаў.)* Па форме праўлення ўсе дзяржавы — рэспублікі. Па палітыка-тэрытарыяльным уладкаванні пераважаюць унітарныя дзяржавы, за выключэннем Бразіліі, Аргенціны і Венесуэлы, якія маюць федэратыўнае дзяржаўнае ўладкаванне.

с. 90

50.2. Насельніцтва і асаблівасці дэмаграфічнага развіцця. Паўднёвая Амерыка — адзін з найменш заселеных мацерыкоў. Тут пражывае крыху больш за 400 млн чалавек, што складае менш за 6 % насельніцтва Зямлі. Амаль палова насельніцтва кантынента пражывае ў самай вялікай па плошчы дзяржаве — Бразіліі (209 млн чал.). Да найбуйнейшых па колькасці насельніцтва таксама адносяцца Калумбія (49 млн чал.), Аргенціна (44 млн чал.).

Паўднёвая Амерыка — самы «малады» рэгіён свету. Сярэдні ўзрост насельніцтва складае каля 30 гадоў. Амаль 70 % насельніцтва знаходзіцца ва ўзросце 15–65 гадоў. Сярэдні каэфіцыент натуральнага прыросту складае каля 10 ‰ (каэфіцыент нараджальнасці — 16 ‰, каэфіцыент смяротнасці — 6 ‰). Высокая і сярэдняя працягласць жыцця насельніцтва — 75,5 года (мужчыны — 72 гады, жанчыны — 79 гадоў).

с. 91

50.3. Расы і расавыя групы. Этнічны і рэлігійны склад. Этнічны склад насельніцтва ўяўляе з сябе пярэстае змешванне плямёнаў, народнасцей, нацый. У яго фарміраванні вялікую ролю адыграла гістарычнае развіццё мацерыка. Тут пражываюць прадстаўнікі ўсіх трох рас: мангалоіднай, еўрапеоіднай і экватарыяльнай. Да прыходу еўрапейцаў кантынент засялялі індзейскія плямёны, якія знаходзіліся на розных ступенях развіцця, — інкі, гуарані і інш. Еўрапейцы іміграваліі сюды ў асноўным з Іспаніі і Партугаліі. Для асваення новых зямель і працы на плантацыях яны прывозілі рабоў з Афрыкі. У цяперашні час у Паўднёвай Амерыцы пераважаюць нашчадкі змешаных шлюбаў — метысы, мулаты і самба. *(Успомніце, ад прадстаўнікоў якіх асноўных рас утварыліся змешаныя расы.)* Этнічны склад насельніцтва ў краінах істотна змяніўся ў XX ст. У сувязі з эміграцыяй з Германіі і Італіі, Індыі і Кітая. Большасць сучаснага насельніцтва мацерыка — метысы. Аднак у шэрага краін захаваліся буйныя індзейскія народы: кечуа — у Перу, Балівіі і Эквадоры (мал. 174), аймара — у Балівіі, араўканы — у Чылі, а таксама невялікія плямёны і народы, якія захавалі сваю мову і культуру.



Мал. 174. Індзейцы Эквадора

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У краінах Паўднёвай Амерыкі расавае змешванне адбываецца досыць актыўна і ў цяперашні час. Працэс фарміравання новых народаў ідзе пераважна ў Бразіліі, Аргенціне, Перу, Венесуэле і інш. У рэгіёне пражывае прыкладна 250 вялікіх і малых народаў. Асноўная частка насельніцтва (90 %) — католікі, ёсць пратэстанты і праваслаўныя. У большасці дзяржаў афіцыйная дзяржаўная мова іспанская, у Бразіліі — партугальская.

50.4. Размяшчэнне насельніцтва. Гарады і агламерацыі. Нераўнамернасць размяшчэння насельніцтва Паўднёвай Амерыкі абумоўлена як прыроднымі ўмовамі, так і гісторыяй засялення кантынента. Асноўная частка насельніцтва сканцэнтравана на ўзбярэжжы Атлантычнага і Ціхага акіяна. Пры сярэдняй шчыльнасці насельніцтва на мацерыку 23,2 чал./км^2 тут яна складае 50–100 і больш чал./км^2. Слабазаселенымі раёнамі з'яўляюцца велізарныя прасторы вільготных экватарыяльных і пераменна-вільготных субэкватарыяльных лясоў басейнаў рэк Амазонкі, Арынока, Парагвай і засушлівая вобласць плато Патагоніі (шчыльнасць менш за 1 чал./км^2). Найбольш высокая шчыльнасць насельніцтва ў Эквадоры (61,1 чал./км^2), найменшая — у Сурынаме (3,4 чал./км^2). Асаблівасцю рассялення людзей у Паўднёвай Амерыцы з'яўляецца тое, што значная частка насельніцтва пражывае не толькі на раўнінах, але і на нагор'ях, у Андах на вышынях ад 1000 да 2500 м, у поясе «вечнай вясны». Ён атрымаў сваю назву з-за роўных на працягу года ўмераных тэмператур (мал. 175).



Мал. 175. Горад Ла-Пас (Балівія) — самы высакагорны горад-мільянер

с. 90

Паўднёвая Амерыка — адзін з самых урбанізаваных рэгіёнаў свету, доля гарадскога насельніцтва 83 %. У цяперашні час тут каля 30 гарадоў-мільянераў, вялікая частка з іх — прыбярэжныя гарады. Найбуйнейшыя гарадскія агламерацыі: Сан-Паўлу — 11,2 млн чал., Рыа-дэ-Жанейра — 6,1 млн чал. (Бразілія), Ліма — 9,6 млн чал. (Перу), Багата — 7,3 млн чал. (Калумбія), Буэнас-Айрэс — 3,1 млн чал. (Аргенціна).

У Аргенціне, Венесуэле, Бразіліі ў гарадах жыве да 90 % насельніцтва. Гэтыя дзяржавы адносяцца да ліку найбольш урбанізаваных у свеце. У асноўным урбанізацыя звязана з развіццём прамысловасці. У Паўднёвай Амерыцы асабліва ярка выяўлена асаблівасць, характэрная таксама для іншых рэгіёнаў свету, якія развіваюцца, і называецца лжывай урбанізацыяй.

Ілжывая ўрбанізацыя — гэта працэс росту колькасці гарадскога насельніцтва і пашырэння тэрыторыі гарадоў з адсутнасцю пераваг гарадскога ладу жыцця.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Галоўная прычына лжывай урбанізацыі — пастаянны прыток у гарады беднага сельскага насельніцтва, якое ўлады не ў стане забяспечыць жыллём, працай. Мігранты з сельскай мясцовасці доўга захоўваюць ранейшы лад жыцця. У выніку адбываецца пранікненне сельскага ладу жыцця ў гарады, уключаючы вялікія. Пры высокай шчыльнасці насельніцтва для іх характэрныя часовыя халупы і трушчобы (мал. 176), беднасць насельніцтва, абвастрэнне крымінальнай сітуацыі.



Мал. 176. Трушчобы (фавэлы) у прыгарадзе Рыа-дэ-Жанейра

Абагульнім і запомнім. На сучаснай палітычнай карце Паўднёвай Амерыкі 12 дзяржаў і тры залежныя тэрыторыі. Каланіяльны перыяд развіцця рэгіёна адбіўся на этнічным і рэлігійным складзе насельніцтва. Для Паўднёвай Амерыкі характэрныя высокія тэмпы росту колькасці насельніцтва, а таксама перавага людзей маладога ўзросту і высокі ўзровень урбанізацыі. Большасць гарадоў і гарадскіх агламерацый засяроджана ў прыбярэжнай зоне. Урбанізацыя суправаджаецца працэсам ілжывай урбанізацыі.

Праверым сябе. 1. Якія этапы вылучаюць у фарміраванні палітычнай карты Паўднёвай Амерыкі? 2. Якія народы засяляюць дзяржавы мацерыка? 3. Які працэс называюць ілжывай урбанізацыяй? 4. Якія раёны Паўднёвай Амерыкі маюць найбольшую і найменшую шчыльнасць насельніцтва і чаму? 5. Чым абумоўлена адносная «маладосць» жыхароў большасці дзяржаў Паўднёвай Амерыкі?

Ад тэорыі да практыкі. У якой з краін або ў якім з гарадоў Паўднёвай Амерыкі вы хацелі б пабываць і чаму?

Абмяркуем. Якія праблемы выклікае лжывая ўрбанізацыя?

§ 51. Агульная характарыстыка гаспадаркі Паўднёвай Амерыкі. Экалагічныя праблемы гаспадарчага асваення рэгіёна

Успамінаем. *Якія асаблівасці геаграфічнага становішча Паўднёвай Амерыкі? На якія прыродныя рэсурсы багаты мацярык?*

Разважаем. *Чым тлумачыцца прыморскі характар размяшчэння большасці буйных прамысловых цэнтраў?*

51.1. Асаблівасці структуры валавога ўнутранага прадукту краін Паўднёвай Амерыкі. Адметнай рысай эканамічнага развіцця краін

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паўднёвай Амерыкі з'яўляецца зніжэнне ў ВУП долі сельскай гаспадаркі і павышэнне ўдзельнай вагі прамысловасці (мал. 177).



Мал. 177. Галіновая структура ВУП Паўднёвай Амерыкі (%)

У апошні час эканоміка краін Паўднёвай Амерыкі паказала тэмпы росту, якія апераджаюць сярэднесусветныя. За апошнія дзесяцігоддзі ў рэгіёне былі практычна зноўку створаны такія галіны, як металургія, машынабудаванне, хімічная прамысловасць. Асноўныя прыродныя багацці рэгіёна — карысныя выкапні, лясныя рэсурсы, а таксама кліматычныя рэсурсы, якія дазваляюць актыўна займацца сельскай гаспадаркай і развіваць турызм.

Краіны рэгіёна знаходзяцца на больш высокім узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця ў параўнанні з краінамі іншых рэгіёнаў, якія развіваюцца. Валавы ўнутраны прадукт рэгіёна складае 3,7 трлн дол. ЗША — гэта каля 5 % сусветнага ВУП. ВУП на душу насельніцтва рэгіён — каля 8,8 тыс. дол. Аднак паміж асобнымі краінамі захоўваюцца значныя адрозненні ва ўзроўні эканамічнага развіцця. Напрыклад, эканоміка Бразіліі, Аргенціны, Чылі набліжаецца да ўзроўню развітых краін. У Балівіі, Парагваі асноўная роля належыць сельскай гаспадарцы, здабычы мінеральнай сыравіны і паліва, лясной прамысловасці. Найбольшая доля ў ВУП Паўднёвай Амерыкі належыць Бразіліі.

51.2. Геаграфія прамысловасці. Нягледзячы на паскоранае развіццё апрацоўчай прамысловасці, галоўнай галіной рэгіёна з'яўляецца здабыўная прамысловасць. У здабыўной прамысловасці вылучаецца здабыча нафты ў Венесуэле, Аргенціне, Эквадоры, Калумбіі.

Здабыча жалезных, медных, нікелевых руд складае аснову здабыўной прамысловасці Бразіліі, Венесуэлы, Чылі, Перу.

У Бразіліі таксама вядзецца здабыча марганцавай руды, баксітаў. Па здабычы меднай руды Чылі і Перу займаюць 1-е і 3-е месцы ў свеце адпаведна (мал. 178). Балівія славіцца здабычай волава. У Калумбіі, Бразіліі, Перу вядзецца здабыча каштоўных металаў.



Мал. 178. Чукікамата — медны руднік у Чылі

Апрацоўчая прамысловасць арыентавана перш за ўсё на задавальненне патрэб унутранага рынку, якія растуць з-за хуткага павелічэння колькасці насельніцтва. Узрастае

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

роля хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці, чорнай металургіі, машынабудавання, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Асновай электраэнергетыкі Паўднёвай Амерыкі з'яўляецца гідраэнергетыка. Гідраэнергетычныя рэсурсы спрыяюць будаўніцтву на кантыненце найбуйнейшых у свеце ГЭС: *Itайпу* на рацэ Паране, Гуры ў Венесуэле, Тукуруі ў Бразіліі. Частка электраэнергіі выпрацоўваецца на цеплавых і атамных электрастанцыях.

Адной з вядучых галін у большасці краін Паўднёвай Амерыкі з'яўляецца ***каляровая металургія***. Прадпрыемствы гэтай галіны размяшчаюцца ўздоўж Анд, каля радовішчаў медзі і іншых каляровых металаў (Чылі, Перу, Балівія). Асаблівае месца ў каляровай металургіі займае алюмініевая прамысловасць. Вылучаецца вытворчасць гліназёму, які ішоў на экспарт у паўночнаамерыканскія краіны, перш за ўсё ў ЗША. Дзякуючы наяўнасці значных запасаў жалезнай руды і энерганосьбітаў атрымала развіццё ***чорная металургія***. Прадпрыемствы чорнай металургіі ёсць у Аргенціне, Бразіліі, Венесуэле, Калумбіі, Перу, Чылі і Уругваі, усе яны працуюць на ўнутраны рынак.

Машынабудаванне развіваецца не толькі ў Аргенціне і Бразіліі, але і ў Венесуэле, Чылі, Калумбіі, Перу. Найважнейшымі яго цэнтрамі сталі Буэнас-Айрэс, Кардова (Аргенціна), Сан-Паўлу, Белу-Арызонты (Бразілія). Галоўная галіна машынабудавання — транспартнае машынабудаванне. Аўтамабілі вырабляюцца ў Бразіліі, Аргенціне, Венесуэле. Развіваецца суднабудаванне і авіябудаванне (Бразілія), сельскагаспадарчае машынабудаванне (Бразілія і Аргенціна). З'яўляюцца аэракасмічная галіна, мікраэлектроніка — у Бразіліі, робататэхніка, ядзерная энергетыка — у Аргенціне.

Хімічная і ***нафтахімічная*** прамысловасць атрымала развіццё ў Бразіліі, Аргенціне і Венесуэле. Асноўную долю яе прадукцыі складаюць тавары бытавой хіміі і асноўнай хіміі. Ва ўсіх нафтаздабыўных краінах (Венесуэла, Эквадор і інш.) развіта нафтаперапрацоўчая прамысловасць.

Аснову ***дрэваапрацоўчай*** прамысловасці Паўднёвай Амерыкі складае лесапілаванне (Бразілія, Аргенціна, Чылі, Калумбія). Краіны рэгіёна цалкам задавальняюць свае патрэбы ў прадукцыі гэтай галіны. Каштоўныя пароды драўніны ідуць на экспарт. Піламатэрыялы экспартуе Бразілія.


с. 92

Асноўнымі прамысловымі цэнтрамі амаль ва ўсіх краінах з'яўляюцца сталічныя гарады, дзе вырабляецца ад 50 да 80 % прамысловай прадукцыі краіны, напрыклад *Буэнас-Айрэс* (Аргенціна), Монтэвідэа (Уругвай), Каракас (Венесуэла), *Ліма* (Перу), *Сант'яга* (Чылі), *Багата* (Калумбія). Выгаднае геаграфічнае становішча, масавы прыток імігрантаў, арыентацыя на знешні рынак спрыялі фарміраванню

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прамысловых цэнтраў у партовых гарадах Атлантычнага і Ціхаакіянскага ўзбярэжжаў, напрыклад Рыа-дэ-Жанейра (Бразілія), Ліма (Перу). Фарміраванне і развіццё іншых галіновых прамысловых цэнтраў і раёнаў адбывалася на аснове здабычы сыравіны і паліва, а затым дадавалася іх апрацоўка: нафтавы раён Маракайба ў Венесуэле (мал. 179), прамысловыя раёны Бразіліі і Чылі на аснове распрацовак жалезных і медных руд.



Мал. 179. Маракайба — «нафтавы горад» у Венесуэле

51.3. Геаграфія сельскай гаспадаркі. У структуры сельскай гаспадаркі Паўднёвай Амерыкі пераважае ***раслінаводства***. Найбольшую плошчу пасеваў займаюць харчовыя культуры паўсядзённага попыту: кукуруза, рыс, проса, бабовыя, батат.

«Твар» Паўднёвай Амерыкі ў сусветнай сельскай гаспадарцы вызначаюць трапічныя культуры: цукровы трыснёг (мал. 180), кава, какава, бананы і бавоўнік, якія растуць на буйных плантацыях. Большую частку ўраджаю пшаніцы даюць Аргенціна і Бразілія.

Жывёлагадоўля мае мясны напрамак, але ў той жа час атрымлівае развіццё малочная жывёлагадоўля. Аргенціна займае 2-е месца ў свеце па экспарце ялавічыны. У Бразіліі развіваецца птушкагадоўля, прадукцыя таксама ідзе на экспарт.



Мал. 180. Механізаваная ўборка цукровага трыснягу

51.4. Транспарт. Знешнія эканамічныя сувязі. Транспартная сетка ў Паўднёвай Амерыцы развіта недастаткова, што з'яўляецца стрымлівальным фактарам у развіцці рэгіёна. Вядучая роля ў перавозках належыць аўтамабільнаму транспарту, аднак гушчыня дарожнай сеткі недастатковая. Найбольш важныя магістралі — Панамерыканскае шасэ, якое працягнулася з поўначы на поўдзень праз увесь рэгіён ад Панамы (Панамскага канала) да сталіцы Аргенціны — горада Буэнас-Айрэс, і Трансамазонская магістраль даўжынёй 5,4 тыс. км, што перасякае Амазонію з захаду на ўсход (мал. 181). Чыгуначная сетка прадстаўлена дарогамі, якія праходзяць з цэнтральных раёнаў краін да буйных партоў. Адна з



Мал. 181. Трансамазонская магістраль

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

самых высакагорных у свеце чыгунак з Лімы ў Арая перасякае Анды на вышыні 4818 м (мал. 182). Паколькі большасць краін мае выхад да акіяна, з дапамогай марскога транспарту ажыццяўляюцца як унутраныя перавозкі, так і міжнародныя. Вялікае значэнне ва ўнутраных перавозках мае паветраны і рачны транспарт.



Мал. 182. Цэнтральнаандзінская чыгунка — першая чыгуначная лінія ў Паўднёвай Амерыцы

Знешнегандлёвыя сувязі Паўднёвай Амерыкі арыентаваны на рынкі ЗША, Заходняй Еўропы і Усходняй Азіі. У экспарце краін пераважае сыравіна, паліва, прадукцыя сельскай гаспадаркі. Краіны Паўднёвай Амерыкі пастаўляюць на сусветны рынак нафту і нафтапрадукты, чорныя і каляровыя металы, каву, какаву, бавоўну, мяса, пшаніцу, цукар, цытрусавыя.

51.5. Экалагічныя праблемы гаспадарчага асваення рэгіёна. На плошчы тэрыторый з непарушанай прыродай Паўднёвая Амерыка займае 2-е месца пасля Антарктыды. Здабыча нафты ў гушчыні экватарыяльных лясоў Амазоніі, жалезных руд на Гвіянскім і бразільскім пласкагор'ях запатрабавала будаўніцтва транспартных шляхоў у нядаўна яшчэ недаступных раёнах. Гэта прывяло да росту колькасці насельніцтва ў гэтых раёнах, знішчэння лясоў, пашырэння ворных і пашавых зямель (мал. 183), забруджвання рэк і азёр. Знішчэнне лясоў прыводзіць да разбурэння глебы, скарачэння колькасці жывёл, памяншэння арэалаў іх распаўсюджання. Амазонію ў Паўднёвым паўшар'і лічаць адным з галоўных раёнаў абязлесення. Па прычыне лясных пажараў у Паўднёвай Амерыцы ўжо знікла каля 40 % трапічных лясоў.



Мал. 183. Выпальванне лясоў Амазоніі для ачышчэння зямель пад сельскагаспадарчыя ўгоддзі

Абагульнім і запомнім. Асаблівасцю структуры ВУП краін Паўднёвай Амерыкі з'яўляецца зніжэнне долі сельскай гаспадаркі і павышэнне ўдзельнай вагі прамысловасці. Тэмпы эканамічнага росту краін рэгіёна апераджаюць сярэднесусветныя паказчыкі. Развіццю эканомікі спрыяюць велізарныя запасы прыродных рэсурсаў, паскоранае развіццё апрацоўчай прамысловасці. У экспарце краін пераважае сыравіна, паліва, прадукцыя сельскай гаспадаркі. Бескантрольнае і не заўсёды апраўданае гаспадарчае асваенне тэрыторый і іх рэсурсаў — прычына экалагічных праблем многіх краін.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым сябе. 1. Якія асаблівасці структуры ВУП паўднёваамерыканскага рэгіёна? 2. Якія галіны здабыўной прамысловасці развіваюцца ў Паўднёвай Амерыцы і ў якіх краінах? 3. Якія галіны апрацоўчай прамысловасці атрымалі большае развіццё ў краінах рэгіёна і якую прадукцыю яны вырабляюць? 4. Якія асаблівасці раслінаводства ў краінах Паўднёвай Амерыкі? 5. З якімі працэсамі ў Паўднёвай Амерыцы звязаны экалагічныя праблемы?

Ад тэорыі да практыкі. Прапануйце сваім аднакласнікам зрабіць віртуальнае падарожжа па Паўднёвай Амерыцы. Выкарыстоўваючы тэматычныя карты і тэкст параграфа, прарэкламуйце тры эканамічныя цэнтры розных краін рэгіёна. Даведайцеся, якому з іх яны аддадуць перавагу і чаму.

Для дапытлівых. Лясы Амазоніі — унікальнае багацце не толькі Паўднёвай Амерыкі, гэта «лёгкія» ўсёй нашай планеты. Падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) на тэму «Праблемы амазонскага лесу».

§ 52. Бразілія

Успамінаем. *Якія ўнікальныя прыродныя і культурныя аб'екты Бразіліі вам вядомыя?*

Разважаем. *Чым Бразілія вылучаецца сярод іншых краін Паўднёвай Амерыкі?*

52.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *Бразілія* — федэратыўная прэзідэнцкая рэспубліка. У складзе дзяржавы 26 штатаў і сталічная федэральная акруга.

Бразілія займае 5-е месца ў свеце па плошчы тэрыторыі і з'яўляецца найбуйнейшай дзяржавай Паўднёвай Амерыкі (8,5 млн км^2). Краіна размешчана ў цэнтральнай частцы мацерыка на ўсход ад Анд і займае каля паловы плошчы кантынента. *(Вызначце па палітычнай карце, з якімі краінамі мяжуе Бразілія.)* Нягледзячы на слабую зрэзанасць марскога ўзбярэжжа Атлантыкі, ёсць спрыяльныя бухты, дзе створаны буйныя марскія парты.

с. 90

Дзякуючы велізарнай плошчы і асаблівасцям геалагічнай будовы (Бразільскі шчыт і платформавая пліта) Бразілія з'яўляецца ўнікальнай краінай па запасах і разнастайнасці мінеральных рэсурсаў. Бразільскае пласкагор'е называюць «жалезным сэрцам» краіны, паколькі тут маюцца вялізныя залежы высакаякасных жалезных і марганцавых руд. На поўначы краіны знаходзіцца адно з найбуйнейшых у свеце радовішчаў жалезнай руды — Каражас. Асаблівае месца займаюць запасы баксітаў, нікелевых руд сусветнага значэння. Буйное радовішча баксітаў — Тромбетас — знаходзіцца на поўначы Бразіліі. На ўсходзе краіны ў радовішчы Караіба сканцэнтравана палова запасаў медзі. Багаццямі гэтай краіны з'яўляюцца таксама каштоўныя і паўкаштоўныя камяні — ізумруды, сапфіры, аметысты, гранаты.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Бразілія — краіна гарачага цеплавога пояса. Яна размешчана ў чатырох кліматычных паясах — ад экватарыяльнага да субтрапічнага. Большую частку тэрыторыі займаюць багатыя па відавым складзе вільготныя экватарыяльныя (гілеі) і пераменна-вільготныя субэкватарыяльныя лясы. Лясы Амазоніі з'яўляюцца найбуйнейшай у свеце крыніцай драўніны. З прычыны прыродных асаблівасцей тэрыторыі Бразілія валодае велізарнымі воднымі рэсурсамі, урадлівымі воранымі землямі і каштоўнымі пашамі.

с. 91

52.2. Дэмаграфічныя асаблівасці. Па колькасці насельніцтва Бразілія ўваходзіць у пяцёрку краін-лідараў (209,4 млн чалавек). Размяшчэнне насельніцтва вельмі нераўнамернае. На вузкай паласе Атлантычнага ўзбярэжжа пражывае амаль палова жыхароў краіны. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва складае 24,5 чал./км^2, на паўднёвым усходзе — больш за 80, на поўначы — 3, на Захадзе — не перавышае 1 чал./км^2.

Этнічны склад насельніцтва Бразіліі вельмі складаны. *(Успомніце чаму.)* Асноўная частка насельніцтва краіны (каля 95 %) — бразільцы, нацыя, адрозная вялікай расавай і этнічнай стракатасцю, у якую ўваходзяць нашчадкі еўрапеоіднай (48 %) і экватарыяльнай (4 %) рас, а таксама мулаты, метысы і самба (43 %). Карэнныя жыхары — індзейцы — складаюць каля 5 % насельніцтва краіны. Рэлігійны склад аднародны. Практычна ўсё насельніцтва — католікі, за выключэннем карэнных жыхароў. Гэта адзіная партугаламоўная дзяржава ў Амерыцы. Бразільская культура ўвабрала ў сябе мноства элементаў партугальскай, афрыканскай і індзейскай культуры (мал. 184).



Мал. 184. Традыцыйны бразільскі карнавал

Для Бразіліі характэрны высокі натуральны прырост насельніцтва (8 ‰). Аднак за апошнія 15 гадоў ён знізіўся за кошт памяншэння нараджальнасці (з 20 да 14 ‰). Амаль 70 % насельніцтва ва ўзросце 15–55 гадоў. Ва ўзроставай структуры доля дзяцей застаецца значнай — каля 23 %. Доля гарадскога насельніцтва складае 86 %. Найбуйнейшыя агламерацыі: Сан-Паўлу, Рыа-дэ-Жанейра, Белу-Арызонты, Сальвадор, Фарталеза.

Сан-Паўлу — «эканамічная сталіца» краіны, якая ўтварае самую вялікую агламерацыю (больш за 20 млн жыхароў) (мал. 185). Штат Сан-Паўлу дае каля 2/3 усёй прамысловай вытворчасці краіны. *Рыа-дэ-Жанейра* («рака студзеня») — адзін з самых прыгожых гарадоў



Мал. 185. Сан-Паўлу — найбуйнейшы горад у Паўднёвым паўшар'і

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

свету на ўзбярэжжы акіяна (каля 13 млн чал.). У новай сталіцы дзяржавы — *Бразіліа* — пражывае ўсяго 2,9 млн чалавек (мал. 186).

Перасяленне сельскіх жыхароў у гарады, развіццё «лжывай урбанізацыі» — характэрная рыса і адна з праблем Бразіліі. Каля 40 % людзей жывуць за рысай беднасці, а 20 % знаходзяцца ва ўмовах галечы.



Мал. 186. Абрысы г. Бразіліа (здымак з космасу)

52.3. Геаграфія прамысловасці. Роля здабыўной прамысловасці ў эканоміцы. Бразілія — адна з ключавых краін, якія развіваюцца, сярод дзяржаў свету з постіндустрыяльным тыпам гаспадаркі (мал. 187). Па аб'ёме ВУП яна займае 1-е месца ў Паўднёвай Амерыцы, а ВУП на душу насельніцтва складае больш за 15 тыс. дол. ЗША. Па аб'ёме вытворчасці ўваходзіць у дзясятку найбуйнейшых краін свету. Найважнейшай галіной бразільскай эканомікі, якая найбольш дынамічна развіваецца, з'яўляецца прамысловасць. Яе доля ў ВУП Бразіліі складае 21 %, пры гэтым вялікая доля апрацоўчай прамысловасці.



Мал. 187. Галіновая структура ВУП Бразіліі (%)

У тэрытарыяльнай структуры прамысловасці ярка выяўлены «індустрыяльны трохвугольнік» Бразіліі, умоўнымі вяршынямі якога з'яўляюцца эканамічныя цэнтры: Рыа-дэ-Жанейра — Белу-Арызонты — Сан-Паўлу. На яго долю прыходзіцца каля 80 % вытворчасці ўсёй прамысловай прадукцыі Бразіліі.

Нягледзячы на тое, што доля і значэнне апрацоўчай прамысловасці Бразіліі пастаянна растуць, галоўнай галіной застаецца ***здабыўная прамысловасць***. Краіне належыць 3-е месца ў свеце па здабычы жалезнай руды, баксітаў, графіту. Яна ўваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых краін па здабычы золата, волава, азбесту і многіх іншых відаў мінеральнай сыравіны.



Мал. 188. АЭС «Анграа-1»

У ***электраэнергетыцы*** Бразіліі пераважаюць гідраэлектрастанцыі, на долю якіх прыходзіцца каля 90 % усёй выпрацаванай электраэнергіі. На рэках Сан-Франсіску і Парана пабудаваны каскады ГЭС. На рацэ Парана працуе каля 20 электрастанцый, сярод якіх другая з найбуйнейшых ГЭС свету — Ітайпу. Запасы

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ўранавых руд спрыялі будаўніцтву першай бразільскай атамнай электрастанцыі «Ангра-1» у раёне Рыа-дэ-Жанейра (мал. 188).

На ўласнай высакаякаснай жалезнай рудзе і прывазным вугалі, які каксуецца, працуе ***чорная металургія***. Бразілія ўваходзіць у першую дзясятку сусветных вытворцаў сталі, абагнаўшы многія краіны Еўропы. Найбуйнейшыя металургічныя заводы знаходзяцца ў штатах Мінас Жэрайс і Сан-Паўлу. У ***каляровай металургіі*** найбольш развіта вытворчасць алюмінію з мясцовых баксітаў з выкарыстаннем таннай гідраэлектраэнергіі.

Па аб'ёме прадукцыі ў апрацоўчай прамысловасці лідзіруюць ***машынабудаванне*** і ***металаапрацоўка***. Развіта транспартнае машынабудаванне, перш за ўсё аўтамабілебудаванне. Бразілія вырабляе больш за 3 млн аўтамабіляў у год і ўваходзіць у дзясятку сусветных лідараў.

Бразілія стала адной з вядучых краін па вытворчасці марскіх суднаў. Па выпуску камп'ютараў саступае толькі ЗША, Японіі і Германіі. Бразілія з'яўляецца першай з лацінаамерыканскіх краін, дзе створаны штучны спадарожнік Зямлі. Машынабудаванне канцэнтруецца ў асноўным у двух прамысловых цэнтрах — Сан-Паўлу і Рыа-дэ-Жанейра. Адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця з'яўляецца ***лясная прамысловасць***.

52.4. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Сельская гаспадарка Бразіліі з'яўляецца развітой і значнай галіной у эканоміцы краіны. Яна забяспечвае 95 % патрэб краіны ў прадуктах харчавання. Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — ***раслінаводства***. Краіна з'яўляецца традыцыйным вытворцам і экспарцёрам кавы, цукровага трыснягу, соі, кукурузы, какава, апельсінаў, бананаў, бавоўніку. Па аб'ёмах валавога збору кавы займае 1-е месца ў свеце. Кававыя плантацыі размешчаны ў паўднёва-ўсходняй частцы Бразільскага пласкагор'я, дзе рэльеф і глебы ідэальныя для вырошчвання кававых дрэў (мал. 189). Бразілія таксама займае 1-е месца ў свеце па вырошчванні цукровага трыснягу і апельсінаў. ***Жывёлагадоўля*** пераважна мяснога напрамку і развіваецца ў асноўным на натуральных пашах на поўдні краіны. Па пагалоўі буйной рагатай жывёлы Бразілія займае 1-е месца ў свеце. Краіна таксама валодае значным пагалоўем свіней (3-е месца ў свеце).



Мал. 189. Механізаваны збор ураджаю кавы

52.5. Сфера паслуг. Устойліва развіваецца і займае вядучае становішча ў структуры ВУП Бразіліі сфера паслуг. Асабліва дынамічна развіваецца сектар фінансавых паслуг, індустрыя турызму, транспарт і сувязь. ***Турызм*** займае 3-е месца сярод даходаў у структуры экспарту паслуг.

Вядучым відам ***транспарту*** з'яўляецца аўтамабільны. Даўжыня аўтамабільных дарог — каля 1,7 млн км, аднак з цвёрдым пакрыццём — усяго

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

130 тыс. км. У Бразіліі склалася густая транспартная сетка, але ў цэлым яна не адпавядае сучасным патрабаванням. Даўжыня чыгунак больш за 30 тыс. км. Па развіцці марскога транспарту Бразілія займае 1-е месца сярод краін Паўднёвай Амерыкі. Марскі транспарт перавозіць каля 98 % знешнегандлёвых грузаў. У краіне налічваецца каля 50 марскіх і рачных партоў. Авіяцыйны транспарт развіты лепш, чым у іншых краінах Паўднёвай Амерыкі. У Бразіліі каля 80 буйных аэрапортаў і тысячы дробных.

52.6. Знешнія эканамічныя сувязі. **Па экспарце сельскагаспадарчай прадукцыі Бразілія ўваходзіць у лік сусветных лідараў.** Краіна экспартуе мяса, цукар, сою, пшаніцу, алей, бавоўну, каву, какаву, апельсінавы сок, а сярод карысных выкапняў — жалезную і марганцавыя руды. Важную крыніцу даходаў краіны па-ранейшаму складае экспарт каштоўных парод драўніны, каўчук, лекавыя расліны. Бразілія імпартуе нафтапрадукты, разнастайныя машыны і запчасткі да іх, тавары народнага спажывання, тэхналагічнае абсталяванне. Асноўнымі яе гандлёвымі партнёрамі з'яўляюцца Кітай, ЗША, Краіны Еўропы і Лацінскай Амерыкі, Канада, Японія. Устаноўлены эканамічныя сувязі з Рэспублікай Беларусь.

Абагульнім і запомнім. Бразілія — адна з найбуйнейшых краін свету па плошчы тэрыторыі і колькасці насельніцтва. Этнічны склад насельніцтва адрозніваецца стракатасцю, а моўны і рэлігійны — аднароднасцю. Па аб'ёме ВУП займае адно з першых месцаў сярод усіх краін свету, якія развіваюцца. Бразілія адрозніваецца разнастайнасцю прыродных умоў і багатымі мінеральна-сыравіннымі рэсурсамі, валодае высокаразвітой здабыўной прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Расце доля і значэнне апрацоўчай прамысловасці. Вядучае становішча ў структуры ВУП займае сфера паслуг.

Праверым сябе. 1. Назавіце станоўчыя і адмоўныя бакі эканоміка-геаграфічнага становішча Бразіліі. 2. На якія прыродныя рэсурсы багатая Бразілія? 3. Якое значэнне для развіцця Бразіліі мае значная доля дзяцей ва ўзроставай структуры насельніцтва? 4. Якія галіны прамысловасці атрымалі найбольшае развіццё ў Бразіліі? 5. Якую прадукцыю прамысловасці і сельскай гаспадаркі экспартуе Бразілія?

Ад тэорыі да практыкі. Падрыхтуйце буклет на тэму «месца Бразіліі ў свеце». Зрабіце вывад аб міжнароднай спецыялізацыі Бразіліі.

Для дапытлівых. Кожны элемент на сцягу Бразіліі нясе пэўны сэнс, напрыклад, ромб у цэнтры — брыльянт — сімвал багацця краіны; 27 зорак увасабляюць 26 штатаў і сталічную федэральную акругу, на белай паласе словы — «Парадак і прагрэс». Як вы думаеце, што азначаюць дзяржаўныя колеры: зялёны, сіні, жоўты (залацісты)?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 13. АФРЫКА



§ 53. Палітычная карта і насельніцтва Афрыкі

Успамінаем. *Якія асаблівасці геаграфічнага становішча Афрыкі?*

Разважаем. *Чаму палітычная карта Афрыкі і ў XXI ст. адрозніваецца няўстойлівасцю?*

53.1. Палітычная карта Афрыкі. Па колькасці дзяржаў (54) Афрыка пераўзыходзіць любы рэгіён свету. Выхад да акіянаў маюць 37 дзяржаў, астраўныя — 10 дзяржаў. Самымі вялікімі па плошчы тэрыторыі з'яўляюцца Алжыр, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Судан. Каля 40 % працягласці дзяржаўных меж праведзены ўмоўна. Многія праведзены па паралелях або мерыдыянах. Рэдка межы праводзяцца па прыродных рубяжах. *(Супастаўце палітычную і фізічную карты Афрыкі, назавіце прычыны такога падыходу да вызначэння меж.)*

с. 94

У фарміраванні сучаснай палітычнай карты Афрыкі вылучаюцца чатыры этапы: каланіяльны, этап пачатку барацьбы за незалежнасць (1950-я гг.), 1960 г. — «год Афрыкі», этап канчатковага крушэння каланіяльнай сістэмы.

Да пачатку 50-х гадоў XX ст. на кантыненце было толькі чатыры незалежныя дзяржавы — Егіпет, Эфіопія, Ліберыя, ПАР. Першымі дамагліся незалежнасці больш развітыя краіны Паўночнай Афрыкі: Лівія, Марока, Туніс, Судан. 1960 г. увайшоў у гісторыю як «год Афрыкі», на працягу якога дамагліся незалежнасці адразу 17 калоній. Апошняя буйная калонія — Намібія — атрымала незалежнасць у 1990 г. У 1993 г. утварылася дзяржава Эрытрэя. Да цяперашняга часу незалежнага статусу дзяржавы не мае Заходняя Сахара.

Большасць дзяржаў Афрыкі па форме праўлення — прэзідэнцкія рэспублікі. Парламенцкіх рэспублік мала. Некаторыя дзяржавы маюць змешаную форму праўлення — прэзідэнцка-парламенцкія рэспублікі — Алжыр, Егіпет, Малі, Сенегал. Манархічная форма праўлення захавалася толькі ў Марока, Лесота і Свазілендзе. Статус Заходняй Сахары падлягае ўрэгуляванню з удзелам ААН.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па форме адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання большасць дзяржаў Афрыкі адносіцца да ўнітарных. Федэратыўных дзяржаў пяць: Нігерыя, Каморскія астравы, Эфіопія, Судан, Паўднёвы Судан.


с. 48

Па рашэнні эканамічнай камісіі ААН краіны Афрыкі падзелены на пяць рэгіёнаў. *(Выкарыстоўваючы карту, назавіце рэгіёны Афрыкі, прывядзіце прыклады краін кожнага рэгіёна.)* Раяніраванне ўлічвае прыродна-рэсурсныя, гістарычныя, этнічныя, сацыяльна-эканамічныя і геапалітычныя фактары.

Афрыка ўяўляе з сябе рэгіён, дзе штогод назіраюцца канфлікты і войны. Тэрытарыяльныя спрэчкі тычацца 20 % тэрыторыі ўсёй Афрыкі. У аснове канфліктаў ляжаць этнічныя і рэлігійныя прычыны. Гэтыя канфлікты ўмоўна можна падзяліць на дзве групы: унутрыдзяржаўныя і міждзяржаўныя. Прыкладам міждзяржаўных спрэчак служыць Заходняя Сахара, акупіраваная Марока і Маўрытаніяй. Судан з'яўляецца прыкладам унутрыдзяржаўнага канфлікту, дзе яго прычынай стала супярэчнасць паміж народамі поўначы, якія вызнаюць іслам, і поўдня краіны (хрысціянства і мясцовыя рэлігіі).

53.2. Дэмаграфічныя асаблівасці. Афрыка — рэгіён, насельніцтва якога расце самымі хуткімі тэмпамі на Зямлі. Для Афрыкі характэрныя высокая нараджальнасць (35 ‰) і смяротнасць (9 ‰), нізкая працягласць жыцця. Асноўная прычына — нізкі ўзровень жыцця і медыцынскага абслугоўвання, распаўсюджванне хвароб. Доўгі час насельніцтва Афрыкі адрознівалася нізкім натуральным прыростам. Рэзкае павелічэнне колькасці насельніцтва адбылося ў другой палове XX ст. У параўнанні з сярэдзінай XX ст. насельніцтва Афрыкі павялічылася больш чым у 4 разы. Рост насельніцтва абумоўлены памяншэннем смяротнасці пры высокай нараджальнасці. Доля насельніцтва ва ўзросце да 15 гадоў складае 41 %. Каля 56 % насельніцтва знаходзіцца ва ўзросце 15–50 гадоў. Працягласць жыцця ўсё яшчэ невысокая — 60 гадоў, а ў Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы — менш за 50 гадоў.

У цяперашні час колькасць насельніцтва Афрыкі перавысіла 1,2 млрд чалавек. Па гэтым паказчыку краіна саступае толькі Азіі. Сярод дзяржаў найбольшая колькасць насельніцтва ў Нігерыі — 196 млн чалавек, найменшая — у астраўных дзяржавах. Напрыклад, Сейшэльскія астравы засяляюць усяго 90 тыс. чалавек.


с. 95

Насельніцтва Афрыкі размешчана вельмі нераўнамерна. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 41,5 чал./км^2, што амаль у 2 разы вышэй, чым у Паўднёвай Амерыцы. На размяшчэнне насельніцтва ўплываюць прыродныя ўмовы і гаспадарчая дзейнасць чалавека. Шырокія

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прасторы пустынь Сахары, Наміб і Калахары (менш за 1 чал./км^2), а таксама ўпадзіна Конга практычна не заселены. Максімальная шчыльнасць насельніцтва (больш за 1000 чал./км^2) прыходзіцца на дэльту Ніла.

Больш як палова насельніцтва кантынента жыве ў сельскай мясцовасці (каля 60 %). Аднак Афрыка — гэта рэгіён «гарадскога выбуху». Тут самыя высокія ў свеце тэмпы ўрбанізацыі. Насельніцтва некаторых гарадоў падвойваецца кожныя 10 гадоў. У цяперашні час каля 40 гарадоў маюць насельніцтва больш як 1 млн чалавек. Колькасць насельніцтва гарадоў Каір, Лагас і Кіншаса перавышае 10 млн чалавек, а Ёханесбурга і Хартума складае больш за 5 млн чалавек. У сталіцах некаторых дзяржаў засяроджана да 80 % іх насельніцтва (Гвінея, Конга, Ангола). Паўночная і Паўднёвая Афрыка адрозніваюцца высокім узроўнем урбанізацыі. Так, у Паўночнай Афрыцы яе ўзровень перавышае сярэднесусветны паказчык і, напрыклад, у Лівіі дасягае 78 %, у Алжыры — больш за 70 %. За кошт ПАР у Паўднёвай Афрыцы ўзровень урбанізацыі перавышае 50 %.

с. 95

53.3. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва. У сувязі з асаблівасцямі засялення на тэрыторыі Афрыкі пражываюць тры асноўныя расы — экватарыяльная, еўрапеоідная і мангалоідная. Асноўная частка карэннага насельніцтва — прадстаўнікі экватарыяльнай расы.

Насельніцтва Афрыкі прадстаўлена некалькімі сотнямі народаў (этнасаў), прычым толькі 10 з іх колькасцю большыя за 10 млн чалавек, а 111 — каля 1 млн, што складае 80 % усяго насельніцтва Афрыкі (мал. 190). Большую частку Паўночнай Афрыкі засяляюць арабы і берберы. Самай складанай па этнічным складзе з'яўляецца Заходняя Афрыка. Тут адзначаецца і найбольшая колькасць дзяржаў. У Цэнтральнай і Паўднёвай Афрыцы ў асноўным пражываюць народы банту, у краінах, якія былі калоніямі, — значная колькасць прадстаўнікоў еўрапейскіх народаў. У многіх з іх дзяржаўнай мовай з'яўляецца англійская або французская.

У Афрыцы пераважаюць дзве сусветныя рэлігіі — іслам (2/5 вернікаў) і хрысціянства (1/5), якія спалучаюцца з мясцовымі племяннымі рэлігіямі. Іслам характэрны для краін Паўночнай Афрыкі. У Цэнтральнай і Усходняй Афрыцы, напрыклад, іслам спалучаецца з мясцовымі рэлігіямі, радзей з хрысціянствам.



Мал. 190. Народы (плямёны) Афрыкі: маўры (*а*); пігмеі (*б*); нілоты (*в*); туарэгі (*г*)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Афрыка — рэгіён з самай вялікай колькасцю дзяржаў, у асноўным з рэспубліканскай формай праўлення і ўнітарным палітыка-тэрытарыяльным уладкаваннем. У Афрыцы пражываюць тры асноўныя расы. Для рэгіёна характэрныя самыя высокія тэмпы росту колькасці насельніцтва ў свеце і нізкая працягласць жыцця. Нераўнамернае размяшчэнне насельніцтва звязана з прыроднымі асаблівасцямі мацерыка. Афрыка — адзін з найменш урбанізаваных рэгіёнаў свету. У рэгіёне назіраюцца ўнутрыдзяржаўныя і міждзяржаўныя канфлікты.

Праверым сябе. 1. Якія змены адбыліся на палітычнай карце Афрыкі з пачатку 50-х гг. XX ст.? 2. Якія формы праўлення і палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання характэрныя для краін Афрыкі? 3. Прывядзіце прыклады афрыканскіх краін: рэспублік, манархій, федэратыўных, унітарных. 4. Якія дэмаграфічныя асаблівасці рэгіёна? 5. У чым прычыны высокага натуральнага прыросту насельніцтва і як ён уплывае на ўзроставую структуру насельніцтва Афрыкі?

Ад тэорыі да практыкі. Пакажыце на карце раёны з высокай і нізкай шчыльнасцю насельніцтва. Растлумачце прычыны нераўнамернага размяшчэння насельніцтва ў рэгіёне.

Абмяркуем. Улічваючы асаблівасці фарміравання палітычнай карты Афрыкі, растлумачце, чаму каля 40 % усёй працягласці дзяржаўных меж не дэмаркіравана.

§ 54. Агульная характарыстыка гаспадаркі Афрыкі

Успамінаем. *Якія асаблівасці геаграфічнага становішча Афрыкі? На якія прыродныя рэсурсы багатая Афрыка?*

Разважаем. *Чаму краіны Афрыкі, якія развіваюцца, адносяцца да ліку найбольш адсталай часткі сусветнай супольнасці?*

54.1. Асаблівасці структуры валавога ўнутранага прадукту краін. Афрыка — найбольш адсталы рэгіён сусветнай гаспадаркі па ўсіх паказчыках эканамічнага развіцця. Удзельная вага краін Афрыкі ў сусветным аб'ёме ВУП складае 3 %. Эканамічная адсталасць тлумачыцца каланіяльным мінулым дзяржаў мацерыка. Эканамічнае і сацыяльнае развіццё краін стрымліваюць таксама нізкі ўзровень адукацыі насельніцтва, унутраныя канфлікты, велізарныя пустынныя раёны, нізкая ўрадлівасць зямель, недахоп пітной вады.

ВУП на душу насельніцтва Афрыкі складае ўсяго 1,9 тыс. дол. ЗША. Найбольш высокі ён у Нігерыі, Егіпце і ПАР, найбольш нізкі — у краінах

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Усходняй, Цэнтральнай і Заходняй Афрыкі. У структуры ВУП большасці краін Афрыкі пераважае сельская гаспадарка. Аднак пасля атрымання незалежнасці ў галіновай структуры гаспадаркі краін рэгіёна павялічылася доля прамысловасці і сферы паслуг. Адметнымі рысамі гаспадаркі Афрыкі з'яўляюцца: перавага малатаварнай, нізкапрадукцыйнай сельскай гаспадаркі; слабае развіццё апрацоўчай прамысловасці; абмежаванне сферы паслуг пераважна гандлем.

54.2. Геаграфія сферы паслуг і прамысловасці. Нягледзячы на значную ўдзельную вагу ў галіновай структуры Афрыкі сфера паслуг развіваецца слаба (мал. 191). Прычыны — нестабільная палітычная і эканамічная сітуацыя ў рэгіёне, а таксама нізкі попыт на прадукцыю сферы паслуг, абумоўлены нізкім узроўнем жыцця насельніцтва. Перспектыўнай галіной сферы паслуг Паўночнай і Паўднёвай Афрыкі, якая дынамічна развіваецца, з'яўляецца турызм. Актыўнымі тэмпамі развіваецца турысцкі бізнэс у Егіпце, Лівіі, Тунісе і Марока, ПАР.



Мал. 191. Сучасная галіновая структура ВУП Афрыкі (%)

с. 96

У Афрыцы не сфарміравана адзіная транспартная сістэма. На яе прыходзіцца менш за 5 % сусветных перавозак грузаў і пасажыраў. Ва ўнутрыкантынентальных перавозках асноўным з'яўляецца чыгуначны транспарт — тэхнічна адсталы са спецыфічна арыентаванай сеткай дарог: ад плантацый і распрацаваных радовішчаў да ўзбярэжжа. Для некаторых краін Цэнтральнай і Усходняй Афрыкі вялікае гаспадарчае значэнне мае ўнутраны водны транспарт. Цяпер развіваецца аўтамабільны і паветраны транспарт. Пабудавана некалькі транскантынентальных аўтамагістралей: Магрыбская (Рабат — Каір), Транссахарская (Алжыр — Лагас), Транссахельская (Дакар-Нджамена), ствараецца Трансафрыканская (поўнач — поўдзень) і інш. У знешнегандлёвых адносінах лідзіруе марскі транспарт. У прыбярэжных дзяржавах развіваецца марскі флот. Пад сцягам Ліберыі ходзяць па акіянах тысячы суднаў заходніх суднаходных кампаній. Дзякуючы нізкім падаткам у Ліберыі шматлікія кампаніі рэгіструюць у гэтай краіне свой гандлёвы флот. Галоўныя марскія парты Афрыкі: Александрыя, Касабланка, *Кейптаўн*, Порт-Элізабэт, Магадзіша.

Краіны Афрыкі валодаюць багатымі прыроднымі рэсурсамі. Здабыча і экспарт мінеральнай сыравіны і паліва — аснова эканамічнага развіцця многіх дзяржаў. Доля здабыўной прамысловасці Афрыкі складае больш

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

за 1/7 сусветнай. Па здабычы многіх карысных выкапняў яна займае лідзіруючыя пазіцыі ў свеце. У цяперашні час Афрыка забяспечвае каля 1/2 сусветнай здабычы алмазаў (ПАР, Намібія), 1/4 урану і золата (ПАР, Намібія), фасфарытаў (Марока, Заходняя Сахара, Алжыр, Туніс), 1/10 нафты (Лівія, Нігерыя, Алжыр, Габон, Егіпет). Найважнейшае значэнне мае здабыча жалезнай руды (ПАР, Ліберыя, Маўрытанія) і меднай руды.

с. 96

У «медным поясе», які размясціўся ад возера Танган'іка да ракі Аранжавая, ахапіўшы поўдзень Дэмакратычнай Рэспублікі Конга, Замбію, Зімбабвэ, Батсвану і ПАР, вядома каля 100 радовішчаў медных руд (мал. 192). Здабываецца шмат прыроднага газу (Алжыр, Лівія). Гвінея — сусветны лідар па запасах алюмініевых руд. Афрыка з'яўляецца лідарам па здабычы «металаў XXI ст.» — ванадыю, літыю, берылію. Галоўныя здабыўныя раёны Афрыкі знаходзяцца ў Паўночнай Афрыцы, у некаторых раёнах Цэнтральнай і Заходняй Афрыкі, а таксама ў Паўднёвай Афрыцы.



Мал. 192. Здабыча медзі ў Афрыцы

Апрацоўчая прамысловасць развіта слаба. У Афрыцы практычна адсутнічаюць сучасныя машынабудаўнічыя і хімічныя вытворчасці. Галоўнымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца ***харчовая*** і ***лёгкая***. Вядучыя галіны тэкстыльнай прамысловасці — вытворчасць баваўняных тканін, харчовай — вытворчасць алеяў (пальмавага, арахісавага, аліўкавага), кавы, какавы, цукру, рыбных кансерваў, вінаробства. У структуры прамысловасці вылучаецца каляровая металургія. Афрыка вырабляе 3,5 % рафінiраванай медзі свету. Цэнтрамі яе вытворчасці з'яўляюцца Замбія і Дэмакратычная Рэспубліка Конга. Па аб'ёмах вытворчасці першаснага алюмінію ў лік сусветных лідараў уваходзіць ПАР. Наяўныя ў Афрыцы гідраэнергарэсурсы выкарыстоўваюцца недастаткова. Рака Конга, напрыклад, валодае большымі энергарэсурсамі, чым Амазонка (мал. 193).



Мал. 193. Першыя ГЭС на р. Конга

54.3. Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі. Для сельскай гаспадаркі краін Афрыкі характэрныя нізкая забяспечанасць раллі, востры недахоп прэснай вады, адсталая вытворча-тэхнічная база, нізкі ўзровень вытворчасці, павольны рост паказчыкаў ураджайнасці культур і прадукцыйнасці жывёлы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — ***раслінаводства***, прадукцыя якой па кошце складае ў асобных краінах каля 80 % ВУП. Пры гэтым раслінаводства многіх краін носіць монакультурны характар. Гэта значыць вырошчванне якой-небудзь адзінай сельскагаспадарчай культуры на адной і той жа тэрыторыі на працягу многіх гадоў (напрыклад, у Кеніі, Эфіопіі — кава, Кот-д'Івуары — какава-бабы, Сенегале — арахіс) (мал. 194).



Мал. 194. Збор какава-бабоў у Кот-д'Івуары

Монакультурная спецыялізацыя — спецыялізацыя гаспадаркі краіны на вытворчасці аднаго, як правіла, сыравіннага або харчовага тавару, прызначанага ў асноўным для экспарту.

Асноўныя збожжавыя культуры афрыканскага рэгіёна — проса і сорга — апрацоўваюцца амаль паўсюдна. Кукуруза — галоўная харчовая культура зоны саван. Пасевы пшаніцы сканцэнтраваны ў Паўночнай Афрыцы і ПАР. Рыс у асноўным вырошчваюць у добра ўвільготненых раёнах Паўночнай і Усходняй Афрыкі (даліна Ніла, на Мадагаскары і інш.). Палову бавоўны Афрыкі вырабляе Егіпет. Ён займае 1-е месца ў свеце па зборы высакаякаснай доўгавалакністай бавоўны. У Судане, у басейне Белага і Блакітнага Ніла, бавоўнік з'яўляецца монакультурай.

Нягледзячы на адзначаныя асаблівасці сельскай гаспадаркі, Афрыка — пастаўшчык на сусветны рынак какава-бабоў, сізалю, пальмавых арэхаў, арахісу, кавы, алівак, чаю. Афрыканскія краіны таксама буйныя экспарцёры цытрусавых, вінаградных він, тытуню.

У Афрыцы пераважае качавая, паўкачавая і адгонна-пашавая ***жывёлагадоўля***. Галоўныя галіны жывёлагадоўлі — авечкагадоўля (шэрсны і мяса-шэрсны напрамкі) і жывёлагадоўля (пераважна мясны напрамак), вярблюдаводства. У некаторых краінах, напрыклад у ПАР, Кеніі, Маўрытаніі, Эфіопіі, Самалі і іншых, жывёлагадоўля з'яўляецца важнай часткай гаспадарчай дзейнасці. На экспарт паступаюць галоўным чынам воўна, шкуры, скура.

Вялікі эканамічны ўрон жывёлагадоўлі Афрыкі наносіць муха цэцэ, якая распаўсюджвае «сонную хваробу», ад якой штогод гіне некалькі мільёнаў галоў жывёлы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Абагульнім і запомнім. Афрыка — найменш эканамічна развіты рэгіён свету. У гаспадарцы асноўная роля належыць здабыўной прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Галоўнымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца харчовая і лёгкая. Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — раслінаводства. У многіх краінах захоўваецца монакультурная сельская гаспадарка. Традыцыйнымі таварамі экспарту з'яўляюцца мінеральная сыравіна і прадукцыя сельскай гаспадаркі.

Праверым сябе. 1. Якія асаблівасці структуры ВУП краін Афрыкі? 2. Назавіце вядучыя галіны прамысловасці краін Афрыкі. 3. Як уплываюць прыродныя рэсурсы на галіновую структуру і геаграфію прамысловасці? 4. Па здабычы якіх мінеральных рэсурсаў краіны Афрыкі ўваходзяць у лік сусветных лідараў? 5. Што называецца монакультурнай спецыялізацыяй і якія прычыны гэтай з'явы?

Ад тэорыі да практыкі. Што б вы прынеслі на школьную выставу «Афрыканскія тавары ў маім доме»?

Для дапытлівых. Уздоўж паўднёвых меж Сахары ад Маўрытаніі да Эфіопіі па тэрыторыі дзесяці краін працягнулася зона Сахеля — галоўнага раёна засух і апустыньвання. Як праяўляюцца наступствы засух у спецыялізацыі гаспадаркі гэтых краін?

§ 55. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка краін рэгіёна: Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Егіпет

Успамінаем. *Якія асаблівасці трапічнага і субтрапічнага тыпаў клімату? Чаму Егіпет называюць дарам Ніла?*

Разважаем. *Чаму эканоміка ПАР і Егіпта развіваецца больш высокімі тэмпамі, чым іншых дзяржаў Афрыкі?*

Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (ПАР)

55.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. *ПАР* валодае найбольш магутным эканамічным патэнцыялам у Афрыцы і адзіная з афрыканскіх краін адносіцца да ліку развітых краін свету. Кампактная тэрыторыя плошчай 1,2 млн км^2 займае 9-е месца на мацерыку. Краіна размешчана на крайнім поўдні Афрыкі і мае выхад да двух акіянаў — Атлантычнага і Індыйскага. ПАР мяжуе з пяццю краінамі. *(Вызначце па карце, з якімі.)*

с. 94

Разнастайнасць геалагічнай будовы, выхады старажытных крышталічных парод абумовілі выключнае багацце ПАР на карысныя выкапні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па разведаных запасах медных, марганцавых, жалезных, хромавых, ванадыевых руд, плаціны, уранавых руд, каменнага вугалю ПАР займае лідзіруючыя пазіцыі ў свеце. На ПАР прыходзіцца амаль 88 % сусветных запасаў плаціны, 80 % — марганцу, 72 % — хрому, каля 30 % — золата.

Геаграфічнае становішча краіны ў субтрапічным і трапічным паясах, вышыня тэрыторыі, акіянічныя цячэнні, невялікая колькасць ападкаў абумовілі засушлівы клімат, наяўнасць пустынь на значнай частцы тэрыторыі краіны, недахоп водных рэсурсаў. Землі, прыдатныя для земляробства, складаюць менш за 1/5 тэрыторыі.

с. 95

55.2. Насельніцтва. Колькасць насельніцтва ПАР — 57,7 млн чалавек — гэта адна з найбуйнейшых краін у Афрыцы (5-е месца). Насельніцтва ПАР адрозніваецца складанай этнічнай структурай. Каля 80 % насельніцтва — чарнаскурыя афрыканцы, якія належаць да розных этнасаў (зулу, коса, сута і інш.). Колькасць этнічных еўрапейцаў складае каля 10 %. Трэцяя па колькасці група насельніцтва ПАР — мулаты і метысы. Значная частка насельніцтва — выхадцы з Азіі (кітайцы, індусы, прадстаўнікі арабскіх краін). У краіне 11 афіцыйных моў. Натуральны прырост насельніцтва складае 12 ‰ (нараджальнасць — 22 ‰, смяротнасць — 10 ‰). Сярэдняя працягласць жыцця складае 60 гадоў для мужчын і 64 гады для жанчын. Жанчыны колькасна пераважаюць над мужчынамі. Найбольш шчыльна заселены паўднёва-заходнія і паўночна-ўсходнія раёны краіны. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 44 чал./км^2. Доля гарадскога насельніцтва складае 65 %. Найбуйнейшай агламерацыяй краіны з'яўляецца *г. Ёханесбург*, колькасць насельніцтва якога разам з гарадамі-спадарожнікамі больш за 5 млн чалавек. Да ліку найбуйнейшых адносяцца агламерацыі *Кейптаўна*, *Прэторыі* (мал. 195), Дурбана.



Мал. 195. Прэторыя. Сталіца ПАР

55.3. Гаспадарка. Эканоміка ПАР вырабляе 1/5 ВУП рэгіёна. Гэта індустрыяльная дзяржава, у структуры ВУП якой прамысловасць складае 29 % (мал. 196). Асаблівасць гаспадаркі краіны вызначае яе здабыўная прамысловасць, якая забяспечвае больш за 30 % экспарту. Здабываецца больш за 40 відаў карысных выкапняў. Краіна з'яўляецца сусветным лідарам па здабычы хромавых руд,



Мал. 196. Структура ВУП ПАР (%)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 197. Здабыча золата ў ПАР

уваходзіць у тройку лідараў па здабычы марганцавай руды, а таксама ў лік вядучых у свеце краін па здабычы алмазаў, золата, плаціны, ванадыю, уранавых руд. Найбольш важную ролю ў эканоміцы краіны адыгрывае здабыча золата, алмазаў і ўрану (рыс. 197). Галоўным цэнтрам здабычы золата ўжо больш за сто гадоў з'яўляецца Ёханесбург.

Аснову эканомікі ПАР складае ***энергетыка*** (каля 15 % ВУП) і ў першую чаргу — вугальная прамысловасць. ПАР вырабляе больш за 30 % усёй электраэнергіі рэгіёна. Галоўнымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца ***металургія*** і ***машынабудаванне***. Каляровая металургія прадстаўлена вытворчасцю большасці каляровых металаў: ад медзі, сурмы і хрому да рэдказямельных металаў. Машынабудаванне прадстаўлена аўтамабілебудаваннем, вытворчасцю марскіх і рачных суднаў, чыгуначных вагонаў і лакаматываў, самалётаў. Найбуйнейшымі прамысловымі цэнтрамі з'яўляюцца Ёханесбург, Кейптаўн, Дурбан.



Мал. 198. На страусінай ферме ў г. Аудсхорн (ПАР)

Вядучую ролю ў **сельскай гаспадарцы** ПАР адыгрывае ***жывёлагадоўля***, перш за ўсё авечкагадоўля шэрснага напрамку (танкарунныя мерыносы і каракульскія авечкі). Воўна і скуры складаюць прыкметную частку экспарту. Разводзяць таксама буйную рагатую жывёлу і коз, страўсаў (мал. 198). ПАР — найбуйнейшы ў свеце вытворца пражы з воўны ангорскіх коз (паўднёваафрыканскі махер лічыцца найлепшым у свеце).

На развіццё сельскай гаспадаркі ўплываюць засухі, трэцяя частка зямель пашкоджана эрозіяй. Асноўныя збожжавыя культуры — кукуруза, пшаніца, сорга. ПАР забяспечвае сябе ўсімі асноўнымі прадуктамі харчавання, экспартуе цукар, гародніну, садавіну і ягады, цытрусавыя.

Інтэнсіўна ў краіне развіваецца **сфера паслуг**. Найбольшае развіццё атрымалі гандаль, банкаўскі сектар, турызм, транспарт. Асноўны міжраённы від транспарту — чыгуначны. Чыгункі злучаюць марскія парты з прамысловымі цэнтрамі. Узрастае роля аўтамабільнага транспарту, на які прыходзіцца 80 % усіх перавозак у краіне. Найбольш важныя марскія парты — Дурбан, Кейптаўн, Порт-Элізабэт і інш.

Галоўнымі гандлёвымі партнёрамі з'яўляюцца ЗША, Японія, ФРГ, Вялікабрытанія, Францыя, Італія і Канада. Даходы ПАР ад знешняга гандлю складаюць каля 50 % ВУП, пры гэтым аб'ём экспарту перавышае аб'ём

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

імпарту. Краіна экспартуе золата, алмазы, плаціну, розныя мінералы, машыны і абсталяванне, прадукты харчавання і напіткі, імпартуе транспартныя сродкі, машыны, нафту, хімічныя тавары, прадукты харчавання.

Егіпет

55.4. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы Егіпта. *Егіпет* — прэзідэнцкая рэспубліка, размешчаная на стыку двух рэгіёнаў — Афрыкі і Азіі. Тэрыторыя краіны плошчай 1,22 млн км^2 займае паўночна-ўсходнюю частку Афрыкі і Сінайскі паўвостраў у Азіі. Выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча краіны вызначаецца наяўнасцю на яе тэрыторыі Суэцкага канала, выхаду да Атлантычнага і Індыйскага акіянаў праз Міжземнае і Чырвонае моры. Суэцкі канал больш чым у два разы скарачае марскі шлях з Азіі ў Еўропу, а суднаходства па ім з'яўляецца важнай крыніцай даходу Егіпта (мал. 199).



Мал. 199. Суэцкі канал

Дзякуючы таму, што тэрыторыя краіны размешчана ў межах Афрыканскай і Аравійскай платформаў з выхадамі старажытных крышталічных парод на паверхню, Егіпет валодае разнастайнымі мінеральнымі рэсурсамі. Магутныя тоўшчы ападкавых парод на поўначы краіны, а таксама раёны ўздоўж западзіны Чырвонага мора і Суэцкага заліва багатыя на запасы нафты, прыроднага газу, фасфарытаў, каменнай солі. На поўначы і ўсходзе краіны знаходзяцца радовішчы жалезных і марганцавых руд.

Клімат Егіпта на большай тэрыторыі трапічны кантынентальны (пустынны). Для міжземнаморскага ўзбярэжжа шырынёй 30–40 км характэрны міжземнаморскі субтрапічны клімат з гарачым сухім летам і мяккай дажджлівай зімой. Кліматычныя ўмовы дазваляюць збіраць па два ўраджаі ў год. Галоўнай крыніцай водазабеспячэння ў Егіпце з'яўляецца рака Ніл. Па прычыне стварэння на рацэ Асуанскай плаціны ўтварылася вялікае вадасховішча Насер. Глебы даліны і дэльты Ніла вельмі ўрадлівыя і даюць высокія ўраджаі.

с. 95

55.5. Насельніцтва. Колькасць насельніцтва Егіпта — 97 млн чалавек (3-я краіна ў Афрыцы пасля Нігерыі і Эфіопіі і 14-я ў свеце). Этнічны склад аднародны. Каля 98 % насельніцтва краіны складаюць арабы. У Егіпце жывуць таксама нубійцы, берберы і прадстаўнікі іншых народаў. Для краіны характэрны высокі натуральны прырост — 25 ‰ (31 ‰ — нараджальнасць, 6 ‰ — смяротнасць). Сярэдняя працягласць жыцця складае 70 гадоў для мужчын і 73 гады для жанчын.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Насельніцтва размешчана па тэрыторыі краіны вельмі нераўнамерна. На 5 % тэрыторыі краіны сканцэнтравана асноўная частка насельніцтва (дэльта і даліна Ніла), дзе шчыльнасць насельніцтва набліжаецца да 129 чал./км^2. Больш як палова жыхароў — сельскае насельніцтва (60 %).

Сталіца Егіпта — *г. Каір*. Каірская агламерацыя з'яўляецца адной з найбуйнейшых на мацерыку — 19,5 млн (мал. 200). Найбуйнейшым горадам, прамысловым і культурным цэнтрам Егіпта з'яўляецца таксама *г. Александрыя*.

55.6. Гаспадарка. Егіпет — дзяржава, якая развіваецца з гаспадаркай індустрыяльнага тыпу (мал. 201). У **прамысловасці** вялікая роля належыць ***здабычы нафты*** і ***прыроднага газу***, ***харчовай***, ***тэкстыльнай***, ***цэментнай галінам***, ***металургіі*** (вытворчасць сталі і алюмінію), галінам ***машынабудавання*** (зборка аўтамабіляў, вытворчасць узбраенняў), ***электраэнергетыцы***. Нафтавыя радовішчы знаходзяцца на Сінайскім паўвостраве. Найважнейшыя цэнтры нафтаперапрацоўкі размешчаны ў Каіры, Александрыі, Суэцы. Вялікае значэнне маюць гідраэнергетычныя рэсурсы. Асуанская ГЭС дае танную электраэнергію (мал. 202).

Вядучая роля належыць тэкстыльнай і харчовай прамысловасці. У краіне пабудаваны Хелуанскі металургічны камбінат, развіваецца каляровая металургія, фармацэўтыка, вырабляюцца ўгнаенні.

Сельская гаспадарка. На працягу тысячагоддзяў земляробства было асноўным відам дзейнасці егіпцян. Егіпецкія сяляне — фелахі — вырошчваюць проса, пшаніцу, кукурузу, рыс, бабовыя, гародніну, бавоўнік, цукровы трыснёг, алівкі, у аазісах — фінікі, вінаград, цытрусавыя (апельсіны, мандарыны, лімоны) (мал. 203). Бавоўна Егіпта славіцца высокай



Мал. 200. Цэнтр Каіра



Мал. 201. Структура ВУП Егіпта (%)



Мал. 202. Асуанская ГЭС



Мал. 203. Збор фінікаў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

якасцю. З-за адсутнасці пашы жывёлагадоўля развіта слаба. Уласная вытворчасць харчавання задавальняе патрэбы краіны толькі на 40 %.

Сфера паслуг. У краіне развіваецца марскі, чыгуначны, аўтамабільны, водны і трубаправодны транспарт. Суэцкі канал з'яўляецца асноўнай воднай артэрыяй для міжнароднага гандлю. Галоўныя парты краіны — Александрыя, Порт-Саід і Суэц — адрозніваюцца вялікай прапускной здольнасцю. Даўжыня чыгунак складае ўсяго каля 5 тыс. км. Шасэйныя дарогі размешчаны на ўзбярэжжы Чырвонага мора.

Вялікія даходы Егіпту прыносіць міжнародны турызм. Турысцкія цэнтры размешчаны ў асноўным на ўзбярэжжах Міжземнага і Чырвонага мораў, у гарадах Александрыя, Шарм-Эль-Шэйх, Хургада і інш.

Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі Егіпта з'яўляюцца ЗША, Германія, Італія. Экспартуюцца нафта і нафтапрадукты, металавырабы, бавоўна і баваўняная пража, трыкатажныя вырабы, рыс, садавіна. Егіпет імпартуе збожжа, лесаматэрыялы, прамысловыя вырабы.

Абагульнім і запомнім. Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка — адзіная высокаразвітая краіна Афрыкі. Спецыялізуецца на вытворчасці прадукцыі здабыўной прамысловасці, сельскай гаспадаркі, на энергетыцы. Самая буйная галіна апрацоўчай прамысловасці — чорная металургія. Вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы адыгрывае жывёлагадоўля. Егіпет — дзяржава, размешчаная на стыку Афрыкі і Азіі. Этнічны склад насельніцтва аднародны (98 % — арабы). Вядучымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца нафта- і газаздабыўная, харчовая, тэкстыльная, металургічная і некаторыя галіны машынабудавання. Асноўная галіна сельскай гаспадаркі — раслінаводства.

Праверым сябе. 1. Якія дэмаграфічныя асаблівасці ПАР і Егіпта? 2. У чым прычыны нераўнамернага размяшчэння насельніцтва ў ПАР і Егіпце? 3. Якія агульныя і адметныя рысы мінеральна-сыравіннай базы дзвюх дзяржаў? 4. Якія агульныя і адметныя рысы ў развіцці прамысловасці дзвюх краін? 5. Вызначце адрозненні ў развіцці сельскай гаспадаркі ПАР і Егіпта. 6. Якую прадукцыю на міжнародны рынак пастаўляюць ПАР і Егіпет?

Ад тэорыі да практыкі. 1. Выкарыстоўваючы матэрыял параграфа і карты атласа, зрабіце параўнальную характарыстыку эканоміка-геаграфічнага становішча ПАР і Егіпта. 2. Якой з краін вы аддалі б перавагу для падарожжа і якія аб'екты наведалі? Абгрунтуйце свой выбар.

Для дапытлівых. Радовішчы алмазаў называюць кімберлітавымі трубкамі. Адкуль пайшла такая назва радовішчаў?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ТЭМА 14. АЎСТРАЛІЯ І АКІЯНІЯ



§ 56. Аўстралійскі Саюз

Успамінаем. *У чым унікальнасць прыроды Аўстраліі?*

Разважаем. *Хто такія аўстралійцы?*

56.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы. Аўстралія і Новая Зеландыя, а таксама краіны, размешчаныя на шматлікіх астравах у цэнтральнай і паўднёва-заходняй частках Ціхага акіяна, утвараюць рэгіён Аўстралія і Акіянія. Рэгіён адрозніваецца стракатасцю ў палітычных і эканамічных адносінах. Тут суседнічаюць высокаразвітыя краіны — Аўстралійскі Саюз і Новая Зеландыя — і невялікія астраўныя краіны, якія развіваюцца.

Аўстралійскі Саюз — адзіная ў свеце дзяржава, якая займае цэлы мацярык (99 %). Да яго тэрыторыі адносяцца востраў Тасманія і шэраг больш дробных астравоў. Усе межы ў дзяржавы марскія, і ўсе часткі яе тэрыторыі маюць выхад да Ціхага і Індыйскага акіянаў. Галоўная асаблівасць эканоміка-геаграфічнага становішча Аўстралійскага Саюза — адасобленасць ад іншых рэгіёнаў.

Як федэратыўная дзяржава Аўстралійскі Саюз уключае шэсць штатаў. Аўстралійскі Саюз — канстытуцыйная манархія, якая ўваходзіць у склад Брытанскай Садружнасці. Па памерах тэрыторыі займае 6-е месца ў свеце (плошча — 7,7 млн км^2). Тэрыторыю дзяржавы амаль пасярэдзіне перасякае Паўднёвы тропік. Вялікая яго частка знаходзіцца ў кантынентальных трапічнай і субтрапічнай кліматычных абласцях і занятая пусткамі, паўпустынямі, саваннамі і рэдкалессем. Сухасць клімату ўплывае на многія галіны гаспадаркі, асабліва сельскай гаспадаркі. Рэльеф Аўстраліі пераважна раўнінны. Агульная плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складае 53,4 %, з іх: пашы — 47,1 %, раллі — 6,2 %, каля 20 % тэрыторыі займаюць лясы. На паўночным усходзе і ўсходзе краіны знаходзяцца зоны вільготных трапічных і субтрапічных лясоў. Лясы — найважнейшы прыродны рэсурс Аўстраліі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

с. 100 Аўстралія багатая на карысныя выкапні. Вялікія запасы рудных карысных выкапняў (жалеза, марганцу, медзі, свінцу, цынку, нікелю), золата, серабра, каштоўных і вырабных камянёў (алмазаў, апалаў) прымеркаваны да выхадаў крышталічнага падмурка Аўстралійскай платформы. Дзяржава валодае 1/3 сусветных запасаў уранавых руд і баксітаў. Многія карысныя выкапні залягаюць на невялікай глыбіні, і іх здабыча вядзецца адкрытым спосабам. У ападкавым чахле платформы ўтрымліваюцца фасфарыты і каменная соль. Радовішчы нафты і прыроднага газу прымеркаваны да западзін і прагінаў платформы. Велізарныя запасы каменнага вугалю.

с. 99 **56.2. Асаблівасці дэмаграфічнага развіцця.** Колькасць насельніцтва для такой вялікай па плошчы дзяржавы, як Аўстралійскі Саюз, адносна невялікая — 24,1 млн чалавек. Аўстралійцы — нацыя эмігрантаў. Каля 90 % насельніцтва мае еўрапейскае паходжанне: нашчадкі выхадцаў з Англіі і Ірландыі. Крыху больш за 8 % насельніцтва азіяцкага паходжання: кітайцы, в'етнамцы і філіпінцы. Карэннае насельніцтва негра-аўстралоіднай расы складае ўсяго каля 0,5 млн чалавек і пражывае ў асноўным на поўначы мацерыка (мал. 204). Большасць жыхароў краіны вызнаюць хрысціянства (каталіцызм і пратэстанцтва). Дзяржаўнай мовай Аўстраліі з'яўляецца англійская.



Мал. 204. Сучасныя прадстаўнікі аўстралійскай расы

с. 98 Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва адна з самых нізкіх у свеце — 3,2 чал./км^2. Найбольшая яна на паўднёвым захадзе, у паўднёва-ўсходняй і ўсходняй частцы Аўстраліі ў прыбярэжнай паласе. Тут шчыльнасць дасягае 50 чал./км^2. Астатняя тэрыторыя заселена нязначна, сярэдняя шчыльнасць не дасягае і 1 чал./км^2. Засяленне і асваенне ўнутраных пустынных раёнаў было звязана з захопам свабодных зямель і здабычай золата на новых радовішчах (зямельнай і залатой «ліхаманкамі»). Аўстралійскі Саюз, як і іншыя высокаразвітыя краіны, мае нізкі натуральны прырост насельніцтва — каля 6 ‰. Сярэдняя працягласць жыцця адна з самых высокіх у свеце (82,3 года). Каля 65 % насельніцтва знаходзіцца ва ўзросце 15–50 гадоў.

Аўстралійскі Саюз — адна з найбольш урбанізаваных краін у свеце: у гарадах пражывае каля 90 % насельніцтва. Найбольш буйныя гарады і прамысловыя цэнтры размешчаны на паўд-



Мал. 205. Канбера — сталіца Аўстралійскага Саюза

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

нёвым усходзе краіны. *Канбера* — сталіца Аўстралійскага Саюза (432,1 тыс. чалавек) (мал. 205). *Сідней* — самы вялікі горад краіны з насельніцтвам большым за 4,5 млн чалавек. Гэта буйны прамысловы, навуковы і культурны цэнтр. Горадам-мільянерам з'яўляецца таксама *Мельбурн* (4 млн чал.).

56.3. Гаспадарка. Аўстралійскі Саюз уваходзіць у групу эканамічна развітых краін свету з постіндустрыяльным тыпам гаспадаркі (мал. 206). Разнастайнасць прыродных умоў і рэсурсаў, адсутнасць ваенных дзеянняў, пастаянная фінансавая і палітычная падтрымка Вялікабрытаніі спрыяюць развіццю эканомікі Аўстралійскага Саюза.



Мал. 206. Структура ВУП Аўстралійскага Саюза (%)

Прамысловасць. Асаблівае месца ў эканоміцы краіны займае здабыўная прамысловасць. Яна дае больш за 1/3 усёй прамысловай прадукцыі і з'яўляецца галіной міжнароднай спецыялізацыі. Аўстралійскі Саюз займае пазіцыі лідара па здабычы жалезнай руды, каменнага вугалю, баксітаў, золата, алмазаў, а таксама свінцовай, цынкавай, марганцавай і вальфрамавай руд. Большая частка здабытай мінеральнай сыравіны ідзе на экспарт. Краіна займае 1-е месца ў свеце па экспарце вугалю, 2-е — жалезнай руды.

Вядучымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца ***металургія*** (як чорная, так і каляровая), машынабудаванне, хімічная, харчовая прамысловасць, якія працуюць на мясцовай сыравіне. Найбуйнейшыя металургічныя камбінаты размешчаны на поўдні і паўднёвым захадзе краіны паблізу радовішчаў жалезнай руды. ***Машынабудаванне*** краіны абапіраецца на высокатэхналагічныя галіны — электроніку і электратэхніку, аўтамабілебудаванне, сельскагаспадарчае машынабудаванне. ***Хімічная*** прамысловасць развіваецца ў партовых гарадах (на базе прывазной нафты) і ў раёнах каменнавугальных басейнаў.

Асаблівасцю апрацоўчай прамысловасці Аўстраліі з'яўляецца важная роля ***харчовай прамысловасці***. Яна цалкам забяспечвае сябе прадуктамі харчавання і з'яўляецца найбуйнейшым экспарцёрам харчавання. Аўстралія вывозіць у іншыя краіны мяса (бараніну, ялавічыну, цяляціну), малочныя прадукты (сметанковае масла, сыр), муку, цукар. Найбуйнейшымі эканамічнымі цэнтрамі краіны з'яўляюцца Мельбурн, Сідней, Брысбан.

56.4. Сельская гаспадарка адыгрывае важную ролю ў эканоміцы Аўстраліі і з'яўляецца галіной міжнароднай спецыялізацыі. Асаблівае месца ў сельскай гаспадарцы займае ***жывёлагадоўля***. Вялікія плошчы пашы з'яўляюцца спрыяльнымі для развіцця авечкагадоўлі. Аўстралія займае

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2-е месца ў свеце па пагалоўі авечак і 1-е месца па настрыгу воўны і вытворчасці бараніны. Шэрсць аўстралійскіх мерыносаў адрозніваецца высокай якасцю і вельмі цэніцца на сусветным рынку (мал. 207).



Мал. 207. Стрыжка авечак на аўстралійскай ферме

Забяспечанасць раллёй на душу насельніцтва ў Аўстраліі самая высокая ў свеце — больш за 1,8 га. Аўстралія — адзін з галоўных экспарцёраў пшаніцы. Пад гэтай культурай занята 3/4 пасяўных плошчаў. «Пшанічны пояс» Аўстраліі размешчаны на поўдзень ад г. Брысбена. На арашальных землях развіта вінаградарства, вырошчваецца бавоўнік, тытунь.

Знешнія эканамічныя сувязі. Транспарт. Галоўнымі гандлёвымі партнёрамі краіны з'яўляюцца Японія, Паўднёвая Карэя, ЗША, Вялікабрытанія, Германія. Каля трэцяй часткі экспарту складаюць паліва, рудныя карысныя выкапні і першасныя металы, машыны і абсталяванне, мяса, шэрсць, пшаніца. Краіна імпартуе сельскагаспадарчыя машыны, будаўнічую тэхніку, фасфарыты для вытворчасці ўгнаенняў.

Аўстралійскі Саюз — найбуйнейшая марская краіна. Галоўным відам транспарту ў міжнародных перавозках з'яўляецца марскі. Найбуйнейшыя марскія парты — Брысбен, Сідней, Мельбурн. Ва ўнутраных перавозках грузаў лідзіруе чыгуначны транспарт, у пасажырскіх перавозках — аўтамабільны транспарт (мал. 208). Аўтамабільныя дарогі і чыгункіі радыяльна адходзяць ад буйных гарадоў. Транскантынентальныя магістралі перасякаюць Аўстралію з захаду на ўсход (Перт — Сідней) і з поўначы на поўдзень (Дарвін — Адэлаіда — Мельбурн і Дарвін — Брысбен — Н'юкасл — Сідней — Мельбурн).



Мал. 208. Доўгія аўтапаязды здзяйсняюць перавозкі у здабыўных раёнах Аўстраліі

Абагульнім і запомнім. Аўстралійскі Саюз — высокаразвітая федэратыўная дзяржава. Галоўнай асаблівасцю эканоміка-геаграфічнага становішча краіны з'яўляецца адасобленасць ад іншых рэгіёнаў. Для насельніцтва характэрныя складаны этнічны склад, нізкая шчыльнасць насельніцтва, высокі ўзровень урбанізацыі. Аўстралійскі Саюз — краіна з магутнай здабыўной прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Вядучымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца металургія, машынабудаванне, хімічная, харчовая прамысловасць, якія працуюць на мясцовай сыравіне.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым сябе. 1. Якія асаблівасці эканоміка-геаграфічнага становішча Аўстралійскага Саюза? 2. Чаму на сцягу Аўстралійскага Саюза намаляваны сцяг Вялікабрытаніі? 3. Як прыродныя ўмовы Аўстраліі паўплывалі на развіццё гаспадаркі дзяржавы? 4. Чаму ў краіне больш высокае развіццё атрымала здабыўная прамысловасць? 5. У чым асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі краіны?

Ад тэорыі да практыкі. 1. У пустынных раёнах Аўстраліі вылучаюцца невялікія раёны з адносна высокай шчыльнасцю насельніцтва, што не характэрна для пустынь. Выкарыстоўваючы карты атласа, растлумачце прычыны гэтай з'явы. 2. Уявіце сябе ў ролі экскурсавода і распрацуйце для аднакласнікаў віртуальную экскурсію на тэму «Аўстралія — незвычайная краіна».

Абмяркуем. Што з'яўляецца перашкодай, абмежаваннем для магчымасці пераўтварэння Аўстраліі ў буйны сусветны цэнтр турызму?

§ 57. Акіянія. Новая Зеландыя

Успамінаем. *Які рэгіён Зямлі называецца Акіяніяй і з якіх прыродных абласцей яна складаецца? Якія па паходжанні астравы Акіяніі?*

Разважаем. *Чаму ў Новай Зеландыі слаба развіта здабыўная прамысловасць?*

57.1. Палітычная карта. Групы астравоў (архіпелагі) і адзінкавыя астравы заходняй і цэнтральнай частак Ціхага акіяна аб'яднаны ў геаграфічную вобласць пад агульнай назвай Акіянія. Сучасная палітычная карта Акіяніі пачала фарміравацца ў перыяд барацьбы каланіяльных дзяржаў за падзел паміж сабой акіянічных архіпелагаў. Каланіяльны раздзел астравоў Акіяніі завяршыўся да канца XIX ст. Да пачатку 60-х гг. XX ст. у Акіяніі была адна незалежная дзяржава — Новая Зеландыя (былая калонія Вялікабрытаніі). У 60-я гг. у рэгіёне пачаўся працэс распаду каланіяльнай сістэмы. Незалежнымі сталі краіны, якія знаходзяцца пад кіраваннем іншых дзяржаў, — Заходняе Самоа (Новая Зеландыя), Науру (Вялікабрытанія, Аўстралія і Новая Зеландыя), Тонга і Фіджы (Вялікабрытанія) і інш. Да канца XX ст. у Акіяніі ўтварылася больш за 10 незалежных дзяржаў. У цяперашні час Акіянія ўключае больш за 20 краін. Частка з іх з'яўляецца суверэннымі дзяржавамі, некаторыя застаюцца залежнымі тэрыторыямі ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Аўстраліі і інш. *(Знайдзіце іх на карце.)*

с. 98–99

У самым канцы XIX ст. на Гавайскіх астравах жыў і працаваў наш зямляк, ураджэнец Магілёўскай губерні М. К. Судзілоўскі (псеўданім Русель). У мясцовага насельніцтва Гавайскіх астравоў ён меў мянушку Каука Лукіні («рускі доктар»). У 1901 г. М. К. Судзілоўскі-Русель быў абраны першым прэзідэнтам Сената Гавайскіх астравоў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

З улікам прыналежнасці жыхароў да таго ці іншага этнасу гістарычна склалася дзяленне ўсіх астравоў на чатыры этнагеаграфічныя вобласці: Палінезія, Меланезія, Мікранезія, Новая Зеландыя. У цэнтры Ціхага акіяна знаходзіцца самая аддаленая ад усіх мацерыкоў частка Акіяніі — Палінезія (з грэчаскай — ‘шмат астравоў’). Тут размешчаны такія краіны, як Тувалу, Тонга, Самоа. У заходняй частцы Ціхага акіяна паміж Паўночным тропікам і экватарам размешчана Мікранезія (з грэчаскай — ‘малыя астравы’). Да яе адносяцца, напрыклад, краіны Кірыбаці, Науру, Федэратыўныя Штаты Мікранезіі. У Меланезіі (з грэчаскай — ‘чорныя астравы’), якая знаходзіцца таксама ў заходняй частцы Ціхага акіяна, толькі ў Паўднёвым паўшар’і, размешчаны найбуйнейшыя краіны Акіяніі: Папуа-Новая Гвінея, Саламонавы астравы, Фіджы.

57.2. Новая Зеландыя. ЭГС і насельніцтва. Асаблівае месца сярод краін Акіяніі займае Новая Зеландыя. Гэта эканамічна высокаразвітая краіна. Яна размешчана на паўднёвым усходзе ад Аўстраліі на двух буйных астравах — Паўночны і Паўднёвы, а таксама на невялікім востраве Сцюарт. Акрамя таго, да Новай Зеландыі адносяцца больш за 700 дробных астравоў (толькі каля 60 прыдатныя для жыцця і заселеныя).

Плошча краіны складае 270,5 тыс. км^2, колькасць насельніцтва — 4,7 млн чалавек. Сталіца — горад *Велінгтон* (431,4 тыс. чал.) — трэці горад па колькасці насельніцтва, размешчаны на востраве Паўночны (мал. 209). Новая Зеландыя яшчэ больш аддаленая ад іншых мацерыкоў, чым Аўстралійскі Саюз. Тасманава мора аддзяляе Новую Зеландыю ад Аўстраліі на 1700 км. Ціхі акіян абмывае ўсходняе ўзбярэжжа краіны і аддзяляе яе на поўначы на 1000 км ад Новай Каледоніі, на ўсходзе — на 8700 км ад Чылі і на поўдні — на 2500 км ад Антарктыды. Працягласць прыбярэжнай паласы Новай Зеландыі складае больш за 15 тыс. км. Новая Зеландыя — унітарная дзяржава, уключае 17 раёнаў, знаходзіцца ў складзе Брытанскай Садружнасці і пабудавана на прынцыпах канстытуцыйнай манархіі. Гэта былая калонія Вялікабрытаніі.



Мал. 209. Горад Велінгтон

Паўночны і Паўднёвы астравы Новай Зеландыі мацерыковага паходжання ўваходзяць у склад маладога Ціхаакіянскага складкаватага пояса. Паўночны востраў адрозніваецца высокай вулканічнай актыўнасцю. Клімат Новай Зеландыі змяняецца ад цёплага субтрапічнага на Паўночным востраве да больш прахалоднага ўмеранага на поўдні і ў цэнтральных рэгіёнах Паўднёвага вострава з дастатковай колькасцю ападкаў,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

умерана цёплым летам і даволі цёплай зімой. У горных раёнах пераважае суровы высакагорны клімат.

с. 99 Асноўнае насельніцтва — (78 %) — новазеландцы еўрапейскага паходжання, каля 15 % — карэннае насельніцтва — маоры (мал. 210), 4 % — палінезійцы. Дзяржаўнымі мовамі ў Новай Зеландыі з'яўляюцца англійская і маоры. Англійская мова з'яўляецца асноўнай, на ёй гаворыць больш за 90 % насельніцтва краіны. Каля 78 % насельніцтва вызнае хрысціянства, 16,5 % — мясцовыя традыцыйныя вераванні. Нераўнамернае размяшчэнне насельніцтва. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 16 чал./км^2. Прыродныя ўмовы, узровень эканомікі спрыяюць даволі высокай працягласці жыцця (81,5 года). Натуральны прырост невысокі — 6 ‰ (нараджальнасць — 13 ‰, смяротнасць — 7 ‰). Узроставая структура насельніцтва адрозніваецца высокай доляй дзяцей (больш за 20 %). Гарадское насельніцтва складае 86 %. Найбуйнейшы горад — Окленд (1,6 млн чал.).



Мал. 210. Прадстаўнікі абарыгенаў Новай Зеландыі — маоры

57.3. Гаспадарчая дзейнасць насельніцтва. Новая Зеландыя — эканамічна высокаразвітая краіна з эканомікай постіндустрыяльнага тыпу. У эканоміцы краіны на прамысловасць прыходзіцца 17 % ВУП. Распрацоўваюцца радовішчы прыроднага газу, нафты, каменнага вугалю, золата, серабра, жалезістага пяшчаніку. Для вытворчасці электраэнергіі выкарыстоўваецца энергія некалькіх хуткіх рэк, а таксама геатэрмальная пара на вулканічных плато Паўночнага вострава. На выкарыстанні мясцовых прыродных рэсурсаў заснаваны галіны апрацоўчай прамысловасці: лясная, рыбная, гарбарная. Працуюць цэментныя заводы, фабрыкі па вытворчасці ўгнаенняў, шклозаводы, завод па вырабе сталі, алюмініевы завод. Ёсць машынабудаўнічыя і тэкстыльныя прадпрыемствы. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры краіны — Окленд, Данідзін. Аднак галоўныя галіны міжнароднай спецыялізацыі — сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць. Нягледзячы на высокі ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі, яна дае толькі 6 % ВУП краіны. У сельскай гаспадарцы пераважае жывёлагадоўля. У асноўным развіта пашавая жывёлагадоўля і авечкагадоўля (мал. 211). Пашы і ворныя землі займаюць больш за палову тэрыторыі. Прадукцыя сельскай гаспадаркі складае больш за 50 %



Мал. 211. Пашы Новай Зеландыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

экспарту. Асноўныя тавары экспарту — сухое і згушчанае малако, алей, сыр, мяса і воўна. Як астраўная дзяржава Новая Зеландыя экспартуе рыбу і морапрадукты. Экспартуецца таксама драўніна і вырабы з яе.

На сферу паслуг прыходзіцца 77 % ВУП Новай Зеландыі. Значную долю ў сферы паслуг краіны складае гандаль. З кожным годам усё больш важным элементам эканомікі краіны становіцца турызм. Геаграфічнае становішча краіны і прыгажосць яе прыроды ў спалучэнні з высокім узроўнем сэрвісу спрыяюць гэтаму. У цяперашні час турызм дае каля 10 % ВУП.

Асноўны міжнародны аэрапорт знаходзіцца ў сталіцы. Галоўная аўтамабільная траса праходзіць праз абодва астравы. Паміж Паўночным і Паўднёвым астравамі праз праліў Кука дзейнічае паромная пераправа (мал. 212).



Мал. 212. Паромная пераправа паміж Паўночным і Паўднёвым астравамі

Абагульнім і запомнім. Акіянія ўключае больш за 20 краін, частка з якіх з'яўляецца суверэннымі дзяржавамі, некаторыя знаходзяцца пад кіраваннем іншых дзяржаў. Новая Зеландыя — эканамічна высокаразвітая постіндустрыяльная дзяржава Акіяніі. Дзяржаўныя мовы — англійская і маоры. Галоўныя галіны міжнароднай спецыялізацыі Новай Зеландыі — сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць.

Праверым сябе. 1. Які рэгіён свету называецца Акіяніяй? 2. Якая з галін сельскай гаспадаркі з'яўляецца галіной спецыялізацыі і чаму? 3. У чым асаблівасці насельніцтва Новай Зеландыі? 4. Якія галіны прамысловасці развіваюцца ў Новай Зеландыі? 5. Якая прадукцыя Новай Зеландыі запатрабавана на сусветным рынку?

Ад тэорыі да практыкі. 1. Нанясіце на контурную карту этнографа-геаграфічныя вобласці Акіяніі і 2–3 краіны, якія адносяцца да кожнай з іх. 2. Выкарыстоўваючы навучальны матэрыял і тэматычныя карты атласа, падрыхтуйце вуснае паведамленне «Падарожнічаючы па Акіяніі, я бачыў...».

Абмяркуем. Развіццё турысцкага бізнесу для краін Акіяніі — гэта карысць ці не?

Для дапытлівых. Усё больш замежных кампаній ствараюць свае прадпрыемствы (арганізацыі) у Новай Зеландыі. Які бізнес адкрылі б вы ў гэтай краіне і чаму?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар установы адукацыі)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Вучэбнае выданне

Лопух Пётр Сцяпанавіч
Страха Мікалай Леанідавіч
Сарычава Вольга Уладзіміраўна
Шандроха Андрэй Генадзевіч

ГЕАГРАФІЯ. КРАІНЫ І НАРОДЫ

Вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання

Рэдактар *Т. К. Слаута*
Мастакі *В. Ю. Лагун, К. К. Шастоўскі*
Мастацкія рэдактары *Д. В. Кашавар, К. К. Шастоўскі*
Тэхнічныя рэдактары *В. Ю. Лагун, Т. К. Слаута*
Мастак вокладкі *К. У. Максімава*
Камп'ютарны набор *В. Ю. Лагун*
Камп'ютарная вёрстка *В. Ю. Лагун*
Карэктары *К. М. Пучынская, Т. К. Слаута*

Падпісана да друку 30.08.2019. Фармат $70 \times 90\ ^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 18,14. Ул.-выд. арк. 15,0. Тыраж 15 440 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 14.11.2014.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр-т Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

СФЕРЫ, ГАЛІНЫ І ВІДЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ



СФЕРА ПАСЛУГ

ТРАНСПАРТ І СУВЯЗЬ
- Трубаправодны
- Аўтамабільны
- Чыгуначны
- Водны
- Паветраны

ГАНДАЛЬ
- Аптовы гандль
- Рознічны гандль

ПАСЛУГІ ПА ЧАСОВЫМ ПРАЖЫВАННІ І ХАРЧАВАННІ
- Паслугі па часовым пражыванні
- Паслугі па грамадскім харчаванні

АДУКАЦЫЯ І НАВУКА
- Дашкольная, пачатковая, сярэдняя і вышэйшая адукацыя
- Навуковыя даследаванні

АХОВА ЗДАРОЎЯ
- Прадастаўленне сацыяльных паслуг
- Ахова здароўя

ФІНАНСЫ І СТРАХАВАННЕ
- Страхаванне
- Фінансавыя паслугі

ДЗЯРЖАЎНАЕ КІРАВАННЕ
- Абаронная дзейнасць
- Дзейнасць органаў улады

СПОРТ, ЗАБАВЫ І АДПАЧЫНАК
- Фізічная культура і спорт
- Арганізацыя адпачынку і забаў

ТУРЫСЦКІЯ І ІНШЫЯ ПАСЛУГІ
- Арэнда, пракат і інш.
- Турысцкая дзейнасць

АПЕРАЦЫІ З НЕРУХОВАЙ МАЁМАСЦЮ
- Здача ў наём нерухомай маёмасці
- Пакупка і продаж нерухомай маёмасці



ЭНЕРГЕТЫКА
- Вытворчасць, перадача, размеркаванне пары і гарачай вады
- Вытворчасць, перадача і размеркаванне электраэнергіі

СФЕРА ВЫТВОРЧАСЦІ

БУДАЎНІЦТВА
- Будаўніцтва будынкаў
- Будаўніцтва дарог




АПРАЦОЎЧАЯ ПРАМЫЛОВАСЦЬ
- Вытворчасць прадуктаў харчавання
- Тэкстыльная вытворчасць
- Швейная вытворчасць
- Вытворчасць вырабаў са скуры
- Вытворчасць вырабаў з дрэва
- Вытворчасць цэлюлозы, паперы
- Паліграфічная дзейнасць
- Вытворчасць коксу і прадуктаў нафтаперапрацоўкі
- Вытворчасць хімічных прадуктаў
- Фармацэўтычная вытворчасць
- Вытворчасць гумавых і пластмасавых вырабаў
- Металургічная вытворчасць
- Вытворчасць электронікі і электратэхнікі
- Вытворчасць машын і абсталявання
- Вытворчасць транспартных сродкаў
- Вытворчасць іншых гатовых вырабаў

ГОРНАЗДАБЫЎНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ
- Здабыча вугля, нафты і прыроднага газу
- Здабыча металічных руд
- Здабыча іншых карысных выкапняў

СЕЛЬСКАЯ, ЛЯСНАЯ І РЫБНАЯ ГАСПАДАРКА
- Раслінаводства
- Жывёлагадоўля
- Паляванне
- Лесаводства і лесанарыхтоўкі
- Рыбаводства і рыбалоўства




Эскімосы


Мексіканцы


Кечуа


Індзійцы


Нілоты


Арабы


Казахі

Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі
Унітарная манархія
Плошча – 243,8 тыс. км²
Насельніцтва – 66,4 млн чал.
Сталіца – Лондан

Фінляндская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 338,1 тыс. км²
Насельніцтва – 5,5 млн чал.
Сталіца – Хельсінкі

Каралеўства Швецыя
Унітарная манархія
Плошча – 450,0 тыс. км²
Насельніцтва – 10,2 млн чал.
Сталіца – Стакгольм

Каралеўства Данія
Унітарная манархія
Плошча – 42,8 тыс. км²
Насельніцтва – 5,8 млн чал.
Сталіца – Капенгаген

Рэспубліка Ісландыя
Унітарная рэспубліка
Плошча – 102,9 тыс. км²
Насельніцтва – 0,4 млн чал.
Сталіца – Рэйк'явік

Каралеўства Нарвегія
Унітарная манархія
Плошча – 385,2 тыс. км²
Насельніцтва – 5,3 млн чал.
Сталіца – Осла

Рэспубліка Казахстан
Унітарная рэспубліка
Плошча – 2724,9 тыс. км²
Насельніцтва – 18,4 млн чал.
Сталіца – Нур-Султан

Федэратыўная Рэспубліка Германія
Федэратыўная рэспубліка
Плошча – 357,0 тыс. км²
Насельніцтва – 82,8 млн чал.
Сталіца – Берлін

Французская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 547,0 тыс. км²
Насельніцтва – 65,1 млн чал.
Сталіца – Парыж

Злучаныя Штаты Амерыкі (ЗША)
Федэратыўная рэспубліка
Плошча – 9519,0 тыс. км²
Насельніцтва – 328,0 млн чал.
Сталіца – Вашынгтон

Мексіканскія Злучаныя Штаты
Федэратыўная рэспубліка
Плошча – 1964,4 тыс. км²
Насельніцтва – 130,8 млн чал.
Сталіца – Мехіка

Італьянская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 301,3 тыс. км²
Насельніцтва – 60,6 млн чал.
Сталіца – Рым


Літоўская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 65,3 тыс. км²
Насельніцтва – 2,8 млн чал.
Сталіца – Вільнюс

Латвійская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 64,6 тыс. км²
Насельніцтва – 1,9 млн чал.
Сталіца – Рыга

Эстонская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 45,2 тыс. км²
Насельніцтва – 1,3 млн чал.
Сталіца – Талін

Маштаб 1:150 000 000

РЭГІЁНЫ МІРА ПА КЛАСІФІКАЦЫІ ААН



Канада
Федэратыўная манархія
Плошча – 9976,1 тыс. км²
Насельніцтва – 37,2 млн чал.
Сталіца – Атава

Расійская Федэрацыя
Федэратыўная рэспубліка
Плошча – 17 098,2 тыс. км²
Насельніцтва – 147,3 млн чал.
Сталіца – Масква

1 Ісландыя
2 Вялікабрытанія
3 Данія
4 Эстонія
5 Латвія
6 Літва
7 Францыя
8 Германія
9 Польшча
10 Беларусь
11 Грузія
12 Арменія
13 Азербайджан
14 Кыргызстан
15 Таджыкістан

Японія
Унітарная манархія
Плошча – 377,8 тыс. км²
Насельніцтва – 126,5 млн чал.
Сталіца – Токіа

Федэратыўная Рэспубліка Бразілія
Федэратыўная рэспубліка
Плошча – 8544,0 тыс. км²
Насельніцтва – 209,4 млн чал.
Сталіца – Бразіліа

Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (ПАР)
Унітарная рэспубліка
Плошча – 1219,1 тыс. км²
Насельніцтва – 57,7 млн чал.
Сталіца – Прэторыя

Аўстралійскі Саюз
Федэратыўная манархія
Плошча – 7683,0 тыс. км²
Насельніцтва – 24,1 млн чал.
Сталіца – Канбера

ЕЎРОПА
- Паўночная Еўропа
- Заходняя Еўропа
- Усходняя Еўропа
- Паўднёвая Еўропа

АЗІЯ
- Заходняя Азія
- Цэнтральная Азія
- Усходняя Азія
- Паўднёвая Азія
- Паўднёва-Усходняя Азія

АМЕРЫКА
- Паўночная Амерыка
- Лацінская Амерыка і Карыбскі басейн
- Цэнтральная Амерыка
- Карыбскі басейн
- Карыбскі басейн

АФРЫКА
- Паўночная Афрыка
- Заходняя Афрыка
- Цэнтральная Афрыка
- Усходняя Афрыка
- Паўднёвая Афрыка

АЎСТРАЛІЯ І АКІЯНІЯ
- Аўстралія і Новая Зеландыя
- Меланезія
- Мікранезія
- Палінезія

Рэспубліка Польшча
Унітарная рэспубліка
Плошча – 312,7 тыс. км²
Насельніцтва – 38,4 млн чал.
Сталіца – Варшава

Украіна
Унітарная рэспубліка
Плошча – 603,7 тыс. км²
Насельніцтва – 42,3 млн чал.
Сталіца – Кіеў

Арабская Рэспубліка Егіпет
Унітарная рэспубліка
Плошча – 1001,5 тыс. км²
Насельніцтва – 97,0 млн чал.
Сталіца – Каір

Грузія
Унітарная рэспубліка
Плошча – 69,7 тыс. км²
Насельніцтва – 3,9 млн чал.
Сталіца – Тбілісі

Рэспубліка Арменія
Унітарная рэспубліка
Плошча – 29,7 тыс. км²
Насельніцтва – 3,0 млн чал.
Сталіца – Ерэван

Рэспубліка Узбекістан
Унітарная рэспубліка
Плошча – 447,4 тыс. км²
Насельніцтва – 32,9 млн чал.
Сталіца – Ташкент

Кыргызская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 198,5 тыс. км²
Насельніцтва – 6,1 млн чал.
Сталіца – Бішкек

Туркменістан
Унітарная рэспубліка
Плошча – 491,2 тыс. км²
Насельніцтва – 5,9 млн чал.
Сталіца – Ашхабад

Рэспубліка Таджыкістан
Унітарная рэспубліка
Плошча – 143,1 тыс. км²
Насельніцтва – 9,1 млн чал.
Сталіца – Душанбэ

Кітайская Народная Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 9561,0 тыс. км²
Насельніцтва – 1393,8 млн чал.
Сталіца – Пекін

Рэспубліка Індыя
Федэратыўная рэспубліка
Плошча – 3287,3 тыс. км²
Насельніцтва – 1371,3 млн чал.
Сталіца – Нью-Дэлі

Новая Зеландыя
Унітарная манархія
Плошча – 270,5 тыс. км²
Насельніцтва – 4,9 млн чал.
Сталіца – Уэлінгтан

Азербайджанская Рэспубліка
Унітарная рэспубліка
Плошча – 86,6 тыс. км²
Насельніцтва – 9,9 млн чал.
Сталіца – Баку


Шведы


Немцы


Італьянцы


Палякі


Украінцы


Рускія


Японцы

© Геаграфічная аснова. Дзяржаўны камітэт па маёмасці Рэспублікі Беларусь, 2019
© Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белкартаграфія», 2019